Ф. Янкоўскі

ДЫЯЛЕКТНЫ СЛОЎНІК

МІНСК 1959

Ф. Янкоўскі

ДЫЯЛЕКТНЫ СЛОЎНІК

ВЫДАВЕЦТВА АН БССР
МІНСК 1959

Рэдактар
кандыдат філалагічных навук
М. Р. СУДНІК

УВОДЗІНЫ

Надрукаваныя тут народныя словы падслуханы і запісаны мною ў Глускім раёне Мінскай вобласці[1]. Рабілася гэта пачынаючы з 1945 г. З 1947 г. да верасня 1957 г. запісы вяліся несістэматычна.

У слоўнік увайшла толькі частка сабранага матэрыялу.

Розныя групы слоў па-свойму цікавыя. Адны з іх—гэта старажытныя агульнаўсходнеславянскія ці агульнаславянскія, напрыклад: *віж* (**вижь**), *віжаваць* (**вижевати**), *свесь* (**свесь**), *блашчы́ца* (**площица**); другія—узніклі як дыялектныя словы, напрыклад: *зне́хтаваць, ала́дчынка, ралёйны;* трэція—запазычаныя, іншамоўныя, напрыклад: *хвіст, штанда́ра, мітрэнка, пэйсы, шу́пель.*

Спынюся на некаторых з іх.

---

[1] Значная частка слоў з паметкаю «Глуск» запісана ў Глуску, але не ад ураджэнцаў гэтага гарадскога пасёлка.

ВІЖ. Слова запісана ў в. Клетнае. Значэнне яго—хітрун, шпіён, які «жыве ціхянько», заўсёды імкнецца непрыкметна выведаць пра іншых, пра суседзяў; такіх не любяць і характарызуюць як нялюдскіх у грамадзе; аб гэтым сведчаць наступныя фразы: *Віж той пракляты. О-о-о! Ён віж* (з інтанацыяй ганьбы). Слова *віж* ад таго ж кораня, што і старажытнае агульнаўсходнеславянскае слова видѣти; вижь—з видјь (параўн.: польскае widz—глядач, сведка і інш.). У старажытнасці яно мела значэнне паняты, сведка. Такім чынам, слова *віж* захавалася са старадаўнасці, але змяніла значэнне. Ад слова *віж* ёсць і вытворныя — *віжаваць, вывіжаваць, навывіжоўваць, віжаванне, віжаваты.*

ЗНЕ́ХТАВАЦЬ (у вымаўленні *зьнехтуваць* і *зьнехтаваць*). Запісана ў в. Слаўкавічы. Дзеяслоў I спражэння (-ую, -уеш), пераходны. Утвораны ад займенніка, на першы погляд—*нехта,* але сваім сэнсам, значэннем *знехтаваць* у сваяцтве з *ніхто. Знехтаваць*—ахаяць, зганьбіць, зусім прынізіць (каго-небудзь). Параўн.: *Ты—ніхто.* У гаворцы в. Слаўкавічы мае месца зблытванне часціц *не* і *ні,* прычым часцей ужываецца *ні,* іншы раз *не* замест *ні (нечо́га не рабілі).* Можа быць, гэтым і тлумачыцца—*зне́хтаваць* ад *ніхто.*

ХВІСТ. Назоўнік мужчынскага роду. Знак забароны пасвіць жывёлу (на сенажаці, канюшыне, пожні); гэта — тычка, на якой завязан жмут саломы, травы або закручаны вузлом галінкі з лістамі. Можна падумаць, што

хвіст — узятае з украінскай мовы слова: *хвіст* нагадвае падвязаны конскі хвост, а *хвост* паўкраінску—*хвіст.* Параўн. таксама укр. *хист, захист—абарона, забарона.*

Некаторыя з надрукаваных тут слоў пачуеш часцей: *кукўлька, абганяць* (бульбу), *перавéдаць, акалóт, алéшнік, астрóва, бач, батавáць, бáцене, брацéнік, бyякí, галашчóкам, глёўкі, гўшкацца, ёмка, завішавáць, злыгіч;*

а каторыя—радзей ці вельмі рэдка: *барліна, віж, віжавáць, галэп, дóйло, зам'ёт, заўвіца, знéхтавацъ, ірха, лёзная, лучнік, лях, ляшáн, маршчáк, мітрэнка, тóлмач, рашэціна, сахóр, сукáло, траціна.*

Да некаторых слоў прыводзяцца паралелі з гаворак розных раёнаў Беларусі (Радашковіцкі, Заслаўскі, Карэліцкі і інш.; гг. Мсціслаў, Радашковічы). Яны або мною сабраны, або падказаны знаёмымі і калегамі, якія родам з гэтых мясцін.

Рыхтуючы гэты слоўнік да друку, мелася на мэце: даць выкладчыкам беларускай дыялекталогіі, а таксама іншых раздзелаў навукі аб роднай мове (сучасная беларуская мова, гістарычная граматыка) новыя факты і матэрыялы; даць матэрыялы і факты для студэнцкіх курсавых работ па лексіцы народных гаворак; паказаць у пэўнай меры разнастайнасць дыялектнай лексікі поўдня Беларусі; звярнуць увагу на неабходнасць неадкладнага і самага шырокага паходу студэнтаў, вучняў, выкладчыкаў, журналістаў, пісьменнікаў на збіранне, сістэматызацыю, друкаванне і вывучэнне

дыялектнай лексікі — невычэрпнага народнага багацця [1].

Шырокае збіранне дыялектнай лексікі павінна быць падпарадкавана не толькі задачам навуковага асвятлення тэарэтычных пытанняў мовазнаўства, а і задачам штодзённых клопатаў пра ўзбагачэнне і далейшую нармалізацыю нашай літаратурнай мовы. Нярэдка ў нас ужываюцца словы няправільна, часам з «хістаннямі» ў адносінах роду, ліку, націску.

Ці трэба, скажам, ужываць побач і **поезд**, і **цягнік?** Ці захоўваць у літаратурнай мове **атрымаць** (пасылку, зарплату)?

Нярэдка пішуць і гавораць *прызачыніць (пры-за-чыніць), прызакрыць (пры-за-крыць)* юшку, фортачку, дзверы і *прыадчыніць (пры-ад-чыніць), прыадкрыць (пры-ад-крыць)* юшку, фортачку, дзверы. Ці добра? Ці правільна? У Глускім, Любанскім, Старадарожскім раёнах Мінскай вобласці, у Акцябрскім і Парыцкім раёнах Гомельскай вобласці, у Асіповіцкім і Бабруйскім раёнах Магілёўскай вобласці (па маіх уласных назіраннях) гавораць:

прычыніць (юшку, фортачку, дзверы),

прачыніць (юшку, фортачку, дзверы).

У Кандрата Крапівы: Прачыніла дзверы ў хату і яшчэ з-за парога ледзь выгаварыла... (Збор твораў, т. II, Мінск, 1956, стар. 191).

---

[1] Гэтага вымагае і сучасны ўзровень беларускай дыялекталогіі як навукі, якая мае, як ніколі, багатыя матэрыялы па фанетыцы і марфалогіі народных гаворак і мае вельмі бедныя і скупыя матэрыялы па лексіцы народных гаворак.

У Максіма Лужаніна: прачыніць... дзверцы («Моваю сэрца», 1955, стар. 81).

Прычыніць і *прачыніць* ужываюцца і ў некаторых раёнах вакол сталіцы, і ў шэрагу раёнаў Маладзечанскай і Гродзенскай абласцей (высветлена шляхам апытання студэнтаў—ураджэнцаў гэтых абласцей).

Чаму ж аддаць перавагу? *Прызачыніць* ці *прычыніць? Прыадчыніць* ці *прачыніць?*

Пішуць і гавораць іншы раз: *зачыніць* кніжку, *зачыніць* сход, *закрыць* вочы, *як і зачыніць* дзверы. Народная мова і пісьмовая практыка лепшых знаўцаў мовы дае іншае: *зачыніць* дзверы, фортачку, *адчыніць* дзверы, фортачку, але *загарнуць* кніжку, *адгарнуць* кніжку (дарэчы—не *ліста́ць* кніжку, а *гарта́ць* кніжку), *заплюшчыць* вочы, *расплюшчыць* вочы, *закрыць* сход, нараду, *адкры́ць* сход, нараду.

У жывых народных гаворках ужываюцца ў адным значэнні часціцы *вось, вот, от*. У літаратурнай мове запанавала адна з іх—*вось*. І калі хто-небудзь, апісваючы Палессе, Случчыну, жыхароў Палесся або Случчыны (тут звычайна ўжываецца *от*), у дыялагу героя ўжывае часціцу *от* гэта не выклікае здзіўлення. Калі ж пісьменнік апісвае полацкі край, расказвае пра людзей і пра падзеі каля Полацка, то часціца *от* у мове героя—зусім нечаканая.

Да мяне, як выкладчыка, часта звяртаюцца студэнты з просьбаю вызначыць, якая форма, якое слова з'яўляецца нормаю. Як правільна — шо́фер ці шафёр? цэ́мент ці цэме́нт? про́цант ці працэ́нт? і інш. Маючы перад сабою

аўдыторыю, у якой выхадцы з розных куткоў Беларусі, я меў магчымасць высветліць, што і ў Капаткевіцкім, і ў Радашковіцкім, і ў Заслаўскім, і ў Жалудоцкім, і ў Ветрынскім, і ў Дрысенскім, і ў Мсціслаўскім і без ліку іншых раёнах гавораць не *шафёр,* а *шóфер* (у вымаўленні шóфер, шóфяр, шóфір). Лінгвісты тлумачаць, што гэта слова з французскай мовы, у якой націск падае, як норма, на апошні склад, таму з націскам на ё́(о) павінна ўжывацца яно і ў нашай мове. Ці мала ёсць запазычаных слоў, якія, падпарадкоўваючыся фанетычнай сістэме і граматычнаму ладу нашай мовы, змянілі свой выгляд, маюць націск на іншым складзе? Не *цэмéнт,* а *цэ́мент.* Ці па-беларуску гаварыць *трáктары?* У многіх кутках Беларусі гучыць: *трактары́ (трактары́* або *трактарэ́), трактарóў, трактарáмі.*

Ёсць у народных гаворках некалькі слоў, якія абазначаюць працэс уборкі ільну: *браць* лён, *ірваць* лён, *скубці* лён і інш., і няма *церабіць* лён. *Цярэбяць, працярэбліваюць* зараснікі, лес; *цярэбяць (абцярэбліваюць)* галлё; *працярэбліваюць*—у значэнні прабіваюць, расчышчаюць—шлях, дарогу; *церабіць* ужываецца ў значэнні хутка, прагна, з добрым апетытам есці. У газетнай жа мове—*цярэбяць* лён.

У пісьмовай мове часам без разбору, без уліку канкрэтнага кантэксту ўжываецца слова *гвалтоўна,* забываюцца такія словы, як *сілком, сілаю, жывасілам* (ці *жывасіллю)* і інш.; без разбору, без уліку канкрэтнага кантэксту ўжываецца слова *наведаць,* тады як ёсць не толькі *наведаць,* а і *пераведаць, пераведацца, адве-*

даць (каго-небудзь), *адведацца* (параўн.: народныя *адведзіны, адведкі);* без разбору і ўліку канкрэтнага кантэксту ўжываецца кніжнае запазычанае слова *сказіць,* тады як ёсць народныя (яны зрэдку сустракаюцца і на старонках газет) *зняпраўдзіць, зняпраўджваць, няпраўдзіць.*

Лексічныя запазычанні—іншы раз простая неабходнасць у развіцці мовы. Калі ў той ці іншай мове няма адпаведнага слова для абазначэння пэўнага паняцця ці прадмета, то або ўзнікае слова — наватвор, або запазычваецца слова з іншай мовы. Але запазычанню павінны быць межы, а ўвядзенне ў літаратурную мову запазычанняў пры наяўнасці свайго, вядомага ў народна-дыялектнай ці літаратурнай мове — гэта праяўленне абыякавасці да роднай мовы, несвядомае ці свядомае не ўзбагачэнне, а збядненне роднай мовы. Часопіс «Беларусь» ужывае словы (назвы рыб) *фарэль, харыус.* Гэтыя рыбы водзяцца ў рэчках Беларусі, што бяруць пачатак галоўным чынам з крыніц Беларуска-Літоўскага ўзвышша. Л. П. Сабанееў у кнізе «Рыбы России», надрукаванай яшчэ ў сярэдзіне XIX ст., піша, што на Міншчыне, Вілейшчыне гэту рыбу называюць *стронг* (з некаторымі фанетычнымі адрозненнямі). Я пацвярджаю гэта. Гавораць не *фарэль* (гэта—шведскае слова *forele*), а *стронг, малёнькі стрóнжык.* Гавораць не *харыус,* а *ліпéнь.*

Чаму ж не кіравацца патрабаваннем Якуба Коласа аб тым, што «перад увядзеннем кожнага новага слова трэба добра абшарыць кішэні свае памяці, перагледзець слоўнікавыя і фаль-

клорныя крыніцы, прыслухацца да жывой гаворкі—а можа і знойдзецца якраз тое, што неабходна, што ўжо ўжывалася і чамусьці забыта (ці ўжываецца і невядома нам)» [1].

Беларускае радыё, напрыклад, аб'яўляе пра «замазку для вокнаў», ігнаруючы агульнавядомае слова «кіт».

У народна-дыялектнай мове слова *скрозь* ужываецца ў значэнні ўсюды, паўсюдна. У літаратурнай мове, калькіруючы фразеалагізмы, часам ужываюць *скрозь слёзы, скрозь зубы* і некаторыя іншыя. Механічнасць калькіравання тут вельмі відавочная. У дасканалых знаўцаў мовы сустракаем *праз слёзы, праз зубы.* А ёсць жа ў беларускай мове і іншыя свае спалучэнні і словы. Ужыванне дублетных і сінанімічных спалучэнняў і слоў толькі ўзбагачае літаратурную мову. Так, у адным радзе з *праз слёзы* зусім заканамерна і абгрунтавана ўжываць сінонімы *з слязьмі, праз плач, проплач* і некаторыя іншыя.

Ці не наш грэх, што мы скрозь, усюды пішам толькі *жадаю поспеху* і забываем трапныя і разнастайныя ў стылёвых адносінах народныя, не кніжныя пажаданні (напрыклад, *спору ў працы!*)? [2]

---

[1] Якуб Колас. Публіцыстычныя і крытычныя артыкулы. Мінск, 1957, стар. 309.

[2] Гаворачы пра значэнне і ўжыванне некаторых слоў (стар. 6—10), я не маю на мэце самачынна ўзаконіць тыя ці іншыя выпадкі словаўжывання, а толькі звяртаю ўвагу на іх.

Некалькі радкоў пра геаграфічныя назвы. Дзіўна, калі чытаеш, напрыклад, добра знаёмае вядомае слова *Ждановічы*—Здановічы. Каму і для чаго трэба такая пераробка, такая вольніца?

Перадача на пісьме геаграфічных назваў—вельмі адказная справа. Правільнае напісанне іх не можа не грунтавацца на жывым вымаўленні іх. Правільна, напрыклад, зрабілі, што адмовіліся ад напісання «Менск». У старажытнасці яно гучала і пісалася *Мѣньскъ* (параўн.: *мен-а),* сям-там ля сталіцы і цяпер гавораць *Менск* (ці *Меньск*). Аднак такое вымаўленне не тыповае, яно гістарычнае, але зменена е. Тое самае трэба сказаць і пра *Заслаўе*. Горад Заслаўе меў у старажытнасці назву *Ижяславль* або *Изяславль*. З цягам часу яна змянілася. На Заслаўшчыне і ў суседніх раёнах гавораць *Заслаўе* (і *Заслоўе*). Літаратурнаю нормаю стала *Заслаўе*. У гэтым слове, як і ў словах *рубель, журавель, вецер, віхор* і падобных да іх, у старажытнасці на канцы быў галосны, які адпаў, пасля чаго атрымалася нязручнае для вымаўлення канцавое спалучэнне зычных гукаў: *рубл', журавл', карабл'*[1], *ветр, віхр* і інш. Гэтыя канцавыя спалучэнні зычных у мове беларусаў з даўняга часу змяніліся; так, з *журавль*[2] атрымалася *журавел'* або *журáў* ці *жóраў;* з *рубль—рубéл';* з *карабль—карабéл';* з *вѣтръ—вéцер, з вúхрь—віхóр.* У большасці

[1] Значок ' ужываю тут для абазначэння мяккасці зычнага *л*.

[2] Літараю *ь* тут абазначан галосны *ер*.

выпадкаў паміж зычных паявіўся новы галосны (*вѣтръ — вецер*); у спалучэнні *вл'* паявіўся або ўстаўны галосны (*журавль—журавел'*), або зычны *в* змяніўся на *ў*, а *л'*—на зычны ј (*Изяславль — Заслаўе*), або проста зычны *л'* адпаў. Гэта адбылося, напрыклад, у назве горада *Мьстиславль* (у старажытнасці слова мела значэнне прыметніка—*Мсціславаў*). На Мсціслаўшчыне і ў шмат якіх суседніх раёнах гавораць *Мсціслаў* (або *Амсціслаў*), але не *Мсціслаўль*. Варта і пісаць без *ль*. Дарэчы, на Мсціслаўшчыне, як і ў даўнія часы, гэта слова вымаўляецца з націскам на *і*, а не на *а* (параўн. народную прыказку: Мсціслаў не аднаго сціснуў). Няма падставы гаварыць і пісаць *Браслаўль* (параўн.: Лістоў напісаў табе многа ў твой раён, у Браславе [1]).

Ці правільна, што на картах і ў газетах пішуць *Вілія*? (параўн.: Гэта было ў сорак першым, восенню памятнай тою, ранкам, ад хмар пацямнеўшым, па-над ракою Віллёю [2]).

Не *Нéсвіж*, а *Нясвíж*.

Не *Сíманавічы* (вёска на поўдзень ад Бабруйска), а *Сымóнавічы*.

Не *Рогава* (вёска на мяжы Заслаўскага і Радашковіцкага раёнаў), а *Рагавá*.

Не *Асíпавічы*, а *Асіпóвічы*.

Не *Нéман*, а *Нёман*.

Не *Талачынó*, а *Талачы́н*.

---

[1] М. Танк. След бліскавіцы, Мінск, 1957, стар. 92.
[2] Там жа, стар. 17.

Нельга ігнараваць таго вымаўлення, той формы геаграфічнай назвы, якая бытуе ў населеным пункце і вакол яго.

Надышоў час і наспела самая пільная патрэба, каб мы сабралі беларускія тапанімічныя назвы, склалі слоўнікі, даследавалі і ўсебакова вывучылі іх. Неабходна сабраць народную лексіку і тэрміналогію і, не чакаючы паяўлення капітальнага слоўніка, друкаваць тое, што сабрана і паспяхова збіраецца нашымі дыялектолагамі.

Збіраючы народна-дыялектную лексіку, багацце і сінанімічная разнастайнасць якой бязмежныя і невычарпальныя, варта мець на ўвазе не толькі адрозненні тыпу *гáчка, капаніца, матыка* (гэтыя словы абазначаюць той самы прадмет, але бытуюць у розных мясцінах Беларусі), а і тую разнамаснасць лексікі, якая ствараецца адрозненнямі граматычнымі, словаўтваральнымі, фанетычнымі, акцэнталагічнымі і некаторымі іншымі.

Коратка спынюся на некаторых адрозненнях, ілюструючы іх вядомымі мне прыкладамі.

Маюцца так званыя дублетныя словы, раўназначныя: *наравісты* і *натýрысты* (Глускі раён).

Ёсць словы, якія ў розных мясцінах маюць розныя значэнні: *лупáты — губáты* (Мсціслаўскі і Глускі раёны).

Адзін прадмет (дзеянне, прымета) мае розныя назвы: *папрýга* (Акцябрскі, Глускі раёны) і *дзя́га* (Заслаўскі, Лагойскі, Радашковіцкі раёны); *заслóн* (Акцябрскі, Глускі раёны), *перадóк* (Халопеніцкі раён), *зэ́даль* (Радашко-

віцкі раён), *услóн* (Нясвіжскі раён); *шýты, лабáты* і *галамóўзы* (бык); *хвóя* і *сасна́*.

Словы аднаго кораня, але адрозныя па словаўтваральных марфемах—па суфіксах ці прэфіксах: *пячáйка, печая́* (ці *печыя́), някóтка; спявáк* і *пясéльнік*.

Словы, што адрозніваюцца па націску: *пéрун* (Старадарожскі, Глускі раёны) і *пярýн* (Мінскі, Радашковіцкі, Заслаўскі раёны), *гýба* (Глускі раён) і *губá* (Мінскі раён).

Словы, што адрозніваюцца граматычным родам: *навóй* — назоўнік мужчынскага роду (Дрыбінскі раён) і *навóйка*—назоўнік жаночага роду (Глускі раён); *абалачóк* і *вóблачка, асá* і *вóсел*.

Словы, што адрозніваюцца гукавым складам, несупадзеннем аднаго ці некалькіх гукаў: *я́блына* і *я́блыня, пóзны* і *пóзні, старадáўны* і *старадáўні*.

* * *

Выказваю шчырую падзяку П. Ф. Глебку, М. І. Гурскаму, М. І. Жыркевічу, М. Р. Судніку, якія дапамаглі каштоўнымі парадамі пры падрыхтоўцы слоўніка.

Ф. Янкоўскі

АБ МАТЭРЫЯЛЕ І БУДОВЕ СЛОЎНІКА

У гэтым слоўніку, як ужо адзначалася, змешчаны не ўсе сабраныя словы. Адбіраючы іх, я кіраваўся правілам— не браць тых слоў, якія шырока ўжываюцца ў літаратурнай мове, якія з'яўляюцца агульнабеларускімі словамі, таму назоўнікаў тыпу *хата, крыніца, будан, сцежка, шлях, палянка, завушніца, ялаўка, дзірван;* прыметнікаў тыпу *спелы, хмарны, бацькаў, сухі, ядраны, сталы;* займеннікаў тыпу *я, ты, той, наш;* лічэбнікаў тыпу *два, сем, сто;* дзеясловаў тыпу *рабіць, араць, смактаць, смажыць, важыць, крактаць, трэсці, пытацца, псаваць, пражыць, бедаваць;* прыслоўяў тыпу *добра, хутка, моцна, брыдка* тут няма. Увага была накіравана на такія словы, якія адсутнічаюць або якія сустракаюцца рэдка на старонках кніжак, газет, часопісаў. Адсутнасць тлумачальнага нарматыўнага беларускага слоўніка ўскладняла працу. З гэтай прычыны сюды, магчыма, трапілі словы, якія не з'яўляюцца дыялектызмамі, аднак і яны цікавыя ў лінгвістычных адносінах,

тым больш, што падаюцца ў фразе, запісанай з вуснай мовы.

Уключаючы, напрыклад, слова *рана* ў значэнні *ўранні, раніцою,* зразумела, нельга было не ўключыць *рана* як антонім да *позна.*

У слоўніку змешчаны таксама словы, якія адрозніваюцца ад літаратурных фанематычным складам (напрыклад, *сталавéр* — старавер), словаўтваральнымі марфемамі (*карóвічае* малако, *рыбічая* луска), граматычным родам (*абалачóк, памідóра*).

Словы змешчаны ў алфавітным парадку. Словы-амонімы падаюцца як асобныя артыкулы з лічбовымі паметкамі, напрыклад: **клінóк** [1], **клінóк** [2]; **кош** [1], **кош** [2]; **пушы́сты** [1], **пушы́сты** [2]; **бугáй** [1], **бугáй** [2]; **байч** [1], **байч** [2], **байч** [3]. Пасля слова-артыкула звычайна падаецца слова ў транскрыбіраваным запісу—так, як яно вымаўляецца, напрыклад: *пакуштаваць (пакýштуваць* і *пакýштаваць), замёціна (зам'ёціна), мётка (м'ётка), мулка (мýлко* і *мýлка).* Затым звычайна змяшчаецца граматычная прымета, напрыклад: назоўнік мужч. роду; дзеяслоў I спраж. (-ую, -уеш), пераходны; прыслоўе. У артыкуле даецца самае сціслае тлумачэнне слова і сказ ці некалькі сказаў, у якіх ужыта запісанае слова. Шмат якія словы не адназначныя, і значэнні іх падаюцца. Акрэслены, аднак (па зразумелай прычыне), не ўсе значэнні таго ці іншага слова.

У гаворках шмат якім прадметам і паняццям адпавядаюць дублетныя словы, напрыклад: *наравісты* і *натýрысты* (апошняе ад лацінскага natura). Зразумела, падаюцца не ўсе

такія дублетныя словы. За 11 год, напрыклад, мною запісана (в. Клетнае) 15 фраз з словам *кукўля (кукўлька)* і толькі ўлетку 1957 г. пачута дублетнае слова *зязюля.*

Прыведзеныя сказы пашпартызаваны—скарочана пазначана вёска, дзе запісана слова.

Да часткі артыкулаў слоўніка прыведзены паралелі з іншых гаворак або з іншых моў (руская, чэшская, польская, украінская).

Дадатак—фразеалагічныя спалучэнні, прыказкі і прымаўкі, запісаныя таксама ў Глускім раёне,—асобнага тлумачэння не патрабуе. Адзначу толькі, што шмат якія з іх паралельна падаюцца ў транскрыбіраваным запісу.

Некаторыя фразеалагічныя спалучэнні, прыказкі і прымаўкі выкарыстаны былі ў зборніку «Беларускія народныя прыказкі і прымаўкі»[1].

---

[1] Ф. Янкоўскі. Беларускія народныя прыказкі і прымаўкі. Выд. АН БССР, 1957, стар. 452.

ФАНЕТЫЧНЫЯ І ГРАМАТЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ГАВОРАК ГЛУСКАГА РАЁНА[1]

Гаворкі Глускага раёна Мінскай вобласці маюць некалькі вельмі яркіх асаблівасцей. Да ліку іх належаць:

саканне—вымаўленне цвёрдага *с* у зваротнай часціцы *ся* (*прысукраваўса, прымасціўса, налаўчыўса*);

[1] Аб фанетычнай і граматычнай сістэме гаворак Глускага раёна гл. мае артыкулы:

1. Глускія гаворкі. Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук. Мінск, 1954 (на рускай мове);
2. Некаторыя сінтаксічныя асаблівасці народных гаворак. Весці Акадэміі навук БССР, № 2, 1956;
3. Назоўнікі і іх формы ў гаворках Глускага раёна. Вучоныя запіскі Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага, вып. VI, 1956;
4. Нарыс фанетычнай сістэмы гаворак Глускага раёна. Вучоныя запіскі Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага, вып. X, 1958;
5. Прыслоўі і іх утварэнне ў народных гаворках. Вучоныя запіскі Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага, вып. XI, 1959.

змяненне *ы* на *у* пасля губных зычных: *вýпіць, памýць, папутáйса;*

недысіміляцыйнае ўмеранае аканне (з захаваннем канцавых ненаціскных *о, э*): *галавá разразáю, ажаніць, страляю,* але: *перабрáно, скóшано, хóрашэ, лёгянько;*

адсутнасць аглушэння звонкіх зычных перад глухім і на канцы слова: *грýзко, гразь, кніжка, калóдка, церабéж.*

Гэтыя асаблівасці—тыповыя для паўднёвай часткі Глускага раёна і не тыповыя для паўночнай часткі. Тэрыторыю раёна перасякае мяжа дыялектных адрозненняў, яна праходзіць з захаду на ўсход прыкладна праз Глуск. Гаворкі паўднёвай часткі аб'ядноўваюцца з тымі гаворкамі, якія ляжаць на поўдзень і паўднёвы захад ад Глускага раёна. А гаворкі паўночнай часткі раёна аб'ядноўваюцца з тымі, якія ляжаць на поўнач і паўночны ўсход ад Глускага раёна. Гаворкі паўночнай часткі бліжэйшыя да літаратурнай мовы, чым гаворкі паўднёвай часткі раёна.

У гаворках паўночнай часткі раёна (Сымонавічы, Гарадок, Жаўвінец, Дуброва) няма сакання, змянення *ы* пасля губных на *у*; тут поўнае недысіміляцыйнае аканне і поўнае ці амаль поўнае аглушэнне звонкіх зычных (*кнішка, лёхка, дуп*).

Для гаворак усяго раёна характэрна:

ацвярдзенне губных зычных з вылучэннем палатальнага элемента ў зычны гук j (й) перад галоснымі *о, а, (ё, я)*: *пjаць, памjóр,* прычым на поўначы часта і *пяць, памёр;*

сцяжэнне галосных у канчатках прыметнікаў жаночага роду ў назоўным і вінавальным склонах адзіночнага ліку: *до́бра (←до́браа ← до́браја), ціха (←ціхаа←ціхаја), до́бру (←до́бруу ← до́брују), ціху (←ціхуу ←ціхују);*

часцей на поўдні і рэдка на поўначы ўжываецца будучы час незакончанага трывання на *-му: чыта́цьму, хадзіцьму, чыта́цьмам, хадзіцьмам, чыта́цьмуць, хадзіцьмуць;*

часцей на поўдні раёна і радзей на поўначы сустракаюцца галосныя *ô* і *э̂* (*е̂*), так званыя *о* і *э (е)* «закрытыя»; *о* «закрытае» *(ô)*—гэта *о*, набліжанае да *у; э (е)* «закрытае» (*э̂* (*е̂*)—гэта *э (е)*, набліжанае да «і», сустракаецца яно на месцы старажытнага ѣ.

Асаблівасці гаворак пад уплывам літаратурнай мовы так ці інакш сціраюцца. Так, напрыклад, побач з *паму́ць, ву́пісаць* можна пачуць і *памы́ць, выпісаць,* побач з *хо́рашэ, до́брэ, лёгко*—і *хо́раша, до́бра, лёгка.*

УМОЎНЫЯ АБАЗНАЧЭННІ І СКАРАЧЭННІ

У слоўніку выкарыстана спрошчаная транскрыпцыя. Перад галоснымі *а, о, у, э* мяккасць папярэдніх зычных абазначаецца літарамі *я, ё, ю, е,* г. зн. як і ў арфаграфічным пісьме *(лялёе, сáнячкі)*; мяккасць зычных перад зычнымі і на канцы слова абазначаецца мяккім знакам *(сьвіціцца, жыцьмуць, расьці, сьню, зьехаць, сьпісаць)*; зычны *j* абазначаецца літарою *й* толькі перад *і,* на канцы слова *(май)* і перад зычнымі *(стóймо)*. Літарáю *ô* абазначаецца «закрытае» *о;* літарамі *э̂* і *ê* абазначаецца *э (е)* «закрытае». Галосныя *ô, э̂ (ê)* ужываюцца пад націскам, і таму націск на іх не ставіцца *(абêдалі, рэ̂залі, навôйка)*; падоўжаныя мяккія зычныя абазначаюцца падваеннем літар з мяккім знакам паміж імі *(мольлю)* [1]; літара *е* ў квадратовых дужках абазначае гук *е,* набліжаны да *я (а),* пасля мяккіх зычных; літара *э* ў квадратовых дужках абазначае гук э, набліжаны да *а,* пасля цвёрдых зычных: *чытá*[е], *піш*[э];

[1] Для практычнага карыстання абазначэнне мяккасці мяккім знакам (ь) лічу зручнейшым за абазначэнне значком', параўн., напрыклад, с'п'іц', мол'л'у і сьпіць, мольлю.

літараю **г** (*г*) абазначаецца г выбухное (**гала-гу́цкі**);
адз.—адзіночны (лік)
агульн.—агульны (род)
арф.— арфаграфічна (калі тое ці іншае слова не ўдалося затранскрыбіраваць, то яно падаецца ў арфаграфічным запісу)
жан.—жаночы (род)
зак. тр.—закончанае трыванне
незак. тр.—незакончанае трыванне
мужч.—мужчынскі (род)
множн.—множны (лік)
ніяк.—ніякі (род)
гл.—глядзі
параўн.—параўнай
I спраж.—першае спражэнне
II спраж.—другое спражэнне
Байл.—в. Байлюкі
Балаш.—в. Балашэвічы
Барб.—в. Барбароў
Бяр.—в. Бярозаўка
Вайц.—в. Вайцяхоў
Вольн.—в. Вольніца
Дак.—в. Даколь
Зуб.—в. Зубарэвічы
Кас.—в. Касарычы
Кл.—в. Клетнае
Н.-Андр.—в. Нова-Андрэеўка
Пас. Чырвоны—пасёлак Чырвоны
Пас. Янкі Купалы—пасёлак імя Янкі Купалы
Поб.—в. Поблін
Сл.—в. Слаўкавічы
Сым.—в. Сымонавічы
Хал.—в. Халопенічы

СЛОЎНІК

А.

АБАЛАЧО'К *(абалачо́к) мужч.* Найшоў абалачо́к, і дож зака́паў. Сл. Параўн.: у старaславянскай мове **облакъ.**

АБАЛО'НЬ[1] *(абало́нь) жан.* Знешні слой драўніны, слой паміж карою і асяродкам, або «стры́жанем» (гл.). Абало́ні (у хваёвым бервяне) бага́то. Кл. Ні кало́да—адна́ абало́нь. Кл. Параўн.: блонь, болонь, блонка — рыхлые наружные слои лесины, бревна. Даль, «Толковый словарь». Параўн.: фразеалагізм пацягнула на абалонь. Чэрвеньскі раён.

АБАЛО'НЬ[2] Лугавое ўзбярэжжа ракі, якое заліваецца ў разводдзе. На абало́ні лялée. Кл. Параўн.: у старажытнай агульнаўсходнеславянскай мове **болонь, болонье** (балота, нізіна).

АБАПНУ'ЦЬ *(абапну́ць) -у, -еш, пераходны.* Абкрыць што-небудзь чым-небудзь, накінуць што-небудзь на што-небудзь. Абапні ху́стку: ве́льмі дож. Барб. Пашла́ машы́на, не́й-

ка абапнýта брызéнтам. Кл. Параўн.: чэшскае оропа—занавеска.

АБАПНУ′ЦЦА *(абапнýцца)*. Абкрыцца (хусткаю, брызентам). Абапнýса таéю хýсткаю, й дóбра бýдзе. Байл.

АБГАНЯ′ЦЬ[1] *(абганяць) -яю, -яеш, пераходны.* Абганяць (падарожніка, пешахода, фурманку, машыну). Я ні абганяў йіх. Сым. Абагнáлі за Малінавам. Сл.

АБГАНЯ′ЦЬ[2] Ужываецца побач з абóрваць. Тэрмін акучваць (бульбу, буракі) не ўжываецца. Абганялі картóплі. Сéлята хто пóзно сéяў (садзіў бульбу), дак ніабганяные булí. Кл. Абганяць пашлі. Сым.

АБДЗІ′РКІ *(абдзіркі) толькі ў множн.* Кудзéля, атыхóдзіць, [е]к абдзірáюць лён на грэбяні. Кл. Абдзíркі (абдзіркавае палатно) на м[е]шкí, на анýчы. Барб. Параўн.: пáчасся (Ветрынскі раён), асмычыны (Навагрудскі, Карэліцкі раёны).

АБЕ′ДНІК *(абéднік) мужч.* Невялічкі гаршчок. Абéднік крýпніку ўкіс. Кл.

АБЕ′РУЧ *(абéруч)*. Абедзвюма рукамі (узяць што-небудзь, каго-небудзь). Ухваціў абéруч. Кл. Ашчапéрыласа абéруч, плáч[э]. Хал. Параўн.: Ён яшчэ ўбачыў, як Касмакоў абхапіў аберуч нямецкага аўтаматчыка і грымнуў яго галавою і плячыма вобземлю. К. Чорны, Збор. твораў, т. 5, стар. 411.

АБЕ′ЧКА *(абéчко) ніяк.* Побач з больш частым ва ўжыванні вéко(а), вéчко(а). Крышка

дзежкі, каробкі; таксама ў рэшаце, сіце. Абе́чко скі́нула. Барб. Ве́чка то́е пада́й. Хал. Трэба думаць, што слова абечко таго ж кораня, што ве́ко(а).

АБІРА'ЦЬ[1] *(абіра́ць) -аю, -аеш, пераходны.* Абіра́е сьлі́вы. Абіра́лі рой. Кл. Абабра́лі йгру́шы *(зак. тр.)*. Барб.

АБІРА'ЦЬ[2] *(абіра́ць)*. Абкрадаць. Абабра́лі кра́му. Кл.

АБМЕ'ЦІ *(абме́ці, аме́ці, во́бмяці) толькі ў множн.* Аўсяная мякіна. Параўн.: мяту, месці. Пры ручной малацьбе і ручным веянні абмеці аддзялялі лёгкімі павевамі мятлою над тонка разасланым на таку аўсом. Абме́ці конь любіць. Мяшок во́бм[е]цяў прывёз. Кл. Аме́ці й се̂ні пад бо́гаваю страхо́ю. Сл.

АБО'ЗНЯ *(або́зьня, або̂зьня) жан.* 1. Халодная будыніна для саней і іншых прылад. Там у па́на, Рэ́йтан зва́лі, або̂зьня була́. Сл. Нам або́зьня трэ́ба. Хал. 2. Пераносн. Вялікая і няўтульная хата. Не́йку або̂зьню зрабілі, да ні ха́ту. Кл.

АБО'ЙКІ *(або́йкі, або̂йкі) толькі ў множн.* 1. Зношаныя прадметы, прылады. Ні кале́сы—або́йкі не́йкія. Вільча. 2. Акалот (гл.). Або́йкаў два́ццаць прада́ў. Зуб.

АБО'РА[1] *(або́ра) жан.* Тонкая вяровачка, у тым ліку тая, якою падвязваюцца лапці. Усе̂ мае̂ збо́ры—ла́пці й або́ры. Кл. Пашука́й хоць мало́е або́ркі. Хал.

АБО'РА [2] Вялікі будынак для кароў. Абору зрабілі. Мо трыста штук стане ў ей. Хал. Параўн.: чэшскае obora—абгароджаны лес.

АБО'РВАЦЬ (*абóрваць*). Гл. **абганяць [2]**.

АБРО'К (*абрóк*) *мужч.* Ужываецца як назоўнік адз. ліку ў фразеалагізме: Дай аброку, дай бі каня па боку. Сл., Кл. Аброк—корм. Параўн.: чэшскае obrok—корм, фураж.

АБРО'ЦЬ (*абрóць*) *жан.* На аброці ні прыпінай каня. Лепш за шыю. Сл.

АБРО'ЧНАЯ (*абрóчна, абрôчна*). Ужываецца з назоўнікам торба. Аброчная торба—торба для кармоў. Абрôчна торба. Сл. Параўн.: аброк (гл.).

АБРЫТНІ'К (*абрытнік*) *мужч.* Павадок (вяровачка, сырыца—гл.) пры аброці (гл.). Абрытнік згубіў. Сл. Абрытнікоў купіць можно?

АБСАЮ'ЗІЦЬ (*апсаю́зіць*) *-у, -іш.* Налажыць саюзкі (на боты, чаравікі). Апсаюжу чобаты. Вольн.

АБУ'ЛЕБ (*абýлеб,* часам *абылеб*). Абы, хоць. Абулеб хто сказаў штоль, дак і навáліцца. Кл. Мне абулеб куды. Н.-Андр.

АБУЧА'ЦЦА (*абучáцца*) *-аю-ся, -аеш-ся.* Навучацца вайсковай справе. Салдаты абучáліса. Кл. Абучацца ўзялі. Барб.

АБУЧЭ'ННЕ (*абучэ́ньне*) *ніяк.* На абучэньне ўзялі. Кл. Васіль на абучэньні. Барб. Гл. абучацца.

АБШЧАПІ'ЦЬ[1] *(апшчапіць) -плю, -піш.* Абхапіць рукамі. Што і ашчапіць (гл.), абшчаперыць, ашчаперыць (гл.). Апшчапіла ручкамі, што й ручкі паб[е]лелі. Вайц.

АБШЧАПІ'ЦЬ[2] Нарабіць прышчэпак (садоўніцтва). Ён усё сяло абшчапіў (г. зн. усім аднавяскоўцам нарабіў прышчэпак садовых дрэў) *(арф.).* Кл.

АГЛАБІ'НА *(аглабіна) жан.* Частка воза. Каб к стальмашні на аглабіны падвезьлі. Байл. Аглабіну зламаў. Кл. Параўн.: аглабіно (ніякі род). Чырвонаслабодскі раён.

АГЛАМА'ЗДАЦЬ *(агламаздаць) -аю, -аеш.* Хутка, на скорую руку (без апрацоўкі) зрабіць якую-небудзь рэч. Ні майсьцяр: агламаздае што—й у рукі німа чаго ўзяць. Пас. Янкі Купалы. Агламаздаў граблі. Ён нейкаго (пранік) агламаздаў, дак і мучуса. Кл.

АГО'НЬ[1] *(агонь) мужч.* Агонь, святло. У Натальлі ўжэ агонь. Кл. Запалі агонь. Барб. Агонь на ўсю хату (вельмі светла ад лямпы). Кл. У людзей ужэ агнê, а ты сьпіш. Барб.

АГО'НЬ[2] 1. Наклалі агню й пагрэліся. Ідзі к агню, пагрэйса. Кл. Параўн.: у рускай мове костер. Параўн.: у Рагачоўскім раёне цяпло. 2. Пераносн. Ні дзеўка—агонь. Кл.

АГО'ЎТАЦЦА *(агоўтацца) -аю-ся, -аеш-ся.* Асвойтацца з новымі ўмовамі, новым акружэннем (звычайна аб жывёле). Сама буду пасьціць (карову), пакуль агоўтаяцца. Кл. Параўн.:

Вы крыху агоўтарыліся тут. А. Чарнышэвіч, Світанне, 1957, стар. 109.

АДА'ЛЕ *(адáле)*. Але потым, але пасля. Нібýто (быццам бы) разьдзéліць (аддзеліць сям'ю дачкí), адáле рáзам ізнóў. Кл.

АДАЛЕ'ЦЬ *(адалéць) -ею, -ееш, пераходны*. Перамагчы, змагчы, справіцца (з кім-небудзь або чым-небудзь). Адалéлі ўсê абарáнкі? Байл.

АДВЕ'ДАЦЬ *(атвéдаць) -аю, -аеш*. Наведаць, праведаць (каго-небудзь). Атвéдаць дзéці сваê. Сл. Атвéдаю свайíх (сваякоў). Барб. Параўн.: пераведаць (гл.).

АДВЕ'ДАЦЦА *(атвéдацца) -аю-ся, -аеш-ся*. Зваротная форма дзеяслова адведаць (гл.). Даўнó булá ў вас. Дýмала, трэ́ба каб атвéдацца. Барб.

АДВЕ'ДКІ *(атвéдкі), толькі ў множн*. Хадзíла ў атвéдкі. Кл. У атвéдкі с пустымí рукáмі ні йдýць. Байл. Ісці ў адведкі—ісці наведаць парадзіху.

АДГАДЗІ'ЦЬ *(адгадзíць) -джу, -дзіш*. Аддзякаваць (матэрыяльна ці дапамогай у якой-небудзь працы). За éтае адгаджý вам калíль (гл.). Байл. Ні адгадзíла за дрóва. Ён дóбры вôз дроў прыўéз мне. Я самá, сынóк, адгаджý йім за йíху лáску. Кл.

АДГО'ДЖВАЦЬ *(адгóджваць) -аю, -аеш*. Адгоджвала ўсё жыцьцё *(арф.)*. Байл.

АДЗЁ'НАК *(адзёнак) мужч*. Падмосткі пад

стогам. Часам ужываюць (метанімічнасць) у значэнні стог. Адзёнкаў (стагоў) дваццаць нічапаных. Кл.

АДЗЁ'Р *(адзёр) мужч.* Хвароба. Адзёр у хату ўкінуўса. Сл., Кл.

АДКАРА'СКАЦЦА *(аткараскацца) -аю-ся, -аеш-ся.* Адчапіцца; дабіцца, каб адстаў (хто-небудзь дакучлівы, назола). Такі назола, чарку возьме (вып'е), дак ужэ ні аткараскацца, прыстане, што смала. Кл. Од даўней мешчанчукі булі паскудные. На базары прыстануць ш чаголь, то ні аткараскацца. Хал.

АДЛЕ'ГА *(атлега і адлега) жан.* Мо атлега будзе? Вельмі ж даеў мароз. Кл. У адлегу й таварын[е] лёпш. Вільча. Атлегаю прыдам праведаць вас. Барб.

АДМА'ЛКУ *(адмалку і атмалку).* З маленства, з малых год. Атмалку нічогі (гл.). Й атмалку ні ходзіш. Кл. Адмалку жыў тут. Сым.

АДНАВО'Р *(аднавор, аднавôр) мужч.* Ужываецца толькі ў адзіночным ліку, у спалучэнні сеяць у аднавор. Сеяць у аднавор — сеяць у адзін раз (увесну ці ўвосень) узораную глебу. Ячмень у аднавор нядобра сеяць *(арф.)*. Картоплі ў аднавôр парастуць, толькі даглёдзь. Картоплі сеюць у аднавор. Кл. Параўн.: адноралъ. Капыльскі раён.

АДНАЛІ'ЧНІК *(адналічнік) мужч.* Ужываецца побач з аднаасобнік. Адналічнік—што й аднасобнік. Кл.

АДНЕ′КУЛЬ *(атнéкуль)*. Атнéкуль ідзé старшыня́, брыгадзі́р і кі́ншчык. Байл. Атнéкуль прынéсла дзьве гладышкі малі́н. Кл. Параўн.: знéткуль (гл.).

АДНО′ [1] *(адно́)*. Лічэбнік. Кл., Сл., Зуб., Хал., Сым.

АДНО′ [2] *(адно́)*. Толькі. Адно́ ні бáўса там, сы́нку. Хал. Пéр'я адно пасы́палася. Сым.

АДПІРА′ЦЬ [1] *(атпірáць) -аю, -аеш*. Перад тым, як «заліць плацьце» (бялізну), яго атпірáюць. Кл. Сёні атпірáць бýду, а ў сыбóту пазалю́. Кл.

АДПІРА′ЦЬ [2] Антонім да падпіраць, але не ў значэнні адмыкаць. Атапры́ дзьвéры, я ні дастáну кóліка церазь дзьвéра. Наштó йіх падпірáць кóлам? Хібá мáло зáшчапкі? Кл.

АДПЛІКНУ′ЦЦА Гл. адплікнуць. Гýзік атплікнýўса. Кл.

АДПЛІКНУ′ЦЬ *(атплікнýць) -у, -еш, пераходны*. Ні атплікнý гýзіка. Кл. Параўн.: заплікнýць.

АДРЫ′НА *(адры́на* і *андры́на) жан.* Будынак для сена, саломы, увогуле кармоў. Ідзêце ў андры́ну спаць. Кл. З вáшае адры́ны хáта вýйдзе. Барб.

АДУБЕ′ЦЬ *(адубéць) -ею, -ееш, неперахódны*. 1. Вельмі змерзнуць. Й рýкі маê адубéлі. Байл. Я адубéў там. Кл. 2. Вульгарн. Памерці, здохнуць. Каб ён адубéў там. Кл.

АЗУ′ЦЦА *(азýцца) -ую-ся, -уеш-ся*. Ужы-

ваецца зрэдку, побач з больш частым абуцца. Нага́ азу́та. Азу́йся. Сл. Параўн.: антонім разу́цца.

АЗЯРО'Д *(арф.) мужч.* Прыстасаванне для сушкі снапоў—высокі пераплёт, які складаецца з 2—4 рашэцін (гл.) і жэрдак. Малінаўцы (жыхары в. Малінава) не рабілі азяродаў *(арф.)*. Кл.

АЗЯРЭ'ДЗІНА *(арф.) жан.* 1. Жэрдка ў азяродзе. Не бо́ўт, а азярэ́дзіна цэ́лая *(арф.)*. Кл. 2. Пераносн. Высокая нязграбная жывёліна (конь, карова). З тако́е азярэдзіны малака не пад'ясі (арф.). Кл.

АЙЛЯ'! *(айля́!)* Побач з «аюсь!» (прага765нюць свіней). Айля́ куды́! Кл.

АКАЛО'Т *(акало́т) зборны, мужч.* З большага вымалачаныя снапы жыта, але салома не сцёртая. Кл. Акало́ту пудо́ў два. Зуб. Акало́т ве́льма траўлівы. Хал. А ў акало́це есь жы́то. Кл.

АКАПАНІ'ЧВАЦЬ *(акапанічваць) -аю, -аеш, пераходны.* Акопваць (бульбу, буракі) капаніцаю (гл.). Каня́ ні было́, дак акапані́чвала капані́цаю. Кл. Параўн.: гачкава́ць. Радашковічы.

АКАПАНІ'ЧЫЦЬ Гл. акапанічваць. Е́та старэ́нька (бабуля) ўсе̂ карто́плі акапані́чыла сама́. Кл.

АКРА'ЎКА *(акра́ўка) жан.* Звычайна ўжываецца ў форме множн. ліку—акра́ўкі. Абрэзкі сукна, аўчын. Той (кравец) і акра́ўкі, усе̂ чысь-

цянько, аддава́ў. Ве́льмі со́вясны буў. С акра́ўкаў ко́ўдру на ва́це пашы́ла. Кл.

АЛА'ДЧЫНКА (*ала́джчынка*) *жан.* Дзежачка, у якой рашчыняюць цеста на аладкі. Пе́калну (гл.) аддала́ даццэ́, а ў ала́джчынцэ рашчыня́ю. Кл.

АЛА'ДЗЕНІЦА (*ала́дзяніца* і *ала́дзеніца*) *жан.* Тое, што і аладчынка (гл.). Ала́дзеніцу купілі. Сл.

АЛЕ'ЙНІК (*але́йнік*) *мужч.* Ето што але́й рабіў, што прадава́ў але́й. Кл.

АЛЕ'ЙНЯ (*але́йня*) *жан.* Завод, які выпрацоўвае алей з канаплянага, ільнянога семя. Даўне́й скрозь е́тые але́йні булі́. Кл.

АЛЕ'ШНІК (*але́шнік*) *зборны, мужч.* 1. Маладыя дробныя алешчыны (гл.). Але́шніку вазо́ў чаты́ры нагато́вілі. Байл. 2. Зараснік з дробных алешчын (гл.). У але́шніку накасі́ў капê паўтары́. Кл.

АЛЕ'ШЧЫНА (*але́шчына* і *але́шына*) *жан.* Вольха. Ужываецца (вельмі рэдка) і альха. Але́шчыну звалі́лі (зрэзалі). Кл.

АЛЯ'! (*аля́!*) Гл. айля́. Аля́ ў хлёў! Байл.

АМЕ'ЦІ Гл. абмеці. Аме́ці й сё́ні пад бо́гаваю страхо́ю. Сл.

АНДРЫ'НА (*андры́на*). Гл. адрына.

АНІГА'ДКІ (*аніга́дкі*). Някепска, нядрэнна, добра (каму-небудзь). Табе́ аніга́дкі на жа́луваньні. Барб. Прыўе́з лучы́ны на зі́му ўсю,—

ба́бе анігадкі, бу́дзе патпа́лу. Пас. Янкі Купалы.

АНІКУ'ДЫ *(анікýды)*. Ні пасыла́юць анікýды. Кл.

АПА'Д *(апáд) зборны, толькі ў адз.* Яблыкі, грушы, слівы, якія самі апалі. Апа́ду насушы́ла мо мêх. Сым. Апа́ду я й да́рам с пуд насы́плю. Кл.

АПАЛА'НКІ *(апала́нкі) толькі ў множн.* Начовачкі, пры дапамозе якіх апалаюць (гл. апалаць) крупы, збажыну. Апала́нкі тваê вазьмý. Кл.

АПАЛА'ЦЬ *(апала́ць) -аю, -аеш.* Пры дапамозе начовачак (маленькіх, лёгенькіх), падтрусваючы іх перад сабою, веяць (ачышчаць ад мякіны, пылу) крупы, збажыну. Апала́ла крýпы. Кл.

АПЕРАЗА'ЦЬ *(аперазáць, апяразаць) -ж-у, -ж-аш, пераходны.* Выцяць, перацягнуць, сцебануць. Хацéў ап[е]раза́ць папрýгаю, да дýмаю, мо ён нічóга ні вінава́ты. Кл.

АПІВА'КА *(апіва́ка)*. Неадабральнае. Той, хто любіць апіваць (гл.). Я с ха́ты тагó апіва́ку прагна́ла, шчэ ў савéт схадзіла й расказа́ла. Сл. Апіва́ка той швéндаўса тут. Кл.

АПІВА'ЦЬ *(апівáць) -аю, -аеш, пераходны.* Часта і многа піць чужое, гасцяваць у другіх (гл. апівака). Апіва́ў да маніў, пóкуль прагна́лі. Кл.

АПІНЯ'НКА *(апіня́нка) жан.* Вялікая хустка, якою накрываюцца ў дарозе ў халоднае ці

мокрае надвор'е. Апіня́нку забра́лі. Сл. Параўн.: чэшскае оропа—занавеска.

АПІРА'ЦЬ *(апіра́ць) -аю, -аеш, пераходны.* Для каго-небудзь рэгулярна, сістэматычна праць (гл.) бялізну. Уля́нка апіра́е й апшыва́[е] брата. Кл.

АПЛІ'К *(аплі́к) мужч.* Гаплік. Аплі́к нашла́. Кас.

АПО'ЎЗІНА *(апо́ўзіна) жан.* Звязаныя за шчыты лазовыя, бярозавыя ці дубовыя дубцы. Апоўзіны накладаюцца накрыж на вяршыню стога. Апо́ўзінаю прыкладзі́. Барб. Апо́ўзін трэ́ба схадзі́ць. Кл. Параўн.: стагі... з бярозавымі і дубовымі вопаўзнямі. І. Шамякін, Крыніцы, 1957, стар. 121.

АПО'ЎЗЛАЯ *(апо́ўзла).* Ужываецца ў спалучэнні з назоўнікам жаба і абазначае гэта спалучэнне (пра чалавека) нікчэмнасць. Жа́бу ту́ю апо́ўзлу ні пасыла́й. Кл. Жа́ба апо́ўзла. Байл.

АПРО'Ч [1] *(апро́ч).* Асобна. Апро́ч садзі́лі. Кл.

АПРО'Ч [2] *(апроч, апрача́).* Апрача. Апро́ч Трахі́ма, ніко́га ні было́. Кл. Апрача́ йіх і рабо́цькаў німа́. Кл.

АПУ'ДЗІЛА *(апу́дзіло) ніяк.* Пудзіла. На про́со апу́дзіло зане́сьці трэ́ба. Кл.

АРАБІ'НА *(арабі́на* і *верабі́на) жан.* Рабіна. Арабі́на яж гары́ць. Далёка віда́ць ва́ша арабі́на. Пас. Янкі Купалы. Арабі́ні наабіра́ла.

Ні сьсе́кай таê арабіны. Кл. Верабін се́лята багáто. Кл. Параўн.: арабінніца.

АРАБІ'ННІЦА *(арабіньніца) жан.* Назва ўрочышча (ад арабіна). Арабіньніца й ацьсюль відáць. А тáм хóраша. Пас. Янкі Купалы.

А'РХА *(áрха) жан.* Арфа. У нáс áрха й áрха, як зазнáлі, а то йшчэ скажуць áрфа. Поб.

АРХАВА'ЦЬ *(архавáць) -ую, -уеш, пераходны.* Арфаваць. Архавáць пашлí. Поб.

АРША'ЎКА *(аршáўка* і *варшáўка) жан.* Гатунак бульбы. Кл., Вольн., пас. Янкі Купалы. Гл. ме́мка.

АСМО'Л *(асмóл) мужч.* Гл. усмал.

АСМУ'ЗКВАЦЬ *(асмýзкваць) -аю, -аеш, пераходны.* Абрываць зярняты аўса, захопліваючы між пальцаў па адным ці колькі каліваў. Тую аштрапавáлі, хадзіла й асмýзкавала аўёс у прыпóл. Кл.

АСТАДО'ЛІЦЦА *(астадóліцца) -ю-ся, -ішся.* Супакоіцца, сцішыць бег. Конь упýдзіўса, нёс, нёс аж да грэблі. Цяжко стáло й астадóліўса. Барб. Й пра чалаве́ка так гавóраць: бег, бег да й астадóліўса. Кл.

АСТРО'ВА *(астрóва) жан.* Лесвіца пры стайле (гл.). Нятоўстая елка з сучкамі па 10—15 см даўжынёй. Астрóву зрабіў, старýю пастухі спалілі. Кл.

АСЦА' *(асцá) жан.* Ужываецца ў фразеалагізме асца завіла. Завіла асца — моташ-

на, гоніць сліну, сківі́чныя мускулы сутаргава напружаны. Ой, ма́мко, асца́ завіла́. Кл.

АСЯНІ'НА (*ас[е]ніна) жан.* Збор служкамі царквы (увосень) збожжа на царкву і папа. Той дзяк, што ас[е]ніну прапіў. Барб.

АТО'ПАК (*ато́пак) мужч.* Зношаны абутак (боты, чаравікі). Па такой гразі да ў такіх ліхіх (гл.) ато́пках хо́дзіць! Кл.

АТРЭ'ПКІ (*атрэпкі) толькі ў множн.* Кудзеля, якая аддзяляецца ад кужалю пры трапанні лёну. Атрэ́пкі спраду́, мёх бу́дзе. Кл.

АТРЭ'ПКАВЫ (*атрэ́пкавы*). Атрэпкавае палатно—палатно з атрэпак (гл.). Абдзі́ркавае й атрэ́пкавае палатно́—са́мае ніціка́вае. Барб.

АЎСТРЫЯ'КА (*аўстрыя́ка*). Аўстрыец. Аўстрыя́ка тут плённы жыў. Кл.

АХА'ПАК (*аха́пак) мужч.* Ахапкамі носяць сена, салому, дробнае галлё, стружку і падобныя лёгкія рэчывы і матэрыялы, якія можна «ахапіць» і несці перад сабою. Два аха́пкі се́на пазы́чыла. Кл. Адны́м аха́пкам каня́ ні накормі́ш. Барб. Параўн.: у рускай мове охапка (*жан.*).

АЧУ'ЦІЦЦА (*ачу́ціцца) -ч-уся, -ц-ішся.* Раўназначнае рускаму прийти в себя. Уста́ла с пасьце́лі й ні магу ачу́ціцца. Кл.

АШАЛАПУ'ЦЕЦЬ (*ашалапу́цець) -ею, -ееш, неперахо́дны.* Страціць (на некаторы час) здольнасць рэагаваць (на што-небудзь) у выні-

ку моцнай стомленасці або ў сувязі з нечаканым здарэннем. Крычаць «пажар», а я ашалапу́ц[е]ла й сь се́нцаў ні ву́йду. Кл.

АШКІ'Р (*ашкір,* радзей *ашкіра*). Выклічнік тыпу аюсь, айля (гл. айля). Ашкір (на авечак) дадо́му! Кл. Ашкіра куды́! Кл.

АШЧАПЕ'РЫЦЬ (*ашчапе́рыць* і *апшчапе́рыць*) *-у, -ыш, пераходны.* Тое, што і абшчапіць, ашчапіць. Ашчапе́рыў шы́ю. Ашчапе́рыўса за но́гі. Кл.

АШЧАПІ'ЦЬ (*ашчапіць* і *абшчапіць*) *-плю́, -піш, пераходны.* Абхапіць рукамі. Ашчапіў за шы́ю й ні атарва́ць (аб дзіцяці). Кл.

Б.

БАГАТЫ'Р (*багаты́р*) *мужч.* Багаты (у значэнні асілак—не ўжываецца). Багаты́р, бо бага́ты. Пас. Янкі Купалы. У Малінаве (назва вёскі) ўсê багатырэ́. Кл.

БАГАЦЕ'Й (*багаце́й*) *мужч.* Багаты, багатыр (гл.). Багаты́р ці багаце́й ні ро́зьніца. Кл.

БАГО'Н (*баго́н*) *мужч.* Назва расліны. Там баго́н ве́льмі густы́. Пас. Янкі Купалы.

БАГО'ННІК (*баго́ньнік*) *зборны, мужч.* У баго́ньніку ўзагна́ў цэ́лу чэ́раду ц[е]цяруко́ў. Вайц.

БАЙЧ [1] і БАЧ (*бач, байч*). Глянь! Глядзі! Байч, што ро́біць? Бач, куды́ йду́ць? Кл.

БАЙЧ [2] і БАЧ Усечанае бачыш, ці бачыш. Се́лята ні завішу́е й на пракос: бач ста-

ра́юцца. Поб. Мнê, байч, ужэ й ні трэ́ба, усе каб ва́м. Кл. Параўн.: рускае видишь ли.

БАЙЧ[3] і БАЧ У спалучэнні з «як» абазначае вельмі хутка, маланкаю, як га! Як байч прыпру́ (прынясу) вам. Кл. Як ба́чыш зро́біць! Кл.

БАЛЬШУ́Н (*бальшу́н*) *мужч.* Неадабральнае. Падростак, юнак, а паводзіны—дзіцяці. Бальшу́н той хіба́ ні мо́г памагці́? Кл. Усіх бальшуно́ў тых на грэ́блю (грэбці сена). Барб.

БАЛЬШУ́ХА (*бальшу́ха*) *жан.* Параўн.: бальшу́н (гл.). Стра́мно тако́й бальшу́се зь дзе́цьмі бе́гаць. Каб ні падбухто́рвалі (гл. падбухторваць) бальшу́хі, то ён ні зрабі́ў бу так. Кл.

БА́НЬКА[1] (*ба́нька*) *жан.* Бэлька. Ба́нька ў се́нцах злама́ласа. Кл. Параўн.: бэлька. Заслаўскі і Радашковіцкі раёны.

БА́НЬКА[2] Цыліндрычнае колца, якім штонебудзь замацоўваецца ці прымацоўваецца, напрыклад, пры дапамозе банькі прымацоўваецца каса да кассе. Ба́ньку ў каваля́ папрашу́, но́ву ко́су (касу́) аса́джвацьму. Хал. Ба́ньку на кане́ц каштыля́ ўзьбіў. Кл.

БАРЖДЖЭ́Й (*барждже́й*). Вышэйшая ступень ад хутка, а форма звычайнай ступені (борзда) не ўжываецца. Барждже́й несі́. Сл. Барждже́й гані́. Кл.

БАРЛІ́НА (*барлі́на*) *жан.* Вялікая лодка, баржа. Сустрэта ў вёсках, якія знаходзяцца на Пцічы, а таксама ў в. Слаўкавічы, на захад ад

якой пачынаецца Палеская нізіна. У апошняй расказваюць, што «кóлісь тут было́ мóрэ, барлíна дайшла́ аж да Сла́ўкавіч», а як «мóрэ высахло», яна застрала і захаваліся рэшткі яе.

БАТАВА́ЦЬ *(батава́ць) -ую, -уеш, неперах́одны.* Рускае роптать. Кінь батава́ць на йіх. Барб. Я ўсе на Ма́р'ю гавару́ да бату́ю, што к сы́ну ні е́дзе. Кл. Батава́ла, што сьм[е]ю́цца Кл.

БАТАРЭ́Я[1] *(батарэ́я) жан.* Вайсковы тэрмін. На́ша батарэ́я аттýль біла. Сым.

БАТАРЭ́Я[2] Вялікі бурт (гл.) ці (с)капец (гл.) бульбы. Адну́ батарэ́ю (бульбы) раздадзíм (на працадні). Зуб.

БАЦ *(бац) мужч.* Пацук. Бац с ката́. Ба́ца забíў. Сл.

БА́ЦЕНЕ *(ба́цяне) агульн.* Скланяецца, як пытанне, іменне. Сын ці дачка з фізічнымі ці ў характары (або з тымі і другімі) рысамі бацькі. Ёто ж ба́цяне: й хóдзіць, і гавóрыць, як той ба́цько. Кл.

БАЧ Гл. байч.

БЕ́ГАЦЬ[1] *(бе́гаць і бêгаць) -аю, -аеш.* Нашто́ е́та бе́гаць? Кл.

БЕ́ГАЦЬ[2] Пакрывацца (аб карове), паляваць[2] (гл.). На́ша (карова) йшчэ ні бе́гала, пôзна аце́ліцца. Кл.

БЕ́ДНЫ *(бе́дны, бêдны).* 1. Бедны. 2. Небарака. Што ж ён, бе́дны, зрóбіць? Кл.

БЕ'ЖКІ (*бéжкі*). Бяжком. А ты бéжкі, то й нагóніш. Кл.

БЕРКУЛЁ'З (*беркулёз, бяркулёс*) *мужч.* Туберкулёз. На бяркулёс хворы. Вільча. У йіх беркулёз. Кл.

БЕСПЕРАСТА'НКУ (*б[е]сьпярастáнку*). Бесперапынна, безупынна. Ідзé дож б[е]сьпярастáнку. Поб. Ён мажэ́ бесьпярастáнку дзень чытáць. Кл.

БІЗУ'Н [1] (*бізýн*) *мужч.* Рачная расліна, сітнік. За бізýн зачапíўся кручóк (вудачка). Барб.

БІЗУ'Н [2] 1. Бізун. 2. Пераноснае: чалавек, у якога няма ніякіх матэрыяльных каштоўнасцей, вельмі бедны. Ён такí бізýн буў, а сыны́ бач як стáлі жыць? Гóлы як бізýн. Кл.

БІЗУ'ННІК (*бізýньнік*) *зборны* ад бізун [1], *мужч.* Бізýньнік па ўсёй рацэ́ расьцé. У бізýньніку акунькá злóвім, акýнь лю́біць у бізýньніку. Кл.

БІКЛА'ГА (*біклáга, буклáга*) *жан.* Судзіна на вадкасць (ваду, гарэлку), па будове — маленькая бочка. Біклáга вады́ на дзéнь. А ў нас дзьве буклáгі. Кл. А дзé вáша біклáга? Пас. Янкі Купалы. Параўн.: баклага. П. Пестрак, Сустрэнемся на барыкадах, 1954, стар. 47.

БІКЛА'ЖКА (*біклáжка* і *буклáжка*). Памяншальнае ад біклáга (буклага). Кл. Параўн.: бутлáшка. Пярэжыры Радашковіцкага раёна.

БІ'ЛА (*біло*) *ніяк.* Гладка абструганая

жэрдка. 1. Вешалка, адзін канец умураваны ў печ над камінкам, другі прымацаваны да супрацьлеглай сцяны. І ў нас було́ біло. Кл. 2. Жэрдка, аб якую абіваюць што-небудзь, напрыклад, зярняты з снапоў, калі «выбіра́юць куле́». Кл.

БІТВА′ *(бітва́) жан.* Бойка. Даўне́й ні було́ ў Барбаро́ве кірмаша́, каб ні була́ бітва́. Хал. Параўн.: чэшскае bitka—бойка.

БІ′ТКА [1] *(бітка) жан.* Параўн.: фразеалагізм у біткі гуляць (гл.). Яйка, пабітае ў гульні аб другое яйка. Ве́льмі ўмеў вубіра́ць мацака́ (гл.). Ён бітак прыно́сіў на па́ску (гл.) па капе́. Кл. Хто ву́гул[е]е [е]йцэ́ на па́ску, дак е́то бітка. Сл. Параўн.: чэшскае bitka—бойка.

БІ′ТКА [2] Палка (палкі), якою «гулялі ў пігара». Кл.

БІЧ [1] *(біч) мужч.* Біч. Са́мо ле́п[е]й дубо́вы біч. Кл.

БІЧ [2] Патоўшчаная частка пугі (бліжэй да пугаўя). Біч ат пугаўя́ йдзе. Кл. Параўн.: чэшскае bič — пуга, бізун.

БУДЫ′НАК *(будынак) мужч.* 1. Будынак. 2. Зборны (побач з множн. будынкі). Буды́нак у йіх до́бры (у жыхароў в. Лучкі). Кл.

БУДЫ′НІНА *(будыніна) жан.* Побач з будынак. Буды́ніна харо́ша. Кл.

БУК Гл. бык.

БУКЛА′ГА Гл. біклага.

БЛА'ЗЕН *(бла́з[е]н, блазен) мужч.* Недасведчаны, без вопыту ці практыкі; той, хто дрэнна разумее. Два хлапчукі, адзін хітры, а другі бла́з[е]н, — вот табе́ й раве́сьнікі. Хот ты ўжэ й наста́ўнік, а бла́з[е]н: купіў се́на нідо́браго. Кл. Параўн.: Кеп, дурань, блазан — тры штукі разам. Гродзеншчына. Параўн.: чэшскае to je blazen—гэта гатовы дурань, гэта набіты дурань.

БЛАШЧЫ'ЦА *(блашчы́ца) жан.* Клоп. Параўн.: старажытнае площица. У на́с і даўне́й каза́лі блашчы́ца. Клоп ні па-на́шаму. Хал.

БЛІСНЯ' *(бліськя́) жан.* Параўн.: рускае блесна, украінскае блешня. Зачапіў за галі́ну й атарва́ў бліськю́. А ці дарага́я така́я бліськя́? Хал.

БЛЫ'НДАЦЬ *(блы́ндаць) -аю, -аеш, непераходны.* Бадзяцца, хадзіць без справы, без працы «швэндаць». Чаго́ той тут блы́ндае? Сл.

БЛЯША'НКА *(бляша́нка, бл[е]ша́нка).* Каробка з бляхі. Бляша́нка (газы) по́ўна. Вольн. Памяншальн. бляшаначка *(арф).* Кл., Вольн.

БЛЯ'ШКА *(бля́шка) жан.* Невялічкі кавалак бляхі. Бляшка блішчу́сьцянька. Вільча.

БО [1] Злучнік *бо.* Я ні бу́ду жаніціся, бо ліха́я жо́нка. З песні. Кл.

БО [2] *(бо і бок).* Часціца. У пытальным сказе служыць для ўзмацнення пытання, для выражэння непасрэднай зацікаўленасці прадме-

там запытання. Як бо ён? (Як яго завуць?) Кл. Часцей ужываецца не бо, а бок (гл.).

БОК[1] *(бок* і *бôк) мужч.* Бок.

БОК[2] БО[2] Ці твая бок ша́пка знашла́са? Барб.

БОЎТ *(боўт) мужч.* Рыбалавецкая прылада, гладка выструганая жэрдка з «галоўкаю» на канцы; боўтам заганяюць рыбу ў сетку (сець, комель, кломля, падсака — гл.). Бо́ўтам як бо́ўтнуў разо́ў тры, дак аж бе́ло стаўбуно́ў (гл.) у се́ці. Пас. Янкі Купалы.

БО'ЯЗКА *(бо́язко).* Боязна. Бо́язко паўс клады́ (гл.) йці. Кл. Ужываецца і бо́язна *(арф.).* Кл.

БРА'ГА *(бра́га) жан.* 1. Пэўным чынам прыгатаванае рэдкае месіва (вада, вараная бульба, моланы прарослы ячмень, так званы солад і дрожджы). 2. Рэшткі гэтага месіва, якія астаюцца пасля перагонкі. Кл.

БРА'ЗГАЦЬ *(бра́зкаць) -аю, -аеш, неперахodны.* Не бра́зкай. Зуб. Я ц[е]бе́ набра́зкаю. Кл.

БРАЦЕ'НІК *(браце́нік) мужч.* Дваюрадны брат. Браце́нік прыхо́дзіў, дзя́дзькаў Ана́ньня. Кл.

БРАЦІ'ХА *(браціха) жан.* Братава жонка. Пашо́ў к мае́й браці́с[е]. Вайц. Браціха — дак ето бра́тава жо́нка. Барб.

БРУСА'К *(бруса́к і пруса́к) мужч.* Гл. прусак.

БРЫК (*брык*) Выклічнікавы дзеяслоў тыпу гоп, хваць, цоп. 1. Раптоўна ўпасці. Брык на дарóзе й паваліўса. Кл. 2. Брыкануць. Ёты вол вéльмі гáдкі: стайіць, стайіць, адáле (гл.) брык нагóю. Кл.

БУГА'Й[1] (*бугáй*) *мужч.* Непакладаны (некастрыраваны) бык. Бугаé скарбóвые. Бугай здаравéйшы за валá. Кл. 2. Пераноснае (зневажальнае) пра чалавека. Такí бугáй, а на рабóту ні хóдзіць. Байл.

БУГА'Й[2] Назва птушкі. Бугаёў ётых німá ц[е]пéр. Кл. Параўн.: рускае выпь.

БУРАЧКО'ВЫ (*бурачкóвы* і *бурачкóву*, параўн.: вýпіць). Прыметнік ад назоўніка «бурачок». 1. У спалучэнні бурачкóвы мёд—патака з буракоў. 2. Колер. Бурачкóвае хвáрбы купíла. Барб. Набрáла (купіла) нéйкаго бурачкóваго (краму). Кл.

БУРЧА'К (*бурчáк*) *мужч.* Адрэзак ракі, дзе хуткае цячэнне, дзе «бурчыць» вада. На бурчакý злавíў акунá. Кл.

БУСЛЯНЯ' (*бусьлянá, бусьл*[*е*]*нá*) *ніяк.* Буслава дзіцяня. Бусьлянá скíнулася з гняздá. Сым. Бусьл[е]нá нашлí дóхлае. Кл.

БУЯКІ' (*бу*[*е*]*кí* і *буякí*). Ягады. Адз. лік (адно каліва) — буáк. Буáк на кісéль смáшны. Буáшны кісéль смáшны. Кл. Параўн.: дурнíцы. Радашковічы, Мсціслаў.

БЫК (*бык* і *бук*) *мужч.* Нерабочы вол.

Адзін настаўнік Клятнянскай школы-сямігодкі (родам не тутэйшы) расказваў, як ён меўся ўбачыць расліну бук. Гаспадар, у якога сталаваўся настаўнік, паклікаў: «Хадзі, пакажу, які ў мяне бук» — і павёў не ў гарод, а ў хлеў... У загародцы стаяў сыты бык.

БЭЗ (*бэз, без* і *бэ́за*) *мужч.* Бэз. Без расьцьвіў. Кл. Бэ́зу ў нас бага́та. Пас. Янкі Купалы. Бэ́за. Вільча.

БЯГУ'Н (*бягу́н, б[е]гу́н*) *мужч.* Слупок у варотах, на якім «бегаюць» вароты. Бягу́н чуць ліпіць, падгніў. Кл.

БЯЗДО'ЛЛЕ (*арф.*) *ніяк.* Параўн.: без долі. Не́йкае няшча́сце ды бяздо́лле найшло́ на на́с (*арф.*). Кл. Гл. Бяздо́лле найшло́.

БЯСКІ'ШКІ (*бяскі́шкі*). Худы, з упалым жыватом, перахлябісты (гл.). Такіх бяскі́шкіх у маракі́ н[е] бяру́ць. Сым.

В.

ВАЗА'К (*вазá к*) *мужч.* Возчык. П'яць вазакі́ на аўёс. Сл.

ВА'ЛАШАЦЬ (*ва́лашаць*) *-аю, -аеш, пераходны.* Пакладаць, кастрываць. Пашо́ў парася́та ва́лашаць. Кл.

ВА'ЛАШАНЫ (*ва́лашаны*). Пакладаны, кастрываны. Харо́шы парасю́к, да ніва́лашаны. Кл.

ВАЛЛЕ' (*вальле́*) *ніяк.* Валлё. Ка́чка нае́ласа, аж вальле́ трашчы́ць. Кл.

ВАНЗЭ'ЛАК (*ванзэ́лак* і *вандзэ́лак*) *мужч.* Звязак, вязка якіх-небудзь прадметаў. Параўн.: польскае węzeł. Вандзэ́лак на машы́ну ўскіну-ла. Сл. Цэ́лы ванзэ́лак прыне́сла. Кл.

ВАР (*вар*) *мужч.* Ва́рам апа́ру. Ва́рам залі́ла пла́цьце. Кл. Ва́ру нальле́ й п'е, й ні го́рача. Пас. Янкі Купалы.

ВАРАВІ'ТЫ (*варавіты*). Пра самалюбівага чалавека, якому «слова не скажы». Нідо́брая тая дзе́ўка—варавітая, нісл у́шная, сва́рыцца. Кл. Параўн.: по́рсткі. Параўн.: рускае дерзкий.

ВАРАЖБІ'Т (*варажбіт*) *мужч.* Пашла́ по́галаска (гл.), што Кандра́т ве́льмо до́бры варажбіт. З казкі. Кл.

ВАРАНЯНЯ' (*варан[е]ня́, вараняня́*) *ніяк.* Вараняня́т е́тых. Вільча. Варан[е]ня́ нашлі́. Поб.

ВАРНЯ'ЦЦА (*варня́цца*) *-яю-ся, -яеш-ся.* Ледзь жыць, існаваць, вельмі мала працуючы па слабому здароўю ці па старасці. Ні жыву́—варня́юса. Кл. Параўн.: ліпець (гл.).

ВАРСАНУ'ЦЬ (*варсану́ць*) *-у, -еш, пераходны.* Шпурнуць каго-небудзь ад сябе. Ву́піў да ўсе ле́зьці к Мацьве́ю. Дак е́ты засе́рдзіўса да [е]к варсану́ў ат с[е]бе́, дак ледзь узгро́бса на но́гі. Кл.

ВАРТ (*варт*). 1. А ці ва́рт таку́ю рабіць? Пас. Янкі Купалы. Ну й варт йім. Кл. 2. Хто капе́йкі ні беражэ́, той сам рубля́ ні ва́рт. Кл.

ВА'РТА (*варта*) *жан.* 1. Варта, ахова. Пашоў на варту. На варту ходзіць. 2. Старажоўства, вартаванне. Каж[э], абрыдла варта. Кл 3. Чарга вартаваць. Мая сёні варта. Кл. 4. Кій, які перахо́дзіў па чарзе з хаты ў хату, як жазло вартаўніка (у дакалгасныя часы). Гэты кій кім-небудзь з вяскоўцаў упрыгожваўся разьбою, выпальваннем узораў, фігур. Кл. 5. Лясок пры шляху на Глуск, дзе год 60—70 назад у сувязі з нейкаю эпідэміяй «стаяла варта». Кл. Да варты дайдзі й жджы. Кл.

ВАРША'ЎКА (*варшаўка і аршаўка*) *жан.* Гатунак бульбы. Кл., Вольн., пас. Янкі Купалы. Гл. аршаўка, мемка.

ВА'РЫВА [1] (*варыво, варыва*) *ніяк.* Гароднiна, якая прызначаецца для стрававання. Варыво мае ў стопаццэ ўсе дымам пракурало. Кл.

ВА'РЫВА [2] Гатаванне (страў). Хіба та (гэта) варыва ў грубцы? Пас. Янкі Купалы. Твае варыво (гатаванне) далікатнейшае. Кл.

ВАТЭ'ТАЧКІ (*ватэтачкі* і *вацетачкі*). Памяншальнае ад ватэты. Ватэтачкі. Кл. Вацетачкаму малому. Сл. Ватэтачка була. Сл.

ВАТЭ'ТТА (*ватэтта, вацетта; ватэттах* і *вацеттах*). Вось тут. Ватэттах палажы. Кл.

ВАТЭ'ТЫ (*ватэты* і *вацеты*). Вось гэты. Ватэты Хвірод (імя). Ватэта малая курачка. Ватэтае трэба сажаць (зжаць). Кл.

ВАЎКАЎНЯ' (*ваўкаўня*) *жан.* Так гавораць пра вялікую, але халодную пустую хату. У тваёй ваўкаўні зімою мука. Кл.

ВАЎКАЧЭ′ЧА (*ваўкачэ́ча*) *жан., толькі ў адз., зборны* ад воўк. Ваўкачэ́ча ў пілі́паўку цягá́яцца. Поб.

ВАША′Н (*вашáн*) *мужч.* Ад вош. 1. Маленькая вош. 2. Літота пры ацэнцы малой хатняй жывёлы. Два вашаны́ гаду́ю (двух маленькіх кабанчыкаў). Сл.

ВЕ′ДРАНА (*вéдрана* і *вéдрано*). Зорна і ясна (на небе). На нéбе вéдрано-вéдраню. Вéдрано—éто багáто зо́рак, я́сно ўно́чы, зôрно. Кл. Параўн.: я́драна. Кліны Бялыніцкага раёна. Параўн.: рускае вёдро.

ВЕ′ЗАЦЬ (*вéзаць*) *-аю, -аеш.* Неадабральнае. Няўмела рабіць што, квэцаць (галоўным чынам пра гатаванне страў). От, вéзае, а ні ро́біць. Навéзала, што хібá то́лькі парася́там. Кл.

ВЕ′КА (*вéка* і *вéко*) *ніяк.* Крышка скрыні, дзежкі. Вéко раскі́даласо. Кл. Гл. абечка.

ВЕЛІЦУ′ЗАЗНЫ (*веліцу́зазны*). Побач з вялізазны, з адценнем — большы за вялізазны. Кл.

ВЕРАБІ′НА (*верабíна*) *жан.* Рабіна. Верабíну на ду́жку зрэ́заў. Верабíн сéлята багáто. Кл. Часцей — арабíна.

ВЕРАЎЧА′НЫ (*вераўчáны*). З вяроўкі. Вераўчáны гуж. Вольн.

ВЕРАЎЧЫ′НА (*вераўчы́на*) *жан.* Кавалак, абрывак старой вяроўкі, якую нельга назваць ні ўласна вяроўкаю (гл.), ні повадам (гл.), ні вожкамі (гл.). Найдзí вераўчы́ну. Байл. Вераўчы́наю прыкруцí. Кл.

ВЕ́РВЫ (*вёрвы* і *вёрву*) *толькі ў множн.* Вяроўка, на якой вісіць калыска. Кл. Параўн.: старажытнае вьрвь.

ВЕСЛАВА́ЦЬ (*в[е]славáць*) *-ую, -уеш.* Гнаць вяслом лодку. А в[е]славáць хто? Я хіба бўду? Ты йдзéш ні на рыбу, а па рыбу. Кл.

ВЕ́ТРЫЦЬ (*вéтрыць* і *вêтрыць*) *-у, -ыш, пераходны.* Ачышчаць збожжа ад пылу і смецця: сыпаць зверху тонкаю струёю, пыл зганяецца ветрам у бок, а збожжа сыплецца ў начоўкі ці на посьцілку (гл.). Вéтрыла жыто й ні бачыла, што па агарóдзе спўтаные кóні пасўцца. Кл.

ВЕ́ЧАР [1] (*вéчар*) *мужч.* Вечар. Прыдзе вéчар. Хал.

ВЕ́ЧАР [2] Увечары, вечарам. Ужываецца побач з увéчары, увéчарэ, вечарóм і вéчарам. Кл. У такім значэнні ўжываецца толькі ў спалучэнні з рáно (гл. рана). Рáно й вéчар даю (карове) сéна. Рáно й вéчар пáліць печ. Кл. Рáно й вéчар хаджў. Хал. Параўн.: стараславянскае вєчєръ —увечары.

ВЕ́ЧКА (*вéчко, вêчко*) *ніяк.* Гл. века. Вéчко раскідаласо ў вацéтай дзéжаццэ. Кл.

ВІД [1] (*від*) *мужч.* Твар. Ужываецца побач з *твар* і *ліцó.* Цёмны ў відў. Кл. Від нéйкі— што з вóску. Пас. Янкі Купалы.

ВІД [2] Ужываецца ў спалучэнні з прыназоўнікам *на.* На від і побач (у тым жа значэнні) на пагляд. На від харóша карóва. Кл.

ВІЖ (*віж*) *мужч.* Шпіён, хітрун, які «жы-

ве́ ціхянько» (Кл.) і заўсёды імкнецца непрыкметна выведаць пра другіх. Такіх людзей характарызуюць як нядобрых у грамадзе. О-о! ён віж. Кл. Віж той праклятьі. Кл. Параўн.: старажытнае вижь—паняты́, сведка.

ВІЖАВА'ЦЬ (*віжава́ць*) *-ую, -уеш, неперахodны.* Выведваць, выглядаць. Хітра така́я, ўсе віжу́е. Віжава́ць хо́дзіць. Кл. Параўн.: віж.

ВІ'ЛАЧНІК (*вілачнік* і *вілашнік*). Вілашнік злама́ла. Кл. Вілашнікам даў. Барб.

ВІ'ЛЬЧЫК (*вільчык*) *мужч.* Стык дзвюх частак страхі, канёк. Ш чыта́льні зь вільчыка ўпаў. Кл.

ВІ'ТКА (*вітка*) *жан.* Скручаная лазіна, якою прывязваюць салому да латы і пошвы ці пошвіны (гл. по́шва, пошвіна). Вітак пада́й. Вайц. Віткі твае̂ то́ўстые. Во! Хоць адну́ до́бру вітку скруці́ў. Кл.

ВІШ (*віш*) *жан.* Зазімавалая на корані (няскошаная) трава. Прынясу́ вішы́. Вішы́ тае̂. Кл. Параўн.: віша́ (1-е скланенне). Чырвонаслабодскі раён. Вішар. Парыцкі раён.

ВІШАВА'ЦЬ (*вішава́ць*) *I спраж., неперахodны.* Заставацца няскошанаю (аб сенажаці, канюшыне). Вішу́юць сенако́сы. Зуб. У праклёне: Каб твая́ сыно́жаць завішава́ла. Кл. Параўн.: віш, завішава́ць.

ВО'Б'ЕДЗІ (*арф.*) *толькі ў множн.* Аб'едкі сена. Во́б'едзі ў гной вы́кінь (*арф.*). Кл.

ВО'БМАЛЬ (*во́бмаль, во̂бмаль*). Сінонім да малавата. Во́бмаль — з невялічкім недахопам.

Во́бмаль лу́чч[э]й в[е]чэ́раць, здараве́й. Ты, ба́бо, дава́й кабану́ (есці) во́бмаль. Кл. Параўн.: старажытнае въмалѣ—на кароткі час, ненадоўга, небагата.

ВО'ДДЫШКА *(во́ддышка) жан.* Адпачынак. Во́ддышкі мне німа́. Вільча. Е́така во́ддышка ў даро́зе (у вагоне). Кл.

ВО'ДКІДАК *(во́ткідак) мужч.* Небагата ніткі на верацяне. Як толькі станавіцца цяжкае ад нітак верацяно, пралля перастае на яго прасці, хоць яшчэ і можна на яго навіваць нітку. Звітыя на адно верацяно два воткідкі — пачы́нак (гл.). Усе́ (напрадзеныя ніткі) у во́ткідках, у мяне́ вераце́н бага́та. Вайц. Во́ткідкаў тры напра́ла. Кл.

ВО'ДКІДАЧАК Ад во́дкідак (гл.).

ВО'ДКІДАЧКІ Во́ткідачкі пасушы́ць трэ́ба. Кл.

ВО'ЖКІ *(во́жкі* і *во̂жкі) толькі ў множн.* Лейцы. Во́жкі — тое, што й ле́йцы. Хто—во́жкі, хто—ле́йцы. Кл.

ВО'ЛАК *(волак) мужч.* Рыбацкая прылада — сетка-мех на двух шастах. Пае́халі ў во́лака на ры́бу *(арф.)*. Пас. Янкі Купалы.

ВО'НЬДЗЕКА *(во́ньдзяка, во́ньдз[е]ка)*. Вунь, вунь дзе. Во́ньдзяка пасу́цца ко́ні. Кл. У тым жа значэнні: унё, вуняка.

ВО'ПІНКА *(во́пінка) жан.* Тое, што і апінянка (гл.). Во́пінку до́бру прыў́ёз мне. Кл.

ВО'ПСА *(во́пса)*. У значэнні рашуча, раз'юшана, энергічна пры дзеяслове кінуцца,

накінуцца. А ён (сабака) во́пса на мяне́. Кл. Я мата́ю па́лкаю, а ён (бык) во́пса на мяне́. Кл. Параўн.: во́бсас. Танежыцы Чырвонаслабодскага раёна.

ВО′РЫВА (*во́рыво* і *во́рыва) ніяк.* Тваé во́рыва до́брае. Хал. На во́рыве зараблю́ больш. Поб.

ВУ′БАВІЦЬ (*ву́бавіць* і *вы́бавіць*). Гл. выбавіць.

ВУ′БАРСАЦЬ (*ву́барсаць* і *вы́барсаць*). Гл. выбарсаць.

ВУ′ВАРАЦІНА (*вувараціна* і *вывараціна*). Гл. вывараціна.

ВУ′ГАН (*ву́ган* і *вы́ган) мужч.* Гл. выган.

ВУ′ДУБІЦЬ Гл. вы́дубіць.

ВУДЗІ′ЛЬНА (*вудзілно, вудзільно, вудзільна) ніяк.* Вудзільно зрама́ў. Байл. Вудзі́лнам аччапі́ў кручо́к. Кл. На вудзі́льне. Кл.

ВУДЗІ′ЛЬНЕЧКА (*вудзільнячка, вудзільнячко) ніяк.* Памяншальнае ад вудзільна. Вудзі́льнячка до́брае. Кл.

ВУЖО′ЎКІ (*вужо́ўкі* і *вужôўкі*). Не прыдатныя да яды грыбы. Грыбо́вік... Не́йкіх вужо́вак назьбіра́ў. Кл.

ВУ′ЗВАРАТ (*ву́зварат* і *вы́зварат) мужч.* Гл. вы́зварат.

ВУ′ЗВАРАЦІНА (*ву́звараціна* і *вы́звараціна) жан.* Гл. вызвараціна.

ВУ′ЛАДЗІЦЬ (*вýладзіць* і *вы́ладзіць*). Гл. вы́ладзіць.

ВУ′ЛАЧКА (*вýлачка*) *жан.* Памяншальнае ад вулка. Праезд паміж двума дварамі. У вýлачку заля́жце (гл.). Кл.

ВУ′ЛІВАК (*вýліва́к* і *вы́лівак*). Гл. вылівак.

ВУ′ЛКА (*вýлка*) *жан.* Завулак. У тýю вýлку трэ́ба йці. Кл.

ВУЛЛЕ′ (*вульлé*) *ніяк.* Побач з вýлей (*мужч*). Вульлé скінулі з дýба й спалілі. Вýляй купілі. Кл.

ВУ′СКІДЗЬ (*вýскідзь* і *вы́скідзь*). Гл. выскідзь.

ВУ′СЦВІЦА (*вýсьцьвіца*) *жан.* Гладышка. Сустрэта толькі ў в. Слаўкавічы. Вýсьцьвіцаю завýць. Сл.

ВУ′СЬЦЕЛЬГА (*вýсьцяльга*) *жан.* Вяз (гл.), які звязвае «галоўку» полаза з першым (пярэднім) капылом. Вýсьцяльга мая́ лóпнула. Вайц.

ВУЧЫЦЕЛЯВА′ЦЬ (*вучыц[е]лявáць*) *-юю, -юеш.* Сустрэта толькі ў в. Слаўкавічы, ужываецца рэдка; звычайна: настáўнічаць ці вучы́ць. Вучыц[е]ляваць пашóў. Сл. Вýчыць у Дакóлі. Сл. Настáўнічаў да вайны́. Сл.

ВЫ′БАВІЦЬ (*вýбавіць* і *вы́бавіць*) *-ўлю, -віш, пераходны.* З вялікімі цяжкасцямі дастаць што або каго-небудзь з цяжка праходнага, загубнага месца, увогуле з загубных умоў.

Наліло́ вады́ по́ўны[е] брады́, то ні маглі́ мы вы́бавіць (воз сена) на га́й. Кл. Угру́зла (карова) у канюшніцкім бало́це, ледзь вы́бавілі. Байл. Каб як каро́ўку вы́бавіць. Кл. У Бабруйску ў цюрме́ буў, аддала́ ўсе чы́сьцянько паліца́ю, але ву́бавіла сынка́ свайго́. Кл.

ВЫ′БАРСАЦЬ (*ву́барсаць, вы́барсаць*) *-аю, -аеш, пераходны.* Выцягнуць з чаго-небудзь абору.

ВЫ′ВАРАТ (*ву́варат, вы́варат*) *мужч.* Вывернутае з карэннямі дрэва. Пуд ву́варатам вады́ нашлі́. Барб. Ста́лі пад вы́варат, што пат стрэ́ху. Кл. Часцей—вы́варацiна (гл.).

ВЫ′ВАРАЦІНА (*ву́варацiна, вы́варацiна*) *жан.* Што і выварат (гл.). Ву́варацiна на дро́ва до́бра. Кл.

ВЫВІЖО′ЎВАЦЬ (*вувіжо́ўваць* і *вывіжо̂ўваць*). Выведваць, выглядаць. Параўн.: віж (гл.). Вывіжо́ўвае, як што зьзем. Кл. Прыхо́дзіла вувіжо́ўваць. Барб.

ВЫ′ГАН (*ву́ган* і *вы́ган*) *мужч.* На ву́гане калёса ўгру́зьлі. Кл. Ву́ган харо́шы. Хал.

ВЫ′ДУБІЦЬ [1] (*вы́дубіць, ву́дубіць*) *-блю, -біш, пераходны.* Выцягнуць, вывалачы. Што так наму́чыласа, што так наму́чыласа: угру́з конь, насілу ву́дубілі, до́бр[э], што найшлі́ не́йкі[е] лю́дзі. Байл. Упра́віў не́вад у кало́дзьдзе, чуць вы́дубіў. Каб стары́ не́вад, то там бы й аста́ўся. Кл.

ВЫ′ДУБІЦЬ [2] Вырабіць скуру. Кл.

ВЫ'ЗВАРАТ (*вўзварат* і *вызварат*) *мужч.* Прамежак паміж плотам і полем. На вўзвараце цялЯ прыпні́. З вы́зваратаў се́на до́брага нанасіў. Кл.

ВЫ'ЗВАРАЦІНА (*вўзвараціна* і *вызвараціна*) *жан.* Гл. вызварат. Вўзвараціну скасіў. Кл.

ВЫ'ЛАДЗІЦЦА (*вўладзіцца, вы́ладзіцца*) *-джу-ся, дзіш-ся.* Зваротны ад выладзіць (гл.). Куда́ ты вы́ладзілася? Пас. Янкі Купалы.

ВЫ'ЛАДЗІЦЬ (*вўладзіць, вы́ладзіць*) *-джу, -дзіш, пераходны.* Выправіць у дарогу, на працу, на вучобу, у салдаты (параўн.: Выпраўляла маці сына з калгаснае хаты. Я. Купала), забяспечыўшы неабходным. Вўладзіць па́сьціць— накарміць пастуха, сабраць у торбу на дзень есці. Вўладзіла па́сьціць тава́р. Вўладзіў сы́на вучы́цца, дак памага́й. Кл.

ВЫ'ЛІВАК (*вўлівак, вы́лівак*) *мужч.* Яйка, не абцягнутае вапністаю шкарлупінаю. Прада́ць трэ́ба ёту ку́ру, адны́ вы́ліўкі льле. Байлі. Вы́лівак — ёта ні яйцэ́. Кл.

ВЫ'МАРСКАЦЦА (*вўмарськацца, вымарськацца*) *-аю-ся, -аеш-ся.* Выпрацавацца, затраціць многа сілы і мець патрэбу неадкладна папоўніць сілы. Здэ́цца й лёгко касіласо, а вўмарськаўса за ра́ніцу, што й но́гі ні слу́хаюць. Кл. Параўн.: намарска́цца (гл.). Параўн.: чэшскае mrskati — біць, хвастаць, сцябаць; mrsknouti—хвасянуць, сцебануць, выцяць.

ВЫ'ПУСТАК (*выпустак* і *вýпустак*) *мужч.* Цяля, жарабя, якому год ці другі год; выпустак — першы год выпускаецца разам са статкам на пашу; сысуны на пашу са статкам не выпускаюцца. Адны́х вýпусткаў сóрак. Байл. Вýпустачак сы́ты (мяса з выпустка) смашне́йшы за сьвіньні́ну. Кл.

ВЫ'САДКІ (*вы́садкі, вýсадкі*) *толькі ў множн.* Параўн.: у «Русско-белорусском словаре»—высадак. Маê вýсадкі пасьпе́лі. Трэ́ба на вы́садкі вы́браць бурака́ і мóркву. Кл.

ВЫ'СКІДЗЬ (*вýскідзь, вы́скідзь*) *жан.* Тое, што вываpaціна (гл.). Вýскідзь нашлí дóбру. Зуб.

ВЫХАВА'НЕЦ (*выхаван*[*е*]*ц*) *мужч.* Прыёмны сын, выхаванец. Так любіў выхавáнца, што й часць гаспадáркі атпісáў. Кл. Параўн.: чэшскае chovanec.

ВЫХАВА'НКА (*выхаванка*) *жан.* Прыёмная дачка.—Хіба як?—Выхавáнка й выхаванка. Так здáўна ў нас кáжуць. Кл. Параўн.: чэшскае chovati — выхоўваць; chovanka — выхаванка.

ВЯЛІ'ЗАЗНЫ (*вялíзазны, в*[*е*]*лíзазны*). Форма суб'ектыўнай ацэнкі прыметніка вялікі. Ад гэтага прыметніка ўжываюцца такія формы суб'ектыўнай ацэнкі з павелічальна-ўзмацняльным адценнем: вялізны, вялíзазны, велічэ́зазны, веліцýзазны (*арф*). Кл. Вялíзазны-в[е]лізазны кабáн. Барб. Ох, і вяліцýзазнага сóма злавілі. Баян.

ВЯРЭ'НЯ (*в*[*е*]*рэ́ня*) *агульн.* Ацэначнае. Ня-

кемлівы, мешкаваты чалавек. Параўн.: Ускінуў за плечы вярэньку (стар. 31), закусваў з вярэнькі (стар. 32). Адносіў у вызначаны час вярэньку, альбо торбу (стар. 33). «Маладняк» № 1, 1933. Вярэ́ня ты. Кл.

ВЯРО'ЎКА *(арф.)*. Ужываецца ў звужаным значэнні, не як родавае, а як відавое: не любая вяроўка, а тая, якою звязваюць снапы, сена, салому на возе. Кл.

ВЯСЕ'ЛІК *(арф.) мужч.* Смаржок. У на́с вясе́лікаў не яду́ць, а як былі бе́жанцы, дык тыя елі *(арф.)*. Кл.

ВЯСЛО' [1] *(в[е]сло́) ніяк.* Вясло. В[е]сло́ трэ́ба зрабіць но́ва[е]. Пас. Янкі Купалы.

ВЯСЛО' [2] Нізка (грыбоў, абаранкаў). У Цяско́х (Цяскі—урочышча) бага́то баравiко́ў. Га́нна до́брае в[е]сло́ нанiза́ла на дубе́ц. Кл.

Г.

ГАВАРА' *(гавара́) жан.* 1. У значэнні рускага речь. У яго́ гавара́ нехаро́шая, неяк спяша́е, слоў не разбяр́эш *(арф.)*. Сл. Гавара́ харо́ша. Кл. 2. Гутарка, выказанае. Уся́ку гавару́ запіса́ць трэ́ба. Хал. Таго́ старо́га манькута́ гавару́ піса́лі. Зуб. 3. Адпавядае рускаму молва. Пусьцілі лю́дзі гавару́. Кл. Гавара́ пашла́. Барб. Са́мі нарабілі гавары́. Кл.

ГАВАРКІ' *(гаваркі́)*. Філіпо́віч ве́льма гаваркі́. Зуб. Ве́льмі гаваркі́ хлапчу́к. Кл.

ГАДО'ЎЛЯ *(гадо́ўля, гадо̂ўля) жан.* Кінула тро́е парася́так на гадо́ўлю. Кл. Не́шта німа́

на йіх (куранят) гадо̂ўлі. Пас. Янкі Купалы.

ГА′ЛА *(га́ло, га́ла) ніяк.* 1. Шырокая балотная сенажаць між лясоў. Там га́ло — й канца німа́. Байл. 2. Вялікая прастора між лясоў. Кл.

ГАЛАБАРО′ДЗЬКА *(галабаро́дзько, галабаро̂дзька) мужч.* Мужчына, у якога не расце барада і вусы. Галабаро́дзько ў Барбаро́ве буў. У галабародзька. Кл.

ГАЛАГУ′Т (*галагу́т*) *мужч.* Вялікі пародзісты певень. Гл. галагуцкі. Галагу́ту нагу́ злама́лі. Кл.

ГАЛАГУ′ЦКІ (*галагу́цкі*). Называюць пародзістых буйных курэй з голымі (без апярэння) шыямі. Галагу́цкі пе́в[е]нь. Кл.

ГАЛАШЧО′К *(галашчо́к) мужч.* Замерзлая голая (без снегу) зямля, балота. Галашчо́к, хоць каціся бо́кам. Кл.

ГАЛАШЧО′КАМ Галашчо́кам заме́рзла. Кл. Параўн.: галашчо́к.

ГАЛЭ′П *(галэ́п) мужч.* Голае (без апярэння) птушаня. Галэ́паў знашо́ў. Сл.

ГАМЗА′ЛА *(гамза́ло* і *гамза́ла)*. Гл. го́мзала.

ГАМЗА′ТЫ *(гамза́ты)*. Пра чалавека, які гамзае, гугнявіць. Я таго́ гамза́таго ні разабра́ла. Барб.

ГАМЗА′ЦЬ *(гамза́ць* і *го́мзаць) -аю, -аеш, непераходны.* Непрыемна гаварыць у нос, гугнявіць. Гл. го́мзала. Го́мзало го́мзае. Кл.

ГА′НАЧКІ Памяншальнае ад ганкі (гл.). **Га́**начкі на чаты́ры ў́схо́ды. Сл.

ГАНДЗІ′НА (*ганьдзі́на*) *жан.* Гонціна. Вазьмі́ тую ганьдзі́ну. Кл.

ГА′НІЦЦА Зваротная форма ад ганіць (гл.). А чаго́ ён га́ніцца? Га́ніцца пача́ў. Зуб. Можа ўжывацца не ў зваротным значэнні. На йі́х усяк га́ніцца стаў. Кл.

ГА′НІЦЬ (*га́ніць*) *-ю, -іш, пераходны.* А нашто́ вам было́ га́ніць йіх? Кас.

ГА′НКІ (*га́нкі*) *толькі ў множн.* Ганак. **Га́**нкі мае́ згнілі́. Кл.

ГАРБУ′ЗІКІ (*гарбу́зікі*). *Адз. лік*—гарбузік. Гарбузовае семя. Бу́дам луза́ць гарбу́зікі. Кл. Гарбу́зікаў ба́ба дась. Байл. На ко́ляды даўне́й гарбу́зікамі частава́лі. Кл. Параўн.: гарбузяняты (*арф.*). Карэліцкі раён.

ГАРО′ЎЛЯ (*гаро́ўля, гарôўля*) *жан.* Бесперапынная напружаная праца пры нястатку. С таê гарôўлі ніччо́га ні ву́йшло. Сл. Каму́ шанцу́я на гадо́ўлю, а каму́ на гаро́ўлю. Вольн.

ГАРЭ′ЛІК (*гарэ́лік*) *мужч.* Крыху прыгарэлая печаная ці (верхняя ў гаршку) вараная бульбіна. Хадзі́ гарэ́ліка дам. Кл.

ГАСПАДА′Р [1] (*гаспада́р*) *мужч.* Гаспадар. Ён до́бры гаспада́р, усе́ дагле́дзіць, сад лю́біць. Вільча.

ГАСПАДА′Р [2] Муж. Слова муж ужываецца толькі ў сем'ях інтэлігенцыі. Сл., Кл., Вольн.

ГАЦІ′ЦЬ (*гаці́ць*) *-ч-у, -ц-іш.* 1. Закідваць

я́му, балаціну. Трэ́ба гаціць. Кл. 2. Многа і бескарысна дапамагаць матэрыяльна (прычым дапамога не паляпшае справу таго, каму дапамагаюць). Гаціў, гаціў, і ўсе прапа́ло, ні ко́нчыў (вучыцца), тупы́ ве́льма. Барб.

ГІЧ *(гіч) жан.* Ужываецца побач з націна (гл.). Гіч до́бра, а карто́плі дро́бные. Барб. Параўн.: Гічанамі пуза ўздута. Я. Колас.

ГЛЁ'ЎКА *(глёўко, глёўка).* Глёўка—многа вільгаці ў глебе. На паля́нцэ йшчэ глёўко, ра́но ара́ць. Кл. Там глёўка было́, мы кінулі, ні ара́лі. Кл. Параўн.: глёўка. Слуцкі раён.

ГЛЁ'ЎКІ *(глёўкі).* 1. Ужываецца з назоўнікам хлеб. Глёўкі хлеб — нявыпечаны хлеб. Дала́ не́йкаго глёўкаго (хлеба) кава́лак с кіло́. Кл. 2. З назоўнікам поле, зямля (у значэнні глеба). Параўн.: глёўка (гл.). Глёўкае по́ле. Глёўка з[е]мля́. Кл. Глёўкае поле—вільготнае поле.

ГЛУМІ'ЦЦА *(глуміцца) -млю-ся, -міш-ся.* Зваротная форма глуміць (гл.). У значэнні здзекавацца, зневажаць чэсць чалавека. І ні жыві зь йім, хіба́ ма́ло наглуміўса? Кл.

ГЛУМІ'ЦЬ *(глуміць) -млю, -міш, пераходны.* Псаваць, пераводзіць што-небудзь. Нашто́ глуміць до́шку? Хал. Саглумілі такіе ло́ткі. Барб. Глуміць людзей — знішчаць, калечыць людзей. Бага́то людзе́й (нямецкія акупанты) паглумілі. Хал.

ГЛЯК *(гляк) мужч.* Гаршчок з вузенькім горлачкам. Ваце́таму глякý мо два́ццаць гадо́ў. Кл. Параўн.: укр. гле́чик (глэ́чык).

ГЛЯЎКА'Ч *(арф.) мужч.* Глёўкі хлеб. Глеўкачў кавáлак далá. Сл. Параўн.: глёўкі (гл.).

ГНЕ'ВАЦЦА *(гнéваца) -аю-ся, -аеш-ся.* Крыўдзіцца. Чагó ты загнéвалася? Барб. Усé (усё) на бáцька гнéваюцца. А чагó гнéвацца? Кл. Параўн.: чэшскае hněvati se — злавацъ, hněvivy—злы.

ГНІ'ЛКА *(гнілка) жан.* Паляжалая груша. Ёсць гатункі груш, галоўным чынам дзікіх, якія набываюць смак і становяцца прыдатнымі да ежы, калі паляжаць і стануць сочныя. Катóрые гнілкі й вéльма смáшные. Барб. Параўн.: гнілка і (у тым самым значэнні) лéжанка. Мсціслаў.

ГНЯЎЛІ'ВЫ Гл. Гневацца. А囗 наштó такóму гн[е]ўліваму буць? Кл. Параўн.: чэшскае hněvivy.

ГО'МЗАЛА *(гóмзало, гóмзала).* Чалавек, які гаворыць непрыемна ў нос, гамзае, гугнявіць. Гóмзала нéйкі. Пас. Янкі Купалы. Гамзáло — éто хто гамзáе. Гóмзало гóмзае. Кл. Ужываецца з хістаннямі ў адносінах націску *гóмзало(а)* і *гамзáло(а).*

ГО'НДА *(гóнда* і *гóнта) жан., толькі ў адз.* Гонты. Гóндаю накрый, дак да сьмéрці пяракрывáць ні трэ́ба бýдзе. Кл. Параўн.: пад гонтаю. А. Чарнышэвіч, Світанне, 1957, стар. 406. Параўн.: дóбры гонт. Карэліцкі раён.

ГО'НКА[1] *(гóнка* і *гôнка) жан.* Назва дзеяння па дзеяслову гнаць. І наштó так бéгці? Наштó гóнка такáя? Кл.

ГО'НТА (*гонда* і *гонта*). Гл. гонда.

ГО'РЛЕЧКА (*горлячко* і *горлячка*) *ніяк.* Памяншальнае ад горла, горлачка. Горлячко адбілася. Хал.

ГРА'ВЕЛЬ (*арф.*) *мужч.* Гравій. Гравель вазілі (*арф.*). Барб.

ГРА'ЗКА (*гразко* і *гразка*). Гразка на вуліцы, на балоце, на дарозе. Параўн.: гразна (гл.). Вельма гразка на вуліцы. Кл.

ГРА'ЗНА (*гразно* і *гразна*). Брудна ў хаце, на стале. У йіх пастаянно гразна ў хаце. Кл. Параўн.: гразка.

ГРО'ЗЬБА (*грозьба*) *жан.* Я й у прозьбу, я й у грозьбу, а ён ні шманае. Кл. Параўн.: чэшскае hrozba—грозьба.

ГРУБІНЯ' (*грубіня*) *жан.* Таўшчыня. Ужываецца побач з таўшчыня і тэўшч. Мой брус будзе такі грубінёю. Кл.

ГРУ'ЗКА (*грузко* і *грузка*). Гразка. Тудою не ганеце, там грузко, угрузнуць (каровы). На балаціне крэпко грузко, цяжко копы насіць, грузьнеш за калено. У Канюшнішчах заўсёды грузко було. Кл.

ГРЫМЕ'ЦЬ (*грымець*) *-млю, -міш, непераходны.* 1. Грымець. Грыміць усю раніцу. Байл. 2. Пераноснае. Крычаць, лаяцца, бушаваць, абвінавачваць. Прышоў, кажу, сюды грымець? Кл.

ГРЭ'ЦКІ (*грэцкі*). Дзе ты етых круп на-

бра́ла грэ́цкіх? Кл. Грэ́цкіх ала́дак ні люблю́. Байл. Грэ́цкае ка́шы. Кл. Грэ́цкі кру́пнік. Барб.

ГУ'БА [1] *(гўба) жан.* Губа. Гу́бу закапы́ліў. Кл. Гу́бу ап'ёк. Хал. Гу́ба баліць. Хал.

ГУ'БА [2] *(гўба).* Грыб на дрэве. Ко́лісь курцэ́ насілі крэ́м[е]нь, крэ́сіво й гу́бу. Вы́красае агню́ й прыку́рыць. Хал. Параўн.: чэшскае houba — грыб.

ГУБЕ'ЛЬ *(губе́ль) мужч.* Зневажальнае. Чалавек з вялікімі губамі. Кл.

ГУ'БКА [1] *(гўбка) жан.* Памяншальнае ад губа. Кл.

ГУ'БКА [2] Мера палатна або асновы (ткацкае) па даўжыні сцяны, на якой «снава́лі асно́ву». Гу́бак два́ццаць палатна́ натыка́ла. Кл. Твая́ гу́бка мала́я. Байл.

ГУ'КАЦЦА *(гўкацца) I спраж.* Пакрывацца (толькі аб свінні). Сьвіньня́ гу́каяцца, а каро́ва бе́гае ці палю́е. Кл.

ГУКА'ЦЬ *(гука́ць) -аю, -аеш, пераходны.* Хто́ то (хто гэта) ў ле́се гука́е?—Та́тко дзяце́й шука́е. З песні. Кл. Загубілі каро́ву, мо два ча́сы гука́лі. Кл.

ГУЛЕ'Ц *(гуле́ц) мужч.* Ігрок. Той Іва́нчык гуле́ц ве́льмі ў ша́шкі. Параўн.: гулёк (гл.).

ГУЛЁ'К *(гулёк) мужч.* Ігрок. Ён до́бры гулёк у ша́хматы. Зуб. Параўн.: гуле́ц.

ГУЛЯ'КА *(гуля́ка) агульн.* 1. Той, хто гуляе (у каго-небудзь). У ва́с по́ўно гуля́каў. Гуля́-

каў пóўнянька хáта. Кл. 2. З адценнем адабрэння, — пра таго, хто прыгожа і многа гуляе (скача). Ваш Карп гуля́ка буў, а пеў як! Кл. 3. З адценнем неадабральнасці. Гуля́ка той нічагéнькі ні рóбіць. Кл.

ГУРДА′Н *(гурдáн) мужч.* Курган. Гурдáн там высóкі. Вольн.

ГУ′СКА[1] *(гýска) жан.* Памяншальнае ад гусь. Гýску прадалá. Барб.

ГУ′СКА[2] Белая лілея. Гýскі цьвітýць ужэ́. Пас. Янкі Купалы. Гýсак нарвáў пук. Кл.

ГУСТЫ′Ш *(густы́ш) мужч.* Гушча, радзей густыш. Густы́ш кінуў, а ю́шку сцадзíў. Кл.

ГУСЯ′ЧЫНА *(гуся́чына) жан.* Гусінае мяса. Гуся́чыну купля́юць. Зуб.

ГУ′ТА *(гýта) жан.* На дне рэчкі Дóкалька (Кл.) ёсць нейкія выгаркі, шлак. Гýта булá, бы́тто завóд які. Яно й ведáць, што зь нéйкаго п[е]рапáлу. Кл.

ГУТАТА′ЛКА *(гутатáлка* і *гýшкалка) жан.* Арэлі. Зачапí за бáньку лéйцы, вазьмí дóшку — й гутатáлка. Кл. Параўн.: гутарэ́лі. Мсціслаў. Параўн.: гушкалка, ужываецца часцей за гутаталка.

ГУТАТА′ЦЦА *(гутатáцца) -аю-ся, -аеш-ся.* Тое, што і гушкацца.

ГУ′ШКАЛКА *(гýшкалка* і *гутатáлка) жан.* Арэлі. Гýшкалка — ета гутатáлка. Кл. Гл. гутаталка.

ГУ́ШКАЦЦА *(гу́шкацца) -аю-ся, -аеш-ся.* Гу́шкаліся на гу́шкалцэ. Кл. До́бра гу́шкацца на бяро́зе (на апушчанай галіне). Кл.

ГУ́ШЧА *(гу́шча) жан.* 1. Гушча. Гу́шча наве́рх ні ўсплыва́е. Кл. 2. Крупы. Панцак, груца. Пара́ўн.: груца і пансак. Заслаўскі раён. Гу́шчы надра́лі пудо́ў два. Пас. Янкі Купалы. Гу́шча й зь м'я́сам ці хоць ш чым сма́шна. Кл. 3. Крупнік з пансаку. Кл.

Д.

ДАБРА́НАЧ *(дабра́нач).* Дабра́нач ні сказа́ла. Кл. Дабра́нач, стара́я ха́та, дабры́дзень но́вая. З песні. Кл.

ДАГЛЕ́ДАК *(даглёдак) мужч.* Догляд. Даглёдку ні було́. Сл.

ДАЕ́СЦІ [1] *(дае́сьці і даêсьці) пераходны.* Даесці. Кл.

ДАЕ́СЦІ [2] *Непераходны.* Дапячы, даняць. Так ён ужэ дае́ў мне, што й жыць ні хо́чу. Дак.

ДАК *(дак)* Дык. Дак хіба́ німа́? Кл. Дак чаму́ маê ата́ўкі ні ўскінулі на вôз? Пас. Янкі Купалы.

ДАМАВІ́НА *(дамаві́на) жан.* Труна. Сам сабê дамаві́ну Дзюдзю́н зрабі́ў. Кл.

ДАЎБЕ́ШКА *(даўбе́шка) жан.* Доўбня. Ужываецца даўбе́шка і доўбня. 1. Даўбе́шка (доўбня)—прылада. Іншы раз—любы кавалак палена, якім можна стукнуць. Пада́й даўбе́шку. Пас. Янкі Купалы. 2. Пераноснае. Тупіца, няздара, дурань. Кл.

ДВО́ЙКІ (*двóйкі*). Двойчы (побач з двойчы). Двóйкі к старшыні хадзíла. Кас.

ДЛЯ [1] Каля, ля. Нéхта стаў для нáс. Кл.

ДЛЯ [2] Для. Хібá для вáс касíў? Кл.

ДО́ЙЛА (*дóйло* і *дóйла*) *ніяк.* Вымя. Дóйло дóбрае, а малакá мáло. Кл.

ДО́ЛЕ (*дóле*). Закасцянелая форма меснага склону адз. ліку назоўніка дол (долъ). На падлозе, на зямлі. Сакéра дóл[е] пад лáваю. Вайц. Найшлó парцізáнаў паўнютка хáта. Я ўнéсла салóмы й дóле ўпóкат лéглі ўсê. Сл. Параўн.: чэшскае dole—унізе.

ДО́ЧАЧКА (*дóчачка*) *жан.* З маê дóчачкі. Кл. Побач—дачýшка (але не дочанька).

ДРАБІ́НА (*драбíна*) *жан.* 1. Лесвіца. Я прыстáўлю драбíну, загарнý я́йца ў карзíну. Верш. апавяд. Кл. 2. Ацэначнае. Называюць вялікую тонкую і худую карову, каня, ад якіх мала карысці. Ты б малýю (карову) купíў, а то прыцёг такýю драбíну. Кл.

ДРАБІ́НКА [1] (*драбíнка*) *жан.* Часцей у множн. драбіны (гл.). Лёгкі воз для паездак. Драбíнка нічóга (слабая) сусíм. Кл.

ДРАБІ́НКА [2] Трошку чаго-небудзь. Й драбíнка сы́таго памагáе. Хал. Самá драбíнку вазьмí. Кл.

ДРАБІ́НЫ (*драбíны*). Лесвіца. Слова драбіна ў форме жан. роду сустрэў у в. Клетнае толькі ў прыведзенай цытаце зココвершаванага апавядання «Бяда». Звычайна ж—драбíны.

Драбіны нёхта сьцёг. Пас. Янкі Купалы. Прыстáў драбіны. Драбіны зрабіў. Кл.

ДРАБО'К *(драбóк) мужч.* Маленькі кавалачак чаго-небудзь, звычайна пра цукар. Драбóк сáхару ўкінула ў кáшу. Барб. Прышлá, прóсіць хоць малéнькі драбóк сáхару дзіцяці. Кл. Параўн.: драбінка [2] (гл.).

ДУБЕ'Ц *(дубéц) мужч.* Дубéц зламáўся. Байл. Дубцá даць. Кл.

ДУБЕ'ЦЬ *(дубéць, дубêць) -ею, -ееш, непераходны.* Мерзнуць на холадзе. І пáльцы дубéюць. Зуб. Хвáціць дубéць ёй (карове на дварэ). Кл. Параўн.: адубéць (гл.).

ДУ'ЛЯ [1] *(дýля) жан.* Садовая груша, не дзічка. Ігруша — дзічка-груша. Дуль нараслó багáто. Кл.

ДУ'ЛЯ [2] Дуля, фіга. Сл.

ДЫ'БАЧКІ *(дыбачкі) толькі ў множн.* Ужываецца з прыназоўнікам *на* пры дзеясловах стаць, ісці, хадзіць. Стаць на дыбачкі, ісці на дыбачках — стаць, ісці на пальцах. На дыбачках дóўга ні пастаю. Стáнь на дыбачкі, дак углéдзіш. Кл.

ДЗ.

ДЗЕ'ВЕР *(дзéвер, дзéв[е]р) мужч.* Брат гаспадара (мужа). Барб., Байл., Кл. Дзéв[е]р прасіў у гóсьці. Дак. Дзéверу атнесý. Хал.

ДЗЕЛЬ *(дзель).* Дзе-небудзь. Дзель знайдý. Вольн. Дзель пастáўлю éту прáсьніцу нáнач. Мо дзель дась скасіць крóшку? Кл.

ДЗЕ́РАВА[1] *(дзе́раво, дзе́рава, дрэ́во, дрэ́ва) ніяк.* Дрэва. Кл., Пас. Янкі Купалы.

ДЗЕ́РАВА[2] *(дзе́рава* і *дзе́раво).* Стрэмка. Ні вы́няла дзе́рава, дак падрыва́е (палец). Пас. Янкі Купалы. Ву́йммі ты дзе́раво; вуйма́ла, вуйма́ла—й нія́к. Кл.

ДЗЕРАВЯ́КА *(дзераўя́ка* і *дзеравя́ка) жан.* Бервяно. Дзераўя́ку палажы́лі. С-пуд (з-пад) дзераўя́кі. Я б занё́с ету дзеравя́ку, але му́лка ў плячо́. Кл.

ДЗЕСЯЦІ́ННІК *(дзес[е]ці́ньнік) мужч.* Той, хто жыў на купленай у пана дзесяціне зямлі. Дзес[е]ці́ньнікі булі́. Кл.

ДЗЫГА́ТЫ *(дзыга́ты).* Высокі і тонкі (аб чалавеку). Той дзыга́ты сюды́ прыхо́дзіў. Ідзе—толькі дзы́г-дзы́г-дзы́г. Барб.

ДЗЫ́ГАЦЬ *(дзы́гаць) -аю, -аеш.* Гаворацъ аб хадзе вялікімі крокамі высокага даўганогага чалавека. Той дзыга́ты сюды прыхо́дзіў. Ідзе́—толькі дзы́г-дзы́г-дзыг. Барб.

ДЗЮБА́ТЫ *(дзюба́ты).* З доўгім вострым носам (пра чалавека). Дзюба́таму таму́ аддала́. Хал. Не́йкае ніхаро́шае, дзюба́тае (дзіця). Сл.

ДЗЯВУ́ЛЯ *(арф.) жан.* З адценнем зняваґі—дзяўчына. Tако́й дзяву́лі пара́ на рабо́ту хадзі́ць *(арф.).* Барб. Параўн.: дзяво́я. Сіняўская Слабада Карэліцкага раёна.

ДЗЯДО́К[1] *мужч.* Дзядок.

ДЗЯДО́К[2] Колік (іх два), да якога прывязваецца край сеці (трыгубіцы). На ніжні ка-

нéц дзядкá трэ́ба-бáньку (гл.) набíць *(арф.)*. Кл.

ДЗЯ'ННА *(дзя́нна) жан.* Жо́нка дзядзькі. Дзя́нну сваю́ бáчыла. Кас. У дзя́нны папрашу́. Кл. Дзя́нна мая́ казáла. Барб.

ДЗЯРЖА'ННЕ [1] *(дзяржáньне) ніяк.* Трыманне (таксама ўжываецца). Па рукáх даць за такóе дзяржáнне. Каб што? Дзяржáць ні ўмéе. Кл.

ДЗЯРЖА'ННЕ [2] Асадка (палка) у такіх прыладах, як рыдлёўка, вілкі і падобныя. Дзяржáньне зламáла. Дак.

ДЗЯРЖА'ЦЬ [1] *(дз[е]ржáць) -у, -ыш, пераходны.* 1. Трымаць. Слова трымаць таксама ўжываецца. Памажы́ дз[е]ржáць. Кас. 2. Мець (жывёлу). Сьві́ньне дзяржáлі (мелі свіней, гадавалі свіней). Кл.

ДЗЯРЖА'ЦЬ [2] Быць кумою ці кумам. Я дзяржáла мéншу (была кумою, калі нарадзілася меншая дачка). Вайц.

ДЗЯРКА'Ч [1] *(дз[е]ркáч, дзяркáч) мужч.* Птушка. Дз[е]ркáч сваю́ пéсьню дурну́ю задрáў. Вайц.

ДЗЯРКА'Ч [2] 1. Зношаны венік. Дзеркачэ́ пат плóтам валя́юцца. Кл. 2. Пераноснае. Задзірлівы чалавек. Сідóр вéльмі задзі́рлівы, такí дзяркáч, што ні ўжывé ні с кíм. Кл.

ДЗЯТЛУ'К *(дз[е]тлу́к) мужч.* Зніжальнае. Малы ростам, нямоцны фізічна юнак. Йшчэ зь [е]го ні запамагáты, слабéнькі нéйкі дз[е]тлучóк. Кл.

ДЗЯ'ЦЕЛЬНІК (*дзяцяльнік*) *мужч.* Дзікая расліна, нагадвае канюшыну. Называюць часам—дзікая канюшына. Дзяцяльнік ко́ні лю́бяць. Кл.

ДЗЯЦЮ'К (*дз[е]цю́к*) *мужч.* Падростак, юнак. Тагды́ ўжэ ла́дны быў дз[е]цю́к. Поб.

Е.

ЕЗ (*ез* і *ёз*) *мужч.* Прыстасаванне для лоўлі рыбы: рака перагароджваецца каламі ці дошкамі (забіваюцца ў дно), а на самым глыбокім месцы пакідаецца прасвет, куды і застаўляюць нерат або кош. Там ужэ ні рабі́ў ёзу. С твайго́ ёзу нічо́га ні астало́ся. Кл. Параўн.: гаток. Карэліцкі раён. Параўн.: чэшскае jez — плаціна, гаць.

Е'РНІК (*ёрнік*) *мужч.* Аер. Ёрніку нажа́ла. Кл. Ёрнік расьце́ ско́ра. Барб. Параўн.: я́рый. Папаратнае Жлобінскага раёна.

Е'ТТА (*ётта*). Тут. Ётта стань. Байл. Ётта ні ву́рас аўёс. Кл.

Е'ТТАКА (*ёттака*). Тут. Ёттака ні расьце́ пшані́ца. Барб.

Ё'МАЧНІК (*ёмашнік*) *жан.* Палка, на якую насаджваецца ёмка (гл.). Ёмашнік найці́ трэ́ба. Кл.

Ё'МКА (*ёмка*) *жан.* Чапяла. Ёмкаю ву́грабі. Хал. Ёмку купі́ла. Кл. Ёмка мая́ спаха́лася. Барб. Параўн.: чапля́ (гл.).

Ж

ЖА′ГЛЯЎКА *(жа́гляўка) жан.* Маленькая чырвоная мурашка. Жа́гляўка ў рука́ў улёзла. Кл.

ЖАЛЕ′ЗЗЕ [1] *(жалёзьзе) зборны, ніяк.* Жалёзьзе ні пакра́дуць. Зуб. У жалёзьзі пашука́й. Кл.

ЖАЛЕ′ЗЗЕ [2] Металёвая пастка. Жалёзьзе на во́ўка паста́вілі, а каро́ва нагу́ ўправіла й прастая́ла два дні. Пас. Янкі Купалы.

ЖА′ЛЕЦЬ *(жа́л[е]ць* і *жа́ляць) -яю, -яеш, неперахо́дны.* Гарэць (без полымя). Сінонім да тлець. Запалі́лі ў гру́бцэ й пашлі́, а дзьве́рцаў ні зачыні́лі. Прыхо́джу, а падло́га жа́ляе. Вы́жаляла мо спо́дак (з сподак) пля́ма. Пас. Янкі Купалы.

ЖАЛЯ′ЗКА *(жаля́зко* і *жаля́зка) ніяк.* Прас. Бытуе побач з прас. Жаля́зко сваё було́. Барб. Як новае, сустракаецца і ўцюг. Кл.

ЖУРАЛО′ *(журало́) ніяк.* Ручаіна на вуліцы пасля дажджу. Журало́ цераз ву́ліцу. Сл.

ЖЫВАСІ′ЛАМ *(жывасі́лам).* Гвалтоўна, сілком. Жывасі́лам у го́рло ўлілі́ (лякарства карове). Кл.

ЖЫ′ТКА *(жы́тка) жан.* Жыццё. Хіба́ жы́тка була́? Му́чыліса, дай усё. Кл.

ЖЫТЛО′ *(жытло́) ніяк.* Жыццё. Сустрэта ў праклёне. Што б вы жытла́ ні зна́лі. Кл.

ЗАБІЦЦЕ′ *(забіцьцé) ніяк.* Заклапочанасць, поўная адданасць справе, якая патрабуе разумовага напружання. Дзень і нôч то чытáе, то пíша, я батýю: наштó табé éтае забіцьцé? Кл.

ЗАВАЛЮ′ШЧЫ *(завалю́шчы).* Пра зношаны ці проста нягодны прадмет, які «валяецца на ўсякі выпадак». Нéйдзе завалю́шчы прáнік буў тут. Сл. Мо сакéра есь завалю́шча? Грýбку разьбівáцьмам. Кл.

ЗА′ВЕРЦЕНЬ *(зáвярц[е]нь) мужч.* Вяроўка, часцей скручаны распараны дубовы, бярозавы ці лазовы дубец, якім прымацоўваецца аглабля да саней (пярэдняга капыла). Зáверцень трэба новы завярцець *(арф.).* Пас. Янкі Купалы. Зав[е]ртнê нігóдна штýка. Лéп[е]й на залéзных крукóх. Кл. Параўн.: зáвертка *(арф.)* Карэліцкі раён. Галóднаму ваўкý й зáверта па нутрý. Беларускія народныя прыказкі і прымаўкі, 1957, стар. 133.

ЗАВІ′ТАК *(завíтак) мужч.* Завітак, залом у жыце. Кáжуць мáці йíха завíткі ў жы́це завівáла, дóхлі кóні, карóвы, вéльмі в[е]дзьмáрка былá. Кл. Даўнéй вéрылі ў éтые завíткі, баяліся йіх, ні дай бог. Хал.

ЗАВІХА′ЦЦА *(завіхáцца) -аю-ся, -аеш-ся.* Хутка, з лёгкасцю і спрытам працаваць, каб хутчэй закончыць працу. Хмáра нахóдзіць, дак я завіхáцца, завіхáцца й зьнéсла (сена ў будынак). Кл.

ЗАВІ'ЦА *(завіца) жан.* Сястра гаспадара (мужа). Залвіца. Завіца тут тры дні сядзéла. Кл. Гл. заўвіца.

ЗАВІШАВА'ЦЬ *(завішавáць) -ую, -уеш, неперахóдны.* Зазімаваць траве няскошанаю. Завішавáло балóто як вóкам дастáць. Байл. Адзін год вéльмі багáта сенакóсаў завішавáла. Як замéрзла, дык лю́дзі касілі па лёдзе. І ела тавáрына, бо галóдная былá. *(арф.).* Кл. Сéлета ні завішу́е й на пракóс: бач, старáюцца. Поб. Гл. віш, вішавáць.

ЗАВО'З *(завóз* і *завôз) мужч.* Прывезенае ў млын мліва (гл.), збожжа. Зáўтрэ да завóзу прыéдзяце. Кл. Завóзу нібагáтко булó. Кл. Завóзу на п'яць дзён хóпіць. Вайц. Пóўно й пóўно завóзу. Байл.

ЗАВО'ЗНА *(завóзно, завôзно, завóзна, завôзна).* Багата завозу (гл.). Éту ўсю зіму завóзно й завôзно. Кл.

ЗАВО'ЗНІК *(завóзьнік* і *завôзьнік) мужч.* Той, хто прывёз у млын збожжа малоць. У завóзьніка ахáпак салóмы вазьму́. Кл.

ЗАГНЕ'ВАЦЦА *(загнéвацца* і *загнêвацца) -аю-ся, -аеш-ся.* Пакрыўдзіцца. Вéльмо ж на вас загнéваласа Мáрхвачка. Барб.

ЗАГУБІ'ЦЬ [1] *(загубіць) -блю, -біш, перахóдны.* Загубіць. Загубілі дзіця́ мнê. Барб.

ЗАГУБІ'ЦЬ [2] *(загубіць).* Згубіць. Карóву загубілі, пашлі гу́ртам шукáць. Кл. Ішлá к вам да нéйдзе загубіла ключэ́. Барб.

ЗАДАЛЯГО'ДЗЬ (*задалягóдзь, задал*[*е*]-*годзь*). У значэнні зараней. Параўн.: рускае заблаговременно. Можно меркаваць, што гэта складанае слова—ад каранёў даль і годз' (параўн.: гадзіна, ліхая гадзіна, чорная гадзіна, згадзіўся). Задалягóдзь усé сабрáў. Кл. Задал[е]гóдзь нагатавáла ўс[е]гó на сьвя́то. Байл.

ЗАДЗЕ'ЦЬ (*задзéць* і *задзêць*) *-у, -еш, перахóдны.* Дзець, падзець. Куды́ вы йіх задзéлі ётые нôжны? Кл.

ЗАЖА'ЛЕЦЬ (*зажáляць* і *зажáл*[*е*]*ць*) *-ею, -ееш, неперахóдны.* Загарэцца без полымя ад высокай тэмпературы на адлегласці ад агню або ад іскры. Стаялі й грэліся пры агні́, адáл[е] засмалі́ла (запякло)... зажáляла калóша (калашына). Кл.

ЗАЗІ'МКАВАТЫ (*зазі́мкаваты*). Тое, што зазімкавы. Зазі́мкаватае (каровы) ні купля́й. Кл.

ЗАЗІ'МКАВЫ (*зазі́мкавы* і *зазі́мкавуй*). Пра чалавека, жывёлу, якія к канцу зімы, асабліва ў пачатку вясны, становяцца слабыя, худыя. Прадáць трэ́ба: зазі́мкава (карова). Кл. Ён у нáс змáлку нéйкі зазі́мкавуй (пра хлапца). Барб.

ЗА'ЗУБЕНЬ (*арф.*) *мужч.* Бародка рыбацкага кручка. Тады́ кручкі́ дóбрыя, як зáзубень у іх вялíкі. (*арф.*). Пас. Янкі Купалы.

ЗАКАЛЁ'ННЫ (*закалённы*). 1. Жорсткі, люты, злосны (пра чалавека, пра зіму). Ні рáз ні атлёг марóз, от закалённа зімá. Вéльмі ж

ён закалённы буў, еты Андрэй, пастухі й дўху баяліса. Кл. 2. У мове моладзі—і ў значэнні загартаваны (побач з загартаваны). Закалённы стану, што сталь. Пас. Янкі Купалы.

ЗАКАПУ'ЛІЦЬ (*закапўліць* і *закапыліць*). Нешто ні так сказала, дак і закапуліла губу (губы). Кл.

ЗАКО'БАЦЬ (*закобаць*) *-аю, -аеш, пераходны.* Закінуць, закідаць што-небудзь між іншых рэчаў. Закобала ў рызьзі маю хустку, што шукаю й ні знайду. Кл. Параўн.: чэшскае kobka (кобка)—каморка.

ЗАКО'ВАНКА (*закованка*) *жан.* Гульня ў хованкі. У нас у ету закованку й вêк гуляюць. Той, хто знайшоў, «закоўвае», стукае па лаўцы і крычыць: «кую-кую!» (каго-небудзь). Параўн.: хавалка (гл.).

ЗАЛЕ'ГЧЫ [1] (*залегці* і *залегчы*) *-у, -аш, пераходны.* Залегчы. Паклалі косы да залеглі мо на тры часы. Кл.

ЗАЛЕ'ГЧЫ [2] Грозна пагнацца (за кім-небудзь). Увайшлі ў сад, дак вот я йіх залег, шапак аццураліса. Сл.

ЗАЛЕ'ТАСЬ (*залетась* і *залêтась*). Два гады назад. Яны залетась ня булі. Залетась накрыла хату. Кл.

ЗАЛЕ'ТКАВЫ (*залеткавы, залêткавы, залеткавуй, залêткавуй*). Мінулагодні, той, які ўжо быў у мінулае лета. Ужываецца звычайна пры назоўніках, якія абазначаюць назвы сельскагаспадарчых культур; залеткавая культура (насенне)—культура (насенне) з ураджаю мі-

нулага года. Залёткавым жытам ні сêй, бо мóжа ні ўзыйсці. Пас. Янкі Купалы. Залёткавае жыто. Кл.

ЗАЛІ'ЦЬ (*заліць*) *-ю, -іш, пераходны.* Выварваць у лузе (бялізну). Заліць плáцце трэ́ба. Зóляць у лўзе, альбó, кáжуць, зóляць у шчóлаку. Кл.

ЗАЛЫГА'ЦЬ (*залыгáць*) *-аю, -аеш, пераходны.* 1. Узяць на повад (гл.) валоў (вала). Ты ні залы́гваў валá йшчэ? Зуб. Залыгáй Сідóравы валы́. Кл. 2. Пераноснае. Узяць каго-небудзь у рукі, запрэгчы. Пачакáй, вот у салдáты пóйдз[е]ш, перасьціхнеш бушавáць да грымéць, распýсьнік,—там залыгáюць. Барб.

ЗАЛЫ'ГВАЦЬ (*залы́гваць*) *-аю, -аеш, пераходны.* Незак. тр. ад залыгаць. Гл. залыгаць.

ЗАМЕ'СНІК (*замéсьнік, замêсьнік*) *мужч.* Наместнік. Ён жэ замéсьнікам. Кл. Параўн.: намеснік і рускае заместитель.

ЗА'МЕСЬ (*зáм*[*е*]*сь*). Быццам, як быццам, нібыта, быццам бы. Гавóраць пуд акнóм, а я зáм[е]сь ні чýю, да ўсе й чýла. Кл.

ЗАМЁ'Т (*зам'ёт*) *мужч.* Агарожа з бярвенняў. Цяпер сустракаецца рэдка. Зам'ёт рабіўса надóўго. Ён крапчэ́йшы за ўся́кі плôт. Кл.

ЗАМЁ'ЦІНА (*зам'ёціна*) *жан.* Бервяно з замёту. Зам'ёцінаю напаліла ў хáце.

ЗАНО'ЗА (*занóза*) *жан.* Частка ярэмца (1)—моцная палка, якая закладаецца ў ад-

ґуліны ярэмца (гл.) і кульбакі (гл.). Занôз, хлóпч[э], не выкідáй, хай у ярэ̂мцы бýдуць. Кл. Гл. ярэмец, кульбака.

ЗАНЯДУ'ЖАЦЬ *(зан[е]дýжаць, занядý-жаць) -аю, -аеш, непераходны.* Захварэць, няцяжка захварэць. Занядýжаў, а на трэ̂йці дзень—і німá. Барб. Нéшто зан[е]дýжала нáша Анютка. Кл.

ЗАПАМАГЧЫ'СЯ *(запамагціса, запамагці-ся) -у-ся, -аш-ся.* Дапамагчы сабе, пажывіцца, разжывіцца. Калі хто й вóзьме éту пустýю тóрбу, то хібá запамóжацца? Балаш. Чужы́м цяж-ко запамагціса. Ні вéльмі запамóжасса. Кл.

ЗАПАРВА'ЦЬ *(запáрваць) -у, -еш, пераходны.* Застаць, захапіць, набыць што-небудзь. Запарвý ў грáдах, то зьдз[е]рý шáпку. Сл. Каб запарвáла дзе на людзях, то ўсе чы́сьцянько б расказáла б пра ц[е]бé. Сл. Калі запарвýць які рубéль, то ўсе на шшы́ткі, на кніжкі. А ці бý-дзе што зь éстаго. Кл.

ЗАПІСА'ЦЦА *(запісáцца) -у-ся, -аш-ся.* 1. Запісацца, зарэгістравацца (у нейкі спіс). Кл. 2. Зарэгістравацца ў шлюбе, юрыдычна аформіць шлюб. Паéхалі ў Глýск запісацца. Кл. Запісáліса, а назáўтра й павéстку ў салдá-ты йці прынéсьлі. Барб.

ЗАПЛЕ'СЦІ *(заплéсьці) -у, -еш, пераходны.* 1. Заплесці (касу). 2. Заштукаваць. Дзіркі ў кашóх заплёў. Байл. 3. Пачаць плесці. Заплёў аж два кашэ̂ й ніяк ні кóнчу. Кл.

ЗА́ПЛІКНУ'ЦЦА (*заплікну́цца*) *-у-ся, -еш-ся.* Зашпіліцца. Заплікніса на ўсê гу́зікі. Байл. Параўн.: адплікнуцца.

ЗАПЛІКНУ'ЦЬ (*заплікну́ць*) *-у, -еш, пераходны.* Зашпіліць. Заплікні́ піжа́к, ні хварсі́. Кл. Параўн.: адплікнуцца.

ЗАРАБО'ТЛІВА (*зарабо́тліва* і *зарабôтліво*). Добра аплочваецца праца. У Сібе́ры зарабо́тліво було́. Кл. Дзе зарабо́тліва, там бесь цябе́ е (ёсць) каму́ палуча́ць гро́шы. Пас. Янкі Купалы.

ЗАРАБО'ТНА (*зарабо́тно* *і* *зарабôтна*). Што і заработліва. Гл. заработліва. На вадзé (на плытах) зарабо́тно було́, але ця́жко. Хал.

ЗАСЛО'Н (*засло́н* і *заслôн*) *мужч.* Параўн.: 1. Латае халацік на ўслоне матка. Я. Колас. Збегала да суседак, назносіла ўслонаў. А. Чарнышэвіч, Світанне, 1957, стар. 266. 2. Зэ́даль. Радашковіцкі раён. 3. Перадок. Халопеніцкі раён.

ЗА'СТАЎКА (*за́стаўка*) *жан.* Шлюз, дошчачка. 1. За́стаўкі заста́вілі, мало́ць бу́дуць. Кл. Было́ п'яць за́ставак, а но́вы мôст зрабі́лі тôлькі на чаты́ры за́стаўкі. Кл. 2. К кашôм (сплеценым з лазы скрыням) трэ́ба за́стаўкі парабі́ць, у сыбо́ту капа́ць карто́плі бу́дам. Кл.

ЗА'СЦІЦЬ (*за́сьціць*) *-шчу, -сц-іш, непераходны.* Ні трэ́ба было́ за́сьціць. Я табе́ хіба́ за́сьціў? Ні за́сь, атыйдзі́. Кл.

ЗАЎВІ'ЦА *(заўвіца) жан.* Гл. завіца. Заўвіца хадзіла ў Глуск. Барб.

ЗАХВІСТАВА'ЦЬ *(захвіставаць) -ую, -уеш, пераходны.* Паставіць знак забароны пасвіць жывёлу. Гл. хвіст. Цімошак (ляснік) захвіставаў усе балотц[э]. Кл. Забыў захвіставаць. Кл.

ЗАХВІЦО'НЫ *(захвіцоны).* Узбаламучаны, кручаны, неўраўнаважаны. Ні дурная, да захвіцона. Кл. Параўн.: вірутнік. Барысаўскі раён.

ЗАЦУГЛЯ'ЦЬ *(зацугляць) -яю, -яеш, пераходны.* Закілзаць (ужываюцца абодва словы). Мусіць, каб зацугляць каня: машын байіцца. Кл.

ЗА'ШМАРГАМ *(зашмаргам).* Зашмаргай. Завязаць зашмаргам—завязаць так, каб, пацягнуўшы за кончык (ніткі, вяровачкі), можна было лёгка развязаць. Заўязвай зашмаргам. Кл. Параўн.: завязаць бантам *(арф.).* Мсціслаў.

ЗАШПУЛІ'ЦЦА *(зашпуліцца).* Гл. зашпуліць, а таксама заплікнуць, заплікнуцца. Кл.

ЗАШПУЛІ'ЦЬ *(зашпуліць* і *зашпыліць) -ю, -іш, пераходны.* Зашпіліць. Ці заплікнуць ці зашпуліць—тое самае. Кл. Гл. заплікнуць, заплікнуцца.

ЗАШЭ'РХНУЦЬ *(зашэрхнуць) -у, -еш, непераходны.* Пакрыцца (вадзе, гразі, іншай вадкасці) тоненькім лёдам. Толькі зашэрхла (вада ў возеры). Кл.

ЗАЯ'ДА *(заяда) агульн.* Чалавек, які заядаецца. Вайц. Параўн.: дзяркач.

ЗАЯ'ДЛЫ (*заядлы*). Самааддайы ў працы, які кіруецца жаданнем як мага больш зрабіць, больш атрымаць. Бáцько буў вéльма заядлы, дзень і нôч хватáў (рабіў), а сыны ўжэ ні такіе. Байл.

ЗВАЖА'ЦЬ (*зважáць*) *-аю, -аеш*. Паважаць. Трóхі баяцца, а трóхі зважáюць, але ні чапáюць. Кл.

ЗВА'ЛАШАЦЬ (*звáлашаць*) *-ю, -еш, пераходны*. Гл. валашаць. Звáлашалі бугая. Н.-Андр.

ЗВЕ'РВАЦЬ (*зьвéрваць, зьвêрваць*) *-аю, -аеш, пераходны*. Давяраць (каму-небудзь штонебудзь). На мянé ўсе зьвéрвае (на мяне ўсю маёмасць пакідае, мне давярае ўсю маёмасць). Сл.

ЗГАРУ'СЦІЦЬ (*згарýсьціць*) *-шч-у, -сц-іш, пераходны*. Абыякава скідаць, злажыць, зваліць. Згарýсьціць сырóе жыто ў сьвіран, што б прапáло. Хал.

ЗГЛЕ'ДЗЕЦЬ (*зглéдз[е]ць, зглéдзяць*) *-дж-у, -дз-іш, пераходны*. Заўважыць. Так хýтко шчытáе грóшы, што й зглéдз[е]ць ні мóжна. Хал. Я й ні зглéдзяла, як ён праскóчыў на ліса-пéце. Кл.

ЗГЛУМІ'ЦЬ (*зглуміць*) *-мл-ю, -м-іш, пераходны*. Гл. глуміць. Бес пары забілі (кабана), тóлькі зглумілі. Кл.

ЗДЭ'ЦЦА (*здэцца* і *здаéцца*). Здаецца. Ужываецца побач з здаецца. Ты, здэцца, на паліцу палажыў напілак. Кл.

ЗЕ′ЛЛЕ[1] *(зéльле) ніяк., толькі ў адз., зборны.* 1. Пустазелле. Зéльля багáто на грáдах. Хал. У карчóх назьбірáла зéльля. Зéльле ў прóсе. Кл. 2. Расліннасць у рэчцы. Акунê ў карчôх, а шчукí ў зéльлі. Кл. За зéльле зачапíў вýдачку. Хал.

ЗЕ′ЛЛЕ[2] *(зéльле, зяльля́) у адз. і множн.* Лякарства. Зяльлêў прыўêз (фельчар). Кл.

ЗІ′МКА[1] *(зімка) жан.* Памяншальнае ад зіма.

ЗІ′МКА[2] Пшаніца-зімка. Зíмка (пшаніца) ў нас слáбо расьцé. Зуб.

ЗІ′МКА[3] Садовае дрэва (яблыня, груша, сліва), плады якога спеюць позна і добра захоўваюцца зімою. Пасадзíлі дзьве зíмкі (слівы) і дзьве рáньніе. Барб. Зíмка даражэ́йша за ўся́ку йгрýшу. Пас. Янкі Купалы.

ЗІМНЯ′К *(зімня́к) мужч.* Дарога праз балота, па якой ездзяць толькі ўзімку, з наступленнем марозаў. На зімня́к пашлí. Кл. Зімнякóм вóзяць *(арф.)*. Кл. Параўн.: Гэта быў зімнік, а не летняя дарога. А. Чарнышэвіч, Світанне, 1957, стар. 236.

ЗЛЕ′ГЧАНЫ *(зьлéгчаны)*. Спакладаны, звалашаны (гл.). Зьлéгчаных бычкóў штук шаснáццаць. Зьлéгчаных бычкôў лягчэ́й прывучы́ць к рабоце. Кл.

ЗЛЕ′ТАВАЦЬ[1] *(зьлéтаваць, зьлêтуваць) -ую, -уеш, непераходны.* Прабыць лета. Часта— peралéтаваць. Калёса й зьлéтавалі на дварэ́.

Кл. Пашо́ў на во́ду (гнаць плыты) й зьле́туваў на вадзе́. Хал.

ЗЛЕ'ТАВАЦЬ [2] Ледзь-ледзь падагрэць ваду, давесці да летняй тэмпературы. Зьлётавала вады́ каро́ве. Барб. Зьле́таваць вады́ но́гі паму́ць. Кл.

ЗЛЕ'ТКАВАЦЬ Што і злетаваць [2]. Звычайна ўжываецца злетаваць. Гл. злетаваць.

ЗЛЫГА'ЦЬ *(злыга́ць) -аю, -аеш, пераходны.* Звязаць за рогі двух валоў, дзвюх кароў. Йшчэ ні ўмеў валы́ злыга́ць, а па́сьціў і до́брэ пасьці́ў. Кл. Хо́дзяць (ідуць), як злы́ганыя *(арф.)*. Барб., Кл.

ЗЛЫ'ГВАЦЬ *(злы́гваць)*. Незак. тр. ад злыга́ць (гл. злыгаць). Кл.

ЗЛЫ'ГІЧ *(злы́гіч) мужч.* Повад (гл.), на які злыгваюць (гл. злыгваць) валоў. Вазьмі́ злы́гіч да злыга́й валы́. Байл. Параўн.: злыга́ч Слуцкі раён.

ЗЛЯГЧА'ЦЬ *(арф.) -аю, -аеш, пераходны.* Спакладаць, звалашаць (гл.). Кл.

ЗМАКРЭ'ЦЬ *(змакрэ́ць) -эю, -эеш, непераходны.* Зрабіцца мокрым, наскрозь прамокнуць. Усе́ змакрэ́ло на на́с. Кл.

ЗМУ'СЦІЦЬ *(зму́сьціць) -шч-у, -сц-іш, пераходны.* Спакусіць, рускае соблазнить. Сата́на зму́сьціць я́сна сакала́. Касар.

ЗНАЦЬ [1] *(знаць)*. Ведаць. Ужываюцца і ведаць і знаць. Барб., Хал., Кл., Сл. Я зна́ю а́драс, да сказа́ў, што ні ве́даю а́драсу. Кл.

ЗНАЦЬ [2] Відаць. І знáць, што ён підóбры чалавêк. Н.-Андр. Знаць, што марóзы прападýць. Зуб. Знаць (відаць), што даўнó цéлна (карова). Кл.

ЗНА'ЧЫ'ЦЬ *(знáчы́ць) II спраж., непераходны.* Выразна відаць (аб карове), што цельная. Ні палю́я й ні знáчыць нáша карова. Н.-Андр. Скóра малачкá дась карóўка, дóбра значы́ць ужэ́. Кл. Параўн.: Карóва ўжо значы́цца *(арф.)*. Віцебскі раён.

ЗНЕ'КУЛЬ *(зьнéкуль,* радзей *зьнéскуль* і *зьнéткуль).* Аднекуль. Зьнéкуль жóнку сабê прыўéз. Кл.

ЗНЕ'СКУЛЬ *(зьнéскуль)* Гл. знекуль. Кл.

ЗНЕ'ТКУЛЬ *(зьнéткуль).* Гл. знекуль. Кл.

ЗНЕ'ХТАВАЦЬ *(зьнéхтаваць, зьнéхтуваць) -ую, -уеш, пераходны.* Зганьбіць, прынізіць (каго-небудзь), як нікчэмнага, нявартаснага. Прыўéз (жонку) з Расéйі, маладзíца харóша, здарóва, нáшае жы́зьні ні знáе, дак зьнéхтавалі сусíм. Сл. Каб зьнéхтаваць, рóзуму ні трэ́ба. Сл.

ЗНО'САК *(знóсак) мужч.* Зносак, незвычайна малое яйка. Знóскі бывáюць вéльмі такі[е] мацакí. Пас. Янкі Купалы.

ЗНЯБУ'ЦЦА *(зьнябýцца).* Гл. знябыцца.

ЗНЯБЫ'ЦЦА *(зьнябýцца, зьнябы́цца, зьн[е]бы́цца).* Выбіцца з сіл (у дарозе, з бессані, з голаду, з бесперапыннай працы, адзіноцтва ў чужых людзях). Загнáлі (немцы) акóпы ка-

па́ць, хо́ладно, ёсьці німа́ чаго́, от зьнебулі́са. Сл. Зьнябу́ўса, ётаку даро́гу прайшо́ў. Кл.

ЗНЯВЕ́РЫЦЬ *(зьнявéрыць, зьне[я]вéрыць)*. Жорсткім абыходжаннем выклікаць (у чалавека, жывёліны) страх, боязь. Ето ж ты, Вало́дзік, зьнявéрыў ва́ла лы́саго, што й ні патпуска́е блі́зко. Кл.

ЗНЯПРА́ЎДЗІЦЬ *(зьніпра́ўдзіць) -джу, -дз-іш*. Расказваючы (перaказваючы), адступаць ад праўды, расказваць (пераказваць) на шкоду каму-небудзь. Ён усé (усё) зьніпра́ўдзіў, хіба́ так і було́? Кл. Параўн.: рускае исказить. Гл. няпраўдзіць.

ЗНЯЧЭ́ЎКУ *(зьнячэ́ўку, зьн[е]чэ́ўку)*. Ужываецца ў значэнні і побач з знянацку. Зьнячэ́ўку вéльмі напужа́ў. Вольн.

ЗЯЗЮ́ЛЬКА *(арф). жан.* Ці ж е (ёсць) гро́шы на зязю́льку *(арф.)*. Кл. Параўн.: зяўзю́ля, куку́ля, куку́лька.

ЗЯКРА́ТЫ *(зякра́ты, з[е]кра́ты)*. 1. Зякраты (пра чалавека)—з вялікімі вачыма; уставіўшыся, доўга глядзіць нерухомымі вачыма. На свайі́х дачо́к сва́рыцца, ла́е йі́х: «Чаго́, зякра́ты[е], ву́лупіліса?» Кл. 2. Зякратае бёрда—рэ́дкае бёрда. Кл.

ЗЯЛО́ *(арф.) ніяк.* Насенне пустазелля. Зяла́ кура́м прыне́сла *(арф.)*. Кл.

ЗЯЎЗЮ́ЛЯ *(зеўзю́ля)*. Зеўзю́ля куку́е йшчэ. Сл. Гл. зязю́ля.

І.

ІГЛІ'ЦА *(іглі́ца) зборн., жан., толькі ў адз.* Іглы хвоі. Па йглі́цу паехалі: у кабана ўтапі́цца мо́жно. Кл. Параўн. шыльнік. Радашковічы.

ІМСЦІ'ЦЬ *(імсьці́ць) -шчу,-сц-іш, неперах одны.* Нічо́га ні да́й, дак імсьці́цьме. Кл.

ІНДЫ'К *(інды́к) мужч.* Індыко́ў два́ццаць ў йіх. Байл. Інды́к ду́маў, ду́маў, пашо́ў у мо̂х дай здо́х. Кл. Малы́, пасі́ валы́, а ты, вялі́кі, пасі́ інды́кі *(арф.)*. Кл., Сл., Поб. Множн. лік—індыкі́. У прыведзеным жарце: вялі́кі—інды́кі. Кл.

І'РХА *(йі́рха) жан., толькі ў адз.* Вузенькая палоска скуры, якая закладваецца ў шво кажуха. Йі́рха до́бра. Барб. На йі́рху по́йдзе е́та аўчы́нка, ве́льмі ніўда́ла. Кл. Параўн.: чэшскае jircha—замша, лайка.

К.

КА *(ка* і *каа)*. Скарочанае кажа. Так, ка, мне ліхо́ було́. Кл.

КАБАНО'К *(кабано́к) мужч.* Кабанчык. І кабанка́ ўкармі́ла. Байл. Кабано́к харо́шы, але нам малава́ты. Кл.

КА'ДАЎБ [1] *(ка́даўб) мужч.* Судзіна для збожжа, мукі, выдаўбаная з суцэльнага кавалка дрэва. У гэтым жа значэнні кады́р. Барб., Кл.

КА'ДАЎБ [2] 1. Глыбокая яма ў рэчцы. У ка́даўбе я́зя злаві́ў. Кл. 2. Калдобіна на дарозе.

Кадаўбу паўбівалі (павыбівалі) на дарозе. Барб.

КАДАЎБІ'НА (*кадаўбіна*) *жан.* Калдобіна на дарозе. Барб., Байл. Уся (дарога) на кадаўбінах. Пас. Чырвоны.

КАДО'ЎБЧЫК (*кадоўбчык* і *кадаўбчык*). Памяншальнае ад кадаўб. Кл.

КАДЫ'Р (*кадыр*) *мужч.* Што і кадаўб (гл.). Часцей — кадыр. Кадырэ на пашню (збожжа) булі. Кл.

КАЗЁ'НКА [1] (*казёнка*) *жан.* Невялікая кадушка, па форме (часцей)—усечаны конус, аб'ём—на пуд-два збажыны, з адным ці двума вухамі; карыстаюцца, калі перасыпаюць, пераносяць збажыну. Твой дзёд вуняс казёнку жыта, сьвітку й аўчыну. Кл.

КАЗЁ'НКА [2] Сякера заводскага выпуску. Толькі ў мове старых. Цяпер кавалі не робяць сякераў. Казёнка вельма войстра, але цяжка. Кл.

КАЗЛЫ' (*казлы*) *толькі ў множн.* Прылада, на якой перапілоўваюць дрэва. Казлы зламаў. Вайц. Параўн.: козлы. Пярэжыры Радашковіцкага раёна.

КА'ЙСТРА (*кайстра*) *жан.* Торба. Кас.

КАЙСТРЫ'ЦА Гл. кастрыца. Кл.

КАЛАВУ'РЫЦЬ (*калавурыць*) *-у, -ыш, пераходны.* Вартаваць, сцерагчы. Часцей ужываецца вартаваць. Па парадку калавурылі калгаснаго двара. Кл. У слове перастаноўка *р* і *л* (з цюркскага kara(v)ul—дазор).

КАЛАСАВА'ЦЬ[1] *(каласава́ць) -ую, -уеш, пераходны.* Каласаваць, выплываць (пра каласы збожжа). Ужэ́ й жы́то каласу́е. Кл.

КАЛАСАВА'ЦЬ[2] Пры абмалочванні ячменю цэпам на зярнятах застаюцца асцюкі; каласаваць—абіваць асцюкі. Скаласава́лі й згарну́лі ў ку́чу. Байл. Каласава́ць ніця́жко. Кл.

КАЛАТУ'ША *(калату́ша) жан., толькі ў адз.* Зацірка. Калату́шы звару́. Кл. У фразеалагічным спалучэнні—калату́шы нарабі́лі. Сл.

КАЛАЧО'НІК *(калачо́нік) мужч.* Стрэсены (скало́чаны—Кл.) арэх: у верасні—кастрычніку арэхі лёгка страсаюцца (кало́щ[е]цца. Кл.). Калачо́нікі са́мые сма́шные. Йшла́ й ду́мала сама́ сабе̂: каб узя́ў і прада́ў. І гро́шы трэ́ба, й калачо́нікаў шко́да. Кл. Параўн.: труханец. Клімавіцкі раён.

КАЛІ'ЛЬ *(калі́ль).* Калі-небудзь (ужываюцца абедзве формы). Калі́ль пашкаду́юць, аду́маюцца, што ма́ці шкадава́ла йіх, гультае̂ ты́е. Барб. Калі́ль прыду́. Кл.

КАЛНО'Е *(кално́е) жан.* Назва ўгоддзя (балотная сенажаць). Расказвалі пра паходжанне назвы: Наш ба́цько гавары́ў, што пры па́ншчыне во́йта закало́лі насі́лаю (гл.). Во̂йт ліхі буў. Войт, лёгшы на беразе ракі, піў ваду, прыгонны яго праткнуў, закалоў насілаю (апошні сказ запісаў не літаральна). Кл.

КАЛЫ'ШКА *(калы́шка) жан.* Калыска. Адно́ (дзіця) на лане̂, друго́е за ру́ку, а трэ́йцяго (хлопчыка)—ў калы́шку. У калы́сцэ. Кл.

КАЛЯСНІ'К (*калясьнік, кал[е]сьнік*) *мужч.* Невялічкі воз (летні, на калёсах) сена, саломы, канюшыны. Кал[е]сьнік се́на купіў. Кл. Параўн.: настра́мак (гл.).

КАМЕ'НЬКА (*каме́нька*) *жан.* Палка, якою апіраюцца пры хадзе; яна загнутая або мае сучок і нагадвае камяню́ (гл.). Кл.

КАМЯНЯ' (*кам[е]ня́*) *жан.* Качарга. Кам[е]ня́ мая́ пярагарэла. Кл. Дзед за е́ю с камяне́ю. Жартоўная песня. Кл.

КАНАВА'Л (*канава́л*) *мужч.* Чалавек, які пакладае (кастрыруе) жарабцоў, быкоў. У Дако́лі канава́л жыў, ліцьві́н не́йкі. Кл. Параўн.: рускае коновал—знахарь, лечащий лошадей. С. І. Ожагаў, «Словарь русского языка».

КАНАЗА' (*каназа́*) *агульн.* Дзіця, якое крыўляецца, сюсюкае, любіць і вымагае ўвагу ад дарослых. Каназа́ та́я гаво́рыць ні ма́ма, а мя́мя, гавалю́, пля́ўда,—хіба́ ні ўме́е гавары́ць? Кл.

КАНАЗІ'ЦЦА (*каназі́цца*) *-ж-уся, -іш-ся.* Крыўляцца (аб дзіцяці) у гутарцы, сюсюкаць, прыкідвацца зусім маленькім. Ве́льма разду́рны да кано́зіцца. Кл. Параўн. каназа́.

КАНАПЛЯ'НІК (*канапля́нік*) *мужч.* 1. Верабей. Канапля́нік шпако́ўню заня́ў. Кл. 2. Пераноснае. Маленькі, худзенькі, слабы, але спрытны (чалавек, дзіця). Кл.

КАНЕ'ЧНЕ (*кане́шне*). 1. Што і ко́нча (гл.). Хіба толькі, абавязкова. Ужываецца ў пытальных сказах. Хіба́ то (гэта) кане́шне та-

бê êхаць? Кл. 2. Зразумела, вядома, безумоўна, бясспрэчна. Канешне, канюшыну трэба на весну прыхаваць. Барб.

КАНЧА′ (*канча́* і радзей *канчо́*) *ніяк.* Скланяецца з *яц* (як цяля — цяляці). 1. Невялікі слабы конік. Было нейкае дохлае канча. Сл. 2. Аб сваім уласным кані (своеасабліваe табу): Адно канча прадалі, хапіло з нас і аднаго канчаці. Сл.

КАНЧА′НЕЦ (*арф.*) *мужч., множн.* — канчанцы і канчане. Жыхар з супрацьлеглага канца вёскі. Кл.

КАНЧА′НСКІЯ [1] (*канча́нскіе, канча́ньскіе*). Субстантаваны прыметнік. Жыхары супрацьлеглага канца вёскі. Кл. Параўн.: канчанец.

КАНЧА′НСКІЯ [2]. Якія належаць жыхарам супрацьлеглага канца вёскі. Канчанскіе сьвіньне пасуцца на калгаснай канюшыне. Кл.

КАПАНІ′ЦА (*капаніца*) *жан.* Матыка. Капаніцаю акапанічыла. Вайц. Капаніцаю трактар пужаць (*арф.*). Кл. Параўн.: гачка. Радашковічы.

КАПАНІ′ЧЫЦЬ (*капанічыць*) *-у, -ыш, пераходны.* Акапанічваць (гл.). Кл.

КАПА′ЦЬ [1] (*капа́ць*) *-аю, -аеш, пераходны.* Сл., Кл.

КАПА′ЦЬ [2] У значэнні газетнага ўбіраць (бульбу, буракі, моркву) — толькі капаць. Параўн.: копка. Кл., Сл., Хал. П'яць баб капалі картоплі. Кл. Пакуль дзеці ні йдуць у школу

(пачатак навучальнага года), картóпл[е]ў ні капáюць. Кл.

КАПЕ'Ц (*капéц*) *мужч., множн.*—капцэ́(э̂) і капцы́. 1. Куча бульбы, накрытая саломаю і прысыпаная зверху зямлёю. Капéц картóпляў сагніў. Такíе маразы́, — што б у капéц мой ні пралêз марóз. Кл. 2. Невялікі насып зямлі. Хто тут накапáў капéц? Кл. 3. У фразеалагічным спалучэнні: Там табé й капéц бýдзе. Кл. Капец тут у значэнні канец, магіла. Гл. скапéц.

КА'ПКА (*кáпка*) *жан.* Крópля (ужываецца і кропля), прычым кропля звычайна ў сэнсе крошку, трошку. Хмáры німá, а мнê кáпка на рýку кáпнула. Пас. Янкі Купалы. Параўн.: чэшскае kapka—кропля.

КАПСАНУ'ЦЬ (*капсанýць*) *-у, -еш, пераходны.* Штурхнуць, піхнуць. Йшлі ш шкóлы, дурэ́лі, некатóры й капсанýў майгó (сына) й зьвіхнýў. Байл. Параўн.: піргнуць. Радашковічы.

КАПСА'ЦЬ (*капсáць*) *-аю, -аеш, пераходны.* Штурхаць, піхаць. А наштó ты капсáў? Ты ж бóльшы! Барб. Параўн.: піргаць. Радашковічы; вв. Угляны, Маславічы, Казекава Заслаўскага раёна.

КАПШУ'К (*капшýк*) *мужч.* Мяшочак з скуры ці ткані на тытунь. Пóўны капшýк лёгкаго табакý. Н.-Андр. Пераноснае. Жывёліна, якая многа есць, вельмі наядаецца. Кл.

КАРАБО'К (*карабóк*) *мужч.* Карабок запалак — пачак запалак. Бытуюць абодва гэтыя

словы. Мо п'яць карабкі (запалак) на дзень паліш. Кл.

КАРАБ'Я' (караб'я) жан. Вялікая лубяная каробка для бялізны. Караб'йі той гадоў стольki, скольki бацьку. Кл.

КАРА'ВАЧНІК (каравашнік) мужч. Зборшчык утылю, каравак (гл.). Конь у вас—што даўнêй у каравашнікаў булі. Кл.

КА'РАК (карак) мужч. Карак. Надаваць па карку. Вайц. Карак баліць. Кл.

КАРА'К (карак) мужч. Брудная, карэлая, зношаная ануча, рубіна (гл.). Каракі етые вўн[е]сьці трэба на сьметнік. Сл. На каракі йголак набрала. Кл.

КАРАСІ'НА (карасіна) жан. Газа. Бытуюць абодва словы. Карасіны прывезьлі? Хал. Карасінаю абліvалі й палілі. Поб. Карасіна нейка чорна. Зуб.

КАРА'ЎКА (караўка) жан. Тое, што карак. Каравак назьбірала да занесла ў краму. Хал. Ні сукенка, а караўка нейка. Барб.

КАРА'ЧЧА (караччэ і караччa) зборны ад карак (гл. карак), ніяк. Караччa етаго назьбіраласо. Сл. А што зь естаго караччa будзе? Праўда, што кніжкі рабіцьмуць? Кл.

КАРО'БКА (каробка, карôбка). Скрынка з лубу. Каробку гароху, а дзьвê жыта. Хал.

КАРО'ВІЧЫ (каровічы). Прыналежны прыметнік. Каровічае малако. Кл. Каровічае малако смашнейшае за казінае. Сл.

КАРПА'ЦЬ[1] *(карпа́ць) -аю, -аеш.* Калупаць (ужываюцца абодва). Карпа́ў, карпа́ў у но́се, по́куль пашла́ кроў. Пас. Янкі Купалы.

КАРПА'ЦЬ[2] Павольна, па-дзедаўску рабіць што-небудзь. Хіба́ сабе́? Людзям карпа́ю (не для сябе—для людзей робіць),—тро́хі во́чы ба́чаць. Кл.

КАРТАВА'ЦЬ *(картава́ць) -ую, -уеш, пераходны.* Раздаваць карты. Каму́ картава́ць? Кл.

КАРУ'ЗА *(кару́за) агульн.* Неадабральнае. Задзірлівы, неадчэпны чалавек (гл. заяда, дзяркач). Малы́ буў, дак ве́льмі кару́за. Кл.

КАРУ'ЗЛІВЫ *(кару́зьлівы).* Прыметнік ад каруза (гл.). Такі́ кару́зьлівы той Га́ньнін сын. Кл.

КАРЦЕ'ЦЬ *(карце́ць) безасабовы, II спраж., непераходны.* Непакоіць, турбуе які-небудзь клопат, не выходзіць з галавы. Ето табе́ карціць, дак ты й ёсьці ні ёў. Кл.

КАРША'К *(ко́ршак* і *карша́к) мужч.* Гл. коршак.

КАРЭ'ЛЫ *(карэ́лы).* Каравы (ужываецца і карэлы і каравы). Вазьмі́ чы́сту ану́чку, дак ле́п[е]й за той карэ́лы бінт. Пас. Янкі Купалы.

КАСІ'ЛЬНА *(касі́лно, касі́льно, касі́льна) ніяк.* Кассё. Касі́лно ву́стругаў. Кл. Касі́лнам сту́кнуў. Байл. Гл. кассе.

КАССЕ' *(касьсе́) ніяк.* Побач з касілна. Пас. Янкі Купалы. Кл.

КАСТРЫ'ЦА (*кастры́ца* і *кайстры́ца*) *жан., зборны.* Кайстры́цы набрала. Барб. Я по́сьцілак п'яць прыне́сла кастры́цы. Кл.

КАСЦЕРУХА' (*касьц[е]руха́, касьцеруха́*) *жан.* Расліна-пустазелле. Касьцеруха́ на се́но пойдзе. Барб.

КАТА'НКА (*ката́нка*) *жан.* Калыска, якая не падвешваецца, а стаіць на падлозе і прыстасавана для калыхання. Сл.

КАЎНЕ'РЫК[1] (*каўне́рык*) *мужч.* Памяншальнае ад каўнер. І каўне́рык харо́шанькі. Хал.

КАЎНЕ'РЫК[2] Манжэта ў верхняй ці споднай кашулі. Саро́чкі с каўне́рыкамі шы́ла. Кл.

КАЎНУ'ЦЬ (*каўну́ць*) *-у, -еш, пераходны.* Глынуць чаго-небудзь (адзін раз) вадкага. Я папяро́д каўну́ла таê. Сл. Вады́ цё́плае каўну́ла. Кл.

КАЎТА'ЦЬ (*каўта́ць*) *-аю, -аеш, шматкратны.* Глытаць. Вол каўта́е зра́зу па ку́бку вады́. Кл. Параўн.: каўну́ць.

КАЎЦЯ'Ш (*каўця́ш*) *мужч.* Засохлы або замерзлы кавалак конскага ці каровічага памёту. Барб., Кл.

КАХА'НКА (*каха́нка*) *жан.* 1. Любая дзяўчына. Кл. 2. Палюбоўніца. Кл. На просьбу растлумачыць значэнне слова каха́нка адны дзяўчаты называлі першае, другія—другое.

КАЦ (*кац.*). Побач—псік (гл.). Вайц. Барб., Кл.

КАЧАНІ'СТАЯ (*качаніста*). Прыметнік ад качан. Ужываецца з назоўнікам капуста. Качаніста капу́ста. Зуб.

КВАТАРАВА'ЦЬ (*кватарава́ць*) *-ую, -уеш, непераходны*. Кватарава́ў камо́рнік у йіх. Кл.

КВАТАРА'НЕЦ (*кватара́н*[*е*]*ц*) *мужч.* Кватарант. Лу́чч[э]й у ха́це бо́рану паста́віць, як кватара́нца пусьці́ць. Зуб. Параўн.: кватара́нт. Вайц., Байл. Вы тут за кватара́нта? Кл.

КВО'ЛІЦЦА (*кво́ліцца*) *-юся, -ішся*. Параўн.: рускае недомогать. Не́шта ўсе кво́ліцца. Вільча.

КЕ'ЎЛЯЦЬ (*ке́ўляць*) *-яю, -яеш, непераходны*. Ледзь жыць, ледзь дыхаць, без здароўя, вельмі нядужаць. То́лькі што ке́ўляюць. Кл.

КІДУ'Н (*кіду́н*) *мужч.* Эпілепсія, прычым ужываецца толькі ў спалучэнні з дзеясловам кідаць. Кіду́н каб кінуў! Трэ́ба ду́маць! Кінуў сваê да йдзе на чужы́[е] (дзеці). Пас. Янкі Купалы. Што б йіх кіду́н кідаў. Нашто́ кідаць на йгру́шу па́лкі? Кл. Параўн.: паду́чая (хвароба).

КІДЗЬ (*кідзь*). Выклічнікавая дзеясло̂ўная форма (тыпу гоп, хоп) ад кідаць. Тая кі́дзь мнê, а я й ні злаві́ла. Байл.

КІЙ (*кій*) *мужч.* 1. Кій. Хал., Сл., Байл. 2. З прыназоўнікам *у* ў форме меснага склону множн. ліку (у кіёх—Барб., Кл.) абазначае ў кутку, паміж сценкаю і печчу, дзе стаяць прылады гаспадыні: ві́лкі, камяня́, ёмка (гл.) і інш. Пры́дзе, ста́не ў паро́зе або сусі́м у кіёх.

Чаго́ ето ты так? Кл. 3. У прыказцы: І на вас, ой, бу́дзе кій, да нѐ такі! Кл.

ҚІНЬДЗЮ'Қ *(кіньдзю́к) мужч.* Страўнік. Гвазды́ былі ў кіньдзюку́. Хал. Усе́ е́тае (вантробы) у кіньдзю́к да абвару́. Кл.

ҚІ'НШЧЫҚ *(кіншчык) мужч.* Кіномеханік. Кіншчык прые́хаў, бу́дз[е] кіно́. Пас. Янкі Купалы. Ко́сьцікаў (сын) кіншчыкам. Кл.

ҚІ'ПЕЦЬ *(кіп[е]ць, кіпяць) мужч.* Пазногаць. Конь наступіў на но́гу, дак кіп[е]ць зла́зіць. Барб. А кіпці, што ў ко́ршака. Кл.

ҚІРПА'ТЫ *(кірпа́ты).* Кірпаносы. Той кірпа́ты Кайта́наў сын. Кл.

ҚІСЛЯ'Қ *(кісьля́к) мужч.* 1. Сыракваша, кіслае малако. Кісьля́к ні наёдак (гл.). Сл. У раёне ёсць і прозвішча Кісляк. 2. Пераноснае, зневажальнае. Tако́га кісьл[е]ка́ за брыгадзіра зрабілі, хіба́ то́лькі на зіму, а ўве́сну ён не гаспада́р. Барб.

ҚІЯ'ЖЫНА *(кія́жына) жан.* Выпадковая палка, не апрацаваная, не абгладжаная. Хоць што каб у рука́х было́, а то й блі́ска ні было́ яко́[е] кія́жыны. Вольн. Ухапі̀ў не́йку кія́жыну. Ледзь абаранíўса. Кл. У фразеалагізме: даць кія́жыны.

ҚІЯ'Қ *(кія́к) мужч., множн.*—кіякі́ *(арф.).* Кукуруза, пачатак кукурузы. Стары́ кія́к ні сма́шны. Кл. Сустракаў на Гомельшчыне кія́х. Параўн.: кійке́—як форма множн. ліку, у адз. ліку не ўжываецца. Любонічы Кіраўскага раёна.

КІЯ'ЧНІК (*кіяшнік*) *зборны, мужч.* Ужываецца толькі ў адз. ліку. Сцяблы кукурузы, кукурузнік. Кія́шнік мо ў чалавéка (на рост чалавека), а кі[е]кá нігóднаго. Барб. Кія́шніку далá (карове). Кл.

КЛАДЫ' (*клады́*) *толькі ў множн.* Могільнік. На кладóх нéхто хóдзіць. На кладóх нéхто стоўб закапáў. Кл. Бóязко паўс клады́ йці. Кл. Гл. могілкі.

КЛА'ДЗІНА (*клáдзіна*) *жан.* Пакладзеная канцамі тоўстая жэрдка, бервяно. Кýры нéшто крáло, дак я клáдзіну пат страхóю паклáла. Кл. Клáдзіну нашлí дай перайшлí. Барб. У апошнім выпадку—выпадковая, часовая кладка.

КЛАПТАВА'ЦЬ (*клаптавáць*) *-ую, -уеш, непераходны.* Клапаціцца, непакоіцца. Клаптýе, што жóнка нічóга (гл.). Казáў Васіль, што клаптýе, пахудáла. Ці вáрт стóлькі клаптавáць? Кл.

КЛЕ'ЙКА (*клéйка*) *жан.* Рыба, верхаводка. На клéйку шчýка брáла. Хал. Клéйку вы́хваціў (вудачкаю). Кл. Параўн.: рускае уклейка.

КЛЕ'ЙНЯ (*клéйня*) *жан.* Плытніцкі тэрмін, звяно плыта. Клéйню аднý на бéраг вы́гнала вада. Кл. У плыт вяжуць 8—10 клейняў *(арф.)*. Кл.

КЛЕ-КЛЕ Гукапераймальнае. Так перадаюць буславу «песню». Бýсел кле-кле. Кл.

КЛЕ'СЦІ (*клéсьці*) *-н-у, -н-еш, пераходны.*

Клясці. Клéсьці бýду, пакá й памрý. Барб. За штó йіх так клéсьці? Кл.

КЛІНО'К [1] *(клінóк) мужч.* Памяншальнае ад клін. Клінóк раскалóўса. Байл. Тут каб дóбры клін на такóе сукавáтае палéна. Пас. Янкі Купалы.

КЛІНО'К [2] Падобная да конуса торба, у якой адцэджваюць тварог. Ты ні вы́льліла аттóплянага малакá ў клінóк? Кл.

КЛО'МЛЯ *(клóмля) жан.* Рыбацкая прылада. У клóмлю лавíў. Зуб. Параўн.: комель. Кл., Байл., Н.-Андр., пас. Янкі Купалы.

КЛУ'НЯ *(клýня) жан.* Гумно. Сустрэта ў в. Слаўкавічы, прычым і тут часцей—гумно.

КЛЯВА'ЦЦА Йíхні гусáк вéльмі клюéцца. Кл.

КЛЯВА'ЦЬ *(кл[е]вáць) -юó, юéш, пераходны.* 1. Рыбацкі тэрмін. Там клюóць клéйкі. Хал. Сéні ні клюé ры́ба. Кл. 2. Кýры клю́юць кабанóвае цесто. Кл. 3. Пераноснае. Вельмі мала, патрошку есці. Нічóгі (гл.), устáне, клю́не чагóль і цэ́лы дзень так (без яды) хóдзіць. Кл. 4. Пераноснае. Слаба, памалу стукаць, біць, выбіваць, разбіваць. Клюй і клюй памáлячку, то й перас[е]чэ́ш. Пас. Янкі Купалы. 5. У фразеалагічным спалучэнні носам кляваць — драмаць, спаць седзячы. Хлóпцы, ні клю́йце насáмі, малатарня́ пустáя хóдзіць. Сл.

КЛЯВЕ'Ц *(арф.) мужч.* Малаток—інструмент для апрацоўкі каменю, граніту. Зуб.

КЛЯКТА'ЦЬ *(кл[е]ктáць) -у, -аш, неперахoдны.* А сéні ўночы бусял кл[е]ктаў. Кл.

КЛЯПО'ЧНІК *(кл[е]пóчнік) мужч.* Назва асобы па роду заняткаў, спецыяльнасць,—той, хто клёпкі робіць. Бáцька кл[е]пóчнік быў. Сл.

КЛЯСЦЬБА' *(клязьбá) жан.* Ад клéсьці, тыпу просьба, касьба. Клязьбá твая ні памóж[э]. Кл.

КНАК *(кнак) мужч.* 1. Нясцёртыя новыя грошы. 2. Нясцёртыя вялікія грошы. Кл. Сабрáў кнак. Барб.

КНЫР *(кныр) мужч.* Сустракаецца таксама кнораз. Для праверкі здатнасці хутка гаварыць прапануюць часта паўтарыць: Ішóў кныр з кныранятамі *(арф.)*. Кл.

КО'БАЦЦА *(кóбацца) -аю-ся, -аеш-ся.* Марудзіць, мешкаць, калупацца. Ну, бýдзе ўжо табé кóбацца, людзі ўсê на пóлі ўжэ. Кл. Параўн.: закóбаць (гл.). Параўн.: чэшскае kobka—каморка.

КО'ЛАС *(кóлас) мужч.* 1. Колас. Зуб., Кл. і інш. 2. Зборны. Пры архаванні каласавых асобна адыходзяць каласы і кавалачкі саломы—колас. Разóў на двá кóласу бýдзе (хопіць коласу два разы пакарміць карову). Зуб. Кóлас згнайілі. Вайц.

КО'ЛІСЬ *(кóлісь)*. Калісь, калісьці. Кóлісь хадзілі ў адных штанóх. Хал.

КО'МЕЛЬ *(кóм[е]ль, кóмяль) мужч.* Рыбац-

кая прылада, што і кло́мля (гл.). У ко́м[е]ль загна́лі два ліны́. Кл.

КО'МІНАК (*ко́мінак*) *мужч.* Барб., Байл., Кл., Н.-Андр. Параўн.: Ярка на камінку смольны корч палае. Я. Колас.

КО'ННІЦА [1] (*ко́ньніца, ко̂ньніца*) *жан.* Тут ко́ньніца по́льска йшла. Кл.

КО'ННІЦА [2] Начлег, весці коней на конніцу—весці на начлег. На ко̂ньніцу вадзілі́ ко́ні. С ко́ньніцы прые̂дам да й на рабо́ту. Ця́жко було́. Кл.

КО'НЧА (ко́нча). Хіба толькі, абавязкова. Ко́нча се̂ні схадзі́ць? Байл. Ко́нча мне рабіць? Кл.

КО'ПАНКА (*ко́панка*) *жан.* Сажалка. У ко́панцэ й каро́ве й ка́чкам вада́. Барб. У йі́х німа́ ракі́, то́лькі ко́панка. Кл. Гл. копань.

КО'ПАНЬ (*ко́пань*) *жан.* Сажалка. Там ко́пань була́, зарасла́ сусі́м. Сл. Гл. ко́панка.

КО'ПКА [1] (*ко́пка, ко̂пка*) *жан.* Памяншальнае ад капа. Ко́пак шэсь накасі́ў (сена). Сл.

КО'ПКА [2] 1. Уборка (бульбы, морквы, буракоў). Кл., Барб., Хал. На ко́пку (бульбы) выладжа́й. Кл. 2. Назва дзеяння. Кл., Барб.

КО'ПЧЫК (*ко́пчык* і *ко̂пчык*). Памяншальнае ад капец (абодва значэнні). Закапа́ла ко́пчык (бульбы), [е]кура́т на насе́ньне. Таго́ ко́пчыка бу́дзе на насе́ньне, шчэ й на про́даж застане́цца. Кл.

КО'РМА *(ко́рма) жан.* Корм. Дзе тае̂ ко́рмы браць? Вільча.

КО'РМІК *(ко́рмік) мужч.* 1. Побач і ў тым жа значэнні, што кормны кабан (кабан, якога кормяць на сала). У ва́с два ко́рмікі. Ко́рмнага кабана́ забілі. Кл. 2. Пераноснае. Зневажальнае. Гультаяваты поўны чалавек, які любіць багата есці і стараецца не пахудзець. Кл.

КО'РШАК *(ко́ршак* і *карша́к) мужч.* Каршун. Ко́ршак задра́ў ку́ру. Кл. Пабе́це вы е́тые ко́ршакі. Хал.

КО'ЎЗАНКА *(ко́ўзанка) жан.* Расчышчанае месца (лёд) для катання, каток. Хадзе́м на ко́ўзанку на во́зяро. Кл. Параўн.: чэшскае kluzište—каток.

КОЎЦЬ *(коўць).* Выклічнікавая дзеяслоўная форма (тыпу хоп, гоп, топ) ад каўта́ць. (гл.). Узя́ў пля́шку, нагну́ў, коўць-коўць—і німа́. Кл.

КО'ХЛІК *(ко́хлік) мужч.* Коклюш. Ко́хлік так зму́чыў дзіця́... Кл.

КОШ[1] *(кош* і *ко̂ш) мужч.* 1. Кош. Не́сла ў кашы́ грыбко́ў п'яць. Байл. 2. Сплеценая з лазы скрыня на 0,5—1 $м^3$, якая ўстанаўліваецца на возе для перавозкі бульбы, мякіны ці іншых сыпкіх прадметаў. Кл. 3. Рыбацкая прылада. Кл.

КОШ[2] Скрынка з дошак, якая ўстаноўлена ў млыне над каменямі, у яе засыпаюць збожжа, адкуль яно трапляе на камяні. Кл.

КО'ШЛЯ *(ко́шля* і *ко̂шля) жан.* 1. Касьба

(ужываюцца абодва словы). Ідзе́ с ко́шлі. Зуб. 2. З ацэначным адценнем—добрая (кепская) касьба. Кл.

КРАСЕ́Й (красе́й) мужч. 1. Вол чырвонай масці. 2. Ацэначна-зневажальнае. Паўнакроўны, чырвоны, некалькі непаваротлівы чалавек. Красе́ю таму́ скажы́, каб рабі́ў скарэ́й. Кл.

КРАСУ́ЛЯ (красу́ля) жан. Клічка (каровы). Кл.

КРО́ІЦЬ (кро́йіць) -ю, -іш, пераходны. 1. Кроіць матэрыял. Наўчы́ўса кро́йіць. Барб. 2. Рэзаць (хлеб, сала, каўбасу). Накро́йіла хле́ба, са́ла палажы́ла... Кл. 3. Пераноснае. Што б вас рэ́зало да кро́йіло. Каб йіх кро́йіло пага́нцаў тых, усе́ п[е]рае́лі тут. Кл.

КРО́ЛІК (кро́лік) мужч. Ветлівае, ласкальнае пры звароце да чалавека, звычайна да маладзейшага. Мо̂й кро́лік, пазабыва́ла пра па́ншчыну. Вільча. Андрэйко, мой кро́лік, памажы́ загна́ць аве́чкі. Кл. Параўн.: рускае кролик.

КРО́ЛІЧАК (кро́лічак). Гл. кролік. Зьбега́й, кро́лічак, к та́ту. Кл.

КРУГЛАВІ́ДЫ (круглаві́ды). Харо́шы, круглаві́ды хло́п[е]ц. Барб. Гл. від.

КРУНПЕ́ЛЬ (крунпе́ль) мужч. Моцна збіты, прысадзісты чалавек. Кл.

КРУПЯ́НКА (круп'я́нка) жан. Страва; налітая ў тоўстую кішку і запечаная кроў з грэцкімі крупамі і прысмакамі. Каза́ла, круп'я́нкі ёй дам. Кл.

КРУЦЕ'ЛЬ (*круцéль*) *мужч.* Ні бýду с табóю гулáць у кáрты, бо ты круцéль. Барб. Бог не цяля,—убачыць круцялá (*арф.*). Кл.

КРЫВО'ТА (*крывóта*) *жан.* Ужываецца толькі ў адз. Зайздрасць. С крывóты нагаварыў на нáс, чагó й ні былó. Кл.

КРЫВО'ТЛІВЫ (*крывóтлівы*). Зайздросны чалавек, здольны прычыніць шкоду другому «с крывоты» (гл.). Такóго крывóтліваго сусéда далí нам. Кл. Параўн.: крыўда, крывы. Гл. крывóтны.

КРЫВО'ТНЫ (*крывóтны* і *крывôтны*). Гл. Крывотлівы. Звычайна крывотны, радзей крывотлівы. Бес канцá крывóтны буў. Бýдзе йці, дак пашню́ (збожжа) патóпч[э], хоць раз да ўстýпіць у чужы́ аўёс ці жы́то. Кл. Параўн.: крыўда, крывы. Параўн.: падэ́сны. Пярэжыры Радашковіцкага раёна.

КРЫВЯ'НКА (*крыўя́нка, крывя́нка*) *жан.* Крывяная каўбаса (запечаная ў кішках з прысмакамі kроў). Крыўя́нкаю накармíла. Барб.

КРЫ'ГА[1] (*кры́га*) *жан.* Рыбацкая прылада. У кры́гу налавíлі багáта ры́бы. Пас. Янкі Купалы. Кры́гаю ўнóчы лепш лавíць. Пас. Янкі Купалы. Параўн.: трóйнік. Свінка Капыльскага раёна.

КРЫ'ГА[2] Ільдзіна. Кл., Байл., Н.-Андр., пас. Янкі Купалы.

КРЫ'СА (*кры́са*) *жан.* Пала верхняй вопраткі, крысо. Матá[е]цца кры́са. Сл. Кры́су ўрабíў у нéшта. Кл.

КУБЛЕ'ЧКА (*кублéчко* і *кублéчка*) *ніяк.* Памяншальнае ад кубло́ (гл. кубло). На кублéчку злавіў вераб'я́. Кл. Кублéчко нашлі. Кл.

КУБЛО' (*кубло́*) *ніяк.* Гняздо птушкі, у тым ліку хатняй. Его кура́ (і ку́ра) нагатаўляе кубло́. Кл. З ла́стаўчынаго кубла́. Кл.

КУДА'С (*кудáс*) *мужч.* Кутас. Нéйдзе есь с кудаса́мі (пояс), за́раз найду́. Кл.

КУДЫ'ЛЬ (кудыль, куда́ль). Куды-небудзь. Ты кудыль схадзіў бу, а то ўсе чыта́[е] й чытáе. Кл. Ужываецца і куды-нéбудзь.

КУДЗЕ'ЛЯ (*кудзéля*) *жан.* 1. Адыходы пры выпрацоўцы кужалю са сцёртага ільну. Яе разнавіднасці—атрэпкі (гл.) і абдзіркі (гл.). Кл. 2. Любое прадзіва (кужаль, кудзеля, каноплі, а таксама — воўна, вата), прыгатаванае да прадзення: пэўным чынам згорнутае і прывязанае да прасніцы. Такіх малых кудзéль вóўны я ні раблю́. Барб. Кудзéлю вóўны спра́ла за дзéнь. Кл.

КУКУ'ЛЯ (*куку́ля*) *жан.* Зязюля. Больш гавораць куку́ля. Барб.

КУКУ'ЛЬКА (*куку́лька*) *жан.* Памяншальна-ласкальнае ад кукуля. Куку́лька куку́е. Кл. Параўн.: рускае кукушка, чэшскае kukačka, польскае kukułeczka.

КУЛІ'ДА (*кулíда*) *жан.* Вялікая буханка хлеба. Пазычыла кулíду хлéба. Кл.

КУЛІ'ДКА (*кулíдка*) *жан.* Буханка хлеба. Кл.

КУЛЬ[1] *(куль) мужч.* Тоўсты сноп нясцёртай саломы. Нараблю кулёў. Байл. Кулê (кулі) прадала́. Кл. Тваê ні снапы́, а кулê. Кл.

КУЛЬ[2] Мяшок. Куль мукі ў ла́ўцы купілі. Вайц.

КУЛЬ[3] Частка невада. Кл., Хал., Пара́ўн.: рускае мотня́.

КУЛЬБА′КА *(кульба́ка) жан.* Частка ярэмца (гл.), па форме — вугольнік, адзін бок вугольніка наглуха прымацаваны да ярэмца, у другім маецца адтуліна, у якую закладаецца заноза (гл.). Е́халі з Глу́ска й ву́валіласа кульба́ка, так наму́чыласа; я закладу́ — йзно́ў вы́валіцца, й ніхто́ ні натра́піўса, каб памо́г. Кл.

КУЛЬТУ′РА[1] *(культу́ра).* Культура. Кл., Зуб., Поб.

КУЛЬТУ′РА[2] Культурныя сеяныя травы. Культу́ры табê накасі́ў. Кл.

КУЛЯВА′Я *(арф.).* Прыметнік ад назоўніка куль (саломы). Ужываецца з назоўнікам салома. Гл. куль. Некулявая салома на стрэхі не гадзіцца *(арф.).* Кл.

КУ′ПЧА *(ку́пча) жан.* Куплены (не спадчынны) участак зямлі. На ку́пчы жылі́ тут адны́. Байл. Ку́пчу купі́ў. Кл.

КУРАВО′ДЗІХА *(кураво́дзіха) жан.* Курыца, якая выседзела і водзіць куранятаў. Така́я до́бра кураво́дзіха,—што та́к гл[е]дзі́ць кураня́так. Пас. Янкі Купалы. Мая́ кураво́дзіха ужэ́ ўво́с[е]нь не́сьціса пачала́. Кл.

КУРА′К (*курак*) *мужч.* Гермафрадыт. Кл.

КУРА′ЧЫНА (*курáчына*) *жан.* Курынае мяса. Курáчыну лю́біць. Зуб.

КУРО′ДЫМ (*курóдым*) *мужч.* Густы дым пры гарэнні не полымем, а пры тленні. Курóдыму нарабілі, што й вакнá ні відáць. Пас. Янкі Купалы. На пчóлы каб курóдыму. Кл. Параўн.: чэшскае kouř—дым.

КУСО′К (*кусóк*) *мужч.* 1. Побач і ў тым жа значэнні, што і кавалак. Кл. 2. Пры ацэначных п'яніца, гультай, маней (гл.), манькут (гл.). Гультая́ кусóк. Кл., Зуб. Манькутá кусóк. Кл.

КУХА′ЙКА (*кухáйка, кухвáйка*) *жан.* Нáша мáма кухáйку купíла. Хал.

КУ′ХАН (*кýхан*) *мужч.* Пячэнне з прэснага цеста на содзе, поснае або з тлушчамі, з цукрам ці мёдам або без іх. Смáшны кýхан. Барб.

КУ′ХАР[1] (*кýхар*) *мужч.* Тое, што і скрыня, у якую складаюць адзенне, крам, ніткі (нявесты, гаспадыні). Нéйдзе кýхара дзéці,—Скідáймо дадóлу, Паéдам дадóму. З песні. Кл.

КУ′ХАР[2] *мужч.* Повар. Лявóн у салдáтах быў за кýхара. Дак яго й празвáлі кýхар. Кл.

КУХМА′Р (*кухмáр*) *мужч.* Крухмал. Кухмáр чы́сты, што сóда. Пас. Янкі Купалы. Кухмáрам прыклéйвала. Кл. Ужываецца і крухмал. Крухмáлу зраблю́. Кл.

КУ′ШТАВАЦЬ (*кýштаваць, кýштуваць*) *-ую, -уеш, пераходны.* Вызначаць, дробненька

стукаючы аб зубы, ці моцнае яйка. Ты й кўштуваць ні ўмé[е]ш. Кл.

КУШЭ'РКА *(кушэ́рка) жан.* Акушэрка. Схадзіла па кушэ́рку, да нéшта нímá й нímá, нéшта пóзьніцца. Пас. Янкі Купалы. Кушэ́рчыны дзéці. Кл.

Л.

ЛАВА'ЦЬ *(лава́ць) -аю, -аеш, пераходны.* Лавіць. Ужываецца побач з лавíць. Кл., Хал.

ЛА'ДНАГА *(ла́днаго, ла́днага).* Прыслоўе тыпу багата, шмат, многа. Ла́днага — не мала, даволі шмат чаго-небудзь, напрыклад, часу, матэрыялу, людзей і г. д. Дай карóве тагó (сена), што ла́днаго ў куткý. Кл. Тут ла́днаго (бежанцаў) былó. Зуб.

ЛАЗУРКАВА'ЦЬ *(лазуркава́ць) -ую, -уеш, пераходны.* Падсіньваць (бялізну). Лазуркава́ць вучы́ла. Што лазуркава́ць—што пацьсíньваць. Кл.

ЛАКІ'ЗА *(лакìза) агульн.* Бесклапотны, неахайны, апушчаны чалавек. За такóго лакíзу (замуж) ніхтó й ні пóйдзе. Кл.

ЛАНО'[1] *(ланó) ніяк.* Бярэма (дроў, бацвіння). Аднó ланó (дроў) унéсла ў ха́ту, аднó на сьцíрту ўскла́ла. Кл.

ЛАНО'[2] Ужываецца ў він. і месн. склонах у спалучэнні з дзеясловамі сядзець, несці, трымаць, браць і прыназоўнікам *на:* на ланó, на ланé (і на ланê)—у значэнні на руках (на ру-

цэ). Ся́дзе, дзіця́тко на лано́ во́зьме. Ідзе́, дзіця́ на лане́. Не́сьці на ланê (дзіця) перад сабо́ю ця́жко. Кл.

ЛАНО'М (*лано́м*). Прыслоўе ад лано́ (гл.). Нанасіла трэсак по́ўну паве́ць і ўсе лано́м. Кл.

ЛА'СІЦА (*ла́сіца*) *жан.* Звярок ласка. Кл. Гл. падласіца.

ЛА'ТА[1] (*ла́та*) *жан.* Лата. Ла́та на ла́ц[е]. Сым.

ЛА'ТА[2] *Множн.* — латы. Тоўстыя жэрдзі, на якія насцілаецца страха і да якіх прывязваецца віткаю (гл.) салома. Лат навазі́лі й куле́ў нагатава́лі, — то́лькі крыць. Байл.

ЛАХУ'ДРА (*лаху́дра*) *агульн.* Неахайны, апушчаны, няспрытны чалавек, лакі́за (гл.). Хіба́ та́я лаху́дра агле́дзіць ха́ту? Ці дагле́дзіць гра́ды? Дак.

ЛА'ШЧЫЦЦА (*ла́шчыцца*) *-уся, -ышся.* 1. Выяўляць, выражаць ласку да каго-небудзь. Дзе́ці ску́чылі, дак ла́шчацца. Барб. Каб здох (на сабаку)—бач, ла́шчыцца. Кл. 2. Паддобрывацца, падлізвацца (насуперак прыказцы: Не лай і не перапрашай). Кл. То наніпра́ўдзіў бо́гвед чаго́, а тагды́ ла́шчыцца прышо́ў. Кл.

ЛЕ'ГАР (*ле́гар*) *мужч.* Бервяно, на якім спускаюць ці ўсцягваюць дах гонтавы; легараў два ці больш, залежыць ад памераў даху. Легар злама́ўса. Кл.

ЛЕ'ГЧАНЫ (*ле́гчаны*). Гл. злегчаны. Кл.

ЛЕ'ЙЦЫ (*ле́йцы*). Побач вожкі. Ле́йцы ўсê парва́ліся. Зьвілі́ п'я́цяро ле́йцаў Кл.

ЛЕ'ТНІК[1] *(лётнік* і *лêтнік) мужч.* Летняя лёгкая жаночая вопратка без падкладкі. Лéтнік мôй ужэ́ ліхéнькі сусíм. Барб. Тóлькі ў аднóм лéтніку. Кл.

ЛЕ'ТНІК[2] Дарога, па якой можна ехаць летам (у супрацьвагу зімняку). Наяўнасць слоў зімня́к і лéтнік звязана з балоцістасцю мясцовасці і бездарожжам у гэтым краі. Лéтнікам далéка éхаць. Зуб.

ЛЁ'ЗНАЯ *(лёзная* і *лёзна).* Лёзная карта— неказырная карта. Зуб.

ЛЁ'ПЕНЬКА *(лёпянько, лёпянька).* Прыслоўе ад лёпенькі. Лёгенька, у падагнатую да стану вопратку (апрануцца). Такí хóлад, а так лёпянька адзéласа. Новы быт. Лёпянька надзéласа, дак як на карцíнцэ харóша дзéўка. Кл. Лёпянько—éто лёгянько, шчы́льнянько. Кл.

ЛЁ'ПЕНЬКІ Прыметнік. Ужываецца з назоўнікамі, якія абазначаюць назвы адзення. Лёпенькая (сукенка, паддзеўка, летнік) — лёгенькая, падагнаная да стану. Вéльмі ужэ лёпенька сукéнка, дак ні насíласа. Ён усе лёпенькіе касцю́мы нóсіць. Лёпянько—ето лёгянько, шчы́льнянько. Кл.

ЛЁ'СТАЧКА *(лёстачка) жан.* Лёстачкі — дошчачкі ў драбінцы (частцы воза, панарада). Нараблю́ лёстачак. Байл. Усê лёстачкі паламáў. Кл. Лёстачка перабíласа. Вайц.

ЛІГО'ТА *(лігóта) жан.* Ільгота. Лігóта, кáжуць, бýдзе. Сл.

ЛІПЕ'ЦЬ *(ліпéць) -пл-ю, -п-іш, непераход-*

ны. 1. Ледзь трымацца (чаму-небудзь). Ліпе́цьме (будзе ліпець) гадко́ў п'яць (старая хата). Хаце́лі шчэ залêтась перарабіць (студню), а вот ліпіць і се́ні. Кл. 2. Пра чалавека — жыць не падаючы́ надзей на сілу, магчымасць працаваць і на працяглае жыццё. Ліпіць тро́хі, хіба́ тôлькі ў грыбу́ схадзіць. Барб. Параўн.: варня́цца.

ЛІСАПЕ'Т *(лісапе́т) мужч.* Веласіпед. На лісапе́тах пакацілі не́куды. Хал. У Глу́ск лісапе́там пап'е́рса. Кл. У мове моладзі — веласіпе́д.

ЛІТО'Ш *(літо́ш, літôш) мужч.* 1. Літо́ш — хто громка, моцна гаворыць. 2. У вв. Клетнае і Байлюкі было па адной сям'і, членаў гэтых сямей называлі літашы́ (літашэ́ — множн. лік). Тлумачаць, што гэтыя сем'і паходзяць з Літвы. Можна думаць: літо́ш, літашэ́ — літо́вец, літоўцы. Аб мове іх расказваюць, што тро́шкі ні так гавары́лі, тро́шкі ні така́я гавара́. Кл.

ЛІХІ'[1] *(ліхі́).* Злы, сярдзіты. Ве́льмі ліхі́ буга́й, заб'е́, ні йдзі́ ты. Байл. Гадзі́, што ліхо́й скуле́. Сл.

ЛІХІ'[2] Дрэнны, зношаны прадмет, прылада. Ліхо́ю саке́раю. Байл. Ліха́я сьвітка. Сл.

ЛІ'ХА *(ліхо, ліха) ніяк.* Бяда, няшчасце. Ліха на ва́с німа́. Барб. Хай на вас ліхо но́йдзе. Кл. Параўн.: Аднойчы ў Клятнянскай бібліятэцы была група моладзі, вучняў, слухалі перадачы мінскага радыё. Дыктар сказаў: «лі́ха танцава́лі», «лі́ха сплясалі». Гэта выклікала

пытанні: Што такое за «ліха»? Які гэта танец? Як яго танцуюць? (Параўн.: танцавалі польку).

ЛІХО' (*ліхо́*). Кепска, дрэнна, нядобра. Там ліхо́ спаць. Кл. Ліхо́ жыць аднаму́. Кл., Барб. *Лажы́са ту́така, бо там табе̂ ліхо́ спаць.* Кл.

ЛІЦВІ'Н (*ліцьвін*) *мужч.* Літовец. Булі ліцьвіны́. Сл.

ЛІ'ШНЯГА (*лішняго, лішняга*). Больш за норму. Лішняго, сыно́чак, ні дава́й. Ужэ̂ й лішняго (мякіны) прынёс. Кл. Параўн.: во́бмаль.

ЛО'КШЫНА (*ло́кшына*) *жан.* Макарона, локшына. Кл., Барб., Байл. Слова локшына бытуе ў шмат якіх раёнах Беларусі. Ло́кшыну з'еў. Пружанскі раён. Ло́кшыны навары́лі. Карэліцкі раён. Ло́кшыну люблю́ сваю́ ляпе́й, як з ла́ўкі. Радашковіцкі раён.

ЛУЗА'ЦЬ [1] (*лузáць*) *-ж-у, ж-аш, пераходны.* Абчышчаць гарбузікі, фасолю. Луза́лі гарбу́зікі. Барб. Хай ма́ці табе́ лужэ̂. Кл.

ЛУЗА'ЦЬ [2] Біць, караць. Ве́льмі разду́рны сын буў; ён што ні рабі́ў!—стра́шыў, е̂сці ні дава́ў, луза́ў—што шку́ру спушча́ў. Кл.

ЛУЗО'НІК (*лузо́нік*) *мужч.* Арэх, які сам вывальваецца, вылузваецца (гл. лузаць) з шапачкі. Кл. Параўн.: калачо́нікі. Параўн.: лузане́ц. Кліны Бялыніцкага раёна. Параўн.: лускане́ц. Клімавіцкі раён.

ЛУПА'І (*лупа́йі*) *зборны, толькі ў множн.* Абчысткі ад бульбы. Лупа́йі аддае́ сусе́ду,—а сама́ хіба́ хварэ̂е гадава́ць парася́? Гл. лупайкі. Гл. лушпайкі, лушупайкі.

ЛУПА'ЙКА (*лупайка*) *жан.* Звычайна ўжываецца ў множн. Што і лупа́і, г. зн. абчысткі ад бульбы. Абраза́ньніца така́я, па па́льцу лупа́йкі (тоўстыя як палец). Пас. Янкі Купалы. Лупа́йкі й каро́ва зьёсь. Кл.

ЛУПА'ТЫ (*лупаты*). З вялікімі вытрашчанымі вачыма. Ве́льмі лупа́та да ніхаро́ша. Барб. Сава́ та́я лупа́та. Кл.

ЛУСКА' (*луска́*) *жан., толькі ў адз.* 1. Скурка з грэчкі ці проса, якая аддзяляецца пры апрацоўцы на крупы. Луско́ю гусе́й карміла. Кл. 2. На рыбе (параўн.: рускае чешуя). Ры́бу чы́сьцілі, дак лускі́ мо рэ́шато,—вот ры́бы налавілі! Хал. 3. На целе чалавека (параўн.: рускае шелуха). Луска́ не́йка на шы́йі. Кл.

ЛУТ (*лут*) *мужч.* Што і лу́цце (гл.). Кл.

ЛУ'ЦЦЕ (*лу́цьце*) *зборны, ніяк.* Ліповае лыка. Лу́цьце ў Сла́ўкаўшчыне расьце́. Барб. Мы с Трахі́мам хадзілі ў лу́цьце (г. зн. хадзілі, каб надраць ліповага лыка). Кл.

ЛУЧНІ'К (*лушнік*) *мужч.* Прыстасаванне для асвятлення ў хаце, захаваўся толькі ў памяці. У в. Вольніцы адзін дзед захаваў «лушні́к на пака́с».

ЛУЧО'К (*лучо́к*) *мужч.* Ручка на кассі. Лучо́к сагніў. Сл. Лучкоў нарабіў на ўсіх. Кл.

ЛУЧЫ'НА (*лучына*) *зборн. жан., толькі ў адз.* Цёскі (гл.) з хваёвага смольнага карча, з усмала (гл.) або асмола (гл.), якія выкарыстоўваюцца для падпалу дроў і для асвятлення на комінку (гл.); такі від асвятлення ў апошнія

дзесяцігоддзі вышаў з ужытку, адноўлены быў толькі ў часе вайны. Прыўёз лучы́ны на зіму ўсю, ба́бе аніга́дкі, бу́дзе патпа́лу. Пас. Янкі Купалы. Лучы́ны насе̂к кашо̂ў тры. Кл. Параўн.: сініца.

ЛУШПА'ЙКА (*лушпа́йка* і *лушупа́йка*) *жан.* Звычайна ўжываецца ў множн. Што і лупаі, лупайкі (гл.). Зье̂ўшы адны́х лушпа́як, ні не́сьцімуцца (не будуць несціся куры, калі карміць толькі лушпайкамі). Кл.

ЛУШУПА'ЙКА (*лушупа́йка* і *лушпа́йка*). Гл. лушпайка. Кл., пас. Янкі Купалы.

ЛЯЖА'ЦЬ (*л[е]жа́ць, ляжа́ць*) *-у, ыш.* 1. Ляжаць. Кл., Поб. 2. Хварэць, быць прыкаванаму да пасцелі хваробаю. Ляжа́ў ця́жка (*арф*). Кл. Ве́льма ляжа́ў крэ́пко. Кл.

ЛЯМЕ'НЕВЫ (*ляме́нявы* і *ляме́няву*). Алюміневы. Л[е]ме́нявае пасу́ды ўся́кае наве́зьлі. Барб. Ляме́нявы кацяло́к нашла́ ў ле́се. Кл.

ЛЯНЫ' (*ляны́, л[е]ны́*). Гультай, лянівы. Ужываюцца ляны́ і лянівы. Кл., Хал., Кас. Гаспада́р ляны́ буў. Кл.

ЛЯПЕ'Ш (*л[е]пе́ш*) *мужч.* 1. Няўда́лы аце́сьлівы хлеб. Леняша нейкага спякла (*арф.*). Кл. 2. Тоўсты, нязграбны (як злеплены) чалавек. Ні жані́х, а л[е]пе́ш не́йкі. Пас. Янкі Купалы. Калі ідзе гутарка пра малое дзіця ці іншую жывую істоту, слова ляпеш не мае неадабральнага адцення. Хло́пчык як ляпе́ш (*арф.*). Кл.

ЛЯПІ'ТА (*л[е]піта*) *мужч.* Пячнік. Бага́то хто рабілі пе́чы, дак л[е]піты ні нашла́. Кл. Л[е]піту згадзіла. Кл. Параўн.: дзеяслоў ляпіць.

ЛЯ'САЧКА (*ля́сачка*) *жан.* Трысцінка, палачка. Зь ля́сачкаю хадзіў па ву́ліцы. Зуб.

ЛЯСЁ'НКА (*арф.*) *жан.* Посцілка, прыстасаваная (да рагоў прышываюцца вяровачкі) пераносіць сена, салому, траву. Скла́ла ў лясё́нку (*арф.*). Кл.

ЛЯХ (*лях*) *мужч.* Польскі вайсковец, паляк. Ляхо́ў—ляхốў наêхало (з успамінаў аб акупацыі ў 1920 г.). Кл.

ЛЯША'Н (*арф.*) *мужч.* Паляк, лях. Сустрэта толькі ў вершаваным апавяданні «Бяда». Прыêхалі лешаны́, замянілі (бяду) на гаро́х. Кл.

М.

МАГІЛЁ'ВЕЦ (*магілёвец*) *мужч.* Чалавек з Магілёва ці з Магілёўшчыны. Кл.

МАГІЛЁ'ЎКА (*магілёўка*). Жанчына з Магілёва ці з Магілёўшчыны. Кл.

МАГІ'ЛЬНІЦА (*магільніца*) *жан.* Назва вёскі, каля яе багата панасыпаных курганоў.

МАКАЗЫ'Н (*маказы́н*) *мужч.* У дарэвалюцыйны час тры вёскі—Клетнае, Байлюкі і Нова-Андрэеўка—арганізавалі «маказы́н», своеасаблівую касу ўзаемадапамогі: кожны гаспадар засыпаў вызначаную колькасць збожжа; калі была патрэба, укладчык мог атрымаць, узяць у пазыку пэўную колькасць збожжа. Кл.

МАЛАВУ'МНЫ (*малаву́мны*). Той Міко́дым малаву́мны, праста́к. Му́чыўса бếдны. Кл.

МАЛАДЗІ'ЦА (*маладзіца*) *жан.* Маладзіца нейка прасіласа пераначавáць. Сл. Маладзіца харóша й рабóцько. Кл.

МАЛЕ'ЧА (*малéча*) *нíяк., толькі ў адз.* Дробнае што-небудзь, а таксама пра дзяцей. Драбнóта да малéча. Кл.

МАНЕ'Й (*манéй*) *мужч.* Хлус, манюка. Ты манéй, ні хóчу й гаварыць с табóю. Хал. Гл. манькýт, манéка.

МАНЕ'КА (*манéка*) *агульн.* Хлус. Схадзé-ц[е] к тамý манéку. Зуб.

МАНІ'СТЫ (*маністы*). Каралі. Маністы прывéзла. Сл. Гл. пáцаркі.

МАНІ'ЦЬ (*маніць*) *-ю, -іш.* Націск на канчатку толькі ў 1-й асобе адз. ліку (маню́), у астатніх—на á (мáніш). Хлусіць. А囗囗нaштó ты мáніш, скажы ты нам? Хал. Мо ты мáніш? Кл.

МАНЬКУ'Т (*манькýт*) *мужч.* Хлус, манюка. Манькýт? Той, хто мáніць. Кл. Гл. Маніць, манéй, манéка, хлус.

МАРКА'ЛЬ (*маркáль* і радзей *маркáч*) *мужч.* 1. Баран-вытворнік. Маркáль ж жараб'я́. Кл. Адзін год Рыгóру далí маркаля́ за тоé, што бугая́ дóбраго вýгадаваў,—праміróўку. Кл. 2. Пераноснае, зневажальнае. Пра чалавека, які гаворыць непрыемным хрыпатым голасам. Кл.

МАРКА'Ч (*маркáч*) *мужч.* Гл. маркаль. Кл.

МАРШЧА'К (*маршчáк*) *мужч.* Лапаць з скуры. Маршчакí ўсе шыў нéкалі. Кл.

МАСНІ'ЦА *(масьніца) жан.* Дошка падлогі. Масьніцы гнісьці сталі. Кл. Гл. памасніца.

МАТКІ' *(маткі) толькі ў множн.* Канопліпасеннікі, жаночыя калівы канапель. То плоскуні, а ето—маткі. Кл. Параўн.: рускае матерка.

МАЦА'К *(мацак) мужч.* 1. Яйка з моцнай шкарлупінаю. Гл. бітка. Зноскі (гл. зносак) бываюць вельмі мацакі. Пас. Янкі Купалы. 2. Пераноснае. Моцны, дужы чалавек. Кл.

МА'ЦЕНЕ *(мацяне) ніяк.* Сын ці дачка з фізічнымі ці ў характары (або з тымі і другімі) рысамі маткі. Мацяне дай (дый) годзі, уся маці. Кл. Параўн.: чысты бацька, чыстая маці. Параўн.: бацене.

МАЦЬ *(мацьь) -аю, -аеш.* Мецъ. Трэба маць сваê (граблі). Хал. Гараваў, таму й маў. Кл.

МАЦЯРКІ' *(мацяркі, мац[е]ркі).* Множны лік ад маці. Мац[е]ркі сабраліса. Сл. Хай вашы мацяркі самі насеюць гароху. Кл.

МАЧЫ'ЦЬ [1] *(мачыць) -у, -ыш, пераходны.* Мачыць.

МАЧЫ'ЦЬ [2] Засольваць гуркі, капусту. Вучысьціла тое вядро, што гуркі мачыла. Кл.

МАШЫ'НКА [1] *(машынка) жан.* 1. Памяншальнае ад машына. Кл., Хал. 2. Прылада для стрыжкі. Кл., Хал. У вас е машынка? Барб.

МАШЫ'НКА [2] Кнопка ў лёгкай вопратцы. Машынка атарвалася. Вайц.

МЕ'МКА *(мемка) жан.* Гатунак бульбы, які

называюць яшчэ варша́ўка. Ме́мка до́бра була́. Сл. Гл. арша́ўка і варша́ўка.

МЕ'НШЫЦЬ (*ме́ншыць*) *-у, -ыш, пераходны.* Памяншаць, змяншаць. Я саро́чку ме́ншаму купі́ла, да каўне́р шыро́кі, трэ́ба ме́ншыць. Хал. Нашто́ ты ме́ншыш аго́нь? Кл.

МЕ'СТА [1] (*ме́сто, мêсто, ме́ста, мêста*) *ніяк.* Месца.

МЕ'СТА [2] Горад, мястэчка. У Слу́цку на ме́сьце танцава́ло шаўцо́ў дзьве́сьце. Вершаванае апавяданне. Кл.

МЕ'СЯЧКА (*ме́сячко, ме́сячка*) *мужч.* Памяншальнае ад месяц. Ужываецца і месячык. Сьвяці́, сьвяці́, ме́сячко (з песні). Ме́сячко сьве́ціць. Кл.

МЁ'ТКА (*м'ётка*) *жан.* Нізка дробнай рыбы; звычайна ніжуць на нізкі ўюноў. Адзі́н год м'ётак со́рак уюно́ў було́. Кл.

МІТРЭ'НКА (*мітрэ́нка*) *жан.* Непакой, трывога. Ётака мітрэ́нка цяпе́р па сьве́це (у сувязі з падзеямі ў Карэі і пагрозаю сусветнай вайны). Зуб. Тры гады́ така́я мітрэ́нка була́ (гады нямецка-фашысцкай акупацыі). Зуб.

МЛІ'ВА (*млі́ва, млі́во*) *ніяк., толькі ў адз.* Збожжа ў млыне; збожжа, якое прывезена, каб змалоць яго. Млі́ва по́ўны млін. Кл. [Е]зыко́вае млі́во нігадзі́во. Кл.

МЛІН (*млін*) *мужч.* Млын. У млін пашо́ў. Кл.

МЛЫН (*млын*). Млын. Пас. Янкі Купалы. Гл. млін.

МО'ГІЛКІ *(мóгілкі) толькі ў множн.* Могілкі, калі гавораць пра клады (гл.) не для праваслаўных (яўрэйскія, каталіцкія). За пóльскімі мóгілкамі. Кл. Гл. клады.

МО'ЛЛЮ *(мóльлю, мôльлю).* Сплаўляць лес моллю—сплаўляць не звязваючы ў плыты, а пускаючы бярвенні па цячэнню. А мы мóльлю гнáлі. Хал. Далéко мôльлю ні загóніш. Кл.

МОЛЬ [1] *(мóль, мôль) жан.* Моль (насякомае). Мóлі ў вас багáто. Хал.

МОЛЬ [2] *жан., зборны, толькі ў адз.* Рыбымаляўкі. Калі ідзе гутарка пра адну штуку—мóлька. Гл. молька. Што зь éстаю рыбаю? Мóлі й таê німá. Кл.

МО'ЛЬКА *(мóлька, мôлька) жан., множн.*—мóлькі *(мóлькі, мôлькі). Зборны жан.*—моль (гл. моль [2]). Рыбка-маляўка. На мóльку акуня́ вы́цяг (вывудзіў). Пас. Янкі Купалы. Кашóм налавíлі глады́шку мóляк. Кл. Параўн.: рускае малёк.

МУ'ЛІЦЬ *(му́ліць) II спраж.* 1. Пашкоджваць нагу, бок чым-небудзь. Чóбаты сухíя, дык вéльмі му́ляць (націраюць ногі) *(арф.).* Кл. Нéшто му́ліць (на возе пад сенам нейкі цвёрды прадмет), с[е]дзéць ні мóжна. Кл. 2. Не цярпіцца. Кл. Параўн.: му́лка.

МУ'ЛКА *(му́лко* і *му́лка).* 1. Цвёрда (спаць, сядзець, трымаць што-небудзь у руцэ, на плячы). На пéчы му́лко спаць. Барб. Я б занёс ету дзеравя́ку, але му́лка ў пл[е]чó. Кл. 2. Пераноснае. Не цярпіцца. Му́лко ў хáце? Кл.

МУЛЬМО′ *(мульмó) ніяк.* Мазоль. Шчэ ні зажылó мульмó ў лысага (вала), ярмóм намýліў. Кл. Гл. мулка.

МУ′СА *(мýса* і *мыса) жан.* Морда ў каровы, цяляці, сабакі. Мýсу абадрáла карóва. Байл. Што то (што гэта) на мýсе ў карóвы? Кл. Мы́са ўся ў крыві. Пас. Янкі Купалы.

МУХАМО′РА *(мухамóра) жан.* Мухамóру зьела (кошка) й здóхла. Пас. Янкі Купалы.

МЫ′СА *(мýса* і *мыса).* Гл. муса. Кл., пас. Янкі Купалы.

МЯНТА′ШКА *(м[е]нтáшка) жан.* 1. Прылада, якою востраць касу. Кл. Барб. М[е]нтáшка мая́ спахáласа. Кл. 2. Пераноснае. Балбатун, трапло. Пас. Янкі Купалы.

МЯНТА′ШЫЦЬ *(арф.) -у, -ыш, пераходны.* 1. Вастрыць мянташкаю касу. Ты мянтáшыш не так *(арф.).* Кл. 2. Хутка есці, як за сябе закідаць. Кл.

МЯТЛА′ *(мятлá, м[е]тлá) жан.* 1. Венік, насаджаны на палку. Мятла—для працы ў гумне, свірне. Мятла звычайна робіцца таўсцейшая за венік і з даўжэйшых розгаў. Мятлý ні кідай у гумнé. Кл. М[е]тлá нам ні трэ́ба. Кл. 2. Пераноснае. Чалавек, які хутка, спрытна ходзіць, робіць. Кл.

МЯ′ЧЫК *(м'я́чык, мя́чык) мужч.* У м'я́чыка гуля́лі. Байл. М'я́чык у нáс е. Кл.

Н.

НА′БА *(нáбо* і *нáба).* Добра што. Брáцьмуць—нáбо што пазвóліў. Нáбо е камý дроў ацьсéкці. Зуб. Нáбо, кáж[э], ўзялí. Кл.

НАБАСО́НАК (*набасо́нак, набасо́нач*). Набасо́нак абу́ў чо́баты, дак но́гі паме́рзьлі. Кл.

НАБАСО́НАЧ (*набасо́нак* і *набасо́нач*). Кл. Гл. набасонак.

НАБГО́М (*набго́м* і *набгôм*). Піць (жлукціць) набгом—піць не шклянкаю, а з бутэлькі, збана ці іншай судзіны, нахіліўшы яе. Набгом—з нагібам. Набго́м ву́жлукціў. Хал. Набго́м вы́п'ю. Кл.

НАБІ́ЛІЦЫ Гл. набілкі.

НАБІ́ЛКІ (*набі́лкі*) *толькі ў множн.* Частка ткацкага варштата, у якую ўстаўляецца бёрда. Набі́лкі забра́ла й ні прыне́сла. Барб. Набі́ліцы. Зуб.

НАБІ́РАК (*набі́рак* і *набе́рак*) *мужч.* Маленькая каробачка з лубу, з бяросты. Набі́рак малі́н назьбіра́ла. Кл. Параўн.: наберак. П. Панчанка. Выбраныя творы, 1956, стар. 70.

НАБІ́РАЧАК (*набі́рачак* і *набе́рачак*) *мужч.* Памяншальнае ад набірак. Кл., Байл. Гл. набі́рак.

НАВЕ́ЗАЦЬ (*наве́заць*) *-аю, -аеш, непераходны.* Няўмела нагатаваць стравы. Наве́зала, што хіба то́лькі парася́там. Кл. Параўн.: везаць.

НАВЕРАДЗІ́ЦЬ (*арф.*) *-дж-у, дз-іш, пераходны.* Ужываецца з прамым дапаўненнем (рука, нага, спіна). Натаміць, натрудзіць аж да пашкоджання, да захворвання (рукі, нагі, спіны). Наверадзі́ў руку, дык шосты дзень рабіць няма як (*арф.*). Барб.

НАВО'ЙКА (*навойка* і *навôйка*) *жан.* Часткі ткацкага варштата (іх дзве), на адну навіваецца аснова — падпражная навойка (патпра́жна — ад пража, Кл., Зуб.); а тая, на якую навіваецца палатно,—палатняная (палатня́на—Кл., Зуб.). Параўн.: наво́й (*мужч.*) — падпражная навойка; навойчык (*мужч.*)—палатняная навойка. Дрыбінскі раён.

НАВУ'ЛЕТ (*наву́лят, наву́л[е]т*). Кл. Гл. навы́лет.

НАВУ'ПЯРАДКІ (*наву́пярадкі* і *навы́п[е]радкі*). Гл. навыперадкі.

НАВЫ'ЛЕТ (*навы́лят, навы́л[е]т*). Наву́л[е]т ба́чу. Наву́л[е]т прастрэ́ліў. Зуб. Навы́лят ні прайшла́. Байл.

НАВЫ'ПЕРАДКІ (*навы́(у́)пярадкі, навы́(у́)п[е]радкі*). Наперагонкі. Ужываюцца абодва словы. Кінуліса наву́п[е]радкі. Байл.

НАВЯСНЕ' (*навясьне́, навесьне́, нав[е]сьне́*). Вясною, увесну. Ужываецца (Кл., Сл., Байл., Барб.) побач з вясною, увесну, але часцей за апошнія. Навесьне́ прада́ў адно́ канча́. Сл. Ле́тась навясьне́ купі́ў. Нав[е]сьне́ прыхо́дзіў гно́ю. Кл.

НАГАНЯ'ЦЬ (*наганя́ць*) *-яю, -яеш, пераходны.* Гл. нагнаць.

НАГАТАЎЛЯ'ЦЬ (*нагатаўля́ць*) *-яю, -яеш, пераходны.* Падрыхтоўваць, наладжваць. Кура нагатаўля́е кубло́. Кл. Нагатаўля́юць са́ні ў дро́ва е́хаць. Са́ні нагатаўля́й улётку, а кале́са (воз) ўзі́мку. Кл.

НАГАТО'ВІЦЬ (*нагатовіць*) -*ўл-ю, -в-іш*. Зак. тр. ад нагатаўляць (гл.). Кл.

НАГНА'ЦЬ[1] (*нагнаць*) -*ю, -іш, пераходны*. Нагналі паліцая на міну, й пётраху не засталося. Зуб.

НАГНА'ЦЬ[2] Дагнаць. Нагнаў за Вартаю (гл.). Кл.

НАГО'ДКА (*нагодка*) *жан*. Ужываецца часцей у множн. — нагодкі. Наготкі. Нагодкі ўзышлі густо. Пас. Янкі Купалы.

НАГУ'ЛЯНЫ (*нагуляны*). 1. Набыты, нарошчаны гуляючы. Нагулянае пузо на рабоце зьёдзе. Кл. 2. З назоўнікам яйка—яйка з зародкам. Кл.

НАДА'ЦЬ (*надаць*) -*м, -сі*. Набіць, надаваць. Кот вельма шкадлівы, кожны раз за правіннасць надам, а ён ні лёпшае. Кл.

НА'ДСЫР (*натсыр* і *нацсыр*). Сыравата, не зусім згатавана. Натсыр картоплі смашнейшые за развараные. Кл. Як мяса натсыр, трохі нідасмажана[е], то нічога ні зашкодзіць. Вайц.

НАДУБЕ'ЦЦА (*надубецца*) -*ю-ся, -еш-ся*. Намерзнуцца. Ужэ заганеце (карову) ў хлёў, надубеласа (на дварэ), холадно. Кл.

НАЕ'ДАК (*наедак* і *наёдак*) *мужч*. Спажыўнасць (прадуктаў харчавання, кармоў). Ётакі наедак памідоры,—каб сала зьёў; сало ці м'ясо—дак ето наедак. Кл.

НАЗНАРАКІ' (*назнаракі*). Знарок. Назнаракі вурваў. Сл. Гл. назнарок.

НАЗНАРО'К (*назнарóк*). Знарок. Назнарóк так сказáў. Сл. Назнарóк стаў дай (дый) стáю. Вольн. Гл. назнаракí.

НА'ЙМІЧКА (*нáймічка*) *жан.* Наймітка. Калі за нáймічку булá, дóўжан заплацíць; калі за мíлую, дóўжан чóбаты пашы́ць. Вершаванае апавяданне. Кл.

НАЙПЯРВЕ'Й (*найпярвéй, найп[е]рвéй*). Прыслоўе. Найлепш. Найпярвéй—каб сам ты схадзíў. Кл. Параўн.: найпярвéйшы (гл.). Параўн.: чэшскае najperve—перш за ўсё.

НАЙПЯРВЕ'ЙШЫ (*арф.*). Прыметнік, форма найвышэйшай ступені. Найлепшы. Найпярвéйшы (чалавек) з вáмі не ўрáдзіць (гл. урадзіць). Кл.

НАКАПА'ЦЬ Гл. капáць.

НАКІДА'ННІК (*накідáньнік*). *мужч.* Той, хто накідае (сена, салому, гной на воз). А дзé ж ваш накідáньнік? Адны́м воз ця́жка наклáсьці. Кл.

НАКРО'ІЦЬ (*накрóйіць*) *II спраж.* (*-ою, -оіш*). 1. Нарэзаць (пра хлеб). Чамý мáло хлéба накрóйіў? Кл. Накрóйце, тáта, хлéба. Кл. 2. Накроіць (кравецкае). Сам (майстар) накрóйіць, а шы́юць дз[е]вачкí. Баян. Параўн.: чэшскае nakrájeti—нарэзаць.

НА'КРЫЖКІ (*нáкрыжкі*). Від дужання, барацьбы: праціўнікі абхопліваюць адзін другога так, што адна рука аказваецца пад пахаю (пад рукою) другога, а другая—на плячы. Давáй вóзьмамса нáкрыжкі. Хал.

НАКУЛЕ'ШКАЦЬ (*накулёшкаць*) *I спраж.* (*-аю, -аеш*), *пераходны.* Набіць, але не моцна, без асаблівай злосці. Кл.

НАЛА'ПІЦЬ (*налáпіць*) *II спраж.* (*-плю, -п-іш*), *пераходны.* Залапіць, залатаць, калі латка (лата) накладаецца зверху. Мêх налáпіла. Кл.

НАЛІ'СНІК (*налісьнік*) *мужч.* Блінчык (тонкі) з пшанічнае мукі. Такíх смáчных налісьнікаў з двáццаць мóжна зьéсьці. Пас. Янкі Купалы.

НА'ЛІХА (*нáліхо(а)*. Ужываецца, як і нáпусто(а), ва ўстойлівым спалучэнні: Дварý твайму нáліхо да нáпусто. Кл. Параўн.: Налíхо мне такáя хеўра? Кл.

НАМАНІ'ЦЬ (*наманíць*) *II спраж.* Гл. маніць. Наманíў на ўсíх (нагаварыў няпраўды на другіх). Пас. Янкі Купалы. Наманíў, што й у карóбку ні зьбярэ́ш. Кл.

НАМАРСКА'ЦЦА (*намарскáцца*) *I спраж,* (*-аю-ся, -аеш-ся*). Напрацавацца; затраціць многа сілы на такой працы, як касьба, капанне канавы, ямы і мець неадкладную патрэбу пад'есці—папоўніць сілы. Пóкуль сóнячко ўзнялóсо, дак ён ужэ намарскáўса й сьнéдаць прышоў. Кл. Параўн.: вымарскацца (гл.). Параўн.: чэшскае mrskati—біць, хвастаць, сцябаць; mrsknouti—хвасянуць, сцебануць, выцяць.

НАМЕ'ТКА (*намéтка*) *жан.* Пазнавальны знак (напрыклад, на вуху ў авечкі, на лапцы ў гусі). Вазьмí да намéтку зрабí. Кл.

НАМУЛІЦЬ (*намýліць* і *намулíць*) *II спраж.* Намуляць, сцерці нагу, бок чым-небудзь. Далé-ка йці, каб нôг ні намýліў. Сл. Намуліў рýку: дзяржáньне такóе нідóбрае. Кл. Гл. мульмó.

НАПАВІДО'ЦЫ (*напавідóцэ, напавідóц*[э], часам *напавідоцы*). Прыслоўе. У полі зроку; так, што відаць, бачна. Хай хóдзіць тавáр на-павідóцэ. Кл. Параўн.: widok—светлая, адкры-тая мясціна. А. Селішчаў, Старославянский язык, II, стар. 63.

НАПАДБУКРО'ЙВАЦЬ (*напудбукрóйваць, нападбукрóйваць*) *I спраж.* (*-аю, -аеш*), *пера-ходны.* Нападбухторваць (таксама ўжываец-ца), нападгаворваць. Нападбукрóйвалі п'я́ных паліцáяў, дак тые валацýгі (паліцэйскія) й да-вáй спаганя́ць чагó ні булó. Кл.

НАПАДО'РВАЦЬ (*нападóрваць* і *напад-вóрваць*) *I спраж.* (*-аю, -аеш*). Навыворваць барознаў бульбы, буракоў. Ужэ́ нападóрвалі (барознаў) з двáццаць. Кл. Гл. падорваць.

НАПА'ШКІ (*напáшкі*). Ужываецца пры дзеясловах надзець, накінуць, апрануць (верх-няе адзенне). Надзець напашкі—надзець (на-кінуць) толькі на плечы. Хварсýн той напáшкі нóсіць піжáк. Кл. Хоць напáшкі ўскінь што. Барб. Параўн.: ускінуўшы на апашкі паліто. А. Чарнышэвіч, Світанне, 1957, стар. 40.

НАПЕ'РЫЦЬ (*напéрыць*). Гл. перыць. Вот напéрылі твайго Хвéдара. Кл. Параўн.: напя́-рыць. Радашковічы.

НАПРО'СТ (*арф.*). Ужываецца з дзеясло-

вам жаць; жаць напрост—жаць і не звязваць у снапы, а рассцілаць жменькамі. Кл.

НАПРО'ЦІ (*напро́ці*). Насупраць. Стаў напро́ці й стаййць. Кл. Параўн.: чэшскае naproti—насупраць.

НА'ПУСТА (*на́пусто(а)*. Ужываецца, як і прыслоўе на́ліхо(а), ва ўстойлівым спалучэнні: Двару́ тваймý на́ліхо да на́пусто. Кл.

НАПУ'ШЫЦЦА (*напу́шыцца*). Гл. пу́шыцца. Напу́шыцца й хо́дзіць, дзень маўчы́ць. Кл.

НАПЯРЭ'СЦІКІ (*напярэ́сьцікі, нап[е]рэ́сьцікі*). Напярэсцігі, наўпрасткі, карацейшым шляхам, наперарэз (ісці, бегчы). Бяжы напярэ́сцікі (*арф.*). Кл. Параўн.: напрасцік. А. Чарнышэвіч, Світанне, 1957, стар. 73. Параўн.: напярэсцігі. Карэліцкі раён. Параўн.: (кветкі) напярэсцігі кланяліся і заклікалі спыніцца палюбавацца. Я. Скрыган, Наталя, 1957, стар. 27.

НАРАЎЦЭ' (*нараўцэ́*) *ніяк.* Сустрэта толькі ў прыказцы: Дзе сяльцэ́, там і нараўцэ́. Зуб., Сл., Кас.

НАСІ'ЛА (*насі́ла*) *жан.* Гладка абструганая яловая жэрдка; на дзвюх насілах носяць копы на грузкай (гл.) сенажаці. Узя́лі насі́лы й пашлі́ ко́пы насі́ць. Хал.

НА'СКІ (*на́скі, на́ські*). Прыметнік ад займенніка *наш*. На́ськіе гаво́раць (слухаючы радыё). Кл.

НАСТО'ЙНІК (*насто́йнік* і *насто̂йнік*) *мужч.* Судзіна на 2—5 літраў, у якой адстойваецца малако (аддзяляюцца вяршкі). Кл

НАСТРА'МАК (*настрáмак*) *мужч.* Невялічкі, меншы за каляснік (гл.) воз (сена, канюшыны, саломы). Настрáмкаў тры паткінýлі вам. Байл. На дзéнь цялятам настрáмак сéна. Кл.

НАТАСАВА'ЦЬ (*натасавáць*). Зак. тр. ад тасаваць. Кл.

НАЎЗДАВА'ЦЬ (*наўздавáць*) *I спраж. (-аю, -аеш), непераходны.* Набіць, наўскладаць (гл.), накулешкаць (гл.), усыпаць. Што б здагнáў, то ні даравáў бы, отó наўздавáў бы. Кл.

НАЎЗДАГО'Н (*наўздагóн*). Ужываецца пры дзеясловах ісці, ехаць. Кідáйма, ўсе й бяжэ́м наўздагóн, мо шчэ здагóнім дзель на пасёлку. Пас. Я́нкі Купалы. Слова наўздагон у такім самым значэнні адзначыў некалькі разоў у г. Мсціславе.

НА'ЎЗНАЧ (*нáўзнач*). Дагары (упасці, плысці). Нáўзнач упала. Кл.

НА'ЎСКАЧ (*нáўскач*). Параўн.: рускае вскачь. Нáўскач папéрліся на вы́ган. Кл. Баюса нáўскач,—давай трушкóм. Байл.

НАЎСКЛАДА'ЦЬ (*наўсклáдаць* і *наўскладáць*) *I спраж. (-аю, -аеш).* Набіць, наўздаваць (гл.), накулешкаць (гл.), усыпаць. Раз злавілі злóдзея, ну й білі, дóбра наўсклáдалі. Барб.

НАЦІ'НА (*націна*) *жан.* Нацíну вýгнало на рôст чалавéка, а картóплі—арахí. Кл.

НАЦЯ'ГІЧ (*нацягіч*) *мужч.* Бандарская прылада, якой карыстаюцца, калі набіваюць (нацягваюць) абручы на бочку, цэбар. Нацягіч

трэ́ба ў каго́ль узя́ць. Кл. У на́с ка́жуць: наця́гіч. Барб.

НАЧО'ЎКІ (*начо́ўкі* і *начôўкі*) *толькі ў множн.* Побач і но́чвы (гл.). Барб., пас. Янкі Купалы, Кл.

НАЯЗДЖА'ЛЫ (*наяжджа́лы, на*[*е*]*жджа́лы*). Супрацьлеглае тутэйшаму—прыезджы. Ён на[е]жджа́лы. Сл. У Барбаро́ве бага́та на[е]жджа́лых, усе́ (усё) прымакі́. Барб.

НЕБАГА'ТКА (*нібага́тко(а), нябага́тко(а)*). Памяншальнае ад небагата. Я нібага́тко не́сла. Кл.

НЕБАРА'КА (*небара́ка*). Няўдалец, чалавек, якога сустракаюць няўдачы, якому спачуваюць, калі ён у бядзе. Кл., Вайц., Хал. Ёты н[е]бара́ка Па́в[е]л,—і хво́ры, й до́ма абіжа́юць. Кл.

НЕГАДО'ЎНЫ (*нігадо́ўны* і *нігадôўны*). Які (пра дзяцей, пра маладых хатніх жывёл) «не гадуецца» (хвароба, няшчасныя выпадкі і інш.). Ве́льмі хло́пчык нігадоўны. Кл.

НЕГАЛЮ'ЗНЫ (*нігалю́зны, н*[*е*]*галю́зны*). Няўклюдны (пра чалавека, жывёлу). Не́йкі нігалю́зны Ма́рйін жані́х. Барб.

НЕГАНЬБІ'ТНЫ (*ніганьбітны, неганьбітны*). 1. Паслухмяны, памяркоўны, хоць каму дапаможа. 2. Не грэблівы. Кл.

НЕДАПІ'ТКІ (*нідапіткі* і *недапіткі*) *толькі ў множн.* Рэшткі таго, што пілі. Усê нідапіткі зьлілí тамý п'яніцу. Пас. Янкі Купалы. Параўн.:

рускае опивки. С. І. Ожагаў, «Словарь русского языка».

НЕЗДАЛЕ́ТНЫ (*нездалé(ê)тны, ніздалé(ê)тны*). Нямоглы, фізічна слабы. Ніздалéтнаму такому. Барб. Вéльма ніздалêтны стаў. Кл.

НЕЗДАЛЕ́ЦЬ (*ніздалéць, нездалéць*) І *спраж.* Нядужаць, быць фізічна слабым, нямоглым. Ужэ ніздалéе й пчóлак даглéдз[е]ць. Барб. Сáмі як зрабéце, я нездалéю ўжэ. Хал.

НЕ́ЙДЗЕ [1] (*нéйдзе*). Недзе, дзесьці. Нéйдзе лес гары́ць. Хал. Нéйдзе пашóў. Кл.

НЕ́ЙДЗЕ [2] Мусіць, мабыць. Нéйдзе ён бры́тву сапсавáў. Зуб.

НЕНАВІ́ДНЫ (*нінавíдны*). Ненавісны. Ужываюцца і ненавісны і ненавідны. Такíх нінавíсных, скажы́ бо, й дóхля ні пабрáла. Кл. Параўн.: ненавідны. К. Чорны, Збор твораў, 5, стар. 256.

НЕПЯРЭ́ЛІЎКІ (*ніпярэ́ліўкі*). Дрэнь справы; бяда будзе. Бачыць, што ніпярэ́ліўкі—да хóду. Кл. Параўн.: не піва, а пярэліўкі. Я. Брыль, Дзеля сапраўднай радасці, стар. 167.

НЕ́РВА (*нéрва, нэ́рва*) *жан.* Нерв. Нэ́рва хвóра, пэ́ньсяю прасíў. Вольн. Нéрва, сказáлі, прастýджана. Кл.

НЕЦІКА́ВЫ [1] (*ні(е)цікáвы, ні(е)цікáву*). Нецікавы. Усíм ніцікáва кнíжка. Хал. Тáто вéдаў багатó цікáвых слоў. Кл.

НЕЦІКА́ВЫ [2] Слабы, малавартасны, ужываецца з назоўнікамі, якія абазначаюць назвы

сельскагаспадарчых, гароднінных культур або назвы хатніх жывёл. Ніцікáва мая цыбýля. Ніцікáвае парася́тко, але хай жывé. Два гады́ гарбузы́ ніцікáву[е]. Кл.

НЕ′ШТА[1] (*нéшто, нéшта*). Нешта. Нéшта стýкнула. Кл.

НЕ′ШТА[2] Чамусьці. Нéшто ні гóніць Таця́на тавáру. Кл.

НІБУ′ТА (*нібýто* і *нібы́то*). Гл. нібыта.

НІБЫ′ТА (*нібуто, нібыто, нібыта*). Быццам, быццам бы. Яна нібýто разьдзéліць (аддзеліць ад сябе сям'ю дачкі), адáле йзноў разам. Кл.

НІВО′ДЗІН (*нівóдзін* і *нігóдзін*). Гл. нігодзін.

НІГО′ДНЕНЬКІ[1] (*нігóдняньκі* і *нівóднянькі*). Памяншальнае ад нігодзін (гл.). Нігóднянькае німа. Кл.

НІГО′ДНЕНЬКІ[2] Памяншальнае ад нягóдны. Тóе парася́ нігóднянькае, нічóго с такóго н[е]бýдзе. Барб.

НІГО′ДЗІН (*нігóдзін* і *нівóдзін*). Утворана ад ні адзін. Нівóднай сьлíўкі нíмá. Барб. Нігóдзін сын ні прышóў з вайны́. Кл.

НІЧАГЕ′НЬКІ (*нічагéнькі*). Памяншальнае ад нічога. Нічагéнькі ні купіла. Барб.

НІЧО′ГІ (*нічóгі*). Прыметнік ад нічóга. Слабы, малавартасны (пра неадушаўлёныя прадметы), слабы здароўем (аб чалавеку, жывёле). Нічóгі лён наш (Кл.)—слабы, неўрадлівы лён.

Нічо́гае, ба́цька, дзіця́ на́шае, трэ́ба г доктару. Барб.

НІШТО′ [1] (*нішто́*). Нішто. Кл., Байл., Барб., Сл., Хал.

НІШТО′ [2] Нядрэнны, зусім нядрэнны, нядрэнна.—Ці до́бру ха́ту зрабілі?—Нішто. Зуб. Ду́мала зь естаго кабана́ нічо́га ні бу́дзе, а ён нішто́ ву́рас, то́ўсты, са́ла з нас—па са́мае го́рло. Кл. Ці шчэ стары́ ваш ро́біць што, ні асла́б?—Не, нішто́ йшчэ, йшчэ ры́бу ло́віць. Хал.

НІШЧЫ′МНІЦА (*нішчы́мніца*) *жан., толькі ў адз.* Посніца. У во́йну нішчы́мніца була́, дак захварэ́ў на беркулёз дай (дый) пам'ёр. Касар.

НІШЧЫ′МНЫ (*нішчы́мны*). Посны. На нішчы́мным шча́ўлі ні нако́сіш, трэ́ба са́ла сква́рку. Сл.

НО′САЛЬ (*но́саль*). Назоўнік мужч. роду. Зневажальнае. З вялікім носам. Кл., пас. Янкі Купалы.

НО′ССАМ Ужываецца пры дзеяслове біць і яго сінонімах (выцяць, тасаваць і інш.). Но́ссам біў — біў нагою, наском бота (Кл.). У м. Глуск, у в. Вайцяхоў—насцако́м.

НО′ЧВЫ (*но́чву* і *но́чвы, нôчву* і *нôчвы*) *толькі ў множн.* Побач—начо́ўкі. Кл., пас. Янкі Купалы, Барб. Параўн.: начва́ч. Карэліцкі раён.

НЯБО′ГА (*нябо́га, н[е]бо́га*) *жан.* Пляменніца. Зуб., Хал., Сл., Кас., Кл.

НЯБО′Ж (*нябо́ж, н[е]бо́ж*). Пляменнік. Зуб., Хал., Сл., Кас., Кл.

НЯДУ'ЖЫ (*нідўжы, нядўжы*). Хворы; часцей—не цяжка хворы. Не́што нядўжы, чацьвóрты дзень ка́шляе. Кл. Параўн.: занядўжаць (гл.). Параўн.: чэшскае nedužívy—хворы, хваравіты.

НЯЛЮ'ДСКІ (*нялю́дзкі*). Дрэнны, не такі—як трэба, не такі—як звычайна. Ён ве́льмі нялю́дзкі быў (аб чалавеку). От не́йка нілю́дзка каро́ва, заўсе́ды трэ́ба йці па её, нікóлі сама́ дадóму ні йдзе́. Нілю́дзка пе́чка, дымі́ць. Кл. Ні мóжно лю́дзкае кла́дкі пакла́сьці? Дак не́йку крывўлю пакла́лі, — хіба́ гóлаву скруці́ць на ёй. Кл.

НЯМАВЕ'ДАМА (*німаве́дама, н*[*е*]*маве́дама*). З «няма вядома». Невядома, нямаладу (гл.). Німаве́дама куды́ закобалі. Кл. Н[е]маве́дама аткўль узя́лі е́ту пôзву. Кл.

НЯМАЛА'ДУ(*німала́ду*). З «няма ладу». Німала́ду—невядома. Ужываецца ў спалучэннях: Німала́ду што рабі́ць. Німала́ду дзе шука́ць. Німала́ду кагó прасі́ць. Німала́ду як ра́ды даць. Німала́ду за штó ўспаў на на́с. Кл. Нямала́ду дзе й бра́ць усе́. Сым.

НЯМА'ШАКА (*німа́шака, нямá шака*). Няма. Кл., Зуб., Сл., Поб., Байл., Барб., Вайц.

НЯПЕ'ЎНЫ (*н*[*е*]*пе́ўны, непе́ўны, ніпе́ўны*). Што і нецікавы. Ніпе́ўна пшані́ца, але трóхі бўдзе. Н[е]пе́ўнае са́ло. Кл.

НЯПРА'ЎДЗІЦЬ (*ніпра́ўдзіць*) *II спраж.* (*-дж-у, -дз-іш*). Зняпраўджваць (параўн.: часам у публіцыстыцы—скажа́ць), расказваць не

па праўдзе, не так, як было сапраўды. То наніпра́ўдзіў богве́д (абы) чаго́, а тагды́ ла́шчыцца прышоў. Кл.

НЯРО'Т *(нярóт, н[е]рóт) мужч.* Нерат. Барб., Зуб., Хал., Кл. Як у нярóт: ні ўза́д, ні ўпяро́д *(арф.)*. Кл.

НЯЎМЕ'КА *(ніўмéка, няўмéка). агульн.* Ніўмека ты. Няўме́ка та́я. Кл.

П.

ПАБЕ'ГАЦЬ[1] *(пабéгаць* і *пабêгаць)*. Зак. тр. ад бегаць. Пабегаць. Кл.

ПАБЕ'ГАЦЬ[2] Зак. тр. ад бегаць. Пакрыцца (аб карове). На́ша каро́ва ні пабе́гала, малака́ ні бу́дзе. Вайц. У гэтым значэнні ўжываецца папалявала (гл.).

ПАБІ'ЦЦА[1] *I спраж.* Пабіцца. Кл.

ПАБІ'ЦЦА[2] Пакрыцца (толькі аб кабыле). Кл.

ПАБО'ЛЬШАЦЬ *(пабóльшаць, пабôльшаць) I спраж. (-аю, -аеш)*. Павялічыцца, падрасці. Тро́шкі пабо́льшала нôч. Барб. За зі́му ні пабо́льшаў наш Віця. Зуб. Вада́ пабо́льшала ў рацэ́ (прыбыла). Кл.

ПАБО'ЛЬШЫЦЬ *(пабóльшыць, пабôльшыць) II спраж. (-у, -ыш), пераходны.* Павялічыць. Трэ́ба аго́нь у ля́мпе пабо́льшыць. Н.-Андр.

ПАВАЛІ'ЦЦА[1] *(паваліцца) II спраж. (-юся, -ішся)*. Паваліцца, упасці. Там павалі́цца мо́жна, га́нкі круты́[е]. Поб.

ПАВАЛІ'ЦЦА [2] Злегчы, цяжка захварэць, быць у безнадзейным становішчы, памерці. Гаруе, покуль сусім не паваліцца. Байл. Трэба глядзець сябе, а то без пары павалішся *(арф.)*. Барб.

ПАГЛУМІ'ЦЬ Гл. глуміць. Кл.

ПАГО'Н *(пагон і пагôн) мужч.* Месца прагону жывёлы (праз поле, сенажаць). Там пагон зрабілі. Барб. Хіба пагон тут? Кл.

ПАГУ'КАЦЦА *(пагукацца) I спраж.* Пакрыцца (аб свінні). Кл.

ПАГУКА'ЦЬ Гл. гукаць. Я пагукала йіх. Кл.

ПАДАВА'ННІК *(падаваньнік) мужч.* Той, хто падае на стог, воз, скірду (сена, салому, снапы). Падаваньнікаў прышлі нам. Пас. Янкі Купалы.

ПАДАРА'ЦЬ *(падараць) I спраж. (-у, -эш), пераходны.* Гл. падорваць, нападорваць. Сёні падорваю, а заўтра за сваê картоплі. Байл. Мо дзесяць баразьнê падараў. Кл.

ПАДАТКНУ'ЦЬ *(падаткнуць) I спраж. (-у, -еш)*. 1. Падаткнуць. 2. Ціхенька, па-здрадніцку падказаць (пра каго-небудзь), выдаць. Хтоль штоль падаткне, дак тады крыку поўна хата. Кл.

ПАДБУКРО'ІЦЬ *(падбукройіць і пудбукройіць) II спраж. (-ою, -оіш), пераходны.* Падгаварыць, падбухторыць (ужываецца і падбухторыць). Каб ні пудбукройілі бальшуны, то ён ні зрабіў бу так. Кл.

ПАДБУКРО'ЙВАЦЬ (*пудбукрóйваць* і *падбукрóйваць*) *I спраж.* (*-аю, -аеш*), *пераходны.* Падгаворваць, падбухторваць (ужываецца і падбухторваць). Ня трэ́ба падбукрóйваць дзіця́. Кл.

ПАДВАЛІ'НА (*падвалíна* і *пудвалíна*) *жан.* Падваліны—брусы, на якія насцілаецца падлога. Падвалíна сагнілá. Вільча. Тры падвалíны дубóвы[е]. Вайц.

ПАДГЛЯ'ДАЦЬ [1] Падглядаць. Кл.

ПАДГЛЯ'ДАЦЬ [2] *I спраж.* (*-аю, -аеш*). Паглядзець і дастаць (з нератаў) рыбу. Хóдзіць да падгля́дае чужы́[е] нярóты. Барб.

ПАДДЗЕ'ЎКА (*падзьдзéўка* і *пудзьдзéўка*) *жан.* Кароткая верхняя цёплая вопратка. Падзьдзéўку купíла. Сл.

ПАДЗЁ'ННІК (*падзё́ньнік*) *мужч.* Падпасак, які вылучаўся па чарзе на дапамогу пастуху. Пастухá наймáлі, а памагáтаго—падзё́ньніка—давáлі па чарзê, чыя́ чаргá, той і падзё́ньніка даé. Кл. Гл. падпасіч.

ПАДЗІ'РВАЦЬ (*падзíрваць*) *I спраж.* (*-аю, -аеш*). Падглядаць (ужываюцца абодва словы: падзірваць і падглядаць). П[е]растáнь падзíрваць (у гульнí). Кл.

ПАДЛА'СІЦА (*арф.*). Ласка. Часцей—лáсіца (гл.). Кл.

ПАДМАЎЛЯ'ЦЬ (*падмаўля́ць* і *пудмаўля́ць*) *I спраж.* (*-яю, -яеш*), *пераходны.* Падгаворваць, падбіваць. Яны́ пілí і гуля́лі, чарнабрóву падмаўля́лі. Вершаванае апавяданне. Кл.

ПАДМЁ'ТАК (пудм'ётак, падмётак) мужч. Падносак. Часцей—падносак, прычым у множн. (падноскі). Падмёткі купіў. Вайц. Параўн.: рускае подметка—жан.

ПАДНО'САК Падмётак. Паднôскаў ні нашóў на базáры. Хал. Ты й паднôскаў майіх ні вáрты. Кл.

ПАДО'РВАЦЬ (*падóрваць* і *падвóрваць*). *I спраж.* (*-аю, -аеш*). Выворваць барозны бульбы, буракоў. Мікалáй падóрвае дóбра. Н.-Андр. Я вазíў (бульбу), а ты падвóрваў. Кл.

ПАДПА'СІЧ (*арф.*) *мужч.* Падпасак, які вылучаўся па чарзе на дапамогу пастуху. Кл. Гл. падзённік.

ПАДПА'ШКІ (*патпáшкі* і *путпáшкі*). 1. Від дужання, барацьбы, калі адзін бярэ другога пад рукі (падпашкі). Патпáшкі й я цябе апсаджý. Кл. Тое, што і падсілу (гл.). 2. Узяць (абхапіць) каго-небудзь пад рукі. Кл.

ПАДПРА'ЖНАЯ (*патпрáжна*). Прыметнік. Тая навойка (гл.), на якую навіваецца аснова. Кл. Параўн.: навой (*мужч.*). Дрыбінскі раён.

ПАДРУБІ'НА (*падрубíна* і *пудрубíна*) *жан.* Подруб—першы вянок хаты, які кладзецца на штандары. Падрубіна—адно з 4 бярвенняў подрубу. Падрубíн дзьве прыўёз. Кл.

ПАДРУ'ЧНЫ (*падрýчны, пудрýчны*). Падручны вол—той з двух, які «пад рукою», злева (калі быць за валамі, ззаду за імі). Параўн.: ралéйны. Ралéйнаго трэ́ба крапчэ́йшаго валá.

Байл. Ралéйны трэ́ба каб разумнéйшы буў за падру́чнага. Кл.

ПАДСА'КА (*патсáка* і *путсáка*) *жан.* Рыбацкая прылада—сетка, нацягнутая на асадку, якая нагадвае палову разрэзанага конуса. Хадзілі на рыбу с патсáкаю. Н.-Андр. У патсáку самкá й я́зя ўвагнáлі. Кл.

ПАДСІ'ЛУ (*патсілу, пацьсілу, путсілу, пуцьсілу*). 1. Від дужання, барацьбы. Тое, што і падпашкі (гл.). Міша ж мéншы й слабéйшы, то вы патсілу бóрайцяся, а нáкрыжкі ні на прáўду. Кл. Пацьсілу й я грáкну такóго. Байл. 2. Узяць падсілу—узяць пад рукі. Тое, што і падпашкі (гл.). Дай я патсілу вазьму́. Байл.

ПАДУ'ШЧАНІК (*паду́шчанік*) *мужч.* Навалачка. Надзéла нóвы паду́шчанік. Хал. Паду́шчанік ці навáлачка, дак тóе сáмае. Кл.

ПАДЦІКАВА'ЦЬ (*пацьцікавáць, пуцьцікавáць*) *І спраж.* (*-ую, -уеш*), *пераходны.* Падпільнаваць. Ужываюцца абодва словы. Трэба пацьцікавáць йіх (дзікіх свіней). Сл.

ПА'ЖА (*пáжа*) *жан.* Паша. У нáс дóбра пáжа. Кл.

ПАЖАРНІ'ЦА (*пажарніца*) *жан.* Расліна, расце ў хваёвым лесе пасля пажару, на лясным пажарышчы. Пажарніцы кóні ні хóчуць есьці. Кл.

ПАЗАЛЕ'ТАСЬ (*пазалéтась*). У пазамінулым годзе, тры гады назад. Параўн.: залéтась. Кл., Зуб. Пазалéтась купіла. Зуб.

ПАЗАПРАЦО′ЎВАЦЦА *(пазапрацо́ўвацца) I спраж.* Му ж пазапрацо́ўваліса. Кл.

ПАЗДАРО′ЎКАЦЦА *(паздаро́ўкацца) I спраж. (-аю -ся, -ае -шся).* Ён ніганьбітны, пры́йдзе й за ру́ку паздаро́ўкаяцца. Кл.

ПАЗІРНУ′ЦЬ *(пазірну́ць) I спраж. (-еш, -уць).* Глянуць. Пазірну́лі да ху́цянько пашлі. Кл.

ПАЗО′РНЫ *(пазо́рны, пазо̂рны).* Вартасны на выгляд, прыгожы на выгляд. Пазо́рну каро́ву купі́ў, да што ж—даліка́тна, ні ў нас ёй па́сьціцца. Дак. Каро́ва на від пазо̂рна ве́льмі. Кл.

ПАКЛАДА′ЦЬ *(пакладáць) I спраж. (-аю, -аеш), пераходны.* Кастрыраваць. Кл. Гл. спакладаць, спакладаны, валашаць, звалашаны.

ПАКУ′ШТАВАЦЬ *(паку́штаваць, паку́штуваць) I спраж. (-ую, -уеш), пераходны.* Дробненька стукаючы яйкам аб зубы, вызначыць, ці моцнае яно. Даўне́й на па́ску ў біткі гуля́лі; перш чым гуля́ць у біткі, трэ́ба паку́штуваць. Барб.

ПАЛА′ТКІ *(пала́ткі) толькі ў множн.* 1. Насціл з дошак пры печы, звычайна над полам (гл. пол) пры глухой сцяне; палаткі—для сну, адпачынку. Цяпер—сустракаюцца рэдка. На пала́тках сьпі́цца лёпш, на пе́чы го́рач[э]. Кл.

ПАЛЕ′ГЛЫ *(пале́глы).* Жы́то ніпале́глае. Сл. Пале́глы (ячмень) ця́жко жаць. Кл.

ПАЛЕ′ТКУ *(пале́(ê)тку).* Улетку, летам. Ужываецца побач з уле́тку і летам. Пале́т-

ку назьбіра́ла, й до́брэ. Кл. Палётку булí тут. Зуб.

ПАЛО'К (*пало́к*) *мужч.* Памяншальнае ад пол (гл.), невялічкі пол. Мы вы́кінам сво̂й пало́к, на чо́рта ён? Кл.

ПАЛУ'ДНАВАЦЬ (*палу́днаваць* і *палу́днуваць*) *I спраж.* (*-ую, -уеш*). Абедаць. Хадзе́м, ба́бо, палу́днуваць. Кл. Хіба й ні палуднуваць праз вас? Барб.

ПАЛЬНІ'ЦА (*пальні́ца*) *жан.* Дошка з полу (гл. пол). Пальні́цы сухíе, лёгкіе, ле́пшые за но́вые до́шкі. Кл.

ПАЛЯВА'ЦЬ[1] (*палява́ць*) *I спраж.* (*-юю, -юеш*). Паляваць. А дзе палява́лі? Кл.

ПАЛЯВА'ЦЬ[2] Пакрыва́цца (толькі пра карову), бе́гаць (гл. бегаць[2]). Ба́бо, ваша каро́ва палю́е. Сьвіньня́ гу́ка[е]цца (гл.), а каро́ва палю́е. Кл.

ПАМАГА'ТЫ (*памага́ты*). Субстантаванае слова (параўн.: араты). Памочнік; той, хто дапамагае. Пастуха́, найма́лі, а памага́таго... давалі па чарзе̂. Кл. Тако́го памага́таго й н[е] трэ́ба тут. Кл. Параўн.: памага́ч.

ПАМАГА'Ч (*памага́ч*) *мужч.* Памочнік. Іду́ к вам за памагача́. Кл. Параўн.: памага́ты (гл.). Параўн.: чэшскае pomahač—памочнік.

ПАМА'ЛЕЧКУ[1] (*пама́ля*[*е*]*чку* і *памале́чку*). Паціхеньку. Пама́лячку тэ́пае (пра старога). Кл.

ПАМА'ЛЕЧКУ[2] Патрошку. Ве́льма памалячку е̂сь. Кл.

ПАМАНІ'ЦЬ. Гл. маніць.

ПАМАСНІ'ЦА *(памасьніца) жан.* Дошка падлогі. У гэтым значэнні—і масніца. Памасьніцы л[е] парóгу пагнілі́. Барб. Гл. масніца, цясніца.

ПАМЕ'ЦЦА *(памéцца) I спраж.* Сустрэта толькі ў форме прошлага часу (памéўся, памéліся). Намерыцца, што-небудзь паабяцаць, дакляраваць. Былá й памéласа, адáле назáд. Кл.

ПАМІДО'РА *(памідóра) жан.* Параўн.: рускае помидор (мужч. род). Я памідóраю ні пад'ём. Пас. Янкі Купалы. За памідóраю гóніцца. Кл. Параўн.: памідорына. Ветрынскі раён.

ПАМЯНТА'ШЫЦЬ *(арф.) II спраж. (-у, -ыш).* Павастрыць мянташкаю касу. Кл.

ПАНАЖЫ' *(памнажэ́(э̂). толькі ў множн.* Частка ткацкага варштата; дошчачкі, адны канцы якіх ляжаць на падлозе, другія—падняты і падвязаны да нітоў. Панажэ́ дастáнь. Кл. Ёто панажэ́. Зуб.

ПАНАРА'ВІЦЦА *(панарáвіцца) II спраж.* Спадабацца. Калі мне там панарáвіцца, той ні жджы́ дадóму. Вільча.

ПАНАРАВІ'ЦЬ *(панаравіць) II спраж. (-ўлю, -іш).* Пачакаць. Панаравéце, зáраз прын[е]сé зéркало. Касар.

ПАНІМА'ТНЫ *(панімáтны).* Пра чалавека, які добра разумее (у навуцы, у вытворчасці). Параўн.: рускае понимающий. Ніпанімáтна, тупáя дзéўка нáша. Хал. О! Ён панімáтны хлапчýк і ў навýцэ, й у рабóце. Кл.

ПАПАЛУ́ДНАВАЦЬ (*папалу́днаваць* і *папалу́днуваць*) *І спраж.* (*-ую, -уеш*). Паабедаць. Папалу́днаваць каб, дай е́хаць. Барб. Папалу́днаваць мо́жна й пасьле́й. Кл. Гл. палу́днаваць.

ПАПАЛЯВА́ЦЬ [1] Гл. паляваць [1]. Кл.

ПАПАЛЯВА́ЦЬ [2] (*арф.*) *І спраж., непераходны.* Гл. паляваць [2]. Нядо́бра, як папалю́е (карова) ра́на, тады за зі́му малако́ ады́йдзе, а ле́та ўсё без малака (ацеліцца ўвосень ці ў пачатку зімы) (*арф.*). Пас. Янкі Купалы.

ПАПАПЕРЫЦЬ (*папаперыць*). *Шматкратны, II спраж.* (*-у, -ыш*), *пераходны.* Гл. Перыць. Што́ ні гна́ў, што́ ні гна́ў—і ні ўвагна́ў (карову ў рэчку); так папапе́рыў, што ўся на пісяго́х ста́ла. Кл.

ПАПА́РЫНА (*папа́рына*) *зборны, жан.* Расліннасць на папары. Папа́рыну до́бра е̂сь каро́ва. Кл.

ПАПАТА́ЛАВАЦЬ (*папата́лаваць* і *папата́луваць*). *Шматкратны, І спраж.* (*-ую, -уеш*), *пераходны.* Гл. талаваць. Бе̂дну папата́лавалі паліца́йі. Байл.

ПАПІХА́ЙЛА (*папіха́йло* і *папіха́йла*). Зневажальнае. Е́такі жані́х, папіха́йло не́йкае. Байл.

ПА́ПЛІСКА (*па́пліска*) *жан.* Палка. Па́пліскаю ву́ц[е]ў. Барб. Хоць па́пліску вазьмі́. Кл. Параўн.: папліска—тонкая жардзіна, якая накладаецца на разасланую кулявую салому і прывязваецца да латы (гл. лата). Карэліцкі раён. Параўн.: по́шва, по́швіна (гл.).

ПАПУ́ША *(папу́ша) жан.* Скрутак тытуню (лісця). Цэ́лу папу́шу дала́. Пас. Янкі Купалы. Папу́ш два́ццаць на зі́му нагатава́ў. Кл.

ПА́РАНКА *(па́ранка) жан., толькі ў адз.* Спецыяльна прыгатаваны для коровы корм: колас (гл. колас [2]), сечка, або рэзка (гл. рэзка), мякіна, залітая варам. Па́ранка асты́ла, мо́жно не́сьці. Барб.

ПАРУШО́К *(парушо́к) мужч.* Парушынка. Ужываюцца абодва словы. Парушо́к ву́ймі мне з во́ка. Барб.

ПАРЭ́БРЫНА *(парэ́брына) жан.* Рабро з мясам, рабрынка. Капу́ста с парэ́брынаю смашне́йша. Пас. Янкі Купалы. Парэ́брыну ўкі́нула ў кру́пнік. Кл.

ПА́СКА *(па́ска).* Пасха. Барб., Хал., Кл.

ПАСТАНАВІ́ЦЬ [1] *(пастанаві́ць) II спраж. (-ўлю́, -віш).* 1. Пастанавіць, парашыць (напрыклад, на сходзе). Кл., Байл. 2. Прызначыць (каго-небудзь на якую-небудзь пасаду). За брыгадзі́ра пастанаві́лі. Пас. Янкі Купалы. Пастанаві́лі збачо́м. Кл.

ПАСТАНАВІ́ЦЬ [2] Паставіць (што-небудзь). Ужываецца паставіць і пастанавіць. Пастанаві́ла ў се́нцах. Кл.

ПАСТАНАВІ́ЦЬ [3] Пабудаваць. Хамі́ха пастанаві́ла сабе́ ха́ту. Кл.

ПАСТА́Ў *(паста́ў) мужч.* Скрутак, вялікі кавалак сукна. Ка́жуць у нас: паста́ў, ну, цэ́лы паста́ў. Кл.

ПАСТАЎНЯ' *(пастаўня́) жан.* Рыбацкая прылада—вудачка, наматаная на рагульку (вілачку). Параўн.: рускае жерлица. Пастаўню́ днём ні ста́ў,—на нôч. Кл. Гл. старожня.

ПАСТРО'ЙКА *(пастро́йка* і *пастрôйка) жан.* Будынак, а таксама як зборны назоўнік, у значэнні будынкі, страенне (гл.).

ПАТА'ЛАВАЦЬ *(пата́лаваць* і *пата́луваць) I спраж. (-ую -уеш), пераходны.* Гл. талаваць. Такі буў гад, што й глядзе́ў, штоб пата́луваць каго́. Кл.

ПАТКНУ'ЦЬ *(паткну́ць) I спраж. (-у, -еш), пераходны.* Гл. патыкаць. Паткну́ць, дак ён злуе́. Кл.

ПАТО'М [1] *(пато́м* і *по́тым).* Прыслоўе. Потым. Пато́м схаджу́. Зуб.

ПАТО'М [2] Часціца. Але, але ж, усё ж, аднак, а ўсё ж. Нашко́дзілі (дзеці) да сказа́лі, што ні хадзі́цьмам, а пато́м (але ж) прышлі́: ску́чылі. Кл.

ПАТЫКА'ЦЦА *(патыка́цца) I спраж. (-аю-ся, -аеш-ся).* Дражніцца, жартаваць. Патыка́юцца сабра́ўшыся, хіба́ ву́чацца? Кл. Хіба́ ён напра́ўду гавары́ў? Ён патыка́ўса. Кл. Параўн.: потыкати ся—спотыкаться, заблуждаться. С. П. Абнорскі і С. Г. Бархудараў, Хрестоматия по истории русского языка, ч. 1, 1952, стар. 381.

ПАТЫКА'ЦЬ *(патыка́ць) I спраж. (-аю, -аеш), пераходны.* Дражніць, злаваць (каго-небудзь). Патыка́лі саба́ку. Барб. Патыка́юць,

дак ён злуе́. Кл. Ні патыка́й бугая́, бо да́сь Барб.

ПАЎДУ'ЛЬКА *(паўду́лька) жан.* Груша-дзічка, на якой растуць смачнейшыя і большыя грушы, як звычайна бываюць на дзічках. Ва́ша паўду́лька сасхла́. Кл. На паўду́льцэ бага́то було́ што год. Кл. Параўн.: дуля.

ПАЎРО'ЗА *(паўро́за) жан.* Матузкі пры фартуху (іх два), якімі падвязваюць фартух. Паўро́зу атарва́ла. Байл. Дзе маê паўро́зы? (Пагроза). Кл.

ПАХА'ТНАЯ *(паха́тная).* Субстантаваны назоўнік. Што і паха́туха (гл. паха́туха). Ве́льма паха́тная. Зуб.

ПАХА'ТУХА *(паха́туха) жан.* Ацэначна-неадабральнае. Жанчына, якая не любіць працаваць і часта ходзіць па хатах у рабочыя і святочныя дні без справы, пасядзець, пагаварыць. Ідзе́ ўжэ та́я паха́туха. Кл.

ПА'ЦАРКІ *(па́царкі).* Каралі, пацеркі. Па́царкі расы́пала й ні пазьбіра́ла. Пас. Янкі Купалы. Гл. мані́сты.

ПАЦЫ'РКАЦЬ *(пацы́ркаць* і *пацырка́ць).* Падаіць карову. Пацы́ркаю каро́ўку, да й спа́ць ля́жам. Кл.

ПАЧЫ'НАК *(пачы́нак) мужч.* 1. Звітыя на адно верацяно два водкідкі (гл. водкідак). 2. Пераноснае. Сытае, тоўстае парася, цяля (наогул пра маладняк). Парася́та, што пачы́нкі. Кл. Параўн.: починокъ (у старажытнай мове)— выселок, поселок. С. П. Абнорскі і С. Г.

Бархудараў, Хрестоматия по истории русского языка, ч. 1, 1952, стар. 381.

ПАШНЯ′ (*пашня́*) *жан.* Збажына. Пашня́ ў йіх (у в. Малінава) пастая́нна ўрадлі́ва. Кл. І пашня́ до́бра ўся, й карто́плі, як ла́ва, йдуць (растуць). Барб. Град упе́нь зьбіў пашню́. Кл.

ПЕ′КАЛЬНАЯ (*пе́кална*). Прыметнік. Ужываецца толькі ў спалучэнні з назоўнікам дзежка. Пе́кална дзе́жка—дзяжа, у якой рашчыняюць цеста на хлеб і замешваюць яго. Пе́калну дзе́жку памы́ць трэ́ба. Пе́калну аддала́, а ў ала́джчынцэ (гл.) рашчыня́ю. Кл.

ПЕ′ЛКА (*пе́лка* і *пêлка*). Памяншальнае ад пель (гл. пель). Пêлка та́я ні ву́кашана. Сл.

ПЕЛЬ (*пель* і *пêль*) *жан.* Нізіна сярод поля, звычайна круглая або авальная. У Надда́тках пель ву́кашана. Кл. Параўн.: пе́ля. Парыцкі раён.

ПЕ′ЛЬКА (*пе́лька*) *жан.* Палонка. У пе́льку ўско́чыў. Пас. Янкі Купалы. Параўн.: Ды глядзі ў палонку, сынку, не ўваліся. Я. Колас.

ПЕЛЯНА′ (*арф.*) *жан.* Ніз (спераду) кашулі, сукенкі, спадніцы. Ужываецца ў спалучэннях: сып (насып) у пеляну, несла ў пеляне, насіла пеляною. У пе́лену накла́ў я́блык. Барб. Як та́я гаспады́ня, што ў пел[е]не́ жар насі́ла. Кл.

ПЕРАБАРСА′ЦЬ (*перабарса́ць* і *пярабарса́ць*) *І спраж.* (*-аю, -аеш*), *пераходны.* Перабарсаць што-небудзь — выцягнуць абору з аднаго і зацягнуць у другі. Пажджы́: перабарса́ю й пашлі́. Хал.

ПЕРАБРО'Д *(арф.) мужч.* Брод (мясціна, дзе пераязджаюць рэчку). К перабро́ду йдзі й пажджы́ там. Кл.

ПЕРАВЕ'ДАЦЦА *(перавéдацца* і *перавêдацца).* Зваротны дзеяслоў ад пераведаць (гл.). Пашла́ ў Глуск перавéдацца. Барб.

ПЕРАВЕ'ДАЦЬ *(перавéдаць* і *перавêдаць).* Наведаць (каго-небудзь), зайсці спецыяльна, каб даведацца аб жыцці-быцці. Перавéдаць зайшла́. Вільча. Трэ́ба перавêдаць свайіх (радню). Кл.

ПЕРАГАВО'РШЧЫК *(перагаво́ршчык) мужч.* Перакладчык. Перагаво́ршчык за грошы ву́пусьціў (арыштаванага нямецкімі гестапаўцамі). Кл.

ПЕРАДО'ЙКА *(п[е]радо́йка* і *пярэ́дайка).* Карова, што не «папалявала», «ніцельна» і доіцца другі год. Параўн.: ялаўка (гл.). Бува́е, што пярэ́дайка дае́ (малака) лепш за ту́ю, што ац[е]ліласа. У перадо́йкі малако́ смашнéйшае. Кл.

ПЕРАДО'ЎКА *(перадо́ўка* і *пярадо́ўка) мужч.* Вяз, які звязвае «галоўкі» палазоў (у санях). Вільча. Пярадо́ўка ні пада́сься. Вільча. Параўн.: пярэдняя.

ПЕРАЖА'БІЦЬ *(пераж́абіць* і *п[е]ража́біць) І спраж. (-бл-ю, -б-іш).* Надламаць гнучы, згінаючы (дугу, полаз, вобад), але без знешняга пералому. До́брые палазы́, ды (гну́чы) паглумілі, палавíна п[е]ража́бляных. Кл.

ПЕРАЛЕ'ТАВАЦЬ *(пералé(ê)таваць* і *пералé(ê)туваць) І спраж. (-ую, -уеш), неперахол-*

ны. Пражыць, прабыць лета. Пералётаваў у сына, а на зіму дадому. Кл. Хіба ето гаспадар? Сані пералётувалі пад даждж́эм. Барб.

ПЕРАСМІХА́ЦЬ (*перасьміхаць* і *пярасьміхаць*) *I спраж.* (*-аю, -аеш*), *пераходны.* Дражніць, здзекліва ці жартоўна, перадаваць чыю манеру гаварыць, хадзіць і інш. Бокі парваць! Так ужэ перасьміхалі да вытваралі, сабраўшыса. Кл.

ПЕРАСТАРЭ́ЛЫ (*перастарэлы*). Тата ўжэ перастарэлы. Зуб.

ПЕРАСЯ́ДКА (*перасядка*) *жан.* Перасадка (на чыгуначнай станцыі). Кл., Байл.

ПЕРАХЛЯ́БІСТЫ. Худы, з вельмі ўпалым жыватом. У гэтым жа значэнні бяскішкі (гл. бяскішкі). Вельмі перахлябістага каня далі. Ці ж на ім даедзеш? (*арф.*). Барб.

ПЕ́РУН (*перун*) *мужч.* Пярун. Перун стукнуў. Барб. Ат перуну згарэло. Кл.

ПЕ́РЫЦЬ (*перыць*) *II спраж.* (*-у, -ыш*), *пераходны.* Біць. Лупцаваць. Параўн.: пярыць. Радашковічы. Загнаў у стругу (карову) й перыць. Байл.

ПЕ́ТРАХ (*петрах*) *мужч.* Вантробы. І петраху б не було б. Зуб.

ПЕ́ЧЫВА (*печыво* і *печыва*) *ніяк.* Выпечка. (Тут — толькі печыва). Тваé печыва над усім сялом (найлепшае ў вёсцы). Кл. Дзьве печыве сьпякла. Кл.

ПІ́ГАР (*пігар* і *пікар*). Назва гульні, падобная да рускіх гарадкоў. Гулялі ў пігара. Гулялі ў пікара. Кл. Гл. бітка.

ПІСЯ'Г (*пісяг*) *мужч.* Крывавы доўгі след (у выглядзе палоскі) на целе каровы, быка ад удару рогам другой жывёліны; пісягамі называюць таксама крывавыя сляды ад моцных удараў пугаю. Пісяг ц[е]раз увесь бок. Кл.

ПЛАСКУ'ХА (*пласкýха*) *жан.* Рыба, падобная да ляшча. Пласкýх налавíў. Пас. Янкі Купалы.

ПЛА'ЦЦЕ (*плáцьце*) *ніяк.* 1. Бялізна. Плáцьце прáла. Кл. Плáцьце сабрáла, памýць уздýмала. Хал. 2. Побач (у адным значэнні) з сукенка. Кл., Хал., Сл., Поб.

ПЛЁ'НКА (*плёнка*) *жан.* Сіло. У плёнку злавíў сіньдзіка. Кл. Там плёнка маá. Байл.

ПЛО'СКУНІ (*плóскуні*) *толькі ў множн.* Маніцы (мужчынскія калівы канапель). То плóскуні, а éто—маткí. Кл. Параўн.: рускае посконь. Параўн.: пасканí. Толькі ў множн. ліку. Мсцíслаў.

ПЛУ'ХА (*плýха* і часцей *плáха*) *жан.* Адколаная частка бервяна, палена. Тýю плýху не прынясéш. Барб. Плáха на начóўкі дóбра. Кл.

ПО'ВАД (*пóвад*) *мужч.* Нядоўгая, досыць тоўстая і моцная вяроўка, якою залыгваюць (гл. залыгваць), злыгваюць (гл. злыгваць) валоў. На адным канцы повада ёсць вуха, якое надзяваецца на рог вала. Пóвад зьвіў. Кл. Дáйце мне аднагó пóвада. Пас. Янкі Купалы.

ПО'ГАЛАСКА (*пóгаласка*) *жан.* Рэха, пошчак. Ні ўсякі раз пóгаласка па лéсе йдзе. Пас. Янкі Купалы. 2. Чуткі, пагалоска, (пашла) гутарка. Пашлá пóгаласка, што Кандрáт вéльмо

до́бры варажбі́т. З казкі. Кл. А нашто́ нарабі́ў по́галаскі на ўве́сь сьвет? Пас. Янкі Купалы. Пусьці́лі по́галаску, што ба́чылі пры не́мцах у Мі́ньську. Кл. Параўн.: пошла писать губерния, понеслась молва.

ПО'ДБІЎКА (*по́дбіўка* і *по̂дбіўка) жан.* Падкладка ў вопратцы. По́дбіўка знасі́лася. Кл.

ПО'ДЛЕТАК (*по́длетак, по(о̂)длятак* і *по́(о̂)дл[е]так) мужч.* 1. Птушаня, якое крыху лятае. По́дл[е]ткаў налаві́ў. Сл. 2. Пераноснае. Дзіця дашкольнага, малодшага школьнага ўзросту, жвавае, лёгкае, шчуплае, лёгка бегае (параўн.: лятаць). Кл.

ПО'ЖАР (*по́жар) мужч.* Лясны пажар. По́жарам ву́кацiло бага́то ле́су. Кл. Увогуле пажар—пажа́р. Кл.

ПО'ДПЛЕТКА (*по́тплятка) жан.* Завостраная цвёрдая (яловы сук) палачка або костка, своеасабліваe шыла, з дапамогаю якога шыюць каробку. По́тплятка жыве́ мо со́рак гады́. Кл. Параўн.: спіча́к.

ПО'ДРУБ (*по́друб* і *по̂друб) мужч.* Першы вянок хаты, звычайна—з дубу. Подруб кладзецца на штандары. Гл. штандара. По́друб добры прыве̂с. Вайц. По̂друб гнілы́ ўжэ. Пас. Янкі Купалы. Трэ́ба й по́друб м[е]ня́ць. Кл.

ПО'ЗНЫ (*по́зны* і *по̂зны).* Каб ні такі по́зны, то б до́бры б лу́бін быў. Вольн. Іду́ць у по́зны абе̂д ка мне́. Кл.

ПО'КАЗКА (*по́казка) жан.* Прыказка, байка. Стара́я ўжэ ето по́казка. Кл.

ПО'КАНКА (*поканка*) *жан.* Груша, яблык (часцей спелыя), у якіх лопнула скурка. А я й поканку (грушу) нашоў. Пас. Янкі Купалы.

ПОЛ (*пол* і *пôл*) *мужч.* Насціл з дошак, на якім спалі (цяпер палоў у хатах няма), звычайна ад печы да супрацьлеглай сцяны. Цяпер дак ложкі, ці бо караваці, а бывало—пôл, у ўсякай хаце пол. Кл. Параўн.: пальніца, палок.

ПО'ЛУДЗЕНЬ (*арф.*) *мужч.* Абед. А мо пара на полудзень? (*арф.*). Кл.

ПО'ЛЫМЕНЬ (*арф.*) *мужч.* Вялікае полымя ў печы; дровы палаюць. Сухіх дроў паклала багата, дык полымень аж у комін (*арф.*). Вайц. Параўн.: чэшскае plamen—полымя.

ПО'ПАР (*попар,* радзей *папар*). Папар. На попары добра напасьцілі тавар. Кл.

ПО'РСТКІ (*порсткі, пôрсткі*). Пра няўжыўчывага чалавека, які балюча і рэзка рэагуе на папраўкі, заўвагі ці парады. Такі порсткі ні будзь, бо хтоль выб'е такую натуру. Пас. Янкі Купалы. Вельмі порстка, й слова ні скажаш. Кл. Параўн. варавіты.

ПО'СІЛКА (*посілка* і часам *восілка*) *жан.* Вяровачка, дрот, скручаная лазіна на вядры, за якую носяць вядро (дужка вядра). Посілку атарвала. З дроту зрабіў посілку. Кл. Параўн.: восілка. Капыльскі раён.

ПО'ТУЛЬ (*потуль* і *патуль*). Прыслоўе месца і часу. Датуль, да таго месца, да таго часу.

По́туль ско́шана трава́. По́туль хадзіцьме, по́куль пава́ліцца. Паку́ль жыць бу́ду, пату́ль ні забу́ду. Кл.

ПОЎСЦЬ (*поўсь* і часам *поўсьць*, ва ўскосных склонах *ц* захоўваецца—поўсьцю, поўсьці і да таго падобныя) *жан., толькі ў адз.* 1. Шэрсць, якая выпала ці вырвата з каня, каровы. Параўн.: воўна (авечая), шчаціна (свінячая). Лiня́е (конь), дак усю́ сьвіту ўрабіў у по́ўсь. Байл. По́ўсьці ла́ставачка назьбіра́ла й пане́сла. Кл. 2. Валаконцы, якія збіраюцца пад кроснамі, калі ткуць палатно, або пры апрацоўцы нітак ці кужалю. По́ўсьці пад кро́снамі цэ́лые прыгаршчы. Вайц. Ні сукно́ (вельмі тонкае і няякаснае), а не́йка поўсь. Н.-Андр.

ПО'ШВА (*по́шва* і *пôшва*) *жан.* Пошва— і са зборным значэннем, і са значэннем адзінкавасці. Тонкая жардзінка, якая накладаецца на разасланую кулявую салому і прывязваецца віткаю (гл. вітка) да латы (гл. лата). По́шва ні ско́ра гніе. Пас. Янкі Купалы. По́шву (пошвы) трэ́ба но́выя. Кл. Параўн.: по́швіну с каро́ю ні кладзі. Вайц. Параўн.: по́швіна і па́пліска.

ПО'ШВІНА (*по́швіна* і *пôшвіна*) *жан.* Гл. пошва. По́швіну с каро́ю ні кладзі. Вайц. Параўн.: по́шва і па́пліска.

ПРА'ВЫ [1] (*арф.*). Правы (супрацьлеглы леваму). Кл., Сл.

ПРА'ВЫ [2] Драўніна (дуб, бяроза і інш.), у якой прамыя, нязвітыя валокны, роўна расколваецца. Ве́льмі пра́ваго ду́ба трэ́ба. Сл. Найдзі пра́ву быро́зу. Кл.

ПРАГО'НЕНЫ (*прагоняны*). Дзеепрыметнік залежнага стану. Ён буў тады ўжэ прагняны. Кл.

ПРАЕ'Х (*праéх* і *праêх*) *мужч.* Прарэха. Ня ўмéе праяхá зашыць. Кл.

ПРАКАРПА'ЦЬ (*пракарпáць*) *I спраж.* (*-аю, -аеш*). Ужываецца побач з пракалупаць, часцей—другое. Пракарпáлі дзірачку ў зашытым мяшóчку і гарбýзікі выцягалі (*арф.*). Кл.

ПРА'ЛЛЯ (*прáльля*). Папрадуха. Прáльлі зьбірáліса на в[е]чóркі. Кл.

ПРАМІРО'ЎВАЦЬ (*праміроўваць*) *I спраж., незак. тр., пераходны.* Параўн.: у літаратурнай мове прэміраваць. (У Барбарове) сéно даюць, праміроўваюць даярак. Кл.

ПРАМІРО'ЎКА (*праміроўка* і *праміроўка*) *жан.* Прэмія. Праміроўку даюць. Барб. Адзін год Рыгóру далі маркаля за тóе, што бугáя дóбраго вýгадаваў,—праміроўку. Кл.

ПРА'НІК (*прáнік*) *мужч.* Прылада, якою пярýць (гл. праць) бялізну, абіваюць насенне лёну, часам іншых культур. Прáніка ні нашлá, хацéла лёну трóхі абабіць. Пас. Янкі Купалы. Ні ўсякае плáцьце (гл.) прáнікам вубівáць. Кл.

ПРАННЕ' (*праньнé*) *ніяк.* Ад дзеяслова праць (гл.). Тваé праньнé нідóбрае. Барб.

ПРАС (*прас*) *мужч.* Побач з жалязко і уцюг. Барб., Кл.

ПРАСТАРЭ'КА (*прастарэ́ка*) *агульн.* Па-

раўн.: няўмека, калека. Што і прастак, але абавязкова з адценнем зняваґі. Кл.

ПРА́ТВА (пра́тва) жан. Сталае месца на рэчцы, дзе пяру́ць (гл. праць) бялізну. Байлю́цка пра́тва (байлюцка — ад назвы вёскі). Дзе пра́тва, там печкура́ зло́віш. Кл.

ПРА́ЎДЗІЦЦА (пра́ўдзіцца) II спраж. Збывацца (не збывацца), здзяйсняцца (не здзяйсняцца). Твае́ (меркаванне, прагноз) ніч́ога (ані, ніяк) ні пра́ўдзіцца. Кл.

ПРАЎКО́М (праўко́м). Прыслоўе, ужываецца ў фразеалагічным спалучэнні з дзеясловамі стаяць, ставіць. Паставіла (шыю, спіну, чалавека) праўком—страчана ад захворвання рухомасць. Сьпіну паста́віло праўко́м. Кл. Вось гэтак праўком стаяць і глядзець. «Полымя» № 2, 1958, стар. 90.

ПРАЦЬ (праць) I спраж. (пяру́, пярэ́ш), пераходны. Мыць (бялізну). Пра́ла пла́цьце. Пане́сла (на рэчку) пла́цьце, будуць удзьво́х праць. Кл. Параўн.: пранне. Гл. апіраць.

ПРАЧЫНІ́ЦЬ (прачыніць) II спраж., пераходны. Параўн.: рускае приоткрыть (дзверы). Прачыне́це дзве́ра, мо ні та́к камарôў бу́дзе. Сл. Прачыні ю́шку, а то ча́дно. Кл.

ПРО́ПЛАЧ (про́плач). З плачам, з слязьмі; параўн.: рускае сквозь слёзы. Ужываюць з дзеясловамі казаць, гаварыць і падобнымі. Ён (кажа) про́плач: дзе ма́ма? Кл.

ПРУГЛО́ (пругло́) ніяк. Частка збудаван-

ня пры студні. Сл. У вв. Вайцяхоў, Клетнае гэтага слова няма.

ПРУ'ДКІ (*прýдкі*). Пругкі, дужы, з жалезнымі мускуламі. Малы́, а бач прýдкі. Кл. Скóлькі тут ягó е, а прýдкі які́. Пас. Янкі Купалы.

ПРУСА'К (*прусáк, прус* і *прушáк,* а таксама *брусáк*). Насякомае. Кл., Барб. Абыйдзі́ ўсê хáты, то прусакá ні ўбáчыш: зьв[е]лі́. Кл.

ПРЫДА'ЧНЫ (*прыдáчны*). Удалы і ўдачны. Прыдáчны хлеб у цябé. (*арф.*). Вéльмі прыдáчны чалавêк (моцны, вынослівы і практычны чалавек). Кл. прыдáчна гарэ́лка—моцная, чыстая і смачная гарэлка. Кл.

ПРЫДО'БА (*прыдóба*) *жан.* Багатыя прыродныя ўмовы. У Малі́наве вéльмі прыдóба: пáжа дóбра, я́гады пад бóкам, пóле дóбрае, а сенакôс? Кл.

ПРЫДУМЛЯ'ЦЬ (*прыдумля́ць*) *I спраж.* (*-яю, -яеш*). Жартаваць, вытвараць, штукарыць. Прыдумля́юць зь ягó. Кл. От штукáнт, як прыдýмае, прыдýмае! Кл.

ПРЫЗЬМО' (*прызьмó*) *ніяк.* Вяровачка, якою пры запраганні валоў прывязваюць аглоблі да ярма. Зьвіў п'я́цяро лéйцаў і пры́зьмаў. Кл.

ПРЫЛАБУ'НІЦЬ (*прылабýніць*) *II спраж.* (*-ю, -іш*), *пераходны.* Прытуліць, дапамагчы ў бядзе, у цяжкім становішчы. Дзякуй вам, бáбу прылабýнілі. Вайц.

ПРЫЛА'ЦІЦЬ (*прылáціць*) *II спраж.* (*-у, -іш*), *пераходны, зак. тр.* ад прылачваць. (гл.).

Се́ні прыла́цім. А па кулê й без нас е каму́ зье́зьдзіць. Вайц.

ПРЫЛА′ЧВАЦЬ (*прыла́чваць*) *I спраж.* (*-аю, -аеш*), *пераходны.* Прыбіваць латы (гл. лата [2]). Канча́йце прыла́чваць да па кулі́ е́дзьце. Вайц.

ПРЫМА′К (*прыма́к*). Параўн.: прыма́ка. Радашковіцкі і Заслаўскі раёны.

ПРЫМАНІ′ЦЬ (*прыманіць*) *II спраж.* (*-ю, -іш*). Гл. маніць. Тро́хі пра́ўды, а тро́хі прыманіў. Пас. Янкі Купалы.

ПРЫПА′ДНЫ (*прыпа́дны*). 1. Хворы на эпілепсію. Па́вел ніўда́лы буў і прыпа́дны зма́лку. Кл. 2. Халерык, істэрык. Кл.

ПРЫСУКРАВА′ЦЦА (*прысукрава́цца*) *I спраж.* (*-ую-ся, -уеш-ся*). Прыладзіцца, прысуседзіцца (да каго-небудзь, да чаго-небудзь) дзеля сваёй выгады, карысці. Кл.

ПРЫСТА′ВІЦЬ [1] (*прыста́віць*) *II спраж.* (*-ўл-ю, -ві-ш*), *пераходны.* Прыставіць. Прыста́ў драбі́ны. Барб.

ПРЫСТА′ВІЦЬ [2] Прыбудаваць. Прыста́ўлю се́нцы й кладо́вачку. Хал.

ПРЫ′ТНАМ (*пры́тнам* і *прытно́(ô)м*). Штодзень, часта. Прытно́м хадзіў тут. Кл. Пры́тнам захо́дзіць,—ідзе́ й ідзе́. Кл.

ПРЫТНО′М (*прытно(ô)м* і *пры́тнам*). Кл. Гл. пры́тнам.

ПРЫТЫ′КА (*прыты́ка*) *жан.* Тонкі шост пры рыбацкай снасці—падсацы (гл. падсака),

няроце (гл. нярóт). На чóрта такýю даўжэразну прытыку прыўязваць? Пас. Янкі Купалы. Прытыка ў патсáцэ зламáласа. Кл.

ПРЫ'ХВАТКАМ (*прыхваткам*). Рабіць што-небудзь прыхваткам—рабіць пакрысе, сяды-тады ў вольную часіну. Мая сець і згніé недарóбляна,—усé чáсу німá, усé прыхваткам, дак другí год пашóў, [е]к пачáў рабíць. Хал.

ПРЫЧЫНІЦЬ (*прычыніць*) *II спраж., пераходны*. Параўн.: рускае призакрыть (дзверы). Ні зачыняй зусім, толькі прычыні дзвéра. Кл. Я ж прычыніла юшку. Пас. Янкі Купалы.

ПРЫЮ'Т (*прыют*). Дзяржаўны дом для дзяцей-сірат і перастарэлых. Зуб., Кл.

ПСІК (*псік! а псік!*) Выклічнік. Што і кац. Барб., Кл.

ПУГАЎЕ' (*пугаўé*) *ніяк*. Ужываецца побач з пугóлцэ. Пугаўé караткавáтае. Кл.

ПУГО'ЛЕЧКА (*пугóлячко, пугóлячка*). Памяншальнае ад пуголца (гл.). Кл.

ПУГО'ЛЦА (*пугóлцэ* і *пугóльцэ*) *ніяк*. Пугаўё. Пугóлцэ вýразаў. Кл.

ПУДМАЎЛЯ'ЦЬ. Гл. падмаўляць.

ПУЗА'Ч (*пузач*) *мужч*. Пузачý тамý цяжко й сагнýцца. Сл. Параўн.: рускае пузан. Параўн.: начвач. Карэліцкі раён.

ПУЛ (*пул* і *пыл*) *мужч*. Пыл. Пýлу, што й сьвêту ні ўбáчыш. Кл.

ПУ'ПЛІК (*пýплік*) *мужч*. 1. Што-небудзь маленькае, падобнае да шарыка. І пýплік на

ша́пцэ. Кл. 2. Ацэначнае, калі гавораць пра недарослую, дробненькую бульбу, садавіну і нават пра жывых істот. Пу́плікаў тых наскрэ́бла (бульбы). Сл.

ПУ'РАЙ Гл. пы́рай.

ПУ'РНІК Гл. пы́рнік.

ПУСТАДО'МАК *(пустадо́мак) мужч.* 1. Пусты чалавек. Ні бу́дзе дабра́ зь йіх, пустадо́мкі не́йкіе. Кл. 2. Сем'янін, які не лічыцца з чэсцю сям'і, не аберагае ні чэсці, ні маёмасці сям'і. Таму пустадо́мку й хле́ба с ква́сам ні трэ́ба дава́ць. Кл.

ПУСТЭ'ЧА[1] *(пустэ́ча) жан.* Пустая, неўрадлівая глеба, бедны край (па прыродных умовах). У ва́с там балаты́ да пустэ́ча. Сым.

ПУСТЭ'ЧА[2] Пусты чалавек, пустадомак (гл.). Пустэ́ча ты, да й усе́! Кл.

ПУТЛЯ'Р Гл. пытляр.

ПУХО'ЎКА *(пухо́ўка* і *пухôўка) жан.* Гатунак яблык. Пухо́ўкі расту́ць вялі́кія і не по́зныя. *(арф.)* Кл.

ПУЦ *(пуц) мужч.* Цяслярская прылада, цяжкая сякера, якою ачэсваюць тоўстыя бярвенні. Шклюд ы пуц цяга́ў. Вольн.

ПУЧКІ'[1] *(пучкі́) толькі ў множн.* Падсядзёлак. Пучкі́ сусі́м парва́ные. Побач ужываецца сядзёлка (гл.).

ПУЧКІ'[2] Паплаўкі, зробленыя з бізунніку (гл. бізуннік) і прыстасаваныя для плавання

на іх. Пучкі зрабілі нам (малым хлапчукам), дак мы й яму п[е]раплывалі. Кл.

ПУ'ШКА[1] *(пушка) жан.* Каробка. Пушачка—каробачка, пенал. У мацяры парадак буў: у адной пушацца ніткі, ў другой гузікі, ў трэйц[е]й вôск, напарстак ці йшчэ там якое што. Кл.

ПУ'ШКА[2] Вайсковае. Гармата. А ў войну там пушка ўгрузла. Кл.

ПУШЫ'СТЫ[1] *(пушысты).* Пушысты. Лісіны хвôст пушысты вельмі. Кл.

ПУШЫ'СТЫ[2] Той, хто ў выпадку нездавальнення дзьмецца, «пушыцца» (гл. пушыцца). Ён у нас пушысты ат малку. Кл.

ПУ'ШЫЦЦА *(пушыцца) II спраж. (-у-ся, -ыш-ся).* Дзьмуцца на каго-небудзь. Чаго ты пушысса? Німа чаго тут пушыцца. Кл. Ні пушыся, бо напушуся. Пас. Янкі Купалы.

ПУ'ШЫЦЬ *(пушыць) I спраж. (-у, -ыш).* Чаго так жывôт пушыць? Вольн. Тут на травê буваюць павучкі, ззесь таварына (гл.), дак і пушыць.

ПЫ'РАЙ *(пурай* і *пырай).* Пырнік. Ужываецца і пырнік. Байл., Барб., Кл.

ПЫ'РНІК *(пурнік* і *пырнік).* Пырнік. Байл., Барб., Кл.

ПЫТЛЯ'Р *(путляр* і *пытляр) мужч.* Рабочы на млыне, які пытлюе пшаніцу. Тут путляр жыў. Кл.

ПЯРЭ'БІРАК (*пярэ́бірак* і *п[е]рэ́бірак*) *мужч.* Адзі́н п[е]рэ́бірак се́на аста́ўса, на ра́з каро́ве. Зуб. Параўн.: шчын. Сіняўская Слабада Карэліцкага раёна

ПЯРЭ'ДАЙКА. Гл. перадо́йка.

ПЯРЭ'ДНЯЯ [1] (*п[е]рэ́дня, пярэ́дня*). Пярэдняя. Ты й на се́не (на ўборцы сена) ні бу́дзеш п[е]рэ́дня. Хал.

ПЯРЭ'ДНЯЯ [2] Субстантаваны прыметнік. Гл. перадо́ўка.

ПЯРЭ'ЛЕТАК (*пярэ́летак*) *мужч.* Цяля, жарабя, якое пражыло лета, пералетавала. П'яць пярэ́леткаў прапа́ло. Кл. Параўн.: выпустак, трайцяк, чацвярта́к.

ПЯРЭ'РУБ (*пярэ́руб, п[е]рэ́руб*) *мужч.* Капітальная сцяна, якая падзяляе хату на дзве палавіны. Хата велі́ка й п[е]рэ́руб,—сь пярэ́рубам. Барб.

ПЯСЕ'ЛЬНІК (*пясе́льнік, п[е]се́льнік*) *мужч.* Спявак. Алёш ве́льмі пясе́льнік буў. Кл.

ПЯТРЭ'ЦЬ (*пятрэ́ць, п[е]трэ́ць*) *I спраж.* (*-эю, -эеш*), *неперахoдны.* Жыць надгаладзь, прычым працяглы час. Трэба думаць, ад назвы летняга посту—пятроўка. Даўнêй пятрэ́лі, а ц[е]пе́р са́мі ўсе прадаю́ць. Кл. Папап[е]трэ́лі за во́йну. Поб. Параўн.: Другія выпетрылі ў палку. Я. Колас.

ПЯЧКУ'Р (*пячку́р, п[е]чку́р*). Печкуро́ў налаві́ў цэ́лую даёнку (*арф.*). Кл. Параўн.: песькіж. Мсціслаў.

Р.

РАБА'К (*рабак*) *мужч.* Гліст, рабак. З рабакоў памёр. Кл.

РАБО'ЦЬКА (*рабоцько* і *рабоцька*). Здатны да працы і працавіты чалавек, Тая глухая рабоцько добры. Маладзіца хароша й рабоцько. Кл.

РАДАБО'ДДЗЕ (*радабодзьдзе, радабôдзьдзе*) *зборны, ніяк.* Грубая рэдкая тканіна. Такое радабодзьдзе, а дарагое. Байл. Вўткала нейкаго радабôдзьдзя, хіба мо мêх пашые. Кл.

РАДЗІ'НЫ (*радзіны*) *толькі ў множн.* Хрэсьбіны. На радзінах пагуляла. Поб. Паедам на радзіны. Сл.

РАЗБАРСА'ЦЬ (*разбарсаць*) *I спраж.* (*-аю, -аеш*), *пераходны.* Выцягнуць абору з чаго-небудзь. Кл.

РАЗБУ'ДРАЦЬ (*разбудраць*) *I спраж.* (*-аю, -аеш*), *непераходны.* Разбэсціцца, раздурэць. Разбудралі,—толькі што б êсьці й гуляць, да па вечарынках швендаць. Кл.

РАЗБУ'ДРЫЦЬ (*разбудрыць*) *II спраж.* (*-у, -ыш*), *пераходны.* Разбэсціць, раздурыць. Разбудрыла сына, дак на голаву лезе. Кл. Параўн.: разбудраць.

РАЗВЕ'ЗАЦЬ (*разьвезаць*) *I спраж.* Размазаць, расквэцаць. Ні памула, а толькі гразь разьвезала па хаце. Кл.

РАЗГА'Ч (*разкач*) *мужч.* Зношаны, спаха-

ны (гл. спаханы) венік. Разкача́ зада́м. Барб. Разкача́ прынёсла. Разка́ч—ето што спаха́ны ве́нік. Кл.

РАЗЛІ'ВА *(разьліва) жан.* Разводдзе, паводка, разліў. Разьліва була́ веліка. Хал. Була́ разьліва бальша́я. Сл. Параў.: разлі́ў.

РАЗЛІ'Ў *(разьліў) мужч.* Разьлі́ў пача́ўся. Вільча. Параўн.: разлі́ва.

РАЗЛУ'ЧНІК *(разлу́чнік) мужч.* 1. Мужчына, які «разлучыўся» (развёўся) з жонкаю, пакінуў жонку. Разлу́чніку вêры німа́. Барб.

РАЗЛУ'ЧНІЦА *(разлу́чніца). жан.* Жанчына, якая развялася з (мужам) гаспадаром. Барб., Кл. Параўн.: разлу́чнік.

РАЗРАЗНІ'ЦЬ *(разразьніць) II спраж. (-ю, -іш), пераходны.* Раздзяліць (што-небудзь) на часткі; прымусова разлучыць некалькі асоб у незвычайных абставінах. Разразьні́ ніткі. Кл. У плён ра́зам тра́пілі, да разразьнілі нас. Касар.

РАЗУМЕ'ТНЫ *(разуме́тны* і *разумêтны).* Здатны, здатны да навукі, які хутка і добра разумее. Што да́л[е]й бу́дзе, ні ўгада́ць, але відаць, што разуме́тны, бо́йка зада́чкі раша́е. Вайц.

РАЗУМЕ'Ц *(разуме́ц) мужч.* Чалавек, які стараецца паказаць свой розум, паказваць, што ён разумнейшы за другіх. Побач сустракаецца разу́мнік. Кл., Барб. Разуме́ц такі́. Сл. О́! ён разуме́ц ужэ! Кл.

РАЛЕ'ЙНЫ *(ралейны).* Ралейны вол—той, які, калі аруць, ідзе баразною, справа (калі

быць за запрэжанымі валамі, ззаду за імі). Параўн.: падру́чны. Ралéйнаго трэ́ба крапчэ́йшаго за падручнаго. Кл. Ралéйны каб разумнéйшы буў за падру́чнаго. Кл. Параўн.: ралéйны хамут. Крычаўскі раён.

РАМО'НАК (*рамóнак*). Расліна. Рамóнак і ў ча́й гадзíцца. Сл.

РА'НА [1] (*ра́но*). Рана. Шчэ ра́но, й сьцéжкі ні віда́ць. Пачака́ймо, хоць сьцéжка віда́ць бу́дзе. Сл. Му́сіць, ішчэ́ ра́но абганя́ць (бульбу). Барб.

РА'НА [2] (*ра́но*). Раніцою. Магу днём і ра́но. Вільча. Ра́но й вéчар па́ліць у пéчы. Ра́но й вéчар даю́ карóве сéна. Кл. У гэтым значэнні ўжываецца пара́ну, ра́нкам, ра́ніцаю. Кл.

РАСАМА'ТЫ (расама́ты). Непрычэсаны, з доўгімі валасамі, ад расамаха. Расама́таго тагó злавéце (хлапчука). Кл.

РАСАМА'ХА (*расама́ха*) *жан.* 1. Звер. Кл. (Гэты звер тут не водзіцца). 2. Фальклорны вобраз—страшыдла ў вобразе жанчыны, у якой распушчаныя валасы і стальныя грудзі, ёю страшаць малых дзяцей. Ні йдзі: там у канóпл[е]х расама́ха, дась стальнóе цы́цкі пасса́ць. Кл.

РАСПІСАВА'ЦЬ (*расьпісава́ць*) *I спраж.* (*-ую, -уеш*), *пераходны.* Зрабіць пісяг (гл.) на целе жывёліны. Ёты чóрны (бык) вéльма стра́шно расьпісава́ў маладзéнькаго, пісяг цераз увéсь бок. Кл.

РАСПІСА'ЦЦА[1] (*расьпісáцца*). Распісацца. Кл.

РАСПІСА'ЦЦА[2] Ануляваць шлюб. Гадóў тры жылі па сабé, ні разáм. А на в[е]сьнê сышлíса, пашлí й расьпісáліса. Ужэ, казáлі, ён ажаніўса з другóю. Кл.

РАСТАНЦЫ' (*растанцы́*) *толькі ў множн.* Ростані. На растанцóх пачакáй нас. Кл. Параўн.: назва рамана «На ростанях» Я. Коласа.

РАСЦУГЛЯ'ЦЬ (*расцугля́ць*) *I спраж.* (*-яю, -яеш*), *пераходны.* Раскілзаць, выняць з роту каня цуглі. (гл.) Ужываецца і раскілзáць. Ты ні вучы́ нас, а раскажы́ як каня забýў расцугля́ць да сýткі галадáў (конь),—гаспадáр такí. Зуб.

РАШЭ'ЦІНА (*рашэ́ціна*) *жан.* Частка азярода—высокае шула (іх бывае 2—4) з выдаўбанымі дзіркамі, у якія ўпускаюцца азярэдзіны—жэрдкі. У рашэціне выдаўбаны праз кожныя 40—55 см. дзіркі. Параўн.: рэшата. Пасьлéдня рашэ́ціна на дрóвы пашлá. Кл.

РУБЕ'ЛЬ[1] (*рубéль*) *мужч.* Рубель (грошай).

РУБЕ'ЛЬ[2] Жэрдка, якая выкарыстоўваецца для ўвязвання на возе сена, саломы, снапоў. Кл., Байл., Барб., Вайц., Нарабíў рублёў на ўсю брыгáду. Пас. Янкі Купалы.

РУБІ'НА (*рубíна*) *жан.* Кавалак тканіны, звычайна не новай. Пóсьле вайны́ й рубíны ні булó. Хал. Параўн.: старажытнарускае рубъ — кусок, отрывок ткани; у множн.—ветхая одеж-

да, рубище. С. П. Абнорскі і С. Г. Бархудараў, Хрестоматия по истории русского языка, ч. 1, 1952, стар. 386.

РУБІ'НКА. Памяншальнае ад рубіна (гл.). Кл.

РУДАЧКІ' *(рудачкі) толькі ў множн.* Прыхвачаная засухаю (у часе ці хутка пасля цвіцення) грэчка, на ёй мала зярнят або зярняты вельмі дробныя, плоскія; такую грэчку і называюць рудачкамі. Рудачкі тыé сабрáлі. Кл.

РУКА'ТЫ *(рукáты).* Нячысты на руку, схільны да дробнага крадзяжу. Вéльма рукáта бáба. Кл.

РУЧА'ЙКА *(ручáйка) жан.* Жменя лёну (валакна). Атрапáла двáццаць ручáяк лёну. Кл.

РУ'ЧЫ *(рýчы).* Здатны да працы (чалавек), можа выканаць любую працу ў гаспадарцы, рабоцька (гл. рабóцька). І разýмные, й рýчые, дай харóшые ўсê. Барб. Янú вéльмо рýчые. Кл.

РЫ'БІЧЫ *(рыбічы).* Прыналежны прыметнік ад рыба. На рыбічае вóко рыбу злавíў. Баян. Рыбічаю лускóю кáчкі накармíла. Кл.

РЫ'ЗА [1] *(рыза) жан.* Старая падраная вопратка. Нéйка рыза на плéчах. Барб. Рызу тýю скінь. Кл.

РЫ'ЗА [2] Вопратка служкі царквы, раса. Папóўска рыза. Кл.

РЫКА'ЦЬ *(рыкáць) I спраж. (-аю, -аеш), непераходны.* Малады бугáй хóраша рыкáе.

Хал. На малакó дóбра (карова), да ўсе рыкáе—й унóчы й удзéнь. Кл.

РЫ'ЛЬЦА *(рыльцэ і рыльцэ) ніяк.* Горлачка (гл. гóрлечка). Рыльцэ (бутэлькі) адбіла. Рыльцэ знайдзі, кілбáсы рабіцьмам. Кл.

РЫСАКО'М *(рысакóм).* Рыссю. На ём (на кані) рысакóм да Глýска за сóрак мінýт заéду. Барб.

РЭДЗЬ[1] *(рэдзь) жан. (рэ́дзі, рэ́дзьдзю).* 1. Складзі анýчу ў дзьвê рэ́дзі — складзі ў дзьве столкі. Кл. 2. У дзьвê рэ́дзі даражэ́йшы. Кл.

РЭДЗЬ[2] Рэдкае палатно ў трохсценнай сеці. На рэ́дзь трэ́ба тóўсты шпагáт. Кл.

РЭ'ЗКА[1] Прыслоўе. Рэзка. Усім так рэ́зко гавóрыць. Сл.

РЭ'ЗКА[2] *жан.* Зрэзаная сячкарняю салома, канюшына. Рэ́скі даю́ (карове). Вільча. Рэ́зка дóбра да йшчэ мукі ўсыплю. Кл. Гл. сечка[2].

РЭ'ЧАЧКА *(рэ́чачка).* Параўн.: Ой, рэчанька, рэчанька. З народнай песні.

С.

САВА' *(савá) жан.* 1. Птушка. Пас. Янкі Купалы. Кл. 2. Пераноснае. Лупáты (гл.) чалавек; чалавек з вялікімі, маларухомымі вачыма.

САГЛУМІ'ЦЬ. Гл. Глуміць. Кл.

САЛАПА'ЙКА *(салапáйка) жан.* 1. Нlanguageздатны жвава ўспрыймаць і рэагаваць, глядзіць і слухае разявіўшы рот. У таê салапáйкі папутáй.

Кл. Параўн.: Эх, Савось, шалапай, ты мяне не чапай. Я. Колас.

САЛО'МШЧЫК (*саломшчык*) *мужч.* Псаломшчык. Багато гадоў за саломшчыка буў. Кл.

СА'НЕЧКІ (*сάнячкі*). Саначкі. Пастаўлю пут павецьцю сάнячкі, вуйду й німа,—ўзяў, штоб жывôт узяў. Кл.

СА'НЬКІ (*сάнькі*). Санкі. Санькі жыцьмуць да тваê сьмерці. Кл.

САРАМЯ'ЖЫ (*сарам'яжы і сарамяжы*). Прыметнік. Такі сарам'яжы ў нас. Зуб.

САРВІ'ЦЕЛЬ *мужч.* Тое, што і слова ўрвіцель (слова ўрвіцель ужыта толькі ў некаторых беларускіх пісьменнікаў; яно адпавядае рускаму хапуга). Ой, нарвецца ватэты сарвіцель! Гл.

САХО'Р (*сахор і сахôр*) *мужч.* Вілы, якімі накідаюць на воз гной. Часцей вілкі. Кіпці, што сахарэ. Кл.

САЦВІ'ЦА (*сацьвіца*) *жан.* Сачавіца (сачыўка). Ужэ й ні сеюць сацьвіцы, й заваду німа. Кл.

СВЕ'РДЛІК (*сьвердлік*) *мужч.* Маленькі свердзел. Ты ні браў майго сьвердліка? Хочу граблі зрабіць. Пас. Янкі Купалы.

СВЕСЬ (*сьвесь і сьвêсь*) *жан.* Швагерка. Мая сьвесь прыходзіла. Параўн.: свесь—свояченица. Ф. І. Буслаеў. Историческая грамматика русского языка, ч. 1, М., 1875, стар. 30.

СВІНА'РНІЦА (*сьвінарніца*) *жан.* Свінар-

ка, даглядчыца свіней. Га́нна усê гады́ сьвіна́рніцаю. Кл.

СВІ'НКА[1] *(сьві́нка) жан.* Памяншальнае ад свіння. Кл.

СВІ'НКА[2] Грыб. Побач назвы таўсту́ха, кабу́лка (і кабылка). Сьві́нкі чы́стые, нічарві́вые. Кл.

СВІННУ'Х *(сьвіньню́х) мужч.* Хляўчук для свіней. А ў ха́це ў йіх як у сівіньнюху́. Кл.

СВІННУ'ШНІК *(сьвінну́шнік) мужч.* 1. Хлеў для свіней. Кл. Пераноснае. Брудная хата. Запусьці́лі, што сьвінну́шнік. Кл.

СВІЦЕ'ЦЦА *(сьвіцє́цца) ІІ спраж. (-іш-ся, -яц-ца).* Прасвечвацца. Ужэ́ страха́ сьвіці́цца. Кл. Дай пала́плю штаны́, бо сьвіця́цца. Байл.

СЕ'ДАЛА *(се́(ê)дало і се́(ê)дала) ніяк.* Месца, дзе начуюць куры. На сêдало пара́. Кл.

СЕ'МЕНЕ *(се́мяне) ніяк.* Ільняное семя. Прыве́зьлі мêх аўса́ і мêх се́мяня. Хал.

СЕ'МЕЧКІ *(се́мячкі).* Насенне (толькі) сланечніку. Се́мячкі прадава́лі. Кл.

СЕРАДО'ЛЬШЫ *(серадо́льшы).* Прыметнік. Сярэдні (сын, дачка, дзіця) у сям'і па ўзросту. Ёта серадо́льша (адна з трох дачок) худа́я, мала́я. Барб.

СЕ'РКА *(се́рка) жан.* Сера. Кл. Барб.

СЕ'ЧКА[1] *(се́чка і сêчка) жан.* Прылада,

якою сякуць бульбу, траву. Вазьмі сечку: сечка лепш за сакеру. Кл.

СЕ'ЧКА[2] Зрэзаная на корм салома, канюшына. Гл. рэзка[2]. Сечка й каню, й карове гадзіцца. Вольн.

СЁНІ *(сёні)*. Сёння. Кл., Сл., Хал., Зуб.

СІБІ'Р *(Сібер* і *Сібір)*. Ужываецца як назоўнік мужч. роду. За Сіберам. Кл. Сібір той багаты Кл.

СІВУ'ХА *(сівуха) жан.* Дзяўчына, якая вытварае, робіць, як дзіця. Пас. Янкі Купалы. Гл. бальшуха.

СІНІ'ЦА[1] *(сініца) жан.* Птушка сініца, сіньдзік (гл.). Сініца—хароша пціца. Вайц.

СІНІ'ЦА[2] Лучына. Сініцы надраў пучок. Кл. Параўн.: лучына.

СІ'НЬДЗІК *(сіньдзік)*. Сінічка, сіньдзік (гл.). Сіньдзікаў багата, а шчыгла ні бачыў. Пас. Янкі Купалы.

СІ'ТКА (сітка) *жан.* Птушка сітаўка, пліска. Сітка ўсе па дарогах любіць. Кл. Ногі тонкія, якраз як у сіткі *(арф.)*. Пас. Янкі Купалы.

СКАВАРО'ДНІК *(скаваро́днік і скаварôднік)*. Печыва з хлебнага цеста (на скаварадзе, перад полымем). Сам скаварондікаў нап'ёк. Кл.

СКАПЕ'Ц Што і капец (у двух значэннях). Гл. капец. Там скапец і за гумном тры. Кл. На мяжы ўкапалі стоўб і скапец насыпалі. Кл.

Параўн.: скопе́ц—кастрат. С. І. Ожагаў, «Словарь русского языка».

СКАПІ'ЦЬ (*скапіць*) *II спраж.* (*-пл-ю, -п-іш*), *пераходны*. Скласці (сена) у копы. Мы скапілі канюшы́ну ране́й за ва́с. Хал. Скапі́лі ўсю Балаці́ну (назва ўчастка сенажаці). Кл. Параўн.: рускае скопить.

СКАРАДЗІ'ЦЬ (*скарадзіць*) *II спраж., пераходны*. Баранаваць. Скарадзі́ць у на́с малава́то называ́лі. Кл.

СКНА'РЫЦА (*скна́рыца*) *жан*. Скупая жанчына. Хіба́ вы́прасіш у таê скна́рыцы. Вільча.

СКО'ПЧЫК (*ско́пчык* і *скôпчык*). Памяншальнае ад скапец (гл. скапец). У абодвух значэннях. Е́таго скôпчыка бу́дзе (хопіць) на насе́ньне, шчэ й на про́даж застане́цца. Кл.

СКРОЗЬ[1] Прыслоўе. Заўсёды. Ён скро́зь буў такі́. Кл.

СКРОЗЬ[2] Прыслоўе. Усюды. Скрозь аж да Бо́лбатаў (урочышча) ско́шано, згрэ́бляно, у стагі́ скі́дано. Кл.

СКУПЫ'[1] (*скупы́*). Скупы. Скупы́ два разы траціць (*арф.*). Н.-Андр., Кл., Хал. Скуп ні глуп. Кл.

СКУПЫ'[2] Недастатковы, невыстарчальны, з маленькаю нястачаю. Скупы́ хунт. Байл. Скупы́е п'яць ху́нтаў. Кл. Параўн.: во́бмаль.

СЛА'БКА (*сла́бко* і *сла́бка*). Не туга, свабодна; так, што дрэнна трымае, трымаецца.

Сла́бко ўсці́снуў снапы́ (на возе). Н.-Андр. Сла́бко абу́ўса, трэ́ба йшчэ ану́чу адну́, ато мазалі́ натру́. Кл.

СЛА'БКІ (*сла́бкі*). Слова гэта сустракаў не толькі на поўдні Беларусі, а і на паўночным усходзе — у Мсціславе. Слабкі — які дрэнна трымае, трымаецца, слабкі — не тугі, свабодны. Шука́й друго́е ба́нькі (гл.), бо е́тые абе́дзьве сла́бкіе. Кл. Пацьці́сьні папру́жку (гл.), сы́нку, а то сла́бка, шчэ загу́біш бе́гаючы. Пас. Янкі Купалы. Адну́ зі́му панасі́ла й сла́бкі(е) ста́лі (гумовыя подвязкі). Хал.

СМАЖО'НІКІ (*смажо́нікі*). Смажаная бульба. Люблю́ смажо́нікі. Вольн. Смажо́нікамі частава́цьму. Кл.

СМЕ'ТНІК (*сьме́тнік* і *сьмêтнік*) *мужч.* Месца ў дварэ, дзе высыпаецца смецце. На сьме́тнік ву́кінь. Кл. Параўн.: Куча сметніку ляжыць. Я. Колас.

СМЯТА'ННІК (*сьмята́ньнік, сьм[е]та́ньнік*). Неадабральнае. Лізун; слабы на здароўе пястун. С такі́м сьмята́ньнікам бо́рацца німа́ чаго́. Пас. Янкі Купалы. У камсамо́льцы такі́х сьмята́ньнікаў ні на́да. Кл.

СНЯГУ'РКА (*сьнягу́рка, сьн[е]гу́рка*). Сінічка, сіньдзік (гл.). Сьнягу́рка—е́та пта́шачка, быва́ла на́ша ба́ба па сьнягу́рц[э] пазнава́ла, калі́ сьне́гу чака́ць. Кл.

СО'НЕЧКА (*со́нячко, со́нячка*). Сонейка. З суфіксам *-ейк*—рэдка, часцей з *-ечк*. Со́нячка схава́лася. Вайц. Со́нячко брыдзе́. Кл.

СО'ЎГАЦЦА (*со́ўгацца*) *I спраж.* Хадзіць павольна, ледзь перастаўляючы ногі, як без мэты, працаваць без прыкметных вынікаў у працы. Хіба́ то рабо́та? Со́ўгаюцца сюд-туд. Байл.

СПАВЯСЦІ'ЦЬ (*спавесьці́ць*) *II спраж.* Паведаміць. Спавесьці́лі зімо́ю. Хал.

СПАКЛАДА'ЦЬ (*спакладáць*) *I спраж.* (*-аю, -аеш*), *пераходны.* Скастрыраваць. Гл. звалашаць, злягчаць. Спакладáць трэ́ба (парасяты). Кл.

СПАЛЯВА'ЦЬ (*спалявáць* і *спал[е]вáць*) *I спраж.* (*-юю, -юеш*), *пераходны.* Забіць каго-небудзь на паляванні. Му́сіць нічо́га ні спалява́лі. Кл.

СПАМЫЛІ'ЦЦА (*спамулі́цца і спамылі́цца*) *II спраж.* Памыліцца. Ужываецца і памыліцца. Спамулі́ласа да ні ў тóе б'ёрдо накідáць стáла. Кл.

СПАМЫЛЯ'ЦЦА (*спамулáцца і спамылáцца*) *I спраж.* (*-яю-ся, -еш-ся*). Памыляцца. Кл. Параўн.: мыля́юся, мыля́ешся, мыля́юцца. Путнікі, Шалухі, Поравічы Радашковіцкага раёна.

СПАРАЖНІ'ЦЬ (*спаражні́ць*) *II спраж.* (*-ю, -іш*), *пераходны.* Спаражні́ кашэ́. Кл.

СПАРЫЖАВА'ЛА (*спарыжавáло* і *спарыжавáла*). Безасабовы дзеяслоў. Разбіў паляруш. Яго́ спарыжавáло. Кл.

СПА'СНЫ (*спáсны*). Ужываецца з назвамі жывёл, а таксама з назваю асобы чалавека, у

значэнні неперабарлівы на яду (чалавек, конь), вынослівы, расходуе мала энергіі пры выкананні працы. Вот спа́сны е́ты чалавек, ро́біць штодзе́нь, і красе́й такі́ (гл. красей). Кл. Рабе́нькі вôл ве́льмі спа́сны: ра́но грызану́ў разо́ў п'яць і ні прыстае́. Байл.

СПАСО'Б'Е *(спасо́б'е) ніяк.* Пенсія. Ужываецца ў мове малапісьменных і непісьменных, побач — пенсія (пэ́ньсяя, пе́ньсяя). Спасо́б'е пераста́лі дава́ць. Сл. Бага́то спасо́б'я палуча́ла. Кл.

СПА'СЦІЦЬ *(спа́сьціць) II спраж. (-у, -іш).* Стравіць, з'есці, спасвіць (жывёлаю) збажыну ці сенажаць. А по́мніш [е]к спа́сьцілі ата́ву, да ён бучкі́ (бычкоў) заня́ў у хлёў? Кл.

СПАХА'НЫ *(спаха́ны)* Дзеепрыметнік. Зношаны (пра яку-небудзь прыладу, напрыклад, венік). Разка́ч—дак ето, што спаха́ны ве́нік. Кл.

СПАХА'ЦЦА *(спаха́цца) I спраж. (-аю-ся, -аеш-ся).* Знасіцца (ад ужывання) веніку, цэпу. Сустракаецца ў мове старых. Спаха́ласо мае́ весло́. Хал.

СПІРА'ЦЦА *(сьпіра́цца) I спраж. (-аю-ся, -аеш-ся).* Не згаджацца і аспрэчваць (чужую думку). Ні бу́ду сьпіра́цца, мо й так, як ты ска́заў. Барб.

СПІЧА'К *(сьпіча́к) мужч.* Прылада (завостраная палачка або костка), якою карыстаюцца, калі шыюць каробкі з лубу. Сьпіча́к злама́ў. Сл. У в. Клетнае—падплетка (гл.).

СПЛАДЗІ́ЦЬ (*спладзіць*) *II спраж.* (*-у, -іш*), *пераходны.* Ужываецца побач з «пусціць на свет» (дзіця). Барб., Кл.

СПО́ДАК (*спо́дак*) *мужч.* Спо́дачкаў прыве́зьлі. Сл.

СПО́РНЫ (*спо́рны*) *мужч.* То́ўстые (дровы), дак спо́рные. Кл. Бало́тнае се́но ні спо́рнае, канюшы́на ці с по́плава (сена) спарне́йшае. Сл. Параўн.: чэшскае sporý—беражлівы, spořiti—берагчы, эканоміць.

СПРА́ВІЦЬ[1] (*спра́віць*) *II спраж.* (*-ўлю, -віш*), *пераходны.* Набыць (рэчы). Спра́віў валё́нкі сабе̂. Кл.

СПРА́ВІЦЬ[2] Спагнаць (пазы́чанае, доўг), ужываецца побач са спагнаць (апошняе часцей). Мо п'яць гады́ пазы́чыла (грошы) й ні магу́ спра́віць. Кл.

СПРА́ВІЦЬ[3] Направіць, выправіць. Кл.

СПРАДА́ЦЬ (*спрада́ць* і *спро́даць*) *спрада́м, спрадасі́, пераходны.* Распрадаць, прадаць. Усе спрада́ў і ў го́рад сам. Барб.

СПРА́ЎДЗІЦЦА (*спраўдзіцца*). Збыцца (надзеі, прагнозу, меркаванню). Гл. пра́ўдзіцца. Калі спра́ўдзіцца, то ты маладзе́ц. Кл.

СПРА́ЎНЫ[1] (*спра́ўны*). Прыгодны, не сапсаваны, не патрабуе рамонту (аб якой-небудзь прыладзе, рэчы). Спра́ўных калё́с тро́е. Байл. Спра́ўна адна́ малатарня́. Кл.

СПРА́ЎНЫ[2] Паваротлівы, здатны да працы, спрытны (ужываецца побач). І да работы, й да наву́кі спра́ўные хло́пцы. Сл.

СПРО́ДАЦЬ (*спрадáць* і *спрóдаць*). Гл. спрадáць.

СПУСК [1] (*спуск*) *мужч.* У фразеалагічнай адзінцы не дай спýску (*арф.*). Кл.

СПУСК [2] Фуганак. У вáс ні пазы́чу я спýска? Пас. Янкі Купалы. На ўсé с[е]лó два спýскі. Кл.

СПЯЛІ́ЦЬ (*арф.*) *II спраж.* (*-ю, -іш*), *пераходны.* 1. Чакаць даспявання (збажыны, садавіны), не спяшацца з уборкаю. Сп[е]лілі, пакýль крышы́цца стáў (ячмень). Хал. 2. Я спялю́ памідóры ў сéне (*арф.*). Кл.

СТАЕ́ННІК (*стаéньнік*) *мужч.* Сыты выязны конь, якога не пасуць, а трымаюць на стайні, добра даглядаюць. У йіх стаéньнік буў, бо кармі́ць булó чым. Кл. Параўн. (такое ж значэнне): Гняды хвост угору задраў, нібы стаеннік які. А. Чарнышэвіч, Світанне, 1957, стар. 350.

СТА́ЙЛА (*стáйло* і *стáйла*) *ніяк.* Прыстасаванне на тоўстым дрэве для ўстаноўкі вулеякалоды. Усê стайлá аблáзіў. Зуб. Там стáйло стаяло. Кл. На стáйло лáзіў. Хал.

СТА́ЙНЯ (*стáйня*) *жан.* Вялікі хлеў для коней, канюшня. Стáйня й абóра пáнска там стая́лі. Кл.

СТАЛАВЕ́Р (*сталавéр* і *сталавêр*) *мужч.* Старавéр (з дысіміляцыяй). Сталавéр гóнду рабіў тут. Вайц.

СТАЛО́ЎКА (*сталóўка* і *сталôўка*). Гáля ў сталóўцэ булá. Кл. У сталôўку хóдзіць. Хал. За

сталоўку пасадзілі (за растрату грошай на працы ў буфеце сталоўкі). Байл.

СТАЛЬМА'ШНЯ (*стальмáшня*) *жан.* Майстэрня, дзе рамантуюць ці робяць колы, вазы, сані. У стальмáшню завéзьлі дóшкі. Пас. Янкі Купалы. Ламáшка ў стальмáшню пашóў. Пас. Чырвоны.

СТАЛЬНІ'ЦА [1] (*стальнíца*) *жан.* Верх стала. На стальніцы кабанá (забітага) унóсілі. Байл.

СТАЛЬНІ'ЦА [2] Дошка з столі. Вазьмí éту (дошку), стальнíца дóбра, ўдзéржыць. Кл.

СТАЛЮ'ГА (*сталю́га*) *жан.* Бандарскі станок, на якім апрацоўваюць стругам абручы, клёпкі. У в. Вільча сталю́га—тое, што казлы (гл.). Сталю́га раскíдаласа. Кл.

СТАНАВІ'ЦЬ [1] (*станавíць*) *ІІ спраж.* (*-ўл-ю, -ов-іш*), *пераходны.* Ставіць. Наштó ты станавíў пілý так? Кл. Побач ужываецца і стáвіць.

СТАНАВІ'ЦЬ [2] Будаваць. Паслáлі грóшай пáсынку хáту станавíць. Кл. Побач—стáвіць. Хвéдар хáту стáвіць нóву. Кл.

СТА'НІК (*стáнік*) *мужч.* Бюстгальтар. Стáнік самá пашы́ла. Кл.

СТАРО'ЖНЯ (*старóжня* і *старôжня*) *жан.* Рыбацкая прылада—вудачка, наматаная на рагульку (вілачку). Параўн.: рускае жерлица. Усе аднó—пастаўня́ ці старóжня. Кл. Постаражня. Карэліцкі раён.

СТАРЫ'ЗНА *(старызна)*. Назоўнік. 1. Старое, непрыгоднае (пра якую-небудзь рэч). Купіў нейку старызну. Пас. Янкі Купалы. 2. Пра старога чалавека. Такая старызна, а йшчэ гуляць. Кл. Параўн.: рускае старина.

СТАЎБУ'Н *(стаўбун)*. Ялец (рыба). Боўтам як боўтнуў разоў тры, дак аж бёло стаўбуноў у сёці. Пас. Янкі Купалы.

СТО'ЙКА *(стойка) жан.* Прыстасаванне, дзе ставяць дзіця. Нашае стойкі й дома німа. Аддала сама ні вёдаю каму. Кл. Параўн.: стоелка і стойка. Ражанка Гродзенскай вобласці.

СТОЛЬ[1] *(столь* і *стôль) жан.* Столь. У сьвінарніку такая столь, як у хаце. Кл.

СТОЛЬ[2] З прыназоўнікам *у* (у столь) ужываецца ў спалучэнні з дзеясловамі ісці (пайсці), гнаць (пагнаць). Пашлі (пагнала) буракі ў столь, пашла морква ў столь—буракі, морква далі сцяблы. Кл.

СТО'ПКА *(стопка) жан.* У хаце горш холадна, як у стопцэ. Кл.

СТОРЧ *(сторч)*. У значэнні галавою ўніз пры дзеясловах упасці, зваліцца, паляцець і падобн. Таксама старчака. Дурэлі на мосьце. А тагды той большы сторч галавою з мосту й бубухнуў просто ў рэку. Кл. Параўн.: 1. Стоць. Радашковічы. 2. Стоцьма. Пярэжыры Радашковіцкага раёна.

СТРАЕ'ННЕ *(страеньне) зборны, ніяк. роду.* У значэнні будынкі (калгаса, вёскі, гаспа-

дара), а таксама ў значэнні адзін будынак, будыніна, пастройка (гл. пастройка). Усé страéньне згарэ́ло. Кл.

СТРЫГМА'Ч (*стрыгмáч*) *мужч.* Насмешліва-зневажальнае ў сэнсе павыстрыганы, абстрыжаны як авечка. Кл.

СТРЫ'ЖАНЬ [1] (*стры́жань*). 1. Стрыжань, шпень. Кл. 2. Асяродак у хвоі. Вéльмі стрыжнё́ву хвóю знашлí, — адзíн стры́жань. Вайц. Я ўмéю стры́жань з хвайíны вы́круціць і стрэ́льбачку зрабíць. Байл.

СТРЫ'ЖАНЬ [2] (*стры́жань*). Бруд, гной цыліндрычнай формы ў нарыве, скулянцы. Стры́жань мо с пáляц вы́давіўся. Вольн.

СТРЫХАВА'ЦЬ [1] (*стрыхавáць*) *I спраж. (-ую, -уеш), пераходны.* Страхаваць. Хадзíлі стрыхавáць багáцьце (гутарка пра добраахвотнае страхаванне). Кл.

СТРЫХАВА'ЦЬ [2] Раўняць спецыяльнаю прыладаю, якая называецца стрыхоўка (гл. стрыхоўка), разасланую кулявую салому, якою накрываюць будынак. Стрыхавáць німá чым. Кл.

СТРЫХО'ЎКА [1] (*стрыхóўка*). Страхоўка. Стрыхóўку заплацíла. Барб.

СТРЫХО'ЎКА [2] (*стрыхóўка* і *стрыхôўка*). Прылада, пры дапамозе якой крыюць кулявою саломаю будынкі, стрыхуюць (гл. стрыхаваць[2]). Нéйдзе былá свая́ стрыхóўка. Кл.

СТРЫ́ЧКА (*стры́чка*) *жан.* Пстрычка. Стры́чку за то́е, што прагуля́ў. Кл.

СТУПА́К (*ступа́к*) *мужч.* Ступня. Баліць нага́ ў ступаку́. Кл.

СТЭ́ЛЬМАХ (*стэ́льмах*) *мужч.* Той, хто робіць, рамантуе воз, сані і іншыя прылады. Ла́машко ўсе (увесь час) за стэ́льмаха быў, у стальма́шні рабіў хоць што. Пас. Чырвоны.

СУ́ДАЧКІ (*су́дачкі*) *толькі ў множн.* Вузкі праход паміж двума будынкамі або дварамі. У су́дачках тхара́ злавіў у па́стку. Кл.

СУКА́ЛА (*сука́ло,* часам *сука́йло, сука́ла*) *ніяк.* Прылада, пры дапамозе якой навіваюць, сучуць (гл. сукаць) нітку на цэ́ўку. Без сука́ла ця́жко насу́кваць цэ́ўку. Кл.

СУКА́ЦЬ (*сука́ць*) *I спраж.* (*-у, -аш*), *пераходны.* 1. Навіваць нітку на цэўку пры дапамозе сукала (гл.). Кл., Барб. 2. Звіваць дзве, тры ніткі ў адну. Кл., Барб. 3. Хутка і добра, роўнымі баразнамі араць. Вы йшчэ́ спа́лі, а ён уссука́ў го́ні. Кл.

СУКРА́К [1] (*сукра́к*). Вельмі смольны кавалак хваёвага карча, валокны якога сплецены, звіты. Вайц., Байл., Кл.

СУКРА́К [2] (*сукра́к*) *мужч.* Ткацкае. Скручаная пятля, вузел на сукне, на палатне. Е́така тка́льля, вы́ткала сукно́, дак усе́ ў сукрако́х. Кл. Гл. су́крутка.

СУМАРО́К (*сумаро́к*) *мужч., толькі ў адз.* Памяшанне, вар'яцтва. Як пабілі немцаў, дык

прышлі і жалуюцца, што партызаны нядобра робяць, б'юць з-за кустоў, а не ідуць на фронт ваяваць, дык я і кажу: Ага, паночак, праўда, а чаго ж ты ішоў сюды, што б на цябе сумарок найшоў! *(арф.)*. Барб.

СУ'НАЗКІ *(сýназкі) мужч.* Ткацкае. Дзве планкі, як часткі набілак (гл. набілкі, набіліцы), з шпарáмі, у якія ўстаўляецца бёрда (гл.). Кл.

СХВАТА'ЦЬ *(схватáць) -аю, -аеш.* Хутка, спешна змайстраваць (што-небудзь). Пóкуль бáцько кóпу жы́та змалатáў, дык я лáпця схватáў. Кл.

СХУДНЯ'ЦЬ *(схудня́ць) I спраж. (-яю, -яеш), непераходны.* Пахудзець, схудзець. Мá-ло давáла (кармоў), дак (карова) схудня́ла. Байл.

СХУДЗІ'ЦЬ *(схудзíць) II спраж. (-дж-у, -дз-іш), пераходны.* Зрабіць худою (жывёліну) дрэнным доглядам. Я ў пілíпаўку карóву схудзíла. Кл.

СЦАНАВА'ЦЬ *(сцанавáць) I спраж. (-ую, -уеш), пераходны.* Устанавіць цану, за якую прададуць. Кл.

СЦЕ'ЖАР *(сьцéжар) мужч.* Жэрдка, вакол якой звіваюць стог. Пас. Янкі Купалы, Барб., Байл.

СЦЕНАВЫ' *(сьценавý, сьценавы́).* Сустрэты ў спалучэнні з назоўнікам пояс. Сьценавý пó[е]с—шырокі пояс, вытканы пры сцяне. Кл.

СЦІ'РТА *(сьцíрта) жан.* Укладка дроў, звы-

чайна паўз сцяну. Ту́ю сьці́рту ні чапа́й, хай на зі́му бу́дуць дро́вы. Кл.

СЦЯНУ'ЦЦА (*сьцяну́цца, сьц[е]ну́цца) І спраж. (-у-ся, -еш-ся)*. Так кало́ла ў бок, што й сьцяну́цца не магла́. Барб. Не магла сцянуцца—не магла паварухнуцца, крануцца. Так, ста́ло, што й сьц[е]ну́цца ні мо́жно. Кл.

СЦЯНУ'ЦЬ (*сьцяну́ць, сьц[е]ну́ць) І спраж. (-у, -еш)*. 1. Страсануць, скалатнуць (садовае дрэва, каб зваліліся плады; чалавека). Сьцяні́ сьлі́ву. Кл. Ён сьцяне́ цябе́, што й зубы заля́скаюць. Байл. 2. Безасабовы дзеяслоў. Прасты́ла, дак то го́рачэ, то сьцяне́, сьцяне́. Кл.

СЦЯПА' (*сьцяпа́) жан.* Стэп. Сьцяпа́ сьцяпо́ю. Вольн.

СЫБО'ТА (*сыбо́та)*. Субота. Кл., Гл., Сл., Хал., Байл., Барб., Н.-Андр., Вайц.

СЫНО'ЖАЦЬ (*сыно́жаць) жан.* 1. Сенажаць. 2. Палоска, дзялянка сенажаці (у дакалгасныя часы), у гэтым выпадку абавязкова з словам (прыметнікам, прыналежным займеннікам), якое вызначае прыналежнасць сенажаці. Мітрахва́нава сыно́жаць, там на́ша була́ сыно́жаць. Кл.

СЫРО'ВАДКА (*сыро́вадка)*. Сыроватка. Кл.

СЫРЫ'ЦА (*сыры́ца) жан.* Ужываецца таксама як зборны. Вымачаная, перамятая скура, якая ідзе на збрую, прывязкі. Параўн.: сырамец у Заслаўскім і Радашковіцкім раёнах, у рускай

мове сыромять. Параўн.: рускае сырица—сырая, неапрацаваная скура.

СЫРЫ'ЧНЫ (*сыры́чны*). Прыметнік ад сырыца (гл.). Сыры́чны гуж мо два́ццаць вераўча́ных ва́рты. Хал. Уся́ збру́я сыры́чна. Байл.

СЯДА'К (*сяда́к, с[е]да́к*) *мужч.* Пасажыр. Балаго́лы ўсе вазілі з Бабру́ску (у Глуск) й седако́ў бра́лі. Гл. Зарабіў, як на вало́х седако́ў во́зячы (*арф.*). Кл. Параўн.: Машы́на йдзе́ ў Хо́дасы, но й бісь цябе́ сідако́ў хвата́йіць. Мсціслаў.

СЯДЗЁ'ЛКА (*арф.*) *жан.* Падсядзёлак. Сядзёлка перакруцілася і стала дагары. (*арф.*). Кл. Побач ужываецца пучкі́ (гл.).

СЯСТРУ'ЛЯ (*сестру́ля, с[е]стру́ля*) *жан.* Сястра, з адценнем непашаны. Твая́ сестру́ля ўсе сто́гне да бе́дніцца. Барб.

СЯСТРУ'НКА (*сястру́нка, с[е]стру́нка*) *жан.* Дваюрадная сястра. Сястру́нка хадзіла. Зуб. Параўн.: браце́нік.

Т.

ТАБУРЭ'ТКА (*табурэ́тка*) *жан.* Табурэт. На табурэ́тку ста́ла. Пас. Янкі Купалы. Та́я табурэ́тка жыве́ мо два́ццаць гадо́ў. Кл.

ТАВА'Р [1] (*тава́р*) *зборны, мужч.* Буйная рагатая жывёла. Тава́р пасу́. Сл. Тава́р даўно́ пагна́лі. Кл.

ТАВА'Р [2] 1. Тавар. Кл. 2. Камплект матэрыялу на абутак (боты, бацінкі, туфлі). Кл.

ТАВА́РАЧЫ (*та̀ва́рачы*). Прыналежны прыметнік. Тавара̀чы сьлêд — след жывёліны (тава́рыны). Гл. тава́рына. Кл. Параўн.: тава́рачы бабоўнік. Чарацянка Жыткавіцкага раёна.

ТАВА́РЫНА (*тава́рына*) *жан.* 1. Буйная рагатая жывёліна. Кл., Поб., Хал., Зуб. 2. Зневажальнае пра чалавека. Тако́е тава́рыны ні ба́чыў. Гл. Параўн.: рускае скотина.

ТА́ЛАВАЦЬ (*та́лаваць* і *та́луваць*) *I спраж.* (*-ую, -уеш*), *пераходны.* Здзекавацца, мучыць, цягаць. Кіньце та́лаваць катка́. Хал. Зата́лавалі катка́. Кл. Бе́дну папата́лавалі паліца́йі. Байл.

ТА́МАКА (*та́мака*). Там. Поб., Сым., Хал., Н.-Андр., Вольн., Вільча, Вайц.

ТАРА́Н (*тара́н*) *мужч.* 1. Рыба. Тарана́ купіла, дак ве́льма вада́ п'е́шча. Кл. 2. Пераноснае. Таран—сухі, худы, бяскроўны (чалавек, жывёліна). Тараны́, а ні ко́ні. От у на́с стае́ньнікі. Вайц.

ТАСАВА́ЦЬ [1] (*тасава́ць*) *I спраж.* (*-ую, -уеш*). Мяшаць карты перад раздачаю удзельнікам гульні. Хал., Зуб., Кл.

ТАСАВА́ЦЬ [2] Штурхаць, штыляць. І тасу́е, й тасу́е, по́куль той ні запла́каў. Кл.

ТАЎСМА́ТЫ (*таўсма́ты*). Ужываецца пры назвах асобы, жывёлы, дрэва; таўсматы—прысадзісты, моцны. Я кажу́: ні таго́ вусо́каго, а е́таго таўсма́таго (кабана) купе́м. Барб. Такі́ таўсма́ты. Байл.

ТО́ЛЕЧКІ [1] (*то́лячкі*). Толькі што, вось-вось (было што-небудзь). То́лячкі быў. Вайц.

ТО'ЛЕЧКІ [2] Памяншальнае ад столькі (побач з сто́лечкі). Мо й то́лячкі (паказваючы на малую меру) ні бу́дзе про́са. Кл.

ТО'ЛМАЧ (*то́лмач*) *мужч.* Перакладчык (ужываецца побач з перагаворшчык). У на́с ка́жуць — хто то́лмач, а хто перагаво́ршчык. Зуб.

ТОП (*топ*). Выклічнікава-дзеяслоўная форма. Што лётам нôжкаю топ, то́е зімо́ю б ру́чкаю хоп. Кл.

ТО'ПЕНЬ (*то́п*[*е*]*нь*) *мужч.* Рыбацкая прылада, сплеценая з лазы. Тут патса́ка ні гадзіцца, каб то́п[е]нь, то ўюна́ б узя́ў. Кл.

ТО'ЎСТАЯ [1] (*то́ўста*). Тоўстая. То́ўста калода. Вольн.

ТО'ЎСТАЯ [2] Цяжарная (аб жанчыне), у гэтым жа значэнні цяжкая (гл. цяжкая). Ле́тась радзіла да йзно́ў то́ўста. Барб. Була́ то́ўста Ка́рпам. Кл.

ТРАЙЦЯ'К (*трайця́к* і *трацяк*) *мужч.* Цяля, жарабя на трэцім годзе. Кл., Байл., пас. Чырвоны.

ТРАЛЯВА'ЦЬ (*тралява́ць, трал*[*е*]*ва́ць*) *I спраж.* (*-юю, -юеш*). Вывозіць з балота (штонебудзь) малымі часткамі. У сыбо́ту тры падво́ды тралява́ла. Вільча. Шчэ бало́та сла́ба ўме́рзла, трал[е]ва́лі на сабе́, мо па капе́ кла́лі, бôльш бая́ліся. Кл.

ТРАННЕ' (*транньне́*) *нiяк. роду* ад церці (лён, каноплі). Якóе там транньне́? Кл.

ТРАЎЛІ'ВЫ (*траўлівы* і *траўліву*). Ужываецца з назоўнікамі, якія абазначаюць збажыну (ячмень, авёс, пшаніца і інш.), з назоўнікам салома. Траўліва салóма (Кл.) — салома з травою (з пустазеллем). Ячмéнь крэ́пка траўлівы. Сым. Акалóт вéльма траўлівы. Хал.

ТРАЦІ'НА (*траціна*) *жан.* Трэцяя частка надзела (надзел у в. Клетнае—12 дзесяцін). На траціне хлéба ніхватáло. Кл.

ТРАЦЯ'К Гл. трайцяк.

ТРАШЫ'ЦЬ (*трашыць*) *II спраж.* (*-у, -ыш*). Патрашыць рыбу. Ты трашы рыбу, а то прасьмéрдне. Пас. Янкі Купалы.

ТРО'НКА (*трóнка*) *жан.* Тронкі. Трóнку адну пярабіў. Кл.

ТРО'ІЦЬ (*трóйіць*) *II спраж.* (*-ою, -оіш*). Тройчы араць поле: увосень, у раннюю вясну і перад сяўбою. Кл.

ТРУ'ХАМ (*трýхам*). Гл. трушкóм.

ТРУ'ШАНКА (*трýшанка*) *жан.* Сена, змешанае з саломаю, корм для жывёлы. Трýшанкі далá, пасьля дам пáранкі. Кл. Параўн.: Тарасавы сыны... уходжваліся на двары: загатоўвалі каровам трасянку... Я. Колас, Збор твораў, т. 3, стар. 52.

ТРУШКО'М (*трушкóм*). Ужываецца з дзеясловамі бегчы, ехаць у значэнні павольнаю рыссю, без напружання. Бéгу ў éтаго каня німá, шаг ніспóрны. Але паганяць ні трэба: як выладзіцца, то п'яць ўёрст бýдзе трушкóм і трушкóм. Кл.

ТРЫРО'ГІЯ (*трырóгіе*). Ужываецца з назоўнікам вілкі. Трырóгіе вíлкі на тры́ рагí. Сл. Тут трырóгіе трэ́ба. Кл.

ТРЫСЦІ'ЦЬ (*трысьціць*) *II спраж.* (*-у, -іш*). Зводзіць разам дзве ці больш нітак. Ніткі трысьціла. Вайц.

ТРЭ'ЙКІ (*трэ́йкі*). Тройчы. Ужываецца побач з тройчы. Мо трэ́йкі ў Глу́ску булá. Сл. Трэ́йкі хадзіла. Кл.

У.

УАДНАВО'Р (*уаднавóр* і *ўаднавôр*). Гл. аднавор. Картóплі ўаднавôр парасту́ць, тóлькі даглéдзь. Кл.

УВАЗНА'ЦЬ (*увазнáць*) *I спраж.* (*-аю, -аеш*), *пераходны*. Пазнаць (побач з пазнаць). Вы́ б мянé ні ўвазнáлі. Кл.

УВЕРАДЗІ'ЦЦА (*арф.*). Стаміцца аж да захворвання. Часцей сустракаецца як папрок, калі сцвярджаюць, што хто-небудзь не стаміўся, бо не працаваў ці працаваў мала. Хібá ўверадзíўса, лéжачы пад я́блынаю? Н.-Андр. Абéдаць і пачакáяц[е], мо ні ўверадзíліса. Кл.

УВО'СЕ (*увóсе*). Ужываецца абавязкова з часціцаю *ці* (ці ўвосе). Прыслоўе. Ці ўвóсе пашлá, й нíмá. Байл. Ці ўвóсе—даўно, ужо час зрабіць, вярнуцца.

УГАДА'ЦЬ (*угадáць*) *I спраж.* (*-аю, -аеш*). 1. Угадаць. Кл. 2. Пазнаць. Я й ні ўгадáла вас, стары́е стáлі. Кл.

УГАРТА'ЦЬ (угартáць) I спраж. (-аю, -аеш). Угортваць (побач з угортваць). Трэ́ба ўгартáць (хворы палец). Кл.

УГРУ'ЗНУЦЬ (угрýзнуць) I спраж. (-у, -еш), непераходны. Уехаць глыбока ў гразь, балота. Карóва ўгрýзла, чуць вýбавілі на бéраг. Кл.

УДА'ЎНІЦЦА (удáўніцца) II спраж. Гадóў вóсім, [е]к ўзяў тры сóтні й не аддаé. Хочу на сýд падáць. Дак, кáжуць, нічóго ні бýдзе, вéльмо ўдáўніласо. Хал.

УЖЫ'ЦЬ I спраж., непераходны. Наладзіць жыццё ў згодзе (з кім-небудзь). Хібá чорт с табóю ўжывé. Вольн. Памýчыласа, вéдамо, ў чужóй, сям'í, але патóм (гл. патом) ужылá ж. Йшчэ бýдзе відáць, ці ўжывé, ці ні ўжывé, аднý зімку тóлькі жывýць. Кал. Параўн.: рускае разве черт с тобой уживется.

УЗАХАПКІ' (узахапкí). Параўн.: прыказку—У тым гаму, што ўхапіў, тое таму. Ні трэ́ба было́ ўзахапкí бéгці. Дóбр[э] й чынілі, што на сýд падалí. Кл.

УЗВА'Р (узвáр). Назоўнік мужч. роду. Кампот. Узвáру ні лю́біць, а расóл п'е. Глуск.

УКМЯЦІ'ЦЬ (арф.) II спраж. (-чу, -ціш). Запамятаць, уцяміць. Я не ўкмяцíла, што гаварылі (арф.). Сл.

УЛЕ'ГЦЫ (улéгцэ(ы). Форма меснага склону адз. ліку кароткага прыметніка льгъкъ (въ льгъцѣ). Без кладзі ехаць, паражняком.

Улéгцэ за чáс то й у Барбарóў зóйдз[е]ш. Хал. Улéгцэ паêхаў, ён бы й вас заўéз. Сл.

УЛЕ'ГЧЫ (*улéгці*) *I спраж.* (*-у, -аш*). Пагрозна пагнацца (за кім-небудзь). Хамóў сабáка ўлёг за нáмі, чуць нóгі ўнесьлі. Кл.

УНЁ' Часціца. Вунь. Унё рыбакі з вýдкаю-аўтамáтам (спінінгам). Байл. Параўн.: вýньдзека, вýнека.

УПАРА'НУ (*упарáну*). Прыслоўе. Тое, што рáно, урáнні (гл. уранні), уранку, раніцою. Упарáну схадзíла ў грыбы́. Кл.

УПЕ'НЬ (*упéнь*). Ужываецца ў фразеалагічным спалучэнні збіць упень. Збіць упень— збіць, з'есці, стравіць жывёлаю (коньмі, каровамі) сенажаць, пасеў. Вáшае прóсо ўпéнь зьбíлі валáмі. Хал. Упéнь, бáбо, зьбíлі грáды (гарод). Кл.

УПЕ'РЫЦЦА (*упéрыцца*) *II спраж.* (*-у-ся, -ыш-ся*). 1. Выцяцца. Упéрыўса аб бáньку. Байл. 2. Раўназначнае рускаму втюрился. У Гáнну па вýшы ўпéрыўса. Кл.

УПЕ'РЫЦЬ (*упéрыць*) *II спраж.* (*-у, -ыш*). Выцяць, ударыць. Трэ́ба былó пáлкаю ўпéрыць дóбра. Кл. Параўн.: упярыць. Радашковічы.

УПІ'РЫ (*упíры*) *толькі ў множн.* Упартасць. Надаêлі éтые тваê ўпíры. Н.-Андр. Бес твайíх упíраў ні абышлóся. Кл.

УПРА'ЎНЫ (*упрáўны*). Ужываецца з назоўнікамі, якія абазначаюць назвы асоб. Упраўны чалавек—чалавек, які ўсё робіць спрыт-

на, хутка, без спазнення. Упра́ўные лучкаўцэ́ (жыхары в. Лучкі), ужэ німа́ нічо́га на по́лі. Кл.

УПРО'ЧКІ (*упро́чкі*). Ужываецца з дзеясловам ісці і сінонімамі да яго. Пайсці́ ўпро́чкі—пайсці ад сям'і. Той Максі́м, што ўсе ўпро́чкі хадзі́ў. Дзель пярабу́дзе дзён тры й дадо́му ця́гняцца. Кл.

УПЯ'ЦЦА (*уп'я́цца*) *I спраж.* У асабовых формах паяўляецца суфіксальнае *н*, як і упнуцца (ужываецца і упну́цца). Трэ́ба ўп'я́цца до́брэ. Кл. У адно́м ме́сьце ўгруз вôз, ду́маў зачу́ю, але ўпну́ліся (валы) й вы́хвацілі. Байл.

УРАБІ'ЦЦА (*урабі́цца*) *II спраж.* (*-ю-ся, -іш-ся*). Хаця́ б ні ўрабі́ласа ў гра́зь. Кл.

УРА'ДЗІЦЬ (*ура́дзіць*) *II спраж.* (*ура́джу, ура́дзіш*). Даць рады. Ні накрыча́ўшы, з йі́мі (дзяцьмі) нічо́га ні ўра́дзіш. Кл.

УРА'ННІ (*ура́ньні*). Тое, што і ўпара́ну, ра́но (гл. рана), уранку, раніцою. Ура́ньні сêў і паêхаў. Кл.

УСЕ' (*усе́*). Займеннік ніяк. роду і часціца. Усе́ на́шае прапа́ло. Сл. Маршчакі́ ўсе шыў не́калі. Кл. Усе́ й гаво́рыць і гаво́рыць. Хал.

УСЕ'ЯЦЦА (*арф.*). Правесці ўсю сяўбу, закончыць сяўбу. Се́лета ўсе́яліся зараней. (*арф.*). Сл.

УСМА'Л (*усма́л*) *мужч.* Амярцвелая частка ствала хвоі, усохлая і налітая смалою, добра гарыць і выкарыстоўваецца як падпал і для ас-

вятлення на комінку. Усмáла пашукáю. Кл. Гл. асмол.

УХВА'Т *(ухвáт) мужч.* 1. Чорт; у праклёне: каб йіх ухвáт ухваціў: ужэ́ сáнячкі ўхвацілі. Кл. 2. Злодзей, хапун. Той бóльшы вéльма ўхват. Барб.

УШУ'ЛА *(ушýло) ніяк.* Шула. Ушýло дóбрае будзе. Байл. На ўшýло ўскінь. Кл.

УЯ'ДЛЫ *(уя́длы).* Ужываецца з назвамі асоб і жывёл. У адносінах уядлага чалавека растлумачылі (Зуб.): спрактыкаваны і нядобрасумленны працаўнік, які можа абманьваць, абкрадаць, прысвойваць дабро, але раскрыць яго цяжка ці не ўдаецца. У в. Клетнае растлумачылі, што ўжываецца толькі з назвамі жывёл-драпежнікаў (воўк, ліс), якія лоўка і беспакарана крадуць птушку, дробных жывёл.

УЯ'ПА *(уя́па) жан.* Нарост на целе, вальбука. Уя́па вýрасла. Кас. Параўн.: я́па.

Х.

ХАВА'ЛКА *(хавáлка) жан.* Хованкі. У хавáлку гуля́лі. Зуб. Параўн.: закованка (гл.).

ХАДА' *(хадá) жан.* Па хадзê пазнáла. Кл.

ХАДО'К *(хадóк) мужч.* Чалавек, які хутка і лёгка ходзіць. Вéльмі хадóк буў, звáлі кулём. Сл.

ХА'ЎКАЦЬ *(хáўкаць).* Побач з пазяхаць, зяхаць. Чагó тут хáўкаць? Рабéце рабóту. Сл.

ХАЎЦЕ́ЦЬ (*хаўцéць*) *II спраж.* (*-ч-у, -ц-іш*), *непераходны.* Выражаць прагнасць да яды (у часе яды ці бачачы ежу). Галóдные, дак за сталóм аж хаўцяць. Кл.

ХВАРСІ́СТЫ (*хварсісты*). Касáрыцкіе (дзяўчаты) ніхварсістые. Касар. У хварсістага галавá пустáя. Касар.

ХВАРСУ́Н (*хварсýн*) *мужч.* А мой Мішачка хварсýн,—тóлькі гáльштучак да чýб. З частушкі. Кл.

ХВІСТ (*хвіст*) *мужч.* Знак забароны пасвіць жывёлу (на сенажаці, канюшыне, пожні); гэта тычка, на якой, для прыкметнасці, пакідаюць і скручваюць верхнія галінкі з лісточкамі ці ігліцаю або (часцей) накручваюць жмут саломы, травы, моху.

Там Кісéль хвіст пастáвіў, касіцьмуць. Кл. Хвіст нагадвае падвязаны хвост каня. Параўн.: украінскае хвіст — хвост; хист, зáхист — абарона, забарона.

ХВО́Я (*хвóя*) *жан.* Сасна. У нас—хвóя й хвóя (у нас усе і заўсёды гавораць: хвоя). Кл.

ХЛІСНУ́ЦЬ (*хліснýць*) *I спраж.* (*-у, -еш*). Хутка з'есці, прычым крышку якой-небудзь стравы (крупніку, капусты). Хлісні йшчэ на дарóгу гарáчае капýсты. Кл.

ХЛУС Гл. маней, манькут, манека, маніць. Кл.

ХОП (*хоп*). Выклічнікава-дзеяслоўная форма. Што лêтам нôжкаю топ, тóе зімóю б рýчкаю хоп. Кл.

ХО'РАША (*хóрашэ* і *хораша*). Хóрашэ расказвалі. Зуб. Хорашá гуляюць. Вільча. На дварэ́ хорашэ́. Кл.

ХРАМАЛІ'Н (*храмалін*) *мужч.* Крэм для абутку. Храмалін сусім сухі. Байл. Храмаліну купіў. Кл.

ХРА'ПА [1] (*храпа*) *жан.* Ножка качана. Храпу карóўцэ сабрáць. Барб. Храпа дóбрэ карóве. Кл. Параўн.: карова з хрумстаннем з'ела храпкі. І. Шамякін, Крыніцы, 1957, стар. 164.

ХРА'ПА [2] Замёрзлая няроўная паверхня зямлі. На вуліцы храпа. Зуб. Па такóй храпе нікóваны кôнь далёко ні зóйдзе. Кл.

ХРО'СНІК (*хрóсьнік*). Хросны бацька. Хрóсьнік твой пам'ёр. Хрóсьнік ето хрóсны бáцько, ето хто хрысьціў. Кл. Параўн.: у «Русско-белорусском словаре» хроснік адпавядае рускаму крестник, а рускае крестник—крёстный сын. С. І. Ожагаў, «Словарь русского языка».

ХРО'СНІЦА (*хрóсьніца*). Назоўнік. Хросная маці. Бач—путáясса й ні вêдаў, хто хрóсьніца твая́. Хрóсьніца й хрóсна мáці—тóе сáмае. Параўн.: у «Русско-белорусском словаре»: хросніца адпавядае рускаму крестница, а рускае крестница — крёстная дочь. С. І. Ожагаў, «Словарь русского языка». Параўн.: хрышчóніца (гл.).

ХРЫШЧО'НІК (*хрышчóнік*) *мужч.* 1. Хросны сын. Кл. Параўн.: хроснік (гл.). 2. Набіты, «адсвенчаны». Тваê хрышчóнікі, мýсіць, больш ні палёзуць у сáд. Барб.

ХТОЛЬ *(хтоль)*. Хто-небудзь і нехта. Мо хтоль бу́дзе йці да ўкіне пісьмо́ ў я́шчык. Кл. Хтоль но́йдзе й рад бу́дз[е]. Поб. Ужываюцца і хто-небудзь, нехта.

ХУ'НТЫ *(ху́нты)*. Назоўны склон множнага ліку ад хунт.

ХУНТЫ' *(хунты́ і ху́нты) толькі ў множн.* Памольны збор у млыне. Хунты́ паве́зьлі на станцыю. Барб. Каб на гро́шы мало́лі, а ні на хунты́. Кл.

ХУРАВА'ЦЬ *(хурава́ць) I спраж. (-ую, -уеш)*. Кіраваць (запрэжаным канём, коньмі). Хурава́ць магу́. Байл. Нідо́бра хурава́ў. Кл.

Ц.

ЦАЛІ'К *(цалі́к) мужч.* Цалік—цэлы, не пратаптаны снег (па непратаптанай дарозе—па цаліку). Па цаліку́ ця́жко йсці. Заду́ло даро́гу, дак па цаліку́ й па цаліку́—аж у са́мы Глуск. Сл.

ЦАЦКО'ВАНА *(цацко́вано)*. Упрыгожана. На грудзя́х цацко́вано (вышытая, расшытая вопратка). Сл.

ЦВІРКУ'Н *(цьвіркýн і цыркýн)*. Цвыркун. І я́к ён цьві́ркае, е́ты цьвіркýн? Кл. Гл. цыркун.

ЦЕРАБІ'ЦЬ *(церабі́ць) II спраж. (-бл-ю, -б-іш), пераходны.* 1. Высякаць лес, кустарнік, каб зрабіць участак сенажаццю, полем або для праезду. Шчэ й ні пачына́лі церабі́ць. Кл. 2. Абсякаць галлё на дрэве. Вы—рэ́заць, а я церабі́ць гальле́. Кл. 3. Пераноснае. Есці хутка,

з смакам, не зважаючы на смак і спажыўнасць стравы. Галóдные, дак ц[е]рэ́б[е]ць. Сл.

ЦЁ′ГАМ Цёгам ц[е]гнýць. Сл.

ЦЁ′МНАЧЫ (*цёмначы*). Упацёмках. Ні рабіцьму цёмначы. Кл. Штó ты цёмначы там калупáў? Кл.

ЦЁ′САЧКА (*цёсачка*). Памяншальнае ад цёска (гл.). Цёсачак назьбірáй. Пас. Янкі Купалы.

ЦЁ′СКА (*цёска*) *жан.* Палачка, лучына (гл.). Цёсак назьбірáла й дроў ні палíла. Пас. Янкі Купалы.

ЦІ′ПЕЦ (*арф.*) *мужч.* Жорсткая невысокая расліна. Ціпцу ні касілі, вéльма цьвóрды. Барб. Параўн.: сівец. Радашковіцкі і Заслаўскі раёны.

ЦІ′ПЧЫК (*ціпчык*). Памяншальнае ад ціпец (гл.). Ціпчык малады́ да з расóю—то кóсіцца. Пас. Янкі Купалы. Параўн.: сіўчык. Заслаўскі раён.

ЦМЫ′ГА′ЦЬ (*цмы́гáць*) *І спраж.* (*-аю, -аеш*), *непераходны.* Прыгаць. Ну, цмыгáй. А то ўкíну ў канáву. Вольн.

ЦОП (*цоп*). Выклічнікава-дзеяслоўная форма. 1. Нечакана схапіць, у значэнні хоп. Цоп сабáка за рýку. Поб. 2. Нечакана стукнуць, выцяць. У Лукашá булó так, што біч атарвáўса да цóп па йлбу. Кл.

ЦУКРО′ЎКА (*цукрóўка* і *цукрôўка*) *жан.* Гатунак салодкіх яблык. Цукрóўка — такíе я́блыкі, што вéльмі салóдкіе. Кл.

ЦЫ'Б'Е' (*цы́б'е* і *цыб'е́*) *зборны, ніяк.* Табачныя сцяблы без лісця. Цы́б'[е] на го́ру занёсьці, хай бу́дз[е]. Поб.

ЦЫБУ'К [1] (*цыбу́к*) *мужч.* Курэцкая прылада. Цыбу́к сам зрабі́ў. Н.-Андр.

ЦЫБУ'К [2] Пяро цыбулі, якое нясе насенне. Інакш (прычым часцей) называюць стрэ́лка. Адны́ цыбукі́, усі́м нідо́бра расьце́ цыбу́ля. Барб. Цыбу́к на цыбу́лі, што бізу́н. Кл.

ЦЫКА'ЦЦА (*цыка́цца*) *I спраж.* (*-аю-ся, -аеш-ся*). Хістацца. І галі́нка ні цыкне́цца. Байл. У табурэ́ццэ нôжкі цыка́юцца. Пас. Янкі Купалы. Аж два́ зу́бы цыка́юцца. Кл.

ЦЫКА'ЦЬ (*цыка́ць*) *I спраж.* (*-аю, -аеш*), *пераходны.* Хістаць, вагаць. Ты цыка́й (забіты ў дошку цвік), дак ву́рв[е]цца. Ні цыка́й засло́на. Кл.

ЦЫРКУ'Н (*цыркун* і *цьвіркун*) *мужч.* Цвыркун. Ужэ цырку́н запêў,—во́с[е]нь. Хал. Цыркуна́ злаві́ць хо́чу. Кл. Гл. цвіркун.

ЦЯ'ЖКАЯ [1] (*ця́жка*). Цяжкая. М'ёд ве́льмі ця́жкі. Сл. Мо́кры дуб, [е]к во́лаво ця́жкі. Хал.

ЦЯ'ЖКАЯ [2] Цяжарная (жанчына). Твая́ Ма́р'я ця́жка? Барб. Гл. тоўстая. Гл. уцяжку. Параўн.: obtěžkati—зацяжараць, абцяжарыць.

ЦЯЛЕ'Ш (*цялёш*) *мужч.* 1. Кавалак калоды, бервяна. Разраза́лі цялёш на дошкі. Вайц. 2. Пераноснае. Тоўсты, непаваротлівы (чалавек, конь). Но! Ц[е]лёш ты! Кл.

ЦЯРЭ'МХА (*цярэ́мха* і *ц*[*е*]*рэ́мха*). Чаром-

ха. Цярэ́мхі наламлю́. Кл. Параўн.: калакалу́ша. Мсціслаў. Какалуша. Пярэжары Радашковіцкага раёна.

ЦЯСЛА′ *(цясла́) жан.* Прылада, якою робяць начоўкі, вулей з калоды і інш. Цяслу́ німаве́д дзе дзеў. Кл. Параўн.: цясло́ (ніякі род). Радашковіцкі раён.

ЦЯСНІ′ЦА *(ц[е]сьніца, цясьніца) жан.* Дошка з падлогі. Цясьні́ца—е́то памасьні́ца. Кл. Гл. масніца, памасніца.

Ч.

ЧАПЛЯ′ *(чапля́) жан.* Чапяла. Чапля́ ў нас гаво́раць. Сл. Параўн.: ёмка (гл.).

ЧАРАНА′ *(чарана́) жан.* Пляцоўка, верх рускай печы. На чаране́ сушы́ла я́гады. Кл. Чарана́, [е]к паля́нка. Барб. Параўн.: черен, чрен—солеварный котел или глубокая сковорода для выпарки соли. Даль, «Толковый словарь».

ЧАСІ′НКА *(часінка) жан.* 1. Крышачку часу, хвіліначку. Часі́нку пачака́й нас. Кл. Параўн.: часінка. Пярэжыры Радашковіцкага раёна. 2. Хвіліна. Мо й часі́нка ні прайшла́. Кл. Параўн.: часінка—хвіліна. Пярэжыры Радашковіцкага раёна. Параўн.: чэшскае časek—кароткі час, нядоўга.

ЧАСЦЯКО′М Часта, часцютка. Часцяком заходзіць у школу *(арф.).* Кл.

ЧАСЦЯЧКО′М Прыслоўе. Часцютка. Часцячко́м у я́блычкі бегаюць. *(арф.).* Барб.

ЧАЦВЯРТА́К (*чацьв[е]ртáк, чацьвяртáк*). Назоўнік. Конь, карова, бык на чацвёртым годзе. Чацьв[е]рта́к ужэ ў рабо́ту по́йдзе. Кл.

ЧО́БАТ (*чо́бат*) *мужч., множн.* — чобаты. Скіда́й чо́баты да лажы́са. Кл.

ЧУЖНІ́К (*чужнік*) *зборны мужч.* Не тутэйшыя, прышлыя людзі. У на́с бага́то чужніку́ рабо́тае (на будаўніцтве). Кл. Параўн.: чэшскае ciż inec—нетутэйшы, наезджы, чужаземец.

ЧЫКІРДА́ (*чыкірдá*) *жан.* Чахарда. Гульня: адзін пераскоквае другога. У чыкірду́ гуля́юць. Зуб.

ЧЫ́СТЫ [1] (*чы́сты*). 1. Чы́сьцянькі шшы́так. Зуб. 2. Чы́сты (не засмечаны) аўе́с. Хал. Перша́к ве́льмо чы́сты. Сл. 3. Брыгадзі́р буў вінава́ты, а ву́йшаў чы́сты. Сл. 4. У чы́сты чацьве́р прыхо́дзіла сюды́. Кл. Параўн.: чысты [2].

ЧЫ́СТЫ [2] Часціца якраз, акурат, як. Е́ты хло́п[е]ц чы́сты Рымашэ́ўські. Сл.

Ш.

ШАБЕ́ТА (*шабéта*) *жан.* Скураны бумажнік, невялічкая скураная торбачка. Шабе́ту е́ту (партфель) во́зьме й хо́дзіць. Вольн. Нашто́ та́я каму́ шабе́та. Кл.

ША́МНУЦЬ (*ша́мнуць*) *І спраж. (-у, -еш), непераходны.* Нечакана, раптоўна рухнуць пры праломе лёду або ў балотнай дрыгве. Гадо́ў два́ццаць (назад), му́сіць, ката́ліся на рацэ́, лёд улама́ўся й ша́мнулі або́два. Кл.

ШАСТАКО'Л (*шастакол* і *шастакôл*). Частакол. Шастакол чуць ліпіць. Кл.

ША'ТКА (*шáтко*). Вельмі рухава, спрытна, паваротліва; ужываецца пры дзеясловах рабіць, упраўляцца і падобн. Маладзіца харóша, так шáтко ўпраўля́[е]цца, л[е] пéчы завіхá[е]цца. Сл.

ША'ТКІ (*шáткі*). Вельмі рухавы і спрытны ў рабоце, паваротлівы. Казáлі, што Васілёва жóнка шáтка вéльмі, пакá ўстáнуць, усе парóбіць. Кл. Параўн.: у рускай мове: 1. Такой, который шатается, качается, неустойчивый... 2. Переносн. Колеблющийся, ненадежный, непрочный. «Толковый словарь русского языка», пад рэд. Д. Н. Ушакова.

ША'ЦЕНЬКА (*шáцянько, шáц[е]нько*). Памяншальнае ад шáтка (гл.). Шáц[е]нько ўсе рóбіць. Сл.

ША'ЦЕНЬКІ (*шáцянькі*). Памяншальнае ад шáткі. Ётае дзіцяня́ спрáўнае, шáцянькае, ўсе й убачыць і падмóж[э]. Кл. Гл. шáткі, шáтка.

ШВЕ'НДАЦЦА (*швéндацца*). Зваротная форма ад швендаць. Кл., Барб.

ШВЕ'НДАЦЬ (*швéндаць*) *І спраж.* (*-аю, -аеш*), *непераходны*. Бадзяцца, хадзіць без справы, без патрэбы. Ідзêце на рабóту, ні швéндайце па вýліцы. Барб.

ШВІ'ВА (*швіво* і *швіва*) *ніяк.* Шыццё. Багата швіва (Вільча)—багата заказаў шыць, багата шыцця. Швíво ні ўц[е]чэ́. Сл. Параўн.: Не

прыйшлося сесці за шытво. А. Чарнышэвіч, Світанне, 1957, стар. 167.

ШКЛЮД (*шклюд*) *мужч.* Цяслярская прылада, сякера, якою ачэсваюць тоўстыя бярвенні, у адрозненне ад пуца (гл. пуц)—мае шырокае лязо. І шклю́д ы пу́ц цяга́ў. Вольн. Шклю́дам часа́лі. Кл. Параўн.: Сцены гладка склютаваны. Я. Купала.

ШКЛЯ'НКА (*шкля́нка*) *жан.* Даўней гаварылі: дай шкля́нку. Хал. Та́то наш: шкля́нка й шкля́нка (г. зн. гаворыць толькі шклянка, не стакан). Кл. Адну́ шкля́начку ўра́ньні надайіла. Кл.

ШЛЁГ (*шлёг*). Выклічнікава-дзеяслоўная форма тыпу гоп, хоп. Рэзкі, нечаканы ўдар пугай, дубцом (па кім-небудзь). Шлёг дубцо́м каня́, а ён брыкану́ў. Кл.

ШЛЁ'ГАЦЬ (*шлёгаць*) *I спраж.* (*-аю, -аеш*), *пераходны.* Ударыць пугай, дубцом. Трэба думаць, з нямецкага schlagen. Што ты шлёга[е]ш (каня) бес канца́? Вазьму́ да само́га нашлёгаю. Кл.

ШЛЁ'ГНУЦЬ Зак. тр. ад шлёгаць. Шлёгнуць. Кл.

ШЛУ'ННЕ (*шлу́ньне*). Вантробы, нутро, унутранасці жывой істоты ці якога прадмета. Так выцяў, што й шлу́ньне палёзла. Пас. Янкі Купалы. У фразеалагізме: шлу́нне выцягнуць (параўн.: вантробы дастаць, вантробы выцягнуць, жылле выцягнуць). Кл.

ШЛЯ'ХЧЫЧ (*шляхчыч*). *Шляхціч.* Шляхчыч з Загальшчыны прадаваў вала. Кл.

ШМАТО'К (*шматок*) *мужч.* Невялічкі кавалачак (чаго-небудзь, звычайна сала, мяса, калбасы), крышку. У фразеалагічным спалучэнні: разарваць на шматкі (Сл.)—разарваць на кавалачкі (вопратку, матэрыял).

ШМУК Гл. шмык.

ШМУ'КНУЦЬ Гл. шмыкнуць.

ШМЫК (*шмук, шмык*). Выклічнікава-дзеяслоўная форма тыпу хоп, гоп. Пасьнедае й шмук с хаты на ўвесь дзень. Пас. Янкі Купалы. Гл. шмыкнуць.

ШМЫ'КНУЦЬ (*шмукнуць* і *шмыкнуць*) *І спраж. (-у, -еш), непераходны.* Выскачыць (з хаты, двара) нечакана, раптоўна, вельмі хутка, імгненна. Шмукнуў за дзьверы, толькі й бачылі. Кл.

ШО'ФЕР (*шоф[е]р*). Шафёр. Шоф[е]р казаў, што рухункавод да Глуська зьбіраяцца. Кл. Мо гадоў тры ўжэ за шофяра. Н.-Андр. Адзін (сын) шофярам, а два трактарыстымі. Кл.

ШТАНДА'РА (*штандара*) *жан., множн.* — штандары. Штандары—дубовыя ці смалістыя хваёвыя круглякі, на якіх стаіць будыніна; штандары ставяцца старчаком. Штандары само леп[е]й, каб з дубу. Вайц. Навазіў штандараў аж лішняго. Барб.

ШТОЛЬ (*штоль*). Займеннік. Што-небудзь і нешта. Штоль прынясу й табе. Барб. Штоль

трэ́ба рабіць. Кл. Дайце мне штоль. З сачыненья вучня 6-га класа. Кл. Ужываюцца і што-небудзь і нешта.

ШТУКА'НТ (*штука́нт*) *мужч.* Жартаўнік, майстар расказваць цікава і многа (гісторыі, прыгоды), майстар на выдумкі і фокусы. Ве́льмо ўжэ штука́нты. Кл.

ШТУКА'Р (*штука́р*). Тое, што і штука́нт. Скажэ́це, ніграма́тныя, а такіе штукарэ́. Кл.

ШУМ (*шум*) *мужч.* 1. Шум. Не́йкі шум у маёй галаве́. Вольн. 2. Пена (на вадзе, на кані). Ко́ні (коней) пач шу́мам прыгна́лі. Кл. Набра́ў (у прыгаршчы) шу́му з начо́вак. Пас. Янкі Купалы.

ШУ'ПЕЛЬ (*шу́п*[*е*]*ль, шу́пель*) *мужч.* Шуфель. Шу́п[е]ль раскало́ўся. Пас. Янкі Купалы.

ШУ'ТЫ [1] (*шу́ты*). Прыметнік. Бязрогі (бык, карова). Шу́ты буга́й буў. Та́я шу́та каро́ва. Кл. Параўн.: лабатая карова. Заслаўскі раён. Параўн.: галамо́ўзая карова. Сіняўская Слабада Карэліцкага раёна.

ШУ'ТЫ [2] (*шу́ты*). Побач з пазыўным шу́ткішу́ткі (для авечак). Шу́ты маê, шу́ты-шу́ты-шу́ты. Кл.

ШЧА'ВЕЛЬ (*шча́в*[*е*]*ль, шча́вяль*) *мужч.* Шчаўе. Шча́ўлю зварыць хо́чу. Пас. Янкі Купалы. Шча́вель засо́львала на зіму (*арф.*). Кл.

ШЧАКО'ЎЗЬ (*шчако́ўзь*). Выклічнікавадзеяслоўная форма тыпу хоп, бразь. Нечакана з'ехаць, скаўзнуцца. Побач з коўзь. Кл. Шчако́ўзь с сто́гу. Кл.

ШЧЫТ (*шчыт*) *мужч.* Вяршыня дрэва. Шчыты зьбіраюць. Вільча. Шчыт усох. Кл. У самым шчытку. Кл.

ШЫБУ'НАК (*шыбунак*) *мужч.* Пагрозныя падзеі, вайна. Стаў еты шыбунак (вайна з белапольскімі акупантамі). Кл. Каб шыбунку (вайны) ні было. Кл.

ШЫТНА'Я (*шытная*) *множн.* — шытные. Ужываецца з назоўнікам нітка, ніткі. Ніткі для шыцця. Шытных нітак купіць хочу. Кл. Параўн.: шаўная. Пярэжыры Радашковіцкага раёна.

Я.

ЯДА'К (*ядак*) *мужч.* Член сям'і. Зямлю давалі на ядакоў. Пас. Янкі Купалы.

ЯДКІ' (*ядкі*). Смачны, які добра, ахвотна есца. Ужываецца ў спалучэнні з назоўнікамі сена, мурог, салома, сенакос (сена з сенакосу). У Ліпцэ сенакос ядкі (сена з сенажаці ў Ліпцы ядкое). Кл.

ЯЗДЖА'ЛАЯ (*яжджала, [е]жджала*). Ужываецца з назоўнікам дарога. Язджалая — у супрацьвагу такой, па якой не ездзяць. З Зубарэвіч у Рацьмяравічы (ст. Ратміравічы) лёгко трапіць, бо там адна яжджала дарога. Кл.

Я'КІЛЬ (*якіль*). Як-небудзь і неяк. Якіль, бабо, гібецьмам, нашто б[е]даваць. Кл. Каб якіль хоць да Малінава датупаць. Сл. Ужываюцца і як-небудзь, неяк.

ЯКІ'ЛЬ (*якіль*, [*е*]*кіль*). Займеннік. Які-небудзь, нейкі. Якіль вýрасьце (які-небудзь вырасце ячмень). Кл.

Я'ПА (*я́па*) *жан.* Грыжа ў жывёліны. Япу нагн[е]лí каню́. Кл. Той вóлік, што я́па на бакý. Байл. Параўн.: уя́па (гл.).

ЯРЭ'МЕЦ *мужч.* Своеасаблівы хамут для валоў. Бываюць прызначаныя на запрэжку аднаго вала і двух. На двух валоў складаюцца з такіх частак: ярэмец—чатырохкантовая перакладзіна (таўшчыня яе 8—13 см), 2 кульбакі (гл.) і 2 занозы (гл.). Валовая шыя закладаецца ў кульбаку і ўстаўляецца заноза ў адтуліны, якія маюцца ў канцах ярэмца і кульбакаў. Ярэмец на аднаго вала—палова апісанага. 2. Частка ярэмца—перакладзіна, якая зверху ляжыць на шыях валоў. Кл.

ЯРЭ'МЧЫК Памяншальнае ад ярэмец. За зіму дзéсяць ярэ́мчыкаў зрабіў на малады́х вóлікаў (*арф.*). Кл.

Я'СІК (*я́сік*) *мужч.* Маленькая падушачка, якою завяршаецца «гара падушак». Ясік зраблю́. Ясік с пýху. Кл.

Я'ТРАСЬ (*я́трась*) *жан.* Вакол раны, прышчыка прыкідвае: пачырваненне, свярбіць і балюча. К ёй хадзілі я́трась лячы́ць. Кл. Параўн. грэчаскае jatros — доктар. Параўн.: чэшскае jitřeniti se.

ЯТРО'ЎКА (*етрóўка*) *жан.* Аднагó бра́та жóнка й другóга бра́та жóнка—éто етрóўкі. Сл.

Я'ТРЫЦЦА *(ятрыцца) II спраж. (-у-ся, -ыш-ся)*. Вакол раны, скулы, прышча чырванее, свярбіць, баліць, вельмі непакоіць. Кл. Параўн.: чэшскае jitřeniti se—гнаіцца, злавацць.

ПРЫКАЗКІ, ПРЫМАЎКІ, ФРАЗЕАЛАГІЧНЫЯ СПАЛУЧЭННІ

АБЕ'Д НА АБЕ'Д—НЕ ТО'Е, ШТО КІ'Й НА КІ'Й *(арф.)*. Сым.

АБШЧАПІ'ЦЬ АБЕ'РУЧ. Апшчапіла абéруч. Кл.

АБЫ ЎМЕЎ ТА'НЧЫЦЬ, А ГАРАВА'ЦЬ І ГО'РА НА'ЎЧЫЦЬ. Абы ўмêў тáнчыць, а гаравáць і гóрэ наўчыць. Кл.

АВЁ'С КА'ЖА: СЕЙ МЯНЕ' Ў ГРАЗЬ, ДЫК БУ'-ДЗЕШ КНЯЗЬ *(арф.)*. Кл.

АГРАНО'МЫ ДЫ МАШЫ'НЫ ПАРА'ДКІ БО'ГА-ВЫ ЗМЯНІ'ЛІ. Агранóмы да машы́ны парáдкі бóгавы зьм[е]нілі. Кл.

АД ВІДНО'ГА ДА ВІДНО'ГА. Усю ноч. Ат віднóга да віднóга спáлі. Кл. Параўн.: Каб з відна да відна не сціхала. А. Куляшоў.

АДНА' (АДЗІ'Н) ДУШО'Ю. Жывé аднá душэ́ю. Сл.

АДНЫ' ВО'ЧЫ ЗАСТАЛІ'СЯ. Ця́жка хвóры буў, дак адны́ вóчы засталíса. Кл.

АДНЫ'М ГАРБУ'ЗІКАМ НЕ ПАД'ЯСІ' *(арф.)*. Вольн.

АКУНІ′ ВУ′ДЗІЦЬ. Спахопліваецца дрэмлючы. Ужэ акуні ву́дзіць. Хал.

АКУНІ′ ЦЯГА′ЦЬ. Гл. акуні вудзіць. Хо́піць акунé ц[е]гáць. Хал.

А МА′МАЧКІ! А мáмачкі! А матачкі! Выклічнік. Выражае ў залежнасці ад сітуацыі здзіўленне, захапленне, спалох. А мáмачкі! Дзé ты такóе ры́бы налавíў? Кл. А мáтачкі! Чагó ты такí мóкры й мурзáты прышóў? Байл.

А МА′МАЧКІ МАЕ′! Гл. А мáмачкі! А мáмачкі маê! Што ж рабíць і штó чыні́ць? Цёмначы ні знайду́, й сьцéжкі ні відáць. Пас. Янкі Купалы.

БАГА′ТА ДЗЕ. Багáта дзе йшоў дож, а ў нáс ні кáпнуў. Пас. Янкі Купалы.

БАГА′ТА КАТО′РЫЯ. Багáто катóрые хадзíлі. Барб. Маê тавáрышкі багáто катóрые павыхóдзілі зáмуж. Кл.

БАГА′ТА ХТО. Багáто хто купíў. Кл.

БАГА′ЦЦЯ ЯК У ПАГАРЭ′ЛЬЦА. У йіх багáцьця [е]к у пагарэ́лца. Сл.

БАКІ′ САРВА′ЦЬ. Такáя сьмéшна (дзіўная), што бóкі сарвáць. Сл. Бакí сарвáлі, так сьмéшна былó. Кл. А гавары́ць стáне, дак бóкі сарвáць—жывýе сьмéхі. Хал.

БА′ЦЬКА БЫЎ СТРАЛО′К, А Я ЯГО́ СЫНО́К. Пас. Янкі Купалы.

БЕ′ДНАЯ Я ДЫ СТРА′ДНАЯ. Бêдна я да стрáдна. Кл.

БЕЗ ГНО′Ю ЦІ ЛУ′БІНУ ХЛЕ′БА НЕ ЧАКА′Й. Б[е]з гнóю ці лу́біну хлéба ні чакáй. Кл.

БЕЗ ДАЙ ПРЫЧЫ′НЫ *(арф.)*. Кл.

БІ′ЛІСЯ, ДЫК Я ЯМУ ТАК НАДАВА′Ў, ШТО ЁН ЧУЦЬ ПАБЕ′Г, А Я ЧУЦЬ ПАЙШО′Ў *(арф.)*. Глуск.

БЛІШЧЫ′ЦЬ, ЯК ВО′ЎЧАЕ ВО′КА *(арф.)*. Пас. Янкі Купалы.

БО′КІ ПАРВА′ЦЬ. Кл.

БО'КІ САРВА'ЦЬ. Глуск.

БО'КІ ПАПАДРЫВА'ЦЬ. Кл. Гл. бóкі парвáць, бакí сарваць.

БРАЦЬ У КЛЯ'МАРЫ *(арф.)*. Змацоўваць дошкамі комін, калі яму пагражае разбурэнне. Браць у лісíцы, йшчэ кáжуць: браць у клямары. Кл.

БРАЦЬ У ЛІСІ'ЦЫ. Кл. Гл. браць у клямары.

БУ'ДЗЕ КІЙ, ДЫ НЕ ТАКІ'. І на вас, ой, бýдзе кій, да не такі! Кл.

БЫ'ТУ НЕ ДА'ЦЬ. Бýту не дáлі. Сл.

БЯСКІ'ШКІХ У МАРАКІ' НЕ БЯРУ'ЦЬ. Сым. Гл. бяскішкі.

ВЕ'РАД УЗЯ'Ў *(арф.)*. Глуск.

ВІЛЯ'ЦЬ ХВАСТО'М. Хто рабíў, а хто віляў хвастом. Вайц.

ВО'КА МЕЦЬ. За нéшта ж вóко мáе на вáс. Кл. Параўн.: у тым жа значэнні вóка ня мáя. Пярэжыры Радашковіцкага раёна.

ВО'ЎЧЫЯ Я'ГАДЫ. Любыя ягады, не прыдатныя да яды. Усякія вóўчыя ягады скупляе аптэка *(арф.)*. Пас. Янкі Купалы.

ВЫБІРА'ЦЬ КАРО'ВУ НЕ КАБ ПАЗО'РНАЯ, А КАБ МАЛО'ЧНАЯ *(арф.)*. Глуск.

ВЫ'БІЦЬ НАТУ'РУ. Вольн.

ВЫ'ГНАЦЬ НАТУ'РУ *(арф.)*. Пас. Чырвоны. Вý-ганю натýру. Барб.

ВЫ'ГНАЦЬ ХВАРО'БУ *(арф.)*. Кл.

ВЫ'ЛУПІЎ ВО'ЧЫ, ЯК САВА' *(арф.)*. Вільча.

ВЫ'ЛУПІЎСЯ, ЯК САВА' *(арф.)*. Вільча.

ВЫ'РУЧЫЦЬ З БЯДЫ *(арф.)*. Глуск.

ВЯЛІ'КІЯ ГАДЫ' *(арф.)*. Многа год. З тагó вялікія гады прайшлí *(арф.)*. Зуб. А яму — вялікія гады *(арф.)*. Кл.

ГАДЗІ′ЦЬ, ШТО ЛІХО′Й СКУЛЕ′. Гадзі́, што лі-хо́й скулê. Сл.

ГАЛАВЫ′ НЯМА′. У мяне́ та́к ц[е]пе́р галавы́ німа́. Кл.

ГАРА′ЧКА ХАПІ′ЛА *(арф.)*. Байл.

ГАСПАДА′Р ЗА ЧАРКУ′, А ЖО′НКА Ў СВА′РКУ *(арф.)*. Глуск.

ГАСПАДЫ′НЯ ПА ГРА′ДАХ ВІДА′ЦЬ, А ПАС-ТУ′Х ПА ГО′ЛАСЕ ЧУВА′ЦЬ. Кл.

(ЯК ТАЯ) ГАСПАДЫ′НЯ, ШТО Ў ПЕЛЯНЕ′ ЖАР НАСІ′ЛА *(арф.)*. Кл. Гл. пеляна́.

ГВА′ЛТУ НАРАБІ′ЦЬ. Гва́лту нарабілі. Хал., Зуб. Параўн.: вэ́рхал падня́ць.

ГІ′ДКІ, ЯК КАЖА′Н *(арф.)*. Кл.

ГНАЁ′К ДЫ ЛУБІНО′К — ХЛЕ′БА І НА ДРУГІ′ ГАДО′К *(арф.)*. Кл.

ГОД МА′Е БАГА′ТА ПРЫГО′Д. Год ма́е бага́то прыгôд. Кл.

ГО′ЛЫ ГАЛЬЦО′М. Прышо́ў к нам го́лы-галь-цэ́м. Кл.

ГО′ЛЫ, ШТО БІЗУ′Н *(арф.)*. Кл.

ГО′ЛЫ, ЯК БІЗУ′Н *(арф.)*. Кл.

ГУБЕ′ НЕ ВЕ′Р, А ПАКАЖЫ′ ПРЫМЕ′Р, ДЫК ЯНА І ПЛЯ′МКАЕ. Праўду казала пакойна маці: гу́бе ні вêр, а пакажы́ прымêр, дак яна й пля́мкае. Глуск.

ГУ′БЫ ЗАКАПЫ′ЛІЦЬ. Гу́бы закапы́ліць — і ні падыйці! Ні закапу́львай губ, а рабі́ што трэ́ба. Кл. Параўн.: гу́бы закапы́зіць. Пярэжыры Радашковіцкага раёна.

ГУЛЬТАЯ′ КАВА′ЛАК *(арф.)*. Кл.

ГУЛЬТАЯ′ КУСО′К *(арф.)*. Кл.

ДАВЕ′СЦІ ДА БЕ′ЛАЕ ГАРА′ЧКІ. Да бêлае га-ра́чкі давелі́. Сл.

ДАЙ АБРО′КУ ДЫЙ БІ′ КАНЯ′ ПА БО′КУ. Дай абро́ку, дай бі каня́ па бо́ку. Кл. Гл. аброк.

ДАЙ, БО′ЖА, УСЁ ЎМЕЦЬ, ДЫ НЕ ЎСЁ РАБІ′ЦЬ *(арф.)*. Кл., Вайц.

ДАЙСЦІ′ СВАЁ′Ю ГАЛАВО′Ю. Сам ра́дзіва зрабіў, сам ру́чку наліўну́ю зрабіў—а нігра́матны, дайшо́ў сваёю галаво́ю. Барб.

ДАЛЕ′Й-НА-ДАЛЕ′Й. Праходзіў час. Да́ляй-нада́ляй, а йіх німа́. Вольн.

ДАСТА′ЦЬ ВАНТРО′БЫ. Кл. Пачка́йце, ён з вас вантро́бы даста́не. Кл.

ДАЎГАНО′ГІ, ЯК БУ′СЕЛ. *(арф.)*. Хал., Сым.

ДАЎ ЛАТАТЫ′. Поб. Ба́чыць, што тру́дна бу́дз[е] да лататы́ даў. Вольн.

ДАЦЬ ГА′НЬБУ. Сам—які́, а ўсім дась га́ньбу. Кл.

ДАЦЬ ДЗЕРАКА′. Сл. Хто ва[е]ва́ў, а ён—дзерака́ даў, шыне́ль палучы́ўшы. Хал.

ДАЦЬ КІЯ′ЖЫНЫ. Ні йгру́ш, а кія́жыны даду́ць там. Кл. Гл. кіяжына.

ДАЦЬ ХВА′ЯРУ. Ён і старшыні́ дась хва́яру. Параўн.: нямецкае Feuer—агонь.

ДВАІ′Х ДУШО′Ю. Жыву́ць двайі́х душэ́ю. Кл. Параўн.: адна́ душо́ю.

ДВОР, ЯК ПА′НІ СЕ′СЦІ. Така́я цясно́та ў нас, а двôр як па́ні сêсьці. Вольн.

ДНЁМ ЛЕ′ТА НЕ ПО′ЗНА. Адзін дзень не вырашае. Днем лêто ні пôзно. Кл.

ДО′БРАМУ ЧАЛАВЕ′ЧКУ ДО′БРА І Ў ЗАПЕ′ЧКУ, А ПУСТАЦЕ′ ЛІХО′ І НА КУЦЕ′. До́браму чалаве́чку до́брэ й у запе́чку, а пустацê ліхо́ й на куцэ́. Кл. Параўн.: До́браму чалаве́чку до́бра й у запе́чку, а благацэ́ ке́пска й на куцэ́. Маладзечна.

ДО'БРАЯ ГУ'ШЧА НАВЕ'РХ НЕ ЎСПЛЫВА'Е. Добра гушча наверх ні ўсплывае. Кл.

ДО'БРА ЖЫЎ! — ПЕХАТО'Ю ЗА КАНЁ'М ХАДЗІ'Ў *(арф.)*. Зуб.

ДО'БРА І ЧЫНІ'ЛІ. Добра й чынілі, што на суд падалі. Пас. Янкі Купалы.

ДО'БРАЯ СЛА'ВА ДАЛЁ'КА ЧУВА'ЦЬ, А ЛІХА'Я ЯШЧЭ' ДАЛЕ'Й. Добра слава далёка чуваць, а ліхая шчэ дал[е]й. Глуск. Добра погаласка далёка чуваць, а ліхая погаласка шчэ дал[е]й. Вольн.

ДО'ХЛЯ НАЙШЛА'. Чаму на йіх дохля ні нойдзе?

ДО'ХЛЯ ЎКІ'НУЛАСЯ. Дохля ўкінуласа, дак мо сорак сьвіньней загінуло. Кл.

ДУБЦА' ДАЦЬ. Папалі моду чытаць на страсе. Другі раз дубца дам. Хал.

ДУ'РАНЬ ГАТО'ВЫ. А што таму дурню гатоваму трэба? Пас. Янкі Купалы. Параўн.: чэшскае to je hotovy blazen.

ДУ'РАНЬ ХОЦЬ НА КАГО' СКА'ЖА: «ДУ'РАНЬ» *(арф.)*. Бяр.

ДУХ ЗАНЯЛО' *(арф.)*. Вільча.

ДУХІ' ПАДЦЯГЛО'. Аж духі падцягло. Ці скора есьцімам? Так выгаладаўса, што аж духі пацьц[е]гло. Зуб.

ДЗЕ'НЬ ПРЫ ДНІ' *(арф.)*. Вольн.

ДЗЕ СЯЛЬЦО', ТАМ І НАРАЎЦО'. Дзе сяльцэ, там і нараўцэ. Зуб.

ДЗЯРЖА'ЦЬ НА СУ'СЕ. Абыякава, ненармальна сім-тым карміць, недакормліваць. Сама ніўдаліца такая, падзяржала йіх на сусе. Кл.

Е'СЦІ, ЯК ВЕРАБЕ'ЙКУ. Нêйкі нігадôўны (гл. негадоўны). Êсь [е]к верабейко. А дай м'яса, й ні êсьціме. Барб.

Е'СЦІ, ЯК СІ'НЬДЗІКУ *(арф.)*. Барб. Гл. сіньдзік.

ЖА′БА АПО′ЎЗЛАЯ. Ацэначна-зневажальнае. Гл. апоўзлая. Жа́ба апо́ўзла. Байл. Жа́бу ту́ю апо́ўзлу ні пасыла́й. Ах, ты жа́ба апо́ўзла. Кл.

ЖА′РУ ША′ПКАЮ НЕ НАНО′СІШ *(арф.)*. Пас. Янкі Купалы.

ЖЫВЕ′ЦЦА, ЯК САВЕ′. Кепска жывецца (каму-небудзь): не любяць, няма ходу, як днём саве. Той ба́бе жыве́цца, [е]к саве́. Кл.

ЖЫВЫ′Я СМЕ′ХІ. Вельмі смешна, смех з глыбокай душы. А гавары́ць ста́не, дак бо́кі парва́ць (гл. бакі сарваць),—жыву́е сьме́хі. Хал.

ЖЫ′ЛЛЕ ВЫ′ЦЯГНУЦЬ *(арф.)*. Гл.

ЗА′ВАДУ НЯМА′. Ужэ́ й ні се́юць сацьві́цы, мо й за́ваду німа́. Кл.

ЗАГАВЕ′ЦЬ ДУШО′Ю. Там і душо́ю загавêў бêдны. Кл.

ЗАГУЛЯ′ЦЬ НА ВЯРО′ЎКАХ. Быць павешанаму ці спушчанаму на вяроўках у магілу. Дзе ты буў? Гуля́ў? Што б на вяро́ўках загуля́ў! Кл.

ЗАДЗІ′РЛІВЫ, ЯК ПЕ′ВЕНЬ *(арф.)*. Кл.

ЗАДЗІ′РЫСТЫ, ЯК ПЕ′ВЕНЬ *(арф.)*. Кл.

ЗА ДУРНО′Ю ГАЛАВО′Ю НАГА′М НЯМА′ СПАКО′Ю. За дурно́ю галаво́ю нага́м німа́ спако́ю. Пас. Чырвоны.

ЗАКАПЫ′ЛІЦЬ ГУ′БЫ. Гл. закапы́ліць і закапуліць. Не́што ні так сказа́ла, дак і закапу́ліла губу (губы). Кл. Параўн.: закапы́зіць гу́бы. Пярэжыры Радашковіцкага раёна.

ЗАКУСІ′ЦЬ ЯЗЫКО′М *(арф.)*. Гл.

ЗАМАЎЧЫ′, КАБ ТЫ НАВЕ′КІ ЗАМАЎЧА′Ў *(арф.)*. Хал.

ЗАРАБІ′Ў, ЯК НА ВАЛА′Х СЕДАКО′Ў ВО′ЗЯЧЫ *(арф.)*. Кл.

ЗА ЦІ′ТА ВЫ′НЕСЦІ. Вынесці за Ціта—пахаваць.

Могілкі за Цітаваю сядзібаю. Кл. Му́сіць ско́ра за Ціта вы́несуць *(арф.)*. Кл. Нашто́ паўно́сілі (павыносілі)? Каб за Ціта ву́нясьлі. Кл.

ЗБІЦЬ УПЕ′НЬ. Зусім збіць (жывёлаю, градам) гарод, збажыну. Зьбілі ўпень ва́шы[е] грады (гарод). Пас. Янкі Купалы. Град упень зьбіў усю́ пашню́. Кл.

ЗДАРО′ВЫ, ШТО ДРО′Т *(арф.)*. Зуб.

З ДУГІ′ АГЛО′БЛІ НЕ ЗРО′БІШ. Нашто́ мудрава́ць? З дугі́, брат, агло́блі не зро́біш. Хал.

З КАМАРО′ВУЮ ДЗЮ′БУ. Вельмі мала чаго-небудзь. Са́ла с камаро́ву дзю́бу зьзеў. Кл.

З ЛО′ЖКА ЎСТАЕ′ СЯРДЗІ′ТЫ, А НА ЛО′ЖАК ЛАЖЫ′ЦЦА НАБІ′ТЫ *(арф.)*. Глуск.

ЗНА′ЦЬ НЕ ЗНА′Ю І ВЕ′ДАЦЬ НЕ ВЕ′ДАЮ. Пута́ліса, дак я нічо́га ні сказа́ла. Гавару йім: Зна́ць ні зна́ю й вêдаць ні вêдаю. Хал.

З ПО′ЦЯГАМ *(с по́цягам, с по́ц[е]гам)*. Ударыць (ляснуць, секануць, сцебануць) пугаю жывёлу, спалучыўшы ўдар з імгненным працягам. Кл.

ЗРАБІ′ЦЬ—І СА′М ЗРО′БІЦЬ, ТО′ЛЬКІ ПЕРАРАБЛЯ′ЦЬ ПРО′СІЦЬ *(арф.)*. Глуск.

ЗРАБІ′ЦЬ ЛАТАТЫ′. А вы ні зрабілі лататы́? Вайц.

З ШЫ′ЛА НЕ ЗРО′БІШ МЫ′ЛА. Ш шыла ня зро́біш му́ла. Кл.

ІДУ′ЦЬ, ЯК НА ШПА′ЦЫР *(арф.)*. Хал.

І ЗА′ВАДУ НЯМА′. Малі́н і за́ваду німа́. Кл. Ско́ро ка́чак дзікіх і за́ваду ні бу́дзе, зьністо́жылі пта́ства. Хал. Ужэ й ні се́юць сацьвіцы (гл. сацьвіца), мо й за́ваду німа́. Кл.

І КЛЯ′МКА! Канец, капут! Тут у нас е швэ́даў зато́н. Ко́лісь швэ́ды на плыто́х плылі́, заплылі́ ў зато́н, а на йі́х с усіх бако́ў (напалі). Тут йім і кля́мка була́. Хал.

ІЛЛЯ′ НАРАБІ′Ў ГНІЛЛЯ′. Ільля́ нарабіў гніль-

ля́. Пас. Янкі Купалы, Кл. Пры́дзе Йілья́ — нарóбіць гнілья́. Вайц.

І НА ЗЕ′ЛЛЕ НЯМА′. І на зéльле нíма́. Кл. Гл. зелле.

ІНДЫ′К ДУ′МАЎ, ДУ′МАЎ, ПАШО′Ў У МО′Х ДЫЙ ЗДО′Х. Інды́к ду́маў, ду́маў, пашóў у мох дай здох. Кл.

ІСЦІ′ НА ВАДУ′.Ісці гнаць плыты, ісці за плытніка. Хадзілі на вóду. Кл. Трэ́ба пайці на вóду. Зуб.

І ТЫ (ЁН, ЯНА) НЕ ЗЛО′МАК! *(арф.)*. Пас. Янкі Купалы.

І Ў ЗУ′Б НЯМА′. Зусім няма кармоў, фуражу, прадуктаў; няма чым і зубы прачысціць. І ў зу́б нíма́ сéна! Зуб.

І Я′ Б КАСІ′Ў, КАБ ЧОРТ КАСУ′ НАСІ′Ў. І я б касíў, каб чорт кóсу насíў. Кл.

КАБ ЗНЕ′ХТАВАЦЬ, РО′ЗУМУ НЕ ТРЭ′БА. Каб зьнéхтаваць, рóзуму ні трэ́ба. Сл. Гл. знехтаваць.

КАБ НА ЦЯБЕ′ СУМАРО′К НАЙШО′Ў! *(арф.)*. Барб.

КАБ НЕ ТОЙ «ЧУЦЬ» — ДО′БРЫ ЧАЛАВЕ′К... Чуць—субстантаванае слова, добры чалавек—прыдатак да яго. Жартоўная заўвага на паведамленне тыпу: чуць не ўпаў, чуць не разбіў (што-небудзь), чуць не памыліўся і да іх падобныя.—Чуць у кана́ву з вóзам ні п[е]ракулíўса.—Але ж. Каб ні той чу́ць, дóбры чалавéк, то ў кана́ве пла́ўваў. Кл.—Чу́[е]ш? А сéні чуць ні ўскóчылі ў пéльку (гл. пелька).—Дóбра, што éты чу́ць — дóбры чалавéк. Кл.

КАБ РОТ ХЛЯСЦЕ′Ў! Каб рот хл[е]сьцéў! Пас. Янкі Купалы.

КАБ ТАК СМЫ′КАМ, ЯК ЯЗЫ′КАМ *(арф.)*. Глуск.

КА′Б ТЫ (ЁН, ЯНЫ, ВЫ) СПРАСО′НКУ КРЫЧА′Ў *(арф.)*. І чагó там раскрыча́ліса? Унíмку нíма́ на ва́с. Каб вы спрасóнку крыча́лі! Кл.

КАБ ЦЯБЕ МАЛА′НКА-РАСЦЕРАЗА′НКА! *(арф.)*. Кл.

КАВА′ЛАК ГУЛЬТАЯ′. Кл.

КАВА′ЛАК МАНЬКУТА′. Кл. Гл. манькýт.

КАВА′ЛАК П'Я′НІЦЫ. Кл.

КАМУ′ КАМЯ′К, А КАМУ′ НІЯ′К. Камý кам'як (і камяк), а камý ніяк (і аніяк). Вайц.

КАМУ′ ШАНЦУ′Е НА ГАДО′ЎЛЮ, А КАМУ НА ГАРО′ЎЛЮ. Камý шанцýя на гадóўлю, а камý на гарóўлю. Вольн.

КАНЕ′Ц ЛА′ПЦЯМ — БО′ТЫ ПАЙШЛІ′ *(арф.)*. Поб.

КАНЧА′Й І ПРАБАЧА′Й. Кл.

КАПАНІ′ЦАЮ ТРА′КТАР ПУЖА′ЦЬ *(арф.)*. Кл. Гл. капаніца.

КАПЫТЫ′ СКЛА′СЦІ *(арф.)*. Байл.

КА′ЧЧЫНАЯ НЯДЗЕ′ЛЯ. Дзясята ат каляд нядзéля, дак éто й е кáччына нядзéля. Кл. Мабыць, у гэты час звычайна вяртаюцца з выраю качкі.

КІДУ′Н КІ′ДАЕ. Прыпадак, прыступ падучай хваробы (эпілепсіі). Кінуў сваê да йдзé на чужы́[е] (дзеці). Што б йіх кідýн кідаў. Пас. Янкі Купалы. Каб вáс кідýн кідаў! Кл.

КІ′ПЦІ, ШТО САХАРЫ′. Кіпці, што сахарэ́. Кл. Гл. кіпець. Гл. сахор.

КЛЯВА′ЦЬ НО′САМ *(арф.)*. Кл. Гл. акуні вýдзіць.

КРАМ, ЯК РЭ′ШАТА. Рэдкі крам, радабоддзе (гл.). Купіў кráму, як рэ́шато. Кл.

КРУ′ЦІЦЦА, ЯК УЮ′Н *(арф.)*. Кл.

КУДЫ′ НЕ ЗАВУ′ЦЬ, АБЫЙДЗІ′. Куды́ ні завýць, абуйдзí. Сл.

КУ′ПЧЫЦЦА, ЯК КУ′РЫ НА КУБЛЕ′ *(арф.)*. Кл. Гл. кубло.

КУ'РЫ НЯМА' КУД'Ы ВЫ'ПУСЦІЦЬ. Ку́ры німа́ куды́ ву́пусьціць. Кл.

КУСО'К ГУЛЬТАЯ'. Кл.

КУСО'К МАНЬКУТА'. Кл. Гл. манькут.

КУСО'К П'Я'НІЦЫ. Кл.

ЛА'ТА НА ЛА'ЦЕ *(арф.)*. Сым.

ЛА'ХІ ПАД ПА'ХІ. Хутка рушыць, не збіраючыся. Ла́хі пад па́хі й пашлі́. Барб.

ЛЕ'ЗЦІ СЛЯПІ'ЦАЮ Ў ВО'ЧЫ. Пяраста́нь ты ў во̂чы лêзьці! Каб за што́, ато за німа́ нішто́ ле́ге сьл[е]піцаю ў во̂чы. Барб.

ЛЕПШ КРО'ШКУ ЗРАБІ'ЦЬ, ЯК БАГА'ТА НАГАВАРЫ'ЦЬ *(арф.)*. Баян.

ЛЁ'ГКІ НА НО'ГІ *(арф.)*. Сым.

ЛІСА' І ПАД БАРАНУ' ХАВА'ЛАСЯ: ТО Ў ЗУ'Б, ТО Ў ПРУ'Т, ДЫ ЎСЁ МІ'МА. Ліса́ й пуд барану́ хава́ласа: то ў зу́б, то ў пру́т, да ўсе мімо. Кл.

ЛІ'ХА НЕ ВО'ЗЬМЕ. Ліхо йіх не во́зьме. Кл.

ЛІХА'Я ГАДЗІ'НА *(арф.)*. Сл., Хал., Кл.

ЛІХА'Я СКУЛА'. Гадзі́, што ліхо́й скуле́. Сл.

ЛІХІ' САБА'КА СПАДЦІШКА' КУСА'Е. На то́е й ка́жуць: ліхі́ саба́ка спацьцішка́ куса́[е]. Пас. Янкі Купалы.

ЛІЦА' НЯМА'. Пра чалавека, надта знясіленага, схварэлага або перапалоханага, — яго па твары не пазнаць. Ліца́ на ём німа́. Сл.

ЛУПЦОЎ'КІ ДАЦЬ *(арф.)*. Сл.

ЛЫ'ТКА ЗАДРЫЖА'ЛА *(арф.)*. Страшна стала. Вайц.

ЛЮ'БІШ КАТА'ЦЦА, ЛЮБІ' І СА'НАЧКІ ВАЗІ'ЦЬ. На то́е й ка́жуць: як лю́біш ката́цца, то любі́ й са́нячкі вазі́ць. Кл. Гл. санечкі.

ЛЮ'БІШ УЗЯ'ЦЬ, ЛЮБІ' І АДДА'ЦЬ. Й сын быў такі, што любіў узяць, а ні любіў аддáць. Праўду кáжуць: любіў узяць, любі й аддáць. Вайц.

ЛЯЙЧЫ'НА ПАД ХВОСТ ТРА'ПІЛА (і папала) *(арф.)*. Кл. Што і шалёная мýха ўкусіла.

ЛЯНО'ТА АДАЛЕ'ЛА *(арф.)*. Пас. Янкі Купалы.

ЛЯНЫ' ГОРШ ЗА БЯЗРУ'КАГА *(арф.)*. Кл. Гл. ляны.

— МАЛЫ', ПАСІ' ВАЛЫ'!

— А ТЫ, ВЯЛІ'КІ, ПАСІ' ІНДЫ'КІ.

— Малы́, пасі валы́.

— А ты, в[е]лікі, пасі йіндыкі. Кл., Байл., Глуск.

МАТКА КРЭ'ПКА ЗАМАХНЕ', А ПАМАЛЕ'ЧКУ ВЫ'ТНЕ. На тое мáці,—й крэпко замахнé, а памалéчку вýтне. Кл.

МАТЫ'ЛІЦУ ВЫ'ГНАЦЬ. Што і выгнаць натуру. Вайц.

МАЎЧЫ', ТО БУ'ДЗЕШ РАЗУМНЕ'ЙШЫ ЗА РАЗУ'МНАГА. Маўчы́, то бýдз[е]ш разумнéйшы за разýмнага. Пас. Янкі Купалы.

МАЦУ'НКУ НАБРА'ЦЦА. А тáм то так і наб[е]рэсься мацýнку? Вайц.

МІХА'СЬ КАГО' ХО'ЧАШ ПРАДА'СЦЬ. Міхáсь каго́ хо́чаш прадáсь. Гл.

МНЕ ХОЦЬ ВО'ЎНА, АБЫ КІ'ШКА ПО'ЎНА. Мне хоць во́ўна, абы кішка по́ўна. Пáс. Янкі Купалы.

МО'ВУ АДАБРА'ЛА. Мо́ву атабрáло. Кл. Мо́ву адабрáла. Сым.

МО'ВУ АДНЯЛО' *(арф.)*. Кл.

МУ'ДРЫ БУДЗЬ, АЛЕ НЕ МУДРУ'ЙСЯ *(арф.)*. Вольн.

МУЖЫКА' НІЖЭ'Й НЕ РАЗЖА'ЛУЕШ *(арф.)*. Глуск.

«МУ′СІЦЬ» ЗА ВУХА ЎКУ′СІЦЬ *(арф.)*. Глуск.

НА ВАДУ′ ІСЦІ′ (хадзіць). Гнаць плыты. Любіў на во́ду хадзі́ць. Хал. На во́ду хадзі́ў. Зуб.

НА ВО′КА ЎСКІДА′ЦЬ *(арф.)*. Кл.

НАВУ′КУ ЗА ПЛЯЧЫ′МА НЕ НО′СЯЦЬ *(арф.)*. Вільча.

НАГУЛЯ′ЎСЯ, ЯК НА ПЕ′ЎНЕВЫМ ВЯСЕ′ЛЛІ. Нагуля́ўса, [е]к на пе́ўнявым в[е]се́льлі. Зуб.

НА ДЗЕ′НЬ ЗАЙМА′ЕЦЦА *(арф.)*. Часіны світання, пачатак світання. Кл.

НАЕ′ДКУ, ШТО (ЯК) З РА′КУ *(арф.)*. Кл.

НА І′Х (ЦЯБЕ, ВАС) ЛІ′ХА! Кас., Зуб., Кл.

НАМАНІ′ЦЬ, ШТО І Ў КАРО′БКУ НЕ ЗБЯРЭ′Ш. Наманіў, што й у каро́бку ні зьбярэ́ш. Кл.

НАРАБІ′ЦЬ КАЛАТУ′ШЫ. Калату́шы нарабілі, што й ні разабра́ць. Сл. Гл. калатуша.

НАРАБІ′ЦЬ КРЫ′КУ *(арф.)*. Кл.

НАРАБІ′ЦЬ ШКО′ДЫ. Пастухо̂м працаднёў назьніма́лі, што шко́ды нарабілі. Байл.

НАРАБІ′ЦЬ ПО′ГАЛАСКІ. А нашто́ нарабіў по́галаскі на ўвесь сьвет? Пас. Янкі Купалы. Гл. погаласка.

НА СКО′РЫМ ЧА′СЕ. Штоб на ско́рам ча́се, то й атратава́лі б. Кл.

НА СТРАСЕ′ ВАЛА′ ПА′СВІЦЬ. Ро́зуму, што ў таго́, што хаце́ў на страсе́ вала́ па́сьціць. Кл.

НАЎСКЛАДА′ЦЬ ПА КАЎНЯРЫ′ *(арф.)*. Набіць. Што і наўскладаць у каўнер. Кл. Гл. наўсклада́ць у каўне́р.

НАЎСКЛАДА′ЦЬ У КАЎНЕ′Р. Набіць. Кл. Гл. наўскладаць.

НЕ ВУЧЫ′ КУЛЬГА′ЦЬ: І ТАК НО′ГІ БАЛЯ′ЦЬ *(арф.)*. Пас. Янкі Купалы.

НЕ ГАСПАДЫ′НЯ, ШТО АПО′ЎДНІ Ў ПЕ′ЧЫ ПА′ЛІЦЬ *(арф.)*. Кл.

НЕ ГАСПАДЫ′НЯ, ШТО АПО′ЎНАЧЫ Ў ПЕ′ЧЫ ПА′ЛІЦЬ *(арф.)*. Кл.

НЕ ДА′Й БОГ ДВА РАЗЫ′ ЖАНІ′ЦЦА І ДВА РАЗЫ′ СТРО′ІЦЦА. Ні да́й бог два раз жаніцца й два раз стро́йіцца (будавацца). Кл. Гл. строіцца.

НЕ ДА′Й, ДО′ЛЯ, У ПРЫ′МАХ ЖЫЦЬ І НА ЧУЖЫ′НЕ ЗАГІ′НУЦЬ. Ні да́й, до́ля, ў пры́мах жыць і на чужы́не загі́нуць. Хал.

НЕ КРУЦІ′ ВЕ′ЛЬМІ: ПЕРАКРУ′ЦІШ. Не круці́ ве́льма: пяракру́ціш. Кл.

НЕ ЛА′Й І НЕ ПЕРАПРАША′Й *(арф.)*. Кл.

НЕ МАЕ′ ГАДЫ′ (н[е] мае́ гады́). Не мой час, не ў мае гады (рабіць што-небудзь). Н[е] маê гады́ на ры́бу хадзі́ць, — у ву́рай зьбіра́цца пара́. Дак. Ні маê гады́ на се́но хадзіць (хадзіць на сена — грэбці сена, складаць у копы). Кл.

НЕ РЫБА, ШТО Ў РАЦЭ′, А РЫ′БА, ШТО Ў РУЦЭ′ *(арф.)*. Глуск.

НЕ ТА′Я МА′ЦІ, ШТО СПАРАДЗІ′ЛА, А ТА′Я, ШТО ВЫ′ГАДАВАЛА *(арф.)*. Зуб.

НЕ Ў ГАЛАВЕ′. Мне й ні ў галаве́, што́ ты ро́біш. Кл.

НЕ ЎГНО′ІШ ПО′ЛЯ, НЕ ПРЫВЯЗЕ′Ш З ПО′ЛЯ *(арф.)*. Ст. Ратміравічы.

НЕ ХАЧУ′, НЕ ХАЧУ′, АДА′ЛЕ І ПА′ПЛІСКАЮ НЕ АДГО′НІШ. Пазаві́, дак—«ні хо́чу». Ні хо́чу, ні хо́чу, ада́ле й па́пліскаю ні адго́ніш. Кл.

НІ НЯБО′Ж НІ ХРЫШЧЭ′НІК *(арф.)*. Барб.

НІ ПО′РАХУ НІ СІ′НЯГА. Анічога. Ні було́ ж у йіх ні по́раху ні сіняго. Кл.

НІ СВАТ НІ БРАТ І НІ ХРО′СНІК *(арф.)*. Вайц.

НІ СЛАВЕ′ЧКА НІ БЕ′ДНАГА. Маўчыць, ні славе́чка ні бе́днаго ні сказа́ў. Кл.

НІ Ў САЛДА′ТЫ, НІ Ў МАТРО′СЫ, А ПАДМА′З-ВАЦЬ КАЛЁ′СЫ *(арф.)*. Глуск.

НІ ШАВЕ′Ц, НІ КРАВЕ′Ц, НІ КАВА′ЛЬ, НІ СТРУ′ГАЛЬ, — ПРО′СТА ГАВАРЫ′ЛЬШЧЫК *(арф.)*. Глуск.

НО′ГІ АДАБРА′ЛА. У пе́льку ўско́чыў зімо́ю, дак но́гі атабра́ло. Кас.

НОС ЗРЫВА′Е *(арф.)*. Хал.

НЯЛЮ′ДСКАЯ КАМПА′НІЯ І ДО′БРАГА ЗВЯДЗЕ′. Нілю́дзка кунпа́няя й до́браго зьв[е]дзе́. Барб.

НЯМА′ І НА ЗЕ′ЛЛЕ. Так жжыла́са, што німа́ й на зе́льле. Сл.

НЯЧЫ′СТЫ ДУХ *(арф.)*. У тым жа значэнні нячысцік *(арф.)*. Кл.

ПАД БО′ГАВАЮ СТРАХО′Ю. Не накрыта, не прыбрана. Аме́ці й се́ні пад бо́гаваю страхо́ю. Сл.

ПАДКРА′ЎСЯ, ШТО КОТ. Паткра́ўса, што кот. Кл.

ПАДКРА′ЎСЯ, ЯК КОТ *(арф.)*. Н.-Андр.

ПАЖАНІ′ЛІСЯ, ШТО МАЛАДЫ′ КОНЬ І СТАРЫ′ ВОЛ СПРЭ′ГЛІСЯ. Ён стары́, а маладу́ю ўзяў. Куды́ ето ва́рт? Пажані́ліса, што малады́ конь і стары́ вол спрэ́гліса. Хал.

ПАЙСЦІ′ Ў СКО′КІ. Ён шчэ ў ско́кі мог пайці́. Хал.

ПАЙСЦІ′ Ў СТОЛЬ. Гл. столь[2]. Бураќі пашлі́ ў столь. Мо́рква йдзе ў столь. Кл.

ПАЛЕ′ПШАЛА! ТО НУ′ДЗІЛА, А ТО ВАНІТУ′Е *(арф.)*. Кл.

ПАЛІ′ЦЬ МАЛА′НКАЮ. Ні ро́біць, а мала́нкаю па́ліць. Вайц.

ПА МАЛАКУ′ НОГ НЕ ПАВАЛАКУ′. Па малаку́ ног ні павалаку́. Байл.

ПАПА́СЦІ МО́ДУ. Папáлі мóду чытáць на страсé. Другі раз дубцá дам. Хал.

ПА́РА КАСЦЕ́Й НЕ ЛО́МІЦЬ. Лепш хай гóрачэ, [е]к хóладно,—пáра касцéй ні лóміць. Хал.

ПАРАСЯ́ТЫ, ЯК ПАЧЫ́НКІ *(арф.)*. Гладкія, тоўстыя парасяты. Кл. Гл. пачы́нак.

ПАСЛЯ́ ІЛЛІ́ ВАДА́ З ЗЯМЛІ́. Пóсьле Йільлí вадá й зь з[е]млí. Кл., Хал.

ПАСЛЯ́ ПЕ́ЎНЯЎ *(арф.)*. Пасля поўначы. Кл. Слова певень у родн. склоне множн. ліку ўжываецца з націскам на першым (пéўняў) і на другім складзе (пяўнёў), часцей—на другім.

ПАСПЫТА́ЦЬ ДУБЦА́ (паспытáць і паспутáць). Ці аўсá спýтвалі (незак. тр.), а ў такóга рабóцька паспутáлі (коні) дубцá. Кл. Ігрýшы паспутáў і дýбчыка паспутáў. Барб.

ПАСПЫТА́ЦЬ ПУ́ГІ (паспытáць і паспутáць пугі). Каб ён паспутáў мóкрае пýгі, то ні перасьміхáў бу (бы) бóльшых. Кл.

ПАЎТАРА́ ЛЮДСКО́ГА. У нáс нéшто паўтарá людзкóго вýйшло. Сл.

ПАШЛА́ ПО́ГАЛАСКА. Пашлá пóгаласка, што Кандрáт вéльмо дóбры варажбíт. З казкі. Кл. Параўн.: пошла писать губерния. Гл. погаласка.

ПІШЧО́М ЛЕ́ЗЦІ. А наштó было так дамагáцца? Наштó пішчóм лéзьці былó? Кл. Так і трэ́ба йім, чагó пішчóм лêзьлі? Кл.

ПЛЁ́ТКІ ПЛЕ́СЦІ *(арф.)*. Вольн.

ПО́ГАЛАСКУ ПУСЦІ́ЦЬ. Пусьцíлі пóгаласку, што бáчылі ў Мíньську. Кл. Гл. погаласка.

ПО́КУЛЬ БА́ЦЬКА КАПУ́ ЖЫ́ТА ЗМАЛАТА́Ў, ДЫК Я ЛА́ПЦЯ СХВАТА́Ў. Пóкуль бáцько кóпу жы́та змалатáў, дак я лáпця схватáў. Кл.

ПРА́ЎДА НЕ ЎТО́НЕ І НЕ ЗГАРЫ́ЦЬ. На тóе й

ка́жуць, што пра́ўда ні ўто́не й ні згары́ць. Пас. Янкі Купалы.

ПРА′ЦЫ І СВІ′ТКІ НЕ САРО′МЕЙСЯ. Пра́цы й сьві́ткі не саро́м[е]йся. Зуб.

ПРЫ′ДЗЕ МЕ′СЯЦ ЛІЗУ′Н *(арф.)*. Кл.

ПРЫ′ДЗЕ, ТА′ТА, І НА′ША СВЯ′ТА. Каза́ў жэ вам: Пры́дзе, та́то, й на́шае сьвя́то. Ст. Ратміравічы.

ПРЫСТА′Ў, ШТО (ЯК) КАРО′СТА *(арф.)*. Пас. Чырвоны.

ПРЫШО′Ў БАГА′Ч (у першай палове верасня) — КІДА′Й РАГА′Ч, БЯРЫ′ СЯВЕ′НЬКУ ДЫЙ СЕЙ ПАМАЛЕ′НЬКУ *(арф.)*. Кл., Хал., Сл., Вольн., Вільча.

ПУСЦІ′ЦЦА Ў СКО′КІ. Бува́ла пу́сьціцца ў ско́кі, дак здэ́цца ні датро́гваяцца з[е]млі́. Зуб.

ПУСЦІ′ЦЬ НА СВЕ′Т. Пусьці́лі на сьвет му́чыцца. Сл.

ПЧАЛЯ′Р ДЫ ДО′КТАР І Ў ЛЕ′СЕ НЕ ПАМРЭ′. Пчаля́р да йшчэ до́ктар мо й у ле́се ні прападзе́. Сл.

ПЭ′ЙСЫ РАСПУСЦІ′ЦЬ. Запл[е]ці́са! Ці хо́рашэ, што ні запле́цяна, што пэ́йсы распусьці́ла? Кл.

РАБІ′ЦЬ, ДУШЫ′ ПАСЛУХА′ЮЧЫ *(арф.)*. Кл. Параўн.: рускае работать не покладая рук.

РАБО′ЦЬКА!—З ХВАІ′НЫ ДУ′ГІ ГНЕ, А З Я′СЕНЯ НАЧО′ЎКІ ВЫДО′ЎБАЕ. Рабо́цько! З хвайі́ны ду́гі гне, а зь я́сеню начо́ўкі выдо́ўбае. Кл.

РАЗ—ГУ′СТА, РАЗ—ПУ′СТА. Німа́ ла́ду: раз гу́сто, раз пу́сто. Барб.

РАЗДУ′РНАЯ, ЯК ПА′НІНА КО′ШКА. Кл.

РАЗЛУ′ЧНІКУ ВЕ′РЫ НЯМА′. Разлу́чніку ве́ры німа́. Барб. Гл. разлучнік.

РО′ЗУМУ НА КІРМАШЫ′ НЕ КУ′ПІШ І Ў СЛА′ЎКАЎШЧЫНЕ НЕ ЗНО′ЙДЗЕШ *(арф.)*. Вольн.

РО′ЎНЫ, ШТО СТРУНА′ *(арф.)*. Глуск.

РУ′КІ АДАБРА′ЛА. Нóгі й рýкі атабрáло. Гадóў мо шэсь страдáў. Кл.

РУПЛІ′ВЫ!—КАБ З'Е′СЦІ СМАЧНЕ′Й І БОЛЬШ, А ЗРАБІ′ЦЬ ЛЯГЧЭ′Й І МЕНШ. Руплівы!—каб зьесьці смашнêй і бóл[е]й, а зрабіць лягчэ̂й і мéн[е]й. Глуск.

РЫБАКІ′ — ГО′ЛЫЯ БАКІ′, А АБЕ′Д ПА′НСКІ *(арф.)*. Кас.

САВА′ НЕ РО′ДЗІЦЬ САКАЛА′, А ТАКО′ГА ЧО′РТА, ЯК САМА′ *(арф.)*. Кл., Барб.

САЛДА′Т НЕ БАІ′ЦЦА І ПЕ′КЛА. Салдáт не байіцца й пéкла. Зуб.

САМ КАПЕ′ЙКІ НЕ ВА′РТЫ, КАЛІ′ ЧА′РЦЫ РА′ДЫ *(арф.)*. Глуск.

СА′НІ НАГАТАЎЛЯ′Й УЛЕ′ТКУ, А КАЛЁ′СЫ (ВОЗ) УЗІ′МКУ *(арф.)*. Кл.

САПЕ′, ЯК КАВА′ЛЬСКІ МЕХ *(арф.)*. Поб.

САРО′ЧКІ СВАЁЙ БАЯ′ЦЦА. Вар'яцець, быць вар'ятам. Штó б тые паліцáйі сарóчкі свае̂ баялíса, [е]к я йіх набаяласа. Сл.

САТАНА′ ЗМУ′СЦІЦЬ І Я′СНА САКАЛА′. Сатанá змýсьціць і ясна сакалá. Зуб.

СВЕТ НЕ БЕЗ ДО′БРЫХ ЛЮДЗЕ′Й, ДЫЙ СВІННО′ТА НЕ ЗВЯЛА′СЯ. Сьвет ні б[е]з дóбрых людзéй, дай сьвіннóта не зьв[е]лáса. Кл.

СВОЙ СВАЯКА′ БА′ЧЫЦЬ ЗДАЛЯКА′ *(арф.)*. Вільча.

СВЯТА′Я МАНА′ *(арф.)*. Пас. Янкі Купалы, Кл.

СЕДАКО′Ў НА ВАЛА′Х ВАЗІ′ЦЬ. Тут так вýгадно, што с[е]дакóў на валох вазíць. Кл.

СЕМ СЕДАКО′Ў НЕ ВО′З, — АБЫ КО′НЬ ВЁЗ! *(арф.)*. Кл.

СЕРАДА′ З-ПАД ПЯ′ТНІЦЫ ВІДА′ЦЬ *(арф.)*. Кл.

СІ′ЛАЮ НЕ БЫ′ЦЬ МІ′ЛАЮ. Сíлаю не бýць мíлаю. Кас., Зуб.

СІ'ЛЫ, ЯК У СІ'НЬДЗІКА *(арф.)*. Кл. Гл. сіньдзік.

СКАЗА'Ў — ШТО ПУ'ГАЮ ПА ВАДЗЕ' ПЛЯ'С-НУЎ *(арф.)*. Сым.

СЛІ'ЗКІ, ШТО ЎЮ'Н *(арф.)*. Кл.

СЛЯПЫ'Я Ў КА'РТЫ НЕ ГУЛЯ'ЮЦЬ *(арф.)*. Кл.

СМА'ГУ ПРАГНА'ЦЬ *(арф.)*. Хал., Поб.

СМАЛІ'ЦЬ МАЛА'НКАЮ. Про́сто што мала́нкаю сма́ліць, так лоўко ро́біць. Кл.

СНЕГ САЛО'МАЮ ТУШЫ'ЦЬ *(арф.)*. Відавочная мана, хлусня, небыль. Зуб.

СПАДЗЯЕ'ШСЯ Ў КУМЫ' ПАД'Е'СЦІ,—АЛЕ ЦІ ВАРЫ'ЛА ЯНА' Е'СЦІ? *(арф.)*. Глуск.

СПІЦЬ І АДНЫ'М ВО'КАМ ГЛЯДЗІ'ЦЬ *(арф.)*. Н.-Андр.

СТО ГАДО'Ў ХАДЗІ'ЦЬ І СТО НА КАРА'ЧКАХ ПО'ЎЗАЦЬ! *(арф.)*. Кл.

СЦЕ'НКІ, ЯК ПАПЕ'РКІ. Вельмі чыстыя сценкі. З песні: Сце́нкі—як папе́ркі, ла́ўкі — як кіта́йкі *(арф.)*. Кл.

ТАМ ТАБЕ' (ЯМУ, ВАМ) І КАПЕ'Ц. Там табе́ й капе́ц будзе. Н.-Андр.

ТО'ЛЬКІ ВУГЛЫ' ПАКІ'НУЦЬ. Абрабаваць, нічога не пакінуць. То́лькі вуглы́ пакіну́лі (нямецкія акупанты), апро́ч вады́ нічо́га ні было́. Вільча.

ТРЭ'ЦІМ РАЗКО'М ЛЕ'ПШЫМ ЧАСКО'М. Трэ́йцім разко́м, ле́пшым часко́м. Сл.

У БАКА'Х САТКА'ЛА (СЦЯЛО'). Сціснула дыханне. У бако́х саткало, й ні дыхну́. Кл.

УВЕ'СНУ НЕ ПРЫСЛУХА'ЙСЯ, ШТО БАЛІ'ЦЬ *(арф.)*. Кл.

УВО'СЕНЬ ДА'ВАЙ КА'РОВЕ, ШТО ЕСЦЬ, А УВЕ'СНУ, ШТО ЁСЦЬ. Уво́с[е]нь дава́й каро́ве, што ёсь, а ўве́сну, што есь. Кл.

У ВО'ЧЫ ЛЕ'ЗЦІ. Пяраста́нь ты ў во̂чы лёзьці!

Каб за штó, а то за німа ніштó лéзе сьл[е]піцаю ў вочы. Барб.

У ВЫРАЙ ЗБІРА′ЦЦА (у вы́рай, у вýрай зьбірáцца). Дажываць дні (на старасці, пасля хваробы). Н[е] маê гады́ на ры́бу хадзіць, — у вýрай зьбірáцца парá. Дак.

У ВЯЛІ′КІХ ГАДА′Х. Бáба ў в[е]лікіх гадóх. Зуб. Яму ўжэ вялíкія гады *(арф.)*. Кл.

УЗБІ′ЦЦА НА ЖЫЦЦЁ′. Ні мôг ніяк на жыццé ўзьбіцца. Кл.

УЗГРЭ′БЦІСЯ НА НО′ГІ *(арф.)*. Кл. Гл. варсануць.

УЗЯ′ЦЬ ВЕРХ *(арф.)*. Глуск.

УЗЯ′ЦЬ ЗА ШЧЭ′ЛЕПЫ. Хварóбу вýлужацца: ўзялí за шчэ́ляпы. Кл.

УЗЯ′ЦЬ МО′ДУ. Як вам ні сóрам! Ето ўзялí мóду— што сыбóты в[е]чары́нка. Пас. Янкі Купалы.

У ІХ КІРМА′Ш, А Ў НАС РАБО′ТЫ НЯМА′Ш. У йіх кірмáш, а ў нас—рабóты німáш. Кл.

У КІЯ′Х. У кутку каля печы, дзе стаяць вілкі, камяня (гл.), ёмка (гл.). Пры́дзе, стáне ў парóзе або ў кіёх. Чагó ето ты так? Кл.

У ЛА′ДКІ СПЛЯСКА′ЦЬ (у лáдкі сплéшчуць). Ён так умée сказáць і прыказáць, што ў б[е]сéдзе й у лáдкі сплéшчуць. За éтае варт у лáдкі сьпл[е]скáць. Кл.

У ЛУ′ЦЦЕ (у лýцьце). Гл. лýцце. Мы с Трахімам хадзілі ў лýцьце—хадзілі ў лес драць ліповае лыка. Кл.

У НА′ШАЕ АКУРА′ТНІЦЫ ВІДА′ЦЬ СЕРАДА′ З-ПАД ПЯ′ТНІЦЫ. А ў нáшае акурáтніцы відáць с[е]рада спат п'я́тніцы. Хал.

У ПА′СКІ. Харóшае матэ́райі ў пáскі купíла. Кл. На кóхту ў пáскі ніхóрашэ. Кл. У пáсачкі крам. Барб.

УПЯЧЫ′СЯ Ў БАКІ′ *(арф.)*. Кл.

У САБА′КІ ВО′ЧЫ ПАЗЫ′ЧЫЎШЫ *(арф.)*. Пас. Янкі Купалы.

УСЁ Ў ЖЫЦЦІ′ ТРЭ′БА, АДНО′ ЛІ′ХА НЕ ТРЭ′-БА *(арф.)*. Глуск, Кл.

У СТРАЛЬЦА′ І МУЗЫ′КІ ХЛЕБ НЕВЯЛІ′КІ. У стральца́ й музы́кі хлеб нів[е]лікі. Кл.

УСЯ′КІ БА′ЧЫЦЬ, ШТО НА МНЕ, ДЫ НІХТО′ НЕ БА′ЧЫЦЬ, ШТО ЎВА МНЕ *(арф.)*. Сл.

У ЦЯЖКУ′ *(арф.)*. Цяжарная. Га́нна ў цяжку́ тады хадзіла *(арф.)*. Кл. Гл. цяжкая. Параўн.: чэшскае obtěžkati—зацяжараць, абцяжарыць.

ХАДЗІ′ЦЬ З ПРЫПО′ЛАМ. Жывіцца, выпрошваючы ў сваякоў і суседзяў. Йіха ма́ці да сьме́рці хадзіла с прыпо́лам. Зуб.

ХАДЗІ′ЦЬ З ТО′РБАЮ. Жабраваць. Ні бу́дам рабіць, а хто́ дась хле́ба гультаю́? С то́рбаю хадзіць? Зуб.

ХАЦЯ ШТО МА′ЛЕЧКУ. Чуць што. Хаця́ што ма́лячку, дак ён ужэ й крычы́ць. Кл.

ХВАРО′БА НЕ ПЕ′РНІК: НЕ ПРАКАЎНЕ′Ш І НЕ АДКА′ЖАШСЯ *(арф.)*. Глуск.

ХВО′РАМУ ЎСЮ′ДЫ МУ′ЛКА. А хво́раму ўсю́ды му́лка. Барб.

ХІБА ХВАРЭ′Е (ХВАРЭ′ЮЦЬ)! Можа, могуць! Хіба хварэе сам накасіць? Кл.

ХЛЕБ КА′ЖА: КІНЬ СТРЭ′ЛЬБУ І ВУ′ДУ, Я Ў ЦЯБЕ′ НА СТАЛЕ′ БУ′ДУ *(арф.)*. Кл.

ХЛЕБ—НЕ ЗЯЦЬ, ДО′БРЫЯ ЛЮ′ДЗІ З′ЯДЗЯ′ЦЬ *(арф.)*. Кл.

ХЛО′ПЕЦ, ЯК КАМЕ′ЛЬ *(арф.)*. Кл.

ХО′ДЗІЦЬ ЦІХО′М, А ВАЛО′ЧЫЦЬ (ЦЯГАЕ) МЯХО′М. Хо́дзіць ціхо́м, а вало́чыць м[е]хо́м. Пас. Янкі Купалы.

ХО′ДЗІЦЬ, ЯК ПАДМЕ′ЦЕНЫ *(арф.)*. Вайц.

ХО′ДЗЯЦЬ, ЯК ЗЛЫ′ГАНЫЯ *(арф.)*. Дружна ў пары, неразлучна. Гл. злыгаць, залыгаць. Кл.

ХОЦЬ КА′ЛІЎЦА, ХОЦЬ ЦАВІ′НКУ (ЦАВІ′НАЧКУ). Хоць крышку (крышачку). Дай хоць ка́ліўцэ, хоць цаві́нку. Кл.

ХОЦЬ ТЫ РО′ВАМ РАВІ′ *(арф.)*. Барб., Кл.

ХТО ГО′РБАМ, А ХТО ГО′РЛАМ *(арф.)*. Глуск.

ХТО — КАБ ГО′РБАМ, ХТО — КАБ ГО′РЛАМ, А ХТО—КАБ ХІ′ТРЫКАМІ *(арф.)*. Глуск.

ХТО КАПЕ′ЙКІ НЕ БЕРАЖЭ′, ТОЙ САМ РУБЛЯ′ НЕ ВАРТ. Хто капе́йкі ні беражэ́, той сам рубля́ ні ва́рт. Кл. Глуск.

ХТО САМ СЯБЕ′ ХВА′ЛІЦЬ, ХАЙ ТАГО ПЯРУ′Н СПА′ЛІЦЬ. Хто сам сябе́ хва́ліць, хай таго́ пе́рун спа́ліць. Кл.

ХУ′ТКА РО′БІЦЬ, АЛЕ ПЕРАРАБЛЯ′Е ДОЎГА. Ху́тко рабіў, але перарабля́ў до́ўго. Кл.

ЦАПУ′-ЛАПУ′. Хапаючыся, абыякава. Кл.

ЦЁ′ГАМ ЦЯГНУ′ЦЬ *(арф.)*. Зуб., Сл.

ЦІ БЫЛА′ Ў САБА′КІ ХА′ТА? *(арф.)*. Зуб.

ЦІ—ЗА НАЧА′ЛЬНІКА, ЦІ — ЛЯ НАЧА′ЛЬНІКА, А ДА ГРАБЕ′ЛЬ РУ′КІ НЕ ДАХО′ДЗЯЦЬ *(арф.)*. Гл.

ЦІ КЛО′ЧЧА, ЦІ ВО′ЎНА — АБЫ КІ′ШКА ПО′ЎНА. Ці кло́чч[э] ці во́ўна, абы (і абу) кі́шка по́ўна. Кл.

ЦІ ЯШЧЭ′, ЦІ ГО′ДЗЕ? Ці йшчэ ці годзе? Барб.

ЦЭ′ЛАЯ ВАЙНА′ (цэла і цэ̂ла вайна́). 1. Багата (пра людзей). Ад Заха́рйі цэ̂ла вайна́ людзе́й ву́йшла. Кл. 2. Сварка з бітваю. Там цэ̂ла вайна́ йшла. Барб.

ЦЯЛЯ′ТЫ ЯЗЫ′К АДЖАВА′ЛІ *(арф.)*. Пас. Янкі Купалы. Параўн.: маўчыць, як ваді́ ў рот набра́ўшы.

ЧАГО′ НЕ ХО′ЧАШ САМО′МУ, НЕ ЧЫНІ′ ДРУГО′МУ *(арф.)*. Кл.

ЧО′БАТАМ ЗНО′СУ НЯМА′: ГАДО′Ў ДЗЕ′СЯЦЬ У РУКА′Х НО′СІЦЬ *(арф.)*. Барб.

ЧОРТ НА ФО′РМУ ЎКРАЎ *(арф.)*. Кл.

ЧУЖЫ'М ЦЯ'ЖКА ЗАПАМАГЧЫ'СЯ. Чужы́м ця́жко запамагці́са. Кл. Гл. запамагчыся.

ШАЛЁ'НАЯ МУ'ХА ЎДЖЫГНУ'ЛА ЗА ВУ'ХА *(арф.)*. Сым.

ШАЛЁ'НАЯ МУ'ХА ЎКУСІ'ЛА ЗА ВУ'ХА *(арф.)*. Сым.

ШАНУ'ЮЧЫ ВАС (ЦЯБЕ). Сінонім да прабача́йце (прабача́й); шану́ючы вас (цябе)—прабачэнне, якога просяць, калі ў гутарцы называюць што-небудзь непажаданае ці не зусім прыемнае для прысутных або не зусім прыстойнае. Разрэ́залі (скулянку), дак, шану́ючы вас, бру́ду мо шкля́нка. Кл.

ШЛУ'ННЕ ВЫ'ЦЯГНУЦЬ *(арф.)*. Кл.

ШТО ЛЕ'ТАМ НО'ЖКАЮ ТОП, ТОЕ ЗІМО'Ю Б РУ'ЧКАЮ ХОП. Што лётам нôжкаю топ, то́е зімо́ю б ру́чкаю хоп. Кл.

ШЧЫРАЯ ПРАЎДА. Ні мана, а шчы́рая пра́ўда. Кл.

ЯК АБЫЯ'КАЯ ПРЫСМА'КА, ТО ЛЕПШ НІШЧЫ'МНАЕ. Я́к абыя́ка прысма́ка, то лепш нішчы́мнае. Кл.

ЯК АБЫЯ'КІ, ДЫК ЛЕПШ НІЯ'КІ. [Е]к абыя́кі, дак ле́п[е]й нія́кі. Зуб.

ЯЗЫКО'ВАЕ МЛІ'ВА НЕ ГАДЗІ'ВАЕ. [Е]зыко́вае млі́во ні гадзі́вае. Кл.

ЯЗЫКО'М СЕ'НА НЕ НАКО'СІШ *(арф.)*. Глуск.

ЯК БАЙЧ! Гл. як бач.

ЯК БАЧ! Хутка, спрытна, імгненна. Як ба́йч прыпру́. Кл. Гл. бач і байч.

ЯК БА'ЧЫШ! Хутка, спрытна, імгненна. Як ба́чыш зро́біць. Кл.

ЯК ВА'РАМ АБЛІ'ТЫ *(арф.)*. Сл.

ЯК ВО'КАМ ДАСТА'ЦЬ. Завішава́ло бало́то, як во́кам даста́ць. Байл.

ЯК ЗА СЯБЕ′ ЗАКІ′НУЦЬ *(арф.)*. Хутка, не разбіраючыся ў якасці і смаку стравы, з'есці. Кл.

ЯК ЗДАЕ′ЦЦА, ТО ХРЫСЦІ′СЯ *(арф.)*. Жартоўны адказ (заўвага) таму, хто няўпэўнена гаворыць, прыпускаючы меркаванні. Кл.

ЯК МА′ЦІ ПАМЕ′РЛА, ДЫК БА′ЦЬКА АСЛЕ′П. Як мáці памéрла, дак бáцька асьлёп. Зуб.

ЯК НАВУЧЫ′ЎСЯ, ТО І НА МА′ТКУ ЗАБЫ′ЎСЯ. Як навучы́ўся, то й на мáтку забы́ўся. Пас. Янкі Купалы.

ЯК НАЛІВА′НЫЯ. Параўнанне да вельмі прыгожых, гладкіх і блішчастых яблыкаў, ягад і да жывых істот (парасяты, быкі). Парася́та — што налівáный[е]. Кл. Яблыкі [е]к налівáныйе. Барб.

ЯК НА ТО′Е ЛІ′ХА *(арф.)*. Сым.

ЯК ПО′ЙДЗЕШ НАЦЯНЬКІ′, ДЫК ПРАХО′ДЗІШ ТРЫ ДЗЯНЬКІ′ *(арф.)*. Кл.

ЯК ПУ′ГАЮ ПА ВАДЗЕ′ *(арф.)*. Глуск.

ЯК СКА′ЖА «МА′БЫЦЬ», ТО ПРА АДКЛА′Д ЗАЛА′ДЗІЦЬ. [Е]к скáж[э] «мáбыць», то пра атклáд залáдзіць. Кл.

ЯК ТАБЕ′ ДО′БРА, ТО І Ў НО′ГІ ЛІЗНЕ′, А ЯК ТАБЕ′ НЕВЫХО′ДНА, ТО Ў ЯМУ КАПСАНЕ′. Як табе дóбр[э], то й у нóгі лізьнé, а як табê нівыхóдно, то ў я́му капсанé. Глуск.

ЯК У ЛУ′ЖУ СЕЎ *(арф.)*. Барб.

ЯК У РА′КУ СМА′КУ *(арф.)*. Кл.

ЯКУРА′Т ЯК У СУ′К *(арф.)*. Вайц.

ЯК У СУ′К УЛЯПІ′Ў *(арф.)*. Пас. Янкі Купалы.

ЯК У ТРА′СЦЫ КІ′ДАЕ *(арф.)*. Вольн.

ЯК ЯЗЫЧКО′М, ТАК СМЫЧКО′М *(арф.)*. Сым.

ПАКАЗЧЫК

моў, з якіх прыводзяцца ў слоўніку прыклады; раёнаў Беларусі, з якіх даюцца словы; аўтараў на якіх робяцца спасылкі. Лічба паказвае старонку ў слоўніку.

ЗМЕСТ

На белорусском языке

Федор Михайлович Янковский

ДИАЛЕКТНЫЙ СЛОВАРЬ

Издательство АН БССР, Минск, 1959 г.

* * *

Рэдактар Выдавецтва *Iв. Чыгрынаў*

Тэхнічны рэдактар *I. Валахановіч*

Карэктар *О. Церашчатава*

*

АТ 02767. Здана ў набор 30/IX-1958 г. Падпісана да друку 3/IV-1959 г. Тыраж 1800 экз. Папера $70 \times 92^1/_{32}$. Выд. арк. 9,0. Друк. арк. 8,5, Выд. заказ 024. Друк. заказ 1794. Цана 4 р.

*

Друкарня Выдавецтва АН БССР

Мінск, праспект Сталіна, 110